В.М. Бялявіна

# Хлеб надзённы беларускай вёскі










В.М. Бялявіна



# ХЛЕБ НАДЗЁННЫ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ




Мінск
«Беларусь»
2016

УДК [631+39](476-22)
ББК 4г(4Беи)
Б44

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

Рэцэнзенты:
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
доктар гістарычных навук, прафесар *А. І. Лакотка*,
доктар гістарычных навук *Т. А. Навагродскі*

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Расійскага этнаграфічнага музея (г. Санкт-Пецярбург), Дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў (г. Дзяржынск), Музея Беларускага Палесся (г. Пінск), Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў, Дзятлаўскага раённага музея народнай славы, Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробству, Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі, архіва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у тым ліку малюнкі мастака-этнографа С. Ц. Гунько, фотаздымкі з калекцый У. М. Меляшэнкі, Т. А. Навагродскага, Л. В. Ракавай.

**Бялявіна, В. М.**

**Б44** Хлеб надзённы беларускай вёскі / В. М. Бялявіна. — Мінск : Беларусь, 2016. — 311 с. : іл.

ISBN 978-985-01-1183-8.

У кнізе, багата ілюстраванай архіўнымі і сучаснымі фотаздымкамі, паказаны этапы развіцця беларускай вёскі і земляробства — ад старажытнасці да нашых дзён, разглядаецца эвалюцыя спосабаў апрацоўкі глебы, прылад працы, якія ў розныя гады выкарыстоўваліся для вырошчвання ўраджаю, расказваецца аб звычаях і традыцыях у сялянскай працы і побыце беларусаў.

Для шырокага кола чытачоў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй сельскай гаспадаркі Беларусі.

**УДК [631+39](476-22)**
**ББК 4г(4Беи)**

**ISBN 978-985-01-1183-8**

© Бялявіна В. М., 2016
© Афармленне. Выдавецтва «Беларусь», 2016

# УВОДЗІНЫ

Земляробства з'яўлялася асновай жыццядзейнасці і галоўным гаспадарчым заняткам беларусаў з глыбокай старажытнасці, вызначаючы характар і асаблівасці іх матэрыяльнай культуры, лад жыцця, працоўныя навыкі. Развіццё земляробства было абумоўлена прыродна-кліматычнымі ўмовамі Беларусі, узроўнем вытворчых сіл грамадства, інтэнсіўнасцю культурных сувязей з суседнімі народамі. Ад земляробства неаддзельна і мноства элементаў народнай духоўнай культуры. Яно спарадзіла самы багаты пласт беларускага фальклору і ўстойлівую сістэму абрадаў і звычаяў, што суправаджалі хлебаробаў як у святы, так і ў штодзённай працы і сваімі вытокамі сягаюць у дахрысціянскую эпоху.

Ва ўсе часы збожжа — галоўны прадукт земляробчай вытворчасці — было і застаецца стратэгічным прадуктам, колькасць і запасы якога характарызуюць эканамічную незалежнасць і харчовую бяспеку любой дзяржавы.

На падставе гістарычнай, сельскагаспадарчай, этналагічнай літаратуры, перыядычных сельскагаспадарчых выданняў XIX — пачатку XXI ст., палявых даследаванняў беларускіх этнолагаў, архіўных, дакументальных матэрыялаў, даных дзяржаўнага статыстычнага ўліку і музейных калекцый у кнізе зроблена спроба прасачыць эвалюцыю земляробства на тэрыторыі Беларусі з ранняга сярэднявечча да цяперашняга часу ва ўзаемасувязі з сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі феадальнага, капіталістычнага, сацыялістычнага і сучаснага грамадства.

Кола пытанняў, якія разглядаюцца ў першай главе, прысвечанай земляробству ў традыцыйнай беларускай вёсцы, надзвычай шырокае. У ёй асвятляецца развіццё на Беларусі асноўных сістэм земляробства і прасочваецца фарміраванне харчовых культур, якія на працягу стагоддзяў вырошчвалі беларусы. Даследавана эвалюцыя сялянскага землеўладання і землекарыстання, на якія вызначальны ўплыў аказалі зямельныя рэформы 1557 і 1861 гг., развіццё капіталістычных адносін у вёсцы ў другой палове XIX ст. і сталыпінская рэформа пачатку XX ст. Земляробства не існуе без хлебаробаў. Таму традыцыйныя спосабы і рэгіянальныя асаблівасці сяўбы збожжавых культур, уборкі і захавання ўраджаю прыведзены ў комплексе са звычаямі, абрадамі і фальклорнымі тэкстамі, якія суправаджалі гэтыя цыклы сялянскіх работ.

У другой главе разглядаюцца сацыялістычныя пераўтварэнні ў аграрнай сферы Беларусі ў гады савецкай улады. Асаблівая ўвага надаецца жыццю сялян і развіццю іх падсобных гаспадарак у часы ваеннага камунізму і нэпу, суцэльнай калектывізацыі, у ваенныя гады і ў перыяд пасляваеннага ўзнаўлення народнай гаспадаркі. На канкрэтных матэрыялах паказваюцца дасягненні сельскай гаспадаркі краіны ў 1970—1980-я гг. і станоўчыя перамены ў матэрыяльным становішчы, умовах жыцця і працы вясковых жыхароў.

Характарыстыка раслінаводства ў краіне і развіццё фермерскіх і падсобных гаспадарак жыхароў у сучаснай беларускай вёсцы размешчаны ў трэцяй главе. У цяперашні час у сельскай мясцовасці пражывае 22,7 працэнта насельніцтва краіны, якое забяспечвае харчаваннем усю нашу дзяржаву і частку іншых дзяржаў. Сельская гаспадарка Беларусі ў постсавецкі перыяд дынамічна развіваецца. Дзякуючы шырокаму прымяненню мінеральных, арганічных удабрэнняў і комплексу спецыялізаваных машын айчыннага машынабудавання створана буйнатаварная сельскагаспадарчая вытворчасць і дасягнута высокая прадукцыйнасць зямель. Сфарміравана навуковае забеспячэнне аграпрамысловай вытворчасці, што гарантуе пастаўкі ў сферу раслінаводства высакаякасныя сарты і гібрыды сельскагаспадарчых культур.

Усебаковая дзяржаўная падтрымка сельскай гаспадаркі і эфектыўнае выкарыстанне ўнутраных рэсурсаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў дазволілі Беларусі ўвайсці ў лік нямногіх краін свету, у якіх забяспечана поўная харчовая бяспека дзяржавы і нарошчваецца экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання. У Беларусі ідзе актыўнае пераўтварэнне вытворчай і сацыяльна-культурнай сферы сяла на аснове найноўшых дасягненняў аграрнай навукі, замежнага вопыту і айчыннай практыкі ўдасканалення сельскагаспадарчай вытворчасці. Поруч з буйнымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі на раўнапраўнай аснове развіваюцца фермерскія гаспадаркі, функцыянуюць падсобныя гаспадаркі вясковых жыхароў. У краіне пабудавана сетка аграгарадкоў, колькасць якіх прыкладна супадае з колькасцю буйных таварных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і цэнтраў сельскіх саветаў, што садзейнічае аптымізацыі развіцця сельскіх тэрыторый. Аграгарадкі забяспечваюць сваіх жыхароў усім комплексам сацыяльных стандартаў жыцця і культурна-бытавых паслуг, якія па якасці не саступаюць гарадскім.

Разам з тым сучасная аграрная вытворчасць, як і шмат стагоддзяў назад, застаецца шмат у чым традыцыйнай, нягледзячы на насычанасць яе перадавымі тэхнічнымі сродкамі. Тэхналогія земляробства па-ранейшаму зводзіцца да апрацоўкі глебы, сяўбы, догляду за раслінамі ў вегетацыйны перыяд уборкі ўраджаю. Пасевы сельскагаспадарчых культур у значнай ступені залежаць ад кліматычных умоў года, бо Беларусь знаходзіцца ў зоне рызыкоўнага земляробства. У сувязі з гэтым удзячны ўлік велізарнага народнага вопыту гаспадарання на зямлі можа быць карысным у вырашэнні сучасных задач развіцця аграпрамысловага комплексу краіны.

Аўтар выказвае шчырую падзяку рэцэнзентам — акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктару гістарычных навук А. І. Лакотку і доктару гістарычных навук Т. А. Навагродскаму за карысныя парады адносна рукапісу кнігі.

За дапамогу па збіранні ілюстрацыйных матэрыялаў аўтар удзячная загадчыцы навукова-фондавага аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Н. І. Саўчанка, адміністрацыі і супрацоўнікам Навукова-вытворчага цэнтра па земляробству Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, адміністрацыі і супрацоўнікам Навукова-вытворчага цэнтра па механізацыі сельскай гаспадаркі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама ўсім уладальнікам апублікаваных фотаздымкаў. Асабліва ўдзячная аўтар за дапамогу Л. Ф. Тарайкоўскай, І. В. Раманенка, Т. В. Бойка і Ю. С. Пракоф'евай.

ГЛАВА 1

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ВЁСКА (X — ПАЧАТАК XX СТ.)





# Сістэмы земляробства і прылады апрацоўкі глебы



Сістэмай земляробства прынята называць формы, у якіх ажыццяўляецца той ці іншы спосаб апрацоўкі зямлі і аднаўлення яе ўрадлівасці. Сярод сістэм земляробства вылучаюць пасечна-агнявую (лядную), залежную (аблогавую), двухполле, трохполле і шматполле (пладазменную сістэму). Яны адлюстроўваюць стан земляробства і яго агратэхнічны ўзровень на розных этапах гістарычнага развіцця народаў.

Земляробства вядома на тэрыторыі Беларусі з часоў неаліту. Аднак канчаткова яно ўсталявалася на ўсіх беларускіх землях у пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. у бронзавым веку[1]. Плямёны, што займаліся земляробствам, сяліліся пераважна ў поймах рэк, на лясных палянах, дзе існавалі прыдатныя для апрацоўкі ўчасткі зямлі, якія рыхлілі каменнымі і рагавымі матыкамі[2]. Апрацаваныя ўчасткі зямлі выкарыстоўвалі некалькі гадоў, а затым глеба страчвала ўрадлівасць і палі даводзілася пакідаць, а пад пасевы шукаць і асвойваць новыя ўчасткі, што суправаджалася перасяленнем у новыя месцы. Гэтая старажытная сістэма земляробства, якая ўзнікла як першая пераходная ступень аседлага жыцця, атрымала назву залежнай (аблогавай).

У другой палове 1-га тысячагоддзя н.э. на тэрыторыі Беларусі пачалося рассяленне славянскіх плямёнаў, гаспадарчым заняткам якіх было земляробства. Вядомы рускі вучоны-аграном XIX ст. А. В. Саветаў у сваёй працы «Аб сістэмах земляробства» (1867) пісаў, што непазбежным спадарожнікам перасялення славянскіх плямёнаў у лясную зону Усходняй Еўропы была пасечна-агнявая сістэма земляробства, калі для ператварэння зямлі ў стан, прыдатны для хлебаробства, высякалі і спальвалі лес. На выпаленым участку глеба ўгнойвалася попелам ад спаленых дрэў і іншай расліннасці, узбагачалася карыснымі мінеральнымі элементамі. Пасля прымітыўнай паверхневай апрацоўкі ўчастак некалькі гадоў запар засявалі збожжавымі культурамі. Калі ж ураджайнасць збожжа значна зніжалася, участак пакідалі і асвойвалі іншы, а пакінуты зноў зарастаў лесам[3].

Характэрнымі рысамі пачатковага перыяду земляробства пры нізкім узроўні развіцця прадукцыйных сіл было толькі выкарыстанне прыродных якасцей зямлі пры адсутнасці мерапрыемстваў па аднаўленні і павышэнні ўрадлівасці глебы. Паводле азначэння А. В. Саветава, пасечна-агнявая сістэма земляробства з'яўляецца самай драпежніцкай у адносінах да прыроды, бо яна толькі бярэ з зямлі яе састаўныя часткі, але нічога ёй не вяртае. Вынік прымянення гэтай сістэмы — часовая неўрадлівасць зямлі. Пакуль былі невядомыя больш дасканалыя формы земляробства, для выжывання старажытным насельнікам патрэбны былі пошукі новых зямель і перыядычная змена месца паселішчаў для набліжэння іх да засеяных палёў[4]. Засявалі толькі свежаўзараныя ўчасткі і пасля выкарыстання іх на працягу некалькіх гадоў рэдка да іх вярталіся[5]. Сістэма такіх недаўгавечных сельскіх паселішчаў X—XI стст. выяўлена археолагамі ў раёне Мінска каля вёскі Гута пад Заслаўем, а таксама каля вёсак Навасады, Гарадзішча на рэках Менка і Ашмянка[6].



Распрацоўка лесу пад лясную дзялянку («ляда»).
Вёска Буды Слуцкага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

Паступовы колькасны рост насельніцтва і ўзнікненне прыватнай уласнасці на зямлю паклалі канец перамяшчэнню пасяленняў да новаасвоеных палёў і абумовілі пераход да пералогавай сістэмы земляробства, пры якой выкарыстанае поле пакідалі толькі на некалькі гадоў для натуральнага ўзнаўлення ўрадлівасці, а потым зноў засявалі.

У канцы 1-га тысячагоддзя на Беларусі ўсталявалася стойлавае ўтрыманне жывёлы, што сведчыла ўжо аб існаванні на беларускіх землях устойлівых мясцовых традыцый жывёлагадоўлі[7], таму, калі ўраджаі пры пералогавай сістэме пачыналі зніжацца, земляробы сталі ўгнойваць палі.

Далейшае ўдасканаленне спосабаў земляробства ішло ў напрамку скарачэння «адпачынку» поля, больш працяглага яго выкарыстання, узнікнення залежнасці земляробства ад жывёлагадоўлі як крыніцы ўгнаення.

Развіццё феадальных адносін і абмежаванне зямельных угоддзяў вялі да эвалюцыі пералогавай сістэмы ў папарную. Пачатковая форма папарнай сістэмы, якая ўзнікла з пералогавай, мела выгляд двухпольнай гаспадаркі, у якой пакідалі адно поле пад збожжам, а другое ў папары. Затым двухполле паступова выцяснілася трохполлем, бо рост насельніцтва патрабаваў большай колькасці хлеба, чым магла вырабляць двухпольная гаспадарка. У такіх умовах земляробам давялося абмежаваць папар з $^1/_2$ да $^1/_3$ часткі поля[8]. Такім чынам, трохпольная гаспадарка развілася з двухпольнай формы, якой гістарычна папярэднічала пералогавая сістэма земляробства.

Пераход ад прымітыўных сістэм да папарнай стаў важным дасягненнем на шляху інтэнсіфікацыі земляробства: палепшылася выкарыстанне зямлі, значна пашырыліся пасевы збожжавых культур і павялічылася вытворчасць збожжа. Апрацоўка глебы ў папарным полі, асабліва ў спалучэнні з угнаеннем, уяўляла сабой ужо актыўнае ўмяшанне чалавека ў прыродныя працэсы, якія адбываюцца ў глебе, і дазваляла падтрымліваць ураджайнасць збожжавых культур на больш высокім узроўні ў параўнанні з прымітыўнымі земляробчымі сістэмамі[9].

Узнаўленне ўрадлівасці глебы шляхам замены шматгадовай аблогі або заросшай маладым лесам былой пасекі аднагадовай апрацоўкай папарнага поля дало магчымасць у значных памерах павялічыць вытворчасць азімага збожжа. Затраты працы на апрацоўку пастаянных ворных палёў рэзка зменшыліся, а прадукцыйнасць працы ўзрасла. Паводле падлікаў акадэміка С. Г. Струміліна, затраты працы на апрацоўку адной дзесяціны пры папарнай сістэме з прымяненнем сахі і коннай цягі амаль у тры разы меншыя, чым пры пасечна-агнявой[10].

Пры папарнай сістэме земляробства два-тры работнікі, якія мелі пару коней, маглі вырошчваць такую колькасць збожжа, корму для жывёлы і іншых прадуктаў, што іх хапала для падтрымання працаздольнасці сям'і і для выплаты феадалу зямельнай рэнты.

Паводле археалагічных і гістарычных крыніц, трохпольная сістэма земляробства ў Старажытнарускай дзяржаве атрымала шырокае распаўсюджанне ў IX—XI стст. Аб гэтым сведчаць развіццё стойлавай жывёлагадоўлі, якая давала ўгнаенне, а таксама наяўнасць у археалагічных помніках азімых і яравых палявых культур[11].

Знаходкі археолагамі зерня збожжавых культур з рознай доляй і складам дамешкаў пустазелля гавораць аб выкарыстанні на Беларусі ў IX—XIII стст. паралельна розных сістэм земляробства: пасечна-агнявой, аблогавай (пералог), двухполля і трохполля. Збожжа, атрыманае ў першыя гады на ачышчаных ад лесу дзялянках, змяшчае нязначную колькасць насення пустазелля, якое гіне пры выпальванні дрэў і выкарчоўванні пнёў. Таму адсутнасць у насенні палявых збожжавых культур значных дамешкаў пустазелля археолагі лічаць доказам выкарыстання пасечна-агнявой сістэмы земляробства. Другім доказам існавання гэтай сістэмы з'яўляецца структура зерневага матэрыялу. На лясных лядах было прынята сеяць пшаніцу, ячмень і проса, якія даюць добры ўраджай на малаакультураных землях[12].

На пясчаных малаўрадлівых глебах сялянамі шырока прымянялася пералогавая сістэма земляробства. Пры пералогу частка зямлі пакідалася на некалькі гадоў без апрацоўкі і станавілася пашай для жывёлы або сенажаццю пад назвай «аблога». Пад уздзеяннем прыродных фактараў урадлівасць глебы за гэты час узнаўлялася натуральным шляхам і ўчастак зноў засяваўся.

Рост попыту на збожжа на замежным рынку і ўзросшыя патрэбы прывілеяванага саслоўя, цяжкі фінансавы стан дзяржавы ў 20-я гг. XVI ст. патрабавалі прыняцця эканамічных мер для павелічэння даходнасці казны і землеўладальнікаў. Перад уладарамі Вялікага Княства Літоўскага паўстала надзённая задача правядзення шырокіх аграрных пераўтварэнняў, якія ў выніку павінны былі прывесці да росту прыбыткаў казны і землеўладальнікаў. Гэтая рэформа вядома ў гістарычнай літаратуры як аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст., ці «валочная памера».

Рэформа ўводзіла абавязковае трохполле з прымусовым севазваротам. Згодна з рэформай, усе вясковыя надзелы зводзіліся ў адзін абруб, а затым у адпаведнасці з патрабаваннямі рэгулярнай трохпольнай сістэмы земляробства падзяляліся на тры роўныя палі. Валокай зямлі, падзеленай на тры часткі, якія знаходзіліся ў розных палях, магла карыстацца як адна сям'я, так і некалькі.

Гэтая рэформа больш чым на тры з паловай стагоддзі замацавала ў сельскай гаспадарцы Беларусі панаванне папарнай, збожжавай трохпольнай сістэмы земляробства. Умовамі такога доўгага яе існавання былі натуральны характар гаспадаркі, раздробленая вытворчасць індывідуальных сялянскіх гаспадарак, бяспраўнае становішча запрыгоненых сялян, застой у земляробчай тэхніцы і нізкі ўзровень яе развіцця.

А. В. Саветаў пісаў, што трохпольная сістэма можа трымацца толькі пры ўмове, калі лугоў у гаспадарцы ў два разы больш, чым ворнай зямлі. У гэтых суадносінах можна трымаць такую колькасць жывёлы, якой дастаткова для таго, каб штогод угнойваць $^1/_3$ раллі і такім чынам пастаянна падтрымліваць ураджайнасць палёў на больш-менш пэўным узроўні. Змена гэтых суадносін паміж раллёй і лугамі на карысць раллі непазбежна цягне за сабой памяншэнне пагалоўя жывёлы, угнаення і ўрадлівасці палёў[13].

З пачатку XIX ст. у найбольш перадавых памешчыцкіх гаспадарках пачынае ўводзіцца плодапераменная сістэма земляробства. Памешчык з Ашмяншчыны Тасатоўскі ў складзеным ім гаспадарча-этнаграфічным апісанні Ашмянскага павета пісаў, што ва ўладаннях Храптовічаў, Агінскіх, Брахоцкіх, Тышкевічаў, Карчэўскіх гаспадарка ў 1839 г. вялася з прымяненнем тагачасных дасягненняў у галіне агранамічнай навукі. Напрыклад, у маёнтку Бянюны пана Карчэўскага ўжывалася шматпольная сістэма гаспадарання; у дзяржаўным уладанні Бакшты, якое знаходзілася ў трыманні графа Храптовіча, — шматполле ў форме шасціполля, а ў маёнтку Брахоцкага Гаўя — шматполле ў форме васьміполля. Гаспадарка ўсіх маёнткаў мела збожжавы кірунак — высяваліся галоўным чынам пшаніца, азімае і яравое жыта[14].

У 1820–1830 гг. пачынаецца актыўная прапаганда плодапераменнай сістэмы земляробства ў агранамічнай літаратуры і перыядычных выданнях. «Працы Вольнага эканамічнага таварыства», «Земляробчая газета», «Земляробчы часопіс» і аддзел прамысловасці і сельскай гаспадаркі

«Бібліятэкі для чытання» друкуюць шмат артыкулаў, прысвечаных крытыцы папарнай сістэмы земляробства з яе збожжавым трохполлем і апісанню пераваг плодапераменнай сістэмы. Аўтары гэтых артыкулаў і брашур прыводзілі наступныя довады супраць трохпольнай сістэмы і на карысць плодапераменнай:

пры трохпольнай гаспадарцы $^1/_3$ ворнай зямлі штогод пустуе пад папарам і дрэнна апрацоўваецца, а пры плодапераменнай яна выкарыстоўваецца для вырошчвання прапашных культур і добра апрацоўваецца;

пры трохполлі пастаянна высяваюцца каласавыя культуры, якія моцна абясплоджваюць глебу, а пры плодапераменнай сістэме збожжавыя чаргуюцца з прапашнымі культурамі і травамі, якія ўзбагачаюць глебу;

трохпольная сістэма з павелічэннем ворных зямель і скарачэннем лугоў і пашы вядзе да ўпадку жывёлагадоўлі і самога земляробства, а плодапераменная, наадварот, садзейнічае ўздыму жывёлагадоўлі і павышэнню ўраджайнасці[15].

Аднак, нягледзячы на шырокую прапаганду, плодапераменная сістэма ў прыгоннай Беларусі, як і ў Расіі, у больш-менш шырокіх маштабах не прыжывалася. У сярэдзіне XIX ст. у памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарках на Беларусі паўсюдна прымянялася трохпольная сістэма земляробства, узаконеная яшчэ ў сярэдзіне XVI ст. Уставай на валокі. Як і ў папярэднія стагоддзі, ворная зямля падзялялася на тры па магчымасці роўныя часткі, якія называліся «зменамі»[16]. Адно поле засявалася жытам або азімай пшаніцай, другое часткова апрацоўвалася з восені або цалкам вясной і засявалася яравымі культурамі: ячменем, аўсом, гарохам, ярыцай (яравым жытам), пшаніцай, просам, бульбай і г. д. Трэцяе заставалася пад папарам і на наступны год засявалася азімымі[17]. Наглядна гэта прадстаўлена ў табліцы за чатыры гады. Чацвёрты год уведзены для таго, каб паказаць узнаўленне цыкла (табліца).

Севазварот палявых культур пры трохпольнай сістэме земляробства

| Год | 1-е поле | 2-е поле | 3-е поле |
|---|---|---|---|
| 1-ы | Азімыя | Яравыя | Папар |
| 2-і | Яравыя | Папар | Азімыя |
| 3-і | Папар | Азімыя | Яравыя |
| 4-ы | Азімыя | Яравыя | Папар |

Згодна з апісаннямі губерняў, зробленымі афіцэрамі генеральнага штаба ў сярэдзіне XIX ст., плодапераменная шматпольная сістэма земляробства толькі пачынала асвойвацца некаторымі памешчыкамі шляхам пераходу да чатырохпольнай гаспадаркі з увядзеннем у севазварот пасеваў бульбы і кармавых траў[18]. Аднак большасць уласнікаў маёнткаў па традыцыі лічылі больш мэтазгодным трымаць частку сваіх палёў пад папарам, спасылаючыся на нястачу працоўных рук і недастатковую колькасць жывёлы[19], якая магла б забяспечыць угнаеннем усю ворную зямлю. У шматзямельных паветах трохпольная сістэма земляробства суіснавала з пералогавай[20], а ў лясных паветах Усходняй Беларусі — з ляднай сістэмай земляробства[21].

Пасля скасавання прыгоннага права плошча сялянскага надзелу ўключала распрацаваную ворную зямлю; лугі і сенажаці; зямлю пад выганамі, пашай, зараснікамі, лесам і няўдобіцамі. У надзеле былых

памешчыцкіх сялян Магілёўскай губерні, напрыклад, ворныя землі пасля рэформы 1861 г. займалі 55,6 працэнта агульнай плошчы, лугі і сенажаці — 15,6, нераспрацаваныя землі — 28,7 працэнта[22]. Пры недастатковай колькасці ворнай зямлі, асабліва ў надзелах дробнай ваколічнай шляхты, пераважала двухпольная (без папару) сістэма земляробства[23].

Не маючы выгадных заробкаў у памешчыцкіх маёнтках, беларускія сяляне ўсе свае намаганні накіравалі на распрацоўку выдзеленых ім у надзел лясоў, зараснікаў, прыворваючы да сваіх палёў свежыя землі, якія не патрабавалі ўгнойвання некалькі гадоў[24].

Хуткі рост насельніцтва пасля рэформы 1861 г. і звязанае з гэтым працэсам драбленне сялянскіх гаспадарак прымушалі сялян арандаваць у памешчыкаў дзялянкі лесу пад расчыстку. Звычайна ўзімку лес высякалі. Мужчыны секлі дрэвы на вышыні 25–35 см ад зямлі, каб пры апрацоўцы дзялянкі пні былі добра відаць і аб іх не ламаліся земляробчыя прылады. Восенню ўся сялянская сям'я ішла «церабіць ляда». Мужчыны абсякалі сукі з паваленых дрэў, вывозілі прыдатныя для будоўлі бярвенні, нарыхтоўвалі дровы. Жанчыны і падлеткі секлі пад корань дробныя дрэўцы і хмызняк. Суччa і хмызняк зносілі ў кучы і пакідалі на зіму. Вясной



Нізіннае балота да раскарчоўкі. Віцебская губерня. Пачатак ХХ ст.

кучы расцягвалі па расцяробе і спальвалі, перасоўваючы агонь жэрдкамі па ўсёй яго плошчы, каб усю яе ачысціць агнём і раўнамерна ўгноіць попелам. Гэта была вельмі цяжкая праца ў дыме і сажы, з якой сяляне кожны вечар вярталіся дадому абпаленыя і чорныя ад іх. Затым трэба было пазносіць з ляда ўсе астаткі лесу, якія не паспелі згарэць. Узараць такі нераскарчаваны ўчастак з тысячамі каранёвых спляценняў было немагчыма. У агні згараў і ператвараўся ў попел і верхні пласт зямлі, што дазваляла праводзіць сяўбу без глыбокага рыхлення глебы.

На тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі ляда аралі лёгкай сахой без перакладкі, а паблізу пнёў глебу рыхлілі матыкай і засявалі просам, грэчкай, ячменем. Зерне засыпалі зямлёй пры дапамозе бараны-сукаваткі. Праз два — чатыры гады падгніўшыя пні выкарчоўвалі і ляда засявалі азімым жытам[25], уключаючы ўчастак у трохпольны севазварот.

На Палессі пры апрацоўцы ляда, якое тут называлі «навіной», «выдзерам», «расчысткай» або «пасекай», саху не выкарыстоўвалі. Пасля выпальвання дрэў і чарналесся яго засявалі без папярэдняй падрыхтоўкі глебы, засыпаючы зерне бараной-сукаваткай[26].

Пасечнае, або ляднае, земляробства, як указваў А. В. Саветаў, магчыма толькі там, дзе праца не аплачваецца грашамі, як гэта было пры прыгоне або ў вялікіх сялянскіх сем'ях, дзе ўсе мужчыны, жанчыны і падлеткі займаюцца расчысткай ляда. Ва ўсіх іншых выпадках агнявая сістэма з'яўляецца настолькі дарагой, што пасля адмены прыгоннага права нават у самых лясістых губернях яна перастала існаваць[27].

Уся ворная зямля ў сялянскім надзеле падзялялася на дзве часткі: на прысельную ворную зямлю і палявыя ворныя землі. Нязначную частку прысельнай зямлі непасрэдна каля комплекса сядзібных сялянскіх будынкаў займалі ўласна агароды, на якіх пастаянна вырошчваліся розныя агародніннымя культуры для патрэб сям'і. За агародамі размяшчаліся канаплянікі, а да іх прылягалі добра ўгноеныя палі, якія кожны год угнойвалі восенню[28] або ранняй вясной і засявалі рознымі яравымі культурамі, бульбай, гарохам, ільном. Таму прысядзібныя землі называлі яшчэ «яравымі палямі». Аднак, як адзначае А. С. Дэмбавецкі, на прысельных землях часам сустракаліся і пасевы азімага жыта, якое сеялі пасля ўборкі ранняга ячменю[29]. Адрозненне гэтай часткі сялянскага надзелу ад астатняй раллі заключалася ў тым, што на прысельных землях не пакідалі ўчасткаў пад папар, а з года ў год вялі інтэнсіўнае пладазменнае земляробства[30]. Палявыя ворныя землі, якія часта знаходзіліся на значнай адлегласці ад вясковых пасяленняў, слаба ўгнойваліся, і на іх вялося трохпольнае земляробства з пакіданнем $^1/_3$ пасяўной плошчы пад папарам[31].

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы пасля адмены прыгону патрабавала прымянення шматпольнай, больш прадукцыйнай пладазменнай сістэмы. Калі ў першыя пасляэформенныя гады чатырохполле і шматполле сустракаліся толькі ў адзінкавых памешчыцкіх гаспадарках Беларусі, то ў канцы XIX — пачатку XX ст. яны ўводзіліся ўжо і сялянамі[32]. У канцы XIX ст. у сялянскіх надзелах уваходзіць ва ўжытак травасеянне, якое парушала трохполле. Папар скарачаўся і на частцы ворыва стваралася чатырохпольная сістэма. Сяляне высявалі з траў пераважна канюшыну, значна менш віку.

З асваеннем славянамі тэрыторыі Беларусі археолагі звязваюць распаўсюджанне тут рал — вупражных ворыўных прылад з нізкім прымацаваннем цяглавай сілы. На Беларусі ўжываліся два асноўныя тыпы славянскіх рал — бясполазныя, у якіх ральнік у працоўным становішчы знаходзіўся пад вуглом да глебы, і ралы з полазам (падэшвенныя ралы)[33].

Бясполазнае рала не падразала пласт зямлі, а проста ўзрыхляла глебу зверху, рассоўваючы яе на абодва бакі. Такое рала рабіла вузкую і адносна неглыбокую баразну. Пры апрацоўцы зямлі паміж баразнамі заўсёды

заставаліся палосы некранутай ворывам глебы. Каб як след узараць поле, патрабавалася шматразовае перакрыжаванае ворыва. Аднак дзякуючы сваёй паваротлівасці і лёгкасці змены глыбіні ўзворвання бясполазнае рала было зручным пры працы на ўчастках камяністых ці засмечаных карэннямі дрэў[34]. У VIII—IX стст. на тэрыторыі Беларусі атрымалі пашырэнне больш дасканалыя ралы з металічным наральнікам і чарэслам[35].

Полазавае (падэшвеннае) рала мела ральнік, які размяшчаўся гарызантальна на полазе. Полаз і ральнік з металічным наральнікам (асабліва калі наральнік меў плечыкі) пры ворыве рабілі шырокія і глыбокія барозны, не пакідаючы паміж імі значных палос неўзаранай зямлі. Нахіленнем рала ўбок можна было дамагчыся пераварочвання пласта глебы.

Два шырокалопасцевыя наральнікі з плечыкамі былі знойдзены археолагамі пры раскопцы ўсходнеславянскага селішча Хотамель (VIII—X стст.) Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Іх працоўная частка па форме блізкая да раўнабедранага трохкутніка, а трубіца разагнута і ў папярэчным сячэнні мае форму авала[36]. Наральнікі з плечыкамі былі распаўсюджаны ў лесастэпавай зоне, адкуль ішло рассяленне славян па тэрыторыі Беларусі. Аднак умовы ляснога земляробства патрабавалі іншага тыпу наральнікаў, без плечыкаў, у якіх утулкавая трубіца ўтваралася загнутымі бакавымі краямі. Менавіта на аснове такіх наральнікаў потым развіліся нарогі[37]. Такога ж тыпу наральнікі былі знойдзены ў паселішчы X ст. каля вёскі Гарадзішча Мінскага раёна[38].

Падразаючы шырокі пласт зямлі, падэшвеннае рала разбурала каранёвую сістэму пустазелля і было прыдатным для апрацоўкі цвёрдай глебы з травяністай расліннасцю[39].



Рабочая частка палескай сахі. Пінск.
Музей Беларускага Палесся. Канец XIX — пачатак XX ст.



Селянін арэ поле палескай сахой у двухваловай запрэжцы.
Вёска Юравічы Бабруйскага павета
Мінскай губерні. Пачатак XX ст.
Фота І. А. Сербава




Палеская саха, прыстасаваная пад конную
хамутова-пастронкавую запрэжку.
Вёска Беліца Лідскага раёна
Гродзенскай вобласці.
Малюнак С. Ц. Гунько

Асноўнай ворыўнай прыладай на Беларусі з IX і да пачатку XX ст. была двухзубая драўляная саха з жалезнымі сашнікамі. Саха з'яўлялася адзінай прыладай для сялян, пры дапамозе якой апрацоўваліся мільёны дзесяцін зямлі, вырошчваліся і адпраўляліся за мяжу мільёны пудоў збожжа.

У працэсе шматвяковага выкарыстання канструкцыя сахі пастаянна паляпшалася сялянамі і ў пачатку XIX ст. дасягнула такой дасканаласці, што беларуская («палеская») саха была прызнана найлепшай сярод усіх відаў сох, якія бытавалі ў той час у Расіі[40]. Яна была ўніверсальнай прыладай, пры дапамозе якой беларускі селянін выконваў цэлы шэраг работ: араў зямлю пад усе палявыя культуры, заворваў гной і пасеянае збожжа, праводзіў сцёкавыя баразны для вады ў полі.

Саху звычайна кожны селянін рабіў з дрэва сам. Купленымі былі толькі жалезныя сашнікі (нарогі) і часам жалезная паліца (закрой), прыстасаванне для адвальвання зямлі, — іх выкоўвалі вясковыя кавалі. Таму існавала безліч лакальных і пераходных варыянтаў сахі. У сярэднявеччы жалезныя вырабы і жалезныя часткі сахі з'яўляліся вялікай каштоўнасцю ў сялянскай гаспадарцы. Як паказваюць дакументы таго часу, рабаўнікі перш за ўсё забіралі ў сялян гэтыя рэчы: «узяли… закрой железный, косу адну» (1590)[41]; «сокеръ чотыри, косъ две, серповъ деветь, сошники двои, закрой, тупицъ две, мотыка, заступень железный» (1590)[42].

Саха чыста і роўна арала любую глебу на невялікую глыбіню, лёгка абыходзіла пні і камяні. Яна хутчэй адхінала, а не пераварочвала ворны пласт і экалагічна адпавядала характару мясцовых дзярнова-падзолістых, часта завалуненых глеб[43]. Сахой можна было араць самыя вузкія і дробныя загоны, што з'яўлялася немалаважным пры панаванні ў беларускай вёсцы ў XIX — пачатку XX ст. малазямелля і цераспалосіцы. Таннасць, прастата канструкцыі, манеўранасць, лёгкасць рамонту, магчымасць апрацоўваць любую глебу забяспечылі ёй шматвяковае існаванне ва ўсіх усходнеславянскіх народаў.

Па канструкцыйных асаблівасцях сохі, якія былі пашыраны на Беларусі, у этнаграфічнай літаратуры прынята падзяляць на тры асноўныя тыпы: палескую (падляшскую, літоўскую), віцебскую (перакладку), падняпроўскую (беларускую, або магілёўскую). Найбольшае распаўсюджанне мела двухпаліцавая палеская саха. Арэал яе бытавання ахопліваў большую частку заходняй і цэнтральнай Беларусі і пашыраўся на ўсход да Бярэзіны і Дняпра. На поўначы мяжа яе распаўсюджання ішла на поўнач ад Ашмянскага і Мінскага паветаў, а на поўдні — па паветах Украінскага Палесся[44]. Саха палескага тыпу была вядома ва Украіне і на прылеглых да Беларусі раёнах Літвы і Польшчы[45].

Палеская саха вылучалася сярод іншых тыпаў сох масіўнасцю свайго корпуса, прыстасаванага для двухваловай запрэжкі. Усе канструкцыйныя часткі сахі ў адно цэлае звязваў рагач — доўгая (3–3,5 м) жэрдка, якую рабілі са ствала высечанай з коранем маладой елкі або бярозы. На адным канцы рагача пакідалі абрубкі двух каранёвых адгалінаванняў, якія служылі дзяржаннем для аратага. Да другога канца рагача мацавалі парнае ярмо для валоў. Каля каранёў-ручак у прабітую ў рагачы адтуліну знізу наўскос устаўлялі крыху выгнутую дошку (расоху, плаху). Ніжняя частка расохі раздвойвалася, і на яе завостраныя канцы набівалі жалезныя наканечнікі (сашнікі, нарогі, ральнікі). Са споду ў расохі каля сашнікоў рабілі ровік, праз які ішла моцная вяроўка, якая для трываласці злучала яе з рагачом[46].

Асаблівасцю рабочай часткі палескай сахі было тое, што сашнікі і адвальныя дошкі (паліцы) былі рознай формы і памеру. Левы сашнік, падобны да пяра, быў даўжэйшы і шырэйшы за правы і называўся «вярхняк»,



Сялянская сям'я на сваім двары. Злева, каля сцяны хлява, прыслоненыя плеценая барана і палеская саха. Вёска Жыцін Бабруйскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Саха віцебскага тыпу з перакладной паліцай. Вёска Сакаловічы Крупскага раёна Мінскай вобласці. Фота М. Я. Грынблата




Саха віцебскага тыпу з перакладной паліцай. Вёска Окана Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько

«вярхоўны», «апірач». Правы сашнік быў вузейшым і называўся «ральнік», «раляны», «спадняк»[47]. Пры гэтым правы сашнік ставіўся гарызантальна ў адносінах да зямлі, а левы — пад тупым вуглом да правага.

Пад сашнікі падбівалі паліцы — выгнутыя дошчачкі для адвалу зямлі. Левая паліца (закрой) была больш кароткая і шырэйшая за правую. Як і сашнік, яна стаяла пад вуглом да правай паліцы (раляны, прыполак), размешчанай гарызантальна. Дзякуючы такой пастаноўцы плахі, сашнікоў і паліц левы перавы сашнік сахі падразаў пласт зямлі збоку, а правы ўздымаў яго знізу, адвальваючы пры дапамозе паліц зямлю на правы бок[48]. Каб было зручней кіраваць сахой у час ворыва, яе левая ручка злучалася з рагачом прутом (мыліцай, муліцай).

Для рэгуліроўкі глыбіні ворыва ў канцы рагача рабілі тры адтуліны, у адну з якіх забівалі калок, а да яго прымацоўвалі парнае ярмо для валоў. Калі калок забівалі ў першую адтуліну ад валоў, то саха ішла вышэй і арала мяльчэй; калі ж яго забівалі ў бліжэйшую адтуліну да расошнай дошкі, то саха арала глыбей[50].

На Панямонні поруч з палескай сахой сялянамі выкарыстоўвалася больш лёгкая, прыстасаваная для аднаконнай або аднаваловай запрэжкі. Яна мела аднолькавыя па форме сашнікі і дзве паліцы. Замест дышля-рагача ў ёй рабілі кароткі градыль, да якога прымацоўвалі ворчык і аглоблі для аднаваловай або аднаконнай запрэжкі[51].

На тэрыторыі Падзвіння быў распаўсюджаны аднапаліцавы тып сахі, якую прынята называць «віцебскай» або «перакладной». Галоўная частка корпуса сахі — расоха — тут называлася «лямешніцай», «лапатай», «плахай», «дзеравам». Гэта была выгнутая бярозавая дошка даўжынёй



Саха магілёўскага тыпу з нерухомай паліцай. Вёска Гірэйшы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько



Адназубая сошка для абворвання бульбы. Брэстчына. Фота 1953 г.

у 1—1,1 м з раздваеннем унізе. Верхняя частка плахі заціскалася паміж двух папярочных брускоў, адзін з якіх быў даўжэйшым, і яго канцы ўтваралі ручкі сахі. З абодвух бакоў плахі да брускоў мацаваліся аглоблі (вобжы). На раздвоены ніжні канец плахі насаджвалі аднолькавыя па форме гарызантальна пастаўленыя жалезныя сашнікі.

Знізу, каля нарогаў, у пласе рабілі канаўку, у якую закладвалі невялікі калок (карац, падсошнік). За канцы карца чаплялі вяровачныя або скураныя падвоі (зямлянкі, іцьвіны, струны) і імі накрыж прымацоўвалі плаху да аглобляў пад вуглом у 40—50°.

Віцебская саха мела лапатападобную жалезную паліцу (пярэкладка, перакладка, закрой) велічынёй «у паўтары далоні»[52] — прыстасаваннем для адвальвання і пераварочвання падрэзанай сашнікамі зямлі ў выглядзе завужанай уніз лапаткі. Зверху ў яе ўстаўлялася драўляная ручка, якая мацавалася ў месцы перакрыжавання зямлянак, а ўнізе адгіналіся два вушкі, з дапамогай якіх паліца трымалася на сашніку. Пры неабходнасці паліцу можна было перакладаць з аднаго сашніка на другі, таму саха называлася перакладной. Калі селянін араў шырокае поле, аб'язджаючы яго кругом, то паліцу не было патрэбы перакладаць на другі сашнік, а пры ўзворванні доўгага вузкага загона ў канцы паласы яе кожны раз даводзілася перакладаць, каб ідучы назад пракладваць новую баразну каля ўжо праведзенай. Пры гэтым конь запрагаўся ў пастронкі, якія мацаваліся да канцоў кароткіх аглобляў. Даўжынёй пастронкаў рэгулявалася глыбіня ворыва[52].



Плуг драўляны з жалезным лемехам

Мяжа распаўсюджання сахі віцебскага тыпу ахоплівала ўсю Віцебшчыну. Паўднёвая граніца яе бытавання праходзіла праз Паставы, Докшыцы, Халопенічы, Оршу[53]. Такога тыпу саха з перакладкай была вядома і на тэрыторыі рускіх абласцей — Пскоўскай, Вялікалукскай, Калінінскай[54].



Селянін арэ поле драўляным плугам з жалезным лемяшом. Рагачоўскі павет Магілёўскай губерні. Пачатак ХХ ст.

На Падняпроўі (прыкладна ў межах сучаснай Магілёўскай вобласці) бытавала саха, падобная на віцебскую, але з паліцай, нерухома замацаванай на левым сашніку. Падобная саха была шырока распаўсюджана і на Смаленшчыне[55].

У 1883 г. на старонках «Земляробчай газеты» была разгорнута дыскусія аб месцы сахі ў сельскай гаспадарцы. Многія з удзельнікаў дыскусіі ставілі саху вышэй за плуг па сваіх якасцях, некаторыя былі ўпэўнены, што больш выгадна толькі работа трохлямешнага плуга. Вялікая колькасць чытачоў газеты лічылі саху «альфай і амегай» сельскагаспадарчага інвентару, а плуг або пустой, або нават шкоднай выдумкай, прыладай вельмі дарагой і не здольнай акупіцца[56].

Поруч з двухзубай сахой у другой палове XIX ст. на Беларусі атрымала шырокае распаўсюджанне і адназубая сошка, якая ў асноўным выкарыстоўвалася для абгонкі бульбы. Па сваёй будове яна блізкая да акучнікаў, якія з сярэдзіны XIX ст. паўсюдна ўжываліся ў памешчыцкіх гаспадарках у сувязі з масавым пашырэннем пасадак бульбы.

У канцы XIX — пачатку XX ст. беларускія сяляне сталі актыўна пераходзіць у апрацоўцы зямлі ад сахі да плуга, які ў памешчыцкіх маёнтках шырока выкарыстоўваўся ўжо з сярэдзіны XIX ст. На Беларусі пачалі ўзнікаць невялікія мясцовыя заводы па вырабе сельскагаспадарчых машын, якія выпускалі плугі і іншыя ўдасканаленыя прылады для земляробчай працы. У 1911 г. іх было 50, а ў 1913 г. — ужо 63[57].

Высокая прадукцыйнасць новых прылад працы і пры гэтым значная эканомія фізічных сіл работніка абумовілі іх хуткае пашырэнне сярод сялян. Вядомы беларускі гісторык М. М. Улашчык пісаў, што аднаконным плугам можна было зааруць за дзень прыкладна столькі, сколькі заворвалі і сахой, але ворыва плугам было больш якаснае і нашмат лягчэйшае. Ім маглі араць ужо хлопчыкі з 12–13 гадоў, а з двухконным плугам адзін чалавек выконваў такі аб'ём працы, як два аратыя з сахой[58].

Замена груваcткай палескай сахі плугам абумовіла выцясненне канём пары валоў у якасці асноўнай цяглавай сілы. Значны ўплыў на гэты працэс аказаў таксама рост пасеваў збожжавых культур на сялянскіх надзелах і скарачэнне плошчы пашы[59].

Першыя сялянскія плугі мелі жалезныя лемех (лямеш, нож) і адвал (паліца), а дышаль і ручкі ў іх былі драўляныя. Як на Беларусі, так і за яе межамі плугі былі падобнай канструкцыі. Жалезны лямеш, які рэзаў глебу, стаяў гарызантальна ў адносінах да паверхні зямлі, а жалезная паліца — пад вуглом да яго, складаючы з ім як бы адно цэлае. Лямеш з паліцай мацаваліся да чатырохграннага або круглага драўлянага дышля (стальніцы), які прыкручваўся металічным балтом звычайна да левай ручкі плуга. Пры ўзворванні цаліны або аблогі перад лемяшом да дышля часам мацаваўся металічны нож — разак. Глыбіня ворыва рэгулявалася «зазубнямі» на канцы дышля.

Цікава, што яшчэ ў 1880-х гг. у сялянскіх гаспадарках, размешчаных паблізу маёнтка «Шчорсы» графа Храптовіча Навагрудскага павета Мінскай губерні, плуг стаў хутка ўваходзіць ва ўсеагульнае ўжыванне, выцясняючы палескую саху, якая існавала там спрадвеку. Паводле слоў мясцовых жыхароў, узорам для іх паслужыў плуг, прывезены з Саксоніі



Аднаконны плуг, зроблены па ўзору саксонскага. Навагрудскі павет Мінскай губерні. 1885 г.



Той жа плуг з супрацьлеглага боку



Фабрычны плуг з разаком для цаліны тыпу сухіні. Пачатак XX ст.



Фабрычны малы арліны плуг № 5. Пачатак XX ст.



Барана-сукаваткa з тэрыторыі Беларусі



Барана-смык.
Пачатак XX ст.

ўпраўляючым маёнткам Шчорсы і падараваны аднаму селяніну. Гэта з'явілася пачаткам распаўсюджання плугоў сярод сялян, якія самі пачалі майстраваць іх па існуючаму ўзору. У 1885 г. ужо многія сяляне ўмелі рабіць усе драўляныя часткі плуга і злучаць іх з жалезнымі, якія навучыліся вырабляць мясцовыя кавалі. Плуг атрымліваўся надзейнай канструкцыі і пры гэтым танным. Ён каштаваў селяніну ад 7 да 12 рублёў у залежнасці ад таго, меў ён аднаколавую жалезную падстаўку або двухкалёсны передок[60].

У сярэдзіне 1890-х гг. апрацоўвалі зямлю плугам у Гродзенскай губерні ўжо 25 працэнтаў сялянскіх гаспадарак, у Мінскай — 21 працэнт, у Віцебскай — 19, у Магілёўскай — 17 працэнтаў[61]. Зразумела, што інтэнсіўнасць працэсу замены сох на плугі ў розных рэгіёнах Беларусі залежала ад многіх абставін і перш за ўсё ад заможнасці селяніна і блізкасці да горада, дзе можна было збываць прадукцыю сваёй гаспадаркі і набываць удасканалены гаспадарчы рыштунак.



Барана-смык. Вёска Юндзілавічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Фота Д. Мазаніка





- Плеценая барана. Вёска Манькавічы Столінскага павета Гродзенскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.

- Барана рамная папярочна-брусковая, з жалезнымі зубамі (кляцамі). Вёска Канашы Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці. Пачатак XX ст. Малюнак С. Ц. Гунько

- Рамная барана з жалезнымі кляцамі. Вёска Налібокі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. 1970 г. Фота М. С. Лобача



Як адзначаў М. М. Улашчык, у яго роднай вёсцы Віцькаўшчыне, размешчанай непадалёку ад Мінска, ужо ў канцы XIX ст. саху амаль поўнасцю выцесніў плуг: спачатку з драўлянай асновай, а потым цалкам жалезны. Перад Першай сусветнай вайной у вёсцы карысталіся аднаконнымі і двухконнымі жалезнымі плугамі, а двое гаспадароў мелі двухлямешныя[62]. У той жа час, паводле даных М. С. Лобача, на Беласточчыне першыя драўляныя плугі, да якіх жалезныя часткі выраблялі мясцовыя кавалі, пачалі з'яўляцца прыблізна каля 1910 г. і толькі пасля Першай сусветнай вайны сяляне адмовіліся ад сахі[63]. Увогуле ў сялянскіх гаспадарках Беларусі ў 1910 г. плугі складалі 36,4 працэнта ўсіх прылад для ўзворвання зямлі[64].



Драпач. Вёска Чарлёна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Фота М. С. Лобача



Барана драўляная з 30 жалезнымі зубамі. Вёска Тамашоўка Брэсцкага павета Гродзенскай губерні. Пачатак XX ст. Малюнак С. Ц. Гунько



Спосаб запрэжкі каня ў барану. Пачатак XX ст.

Такімі ж старажытнымі, як і сохі, былі прылады для рыхлення (баранавання) глебы. Самай архаічнай і прымітыўнай з іх лічыцца сукаватка (астрога, валакуша) — цяглавая прылада для рыхлення і загортвання ў глебу насення збожжавых культур на лядах (пасеках). Рабілі яе з верхавіны елкі, сукі якой абсякалі на адлегласці 40—60 см ад ствала і на канцах завострывалі. Конная або валовая збруя мацавалася да сукаваткі з боку верхавіны, дзе ствол быў больш тонкі, тады сукі елкі аказваліся нахіленымі пад вуглом уперад і пры руху ўразаліся ў зямлю і рыхлілі яе.

А. К. Сержпутоўскі пісаў, што сукаватка была незаменнай прыладай на пясчаных падлесных землях, дзе праз мноства пнёў і драўнінных карэнняў нельга было працаваць ні плугам, ні нават сахой[65]. У сярэдзіне XX ст. сукаватка была выяўлена і апісана Л. А. Малчанавай у вёсцы Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці[66]. Многія старыя вясковыя жыхары ў той час ведалі яшчэ з аповедаў і ўспамінаў бацькоў аб яе выкарыстанні на лядах у канцы XIX і нават у пачатку XX ст.[67]

Другім відам разрыхляльных прылад ляднага земляробства быў смык. Яго рабілі з расколатых папалам або абчасаных з аднаго боку тонкіх яловых ствалоў даўжынёй 1—1,1 м, на другім баку якіх пакідалі сукі даўжынёй 40—60 см. У залежнасці ад таўшчыні 5—10 плашак або ствалоў клалі сукамі ўніз і прывязвалі да дзвюх папярочных планак дубовымі, бярозавымі або лазовымі віткамі. Два крайнія з бакоў ствалы рабілі даўжэйшымі за сярэднія на 1—1,5 м. Яны ўтваралі аглоблі (вобжы), за канцы якіх мацаваліся пастронкі. Яшчэ ў пачатку XX ст. смык бытаваў пры апрацоўцы ляда паўсюдна на Беларусі, за выключэннем паўднёвага Падняпроўя[68].

Больш дасканалай прыладай для рыхлення глебы на стараворных землях з'яўлялася барана (барана, скарада). Паводле канструкцыі вылучаюць плеценую барану (скарада) і брусковую (барана) сталярнай работы[69].

Пры дапамозе бараны сяляне раздрабнялі, разрыхлялі і выраўноўвалі ўзаранае поле, вынішчалі пустазелле, засыпалі зямлёй насенне збожжавых культур, разбуралі глебавую корку, якая ўтваралася на пасевах пасля



Прылады працы сялян Віцебскай губерні. Канец XIX – пачатак XX ст.



Фабрычная барана-зігзаг. Пачатак XX ст.



Фабрычная спружынная барана. Пачатак XX ст.

дажджу. Са старажытнасці і амаль да канца XIX ст. найбольш пашыранай на тэрыторыі Беларусі была дугападобная «плеценая» барана ў 16—25 зубоў, форму якой надаваў гнуты дубовы аблук (самалук, самайлук, каблук). У аблуку знаходзілася рашотка, зробленая з 4–5 радоў папярочных і стольніх жа радоў падоўжаных арэхавых або лазовых прутоў, па тры пруты ў кожным радзе. На перакрыжаваннях пруты замацоўвалі бярозавымі, лазовымі, чаромхавымі віткамі (грывенькамі, кольцамі), паміж якіх убівалі завостраныя дубовыя (часам кляновыя або грабавыя) зубы (кляцы)[70]. На аблук бараны спераду замацоўвалі кальцо, звітае з тонкіх пруткоў, і за яго чаплялі ворчык. У час баранавання кальцо перамяшчалася ўадзін з вуглоў бараны, дзякуючы чаму яна ішла наўкос і зубы пакідалі на зямлі не 4–5 слядоў (па колькасці зубоў у адным радзе), а амаль удвая болей. Плеценая барана была адносна лёгкай, таму для больш глыбокага рыхлення глебы зверху на яе клалі цяжар (камяні, кавалак дзёрну і т. п.). Паступова плеценыя бароны пачалі замяняцца рамнымі папярочна-брусковымі.

Найбольш ранняя рамная барана сталярскай работы мела па баках драўляныя аглоблі, за якія прывязвалі пастронкі для коннай хамутова-пастронкавай запрэжкі, а ўпоперак — паліцы[71]. Рабілі такія бароны звычайна з бярозавых брускоў. У папярочных брусках (паліцах) свідравалі дзіркі, у якія забівалі круглага сячэння вострыя зубы (кляцы). Зубы размяшчаліся так, каб кожны з іх рабіў свой след на раллі. Звычайна ў вобжы ўбівалі па адным зубе, а ў папярочных брусках колькасць зубоў чаргавалася: у адным брусе рабілі парную колькасць зубоў, у другім — няпарную (напрыклад, у першым — 4, у другім — 5, у трэцім — 4, у чацвёртым — 5[72]).

Больш позні тып брусковай бараны — цяжкая рашотка з масіўных брускоў без вобжаў, у якую набівалі драўляныя зубы. Форма рашоткі і колькасць зубоў у баране ваганіся ў залежнасці ад рэгіёна і мясцовай вытворчай традыцыі[73]. Па канструкцыі бароны падзяляліся на падоўжана-брусковыя і папярочна-брусковыя.

З сярэдзіны XIX ст. заможныя сяляне пачалі купляць бароны з жалезнымі зубамі. Часцей за ўсё яны былі саматужнай работы мясцовых майстроў, а жалезныя зубы (кляцы) выкоўвалі і забівалі ў раму мясцовыя кавалі. Большасць барон уяўляла сабой рашотку з трыма — пяццю падоўжанымі і папярочнымі планкамі. Спераду бараны звычайна быў замацаваны жалезны прут з надзетым рухомым кручком, які чаплялі за ворчык, або гэты кручок стацыянарна замацоўвалі ў правым пярэднім куце бараны. Пры рабоце кручок змяшчаўся ўправа і барана ішла наўкос, захопліваючы зубамі большую плошчу раллі. У пачатку XX ст. баронамі

з жалезнымі кляцамі сяляне карысталіся ўжо па ўсёй Беларусі[74]. Як успамінаў М. М. Улашчык, такая барана, як і старадаўняя плеценая, звычайна мела пяць падоўжаных, пяць папярочных планак і 25 жалезных зубоў. Але яна была значна большая і цяжэйшая, захоплівала шырэйшую паласу ворыва, ішла глыбей, нашмат лепей разбівала камякі зямлі і вычышчала палетак ад пырніку і іншага пустазелля[75].

З другой паловы XIX ст. на Беларусі атрымаў пашырэнне драпач — разрыхляльная прылада, падобная на рамную барану трохкутнай або чатырохкутнай формы, але завостраныя жалезныя зубы яго былі ўнізе расклёпаны і загнуты ўперад, як лапкі. Яго перавага перад бараной была ў тым, што ён лепш разрыхляў і ачышчаў моцна засмечаныя пустазеллем палі.

У пачатку XX ст. найбольш заможныя сяляне сталі набываць фабрычныя, цалкам жалезныя бароны, а таксама іх удасканаленыя варыянты — бароны «зігзаг» і спружынныя. Апошнія выкарыстоўваліся для апрацоўкі завалуненых глеб і мелі прыстасаванне для рэгуліроўкі глыбіні рыхлення.

У 1911 г. вырабам сельскагаспадарчых машын і прылад працы ў Расійскай імперыі было занята 820 прадпрыемстваў, сярод якіх 665 былі размешчаны ў Еўрапейскай Расіі, а 110 — у губернях Царства Польскага[76].

[1] Ісаенка У. Ф., Каробушкіна Т. М. Земляробства // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993. С. 275.

[2] Артеменко Н. И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. М., 1966. С. 119–120.

[3] Советов А. В. О системах земледелия: избр. соч. М., 1950. С. 239–250.

[4] Там же. С. 249.

[5] Крохолев Ф. С. О системах земледелия: ист. очерк. М., 1960. С. 137.

[6] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. Мінск, 1972. С. 135.

[7] Тамсама. С. 137.

[8] Советов А. В. О системах земледелия. С. 317–319.

[9] Системы земледелия / А. Ф. Сафонов, А. М. Гатаулин, И. Г. Платонов [и др.]; под ред. А. Ф. Сафонова. М., 2009. С. 73.

[10] Струмилин С. Г. К истории земледельческого труда в России // Вопросы экономики. 1949. № 2. С. 46.

[11] Довженок В. И. К истории земледелия у восточных славян в I тысячелетии н. э. в эпоху Киевской Руси // Материалы по истории земледелия СССР. М., 1952. Т. 1. С. 157–158.

[12] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. С. 135.

[13] Советов А. В. О системах земледелия. С. 243.

[14] Голубеў В. Гаспадарча-этнаграфічнае апісанне Ашмянскага павета 1839 г. // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Ашмяны і Ашмянскі рэгіён: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2015. С. 269.

[15] Крохолев Ф. С. О системах земледелия. С. 77.

[16] Зеленский И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния. Ч. 2. СПб., 1864. С. 9. (Далее: Зеленский И. Минская губерния.)

[17] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2. СПб., 1863. С. 21. (Далее: Бобровский П. Гродненская губерния.)

[18] Зеленский И. Минская губерния. С. 8.

[19] Бобровский П. Гродненская губерния. С.21.

[20] Зеленский И. Минская губерния. С. 8.

[21] Цебриков М. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Смоленская губерния. Ч. 2. СПб., 1862. С. 172. (Далее: Цебриков М. Смоленская губерния.)

[22] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях. Могилев, 1884. Кн. 2. С. 817.

[23] Бобровский П. Гродненская губерния. С. 30; Зеленский И. Минская губерния. С. 8.

[24] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... С. 812–813.

[25] Титов В. С. Земледелие // Белорусы. М., 1998. С. 145.

[26] Кузышин Е. Е., Мандыбура М. Д., Молчанова Л. А. Земледелие // Полесье. Материальная культура. Киев, 1988. С. 111.

[27] Советов А. В. О системах земледелия. С. 270–271.

[28] Бобровский П. Гродненская губерния. С. 32.

[29] Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии... С. 818.

[30] Там же. С. 819–820.

[31] Там же. С. 819.

[32] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў / рэд. В. К.Бандарчык. Мінск, 1974. С. 13.

[33] Краснов Ю. А. К проблеме эволюции рала (об одном широко распространенном заблуждении) // Древние славяне и их соседи. М.. 1970. С. 140.

[34] Загарульскі Э. М. Усходнеславянскія плямёны і іх гаспадарка // Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997. С. 24.

[35] Тамсама. С. 23.

[36] Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961. С. 8–24 (табл. 9, рис. 15–17).

[37] Загарульскі Э. М. Усходнеславянскія плямёны і іх гаспадарка. С. 24.

[38] Коробушкина Т. Н. Земледелие на территории Белоруссии в X–XIII вв. Минск, 1979. С. 21.

[39] Краснов Ю. А. К проблеме эволюции рала... С. 137.

[40] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 27.

[41] АСД. Т. 1. С. 182.

[42] АВАК. Т. II. С. 260.

[43] Цітоў В. С. Саха // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 449.

[44] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 20. Карта № 1.

[45] Тамсама. С. 18.

[46] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 6. Спр. 37. Арк. 26–28.

[47] Тамсама. Спр. 5. Арк. 4–5; Машынскі К. Усходняе Палессе. Мінск, 2014. С. 89.

[48] Цітоў В. С. Саха. С. 448–449.

[49] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 6. Спр. 37. Арк. 26–28.

[50] Цітоў В. С. Саха. С. 449.

[51] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 6. Спр. 5. Арк. 5.

[52] Цітоў В. С. Саха. С. 449.

[53] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 19–20.

[54] Анохина Л. А., Шмелева М. Н. Культура и быт колхозников Калининской области. М., 1964. Цыт. па кн.: Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 20.

[55] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 20.

[56] Л. З. О сохе и сошной палице // Земледельческая газета. 1886. № 2. 11 января. С. 29–30.

[57] Довнар-Запольский М. В. Народное хозяйство Белоруссии (1861–1914 гг.). Минск, 1926. С. 157.

[58] Улашчык М. М. Была такая вёска: гіст.-этнагр. нарыс. Мінск, 1989. С. 58.

[59] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 28.

[60] Курдюков Н. Крестьянский плуг в Новогрудском уезде // Земледельческая газета. 1885. № 17. 27 апреля. С. 365.

[61] Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мінск, 2002. С. 166.

[62] Улашчык М. М. Была такая вёска. С. 57–58.

[63] Лабач М. С. Па слядах рукапіснага этнаграфічнага апісання Бельскага павета свяшчэнніка Келясціна Брэна з 50-х гадоў XIX ст. // Studia polsko-litewsko-białoruskie. Prace Białostockiego Towarystwa Naukowego. № 31. Warszawa, 1988. С. 373.

[64] Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 2. С. 383.

[65] Сержпутовский А. К. Земледельческие орудия белорусского Полесья // Материалы по этнографии России. СПб., 1910. Т. 1. С. 48.

[66] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. Минск, 1968. С. 28.

[67] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 32. Карта № 3.

[68] Записки Северо-Западного отдела Имераторского русского географического общества. Кн. 3. Вильна, 1912. С. 317.

[69] Чарнецкі М. Хата, хатні і гаспадарчы рыштунак // Крывіч. 1924. № 2. С. 72.

[70] Тамсама.

[71] Тамсама.

[72] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 35.

[73] Цітоў В. С. Барана // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 50.

[74] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 35–37.

[75] Улашчык М. Была такая вёска. С. 58–50.

[76] Земледельческая газета. 1913. 28 декабря.



# ЗЕМЛЕЎЛАДАННЕ І ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЕ



З глыбокай старажытнасці парадак, формы і ўмовы валодання і карыстання зямлёй у беларусаў вызначаліся звычаёвым правам.

Агульным уласнікам зямель і ўгоддзяў у X—XI стст. на землях Заходняй Русі з'яўлялася абшчына-верв, у якой частка зямлі была падзелена і знаходзілася ў асабістым уладанні абшчыннікаў, пераходзячы іх нашчадкам у спадчыну. У агульным карыстанні была другая частка зямлі, а таксама пашы, выганы, лясы і вадаёмы, якімі абшчына распараджалася на аснове самакіравання[1].

Паводле нешматлікіх летапісных даных і помнікаў раннефеадальнага права ўсходніх славян, якія захаваліся да нашых дзён, можна меркаваць, што смерды-абшчыннікі валодалі ў гэты час асобнымі зямельнымі ўчасткамі, мелі сваю сямейную гаспадарку і гаспадарчы інвентар[2].

Па меры падпарадкавання ўсходнеславянскіх плямёнаў уладзе кіеўскіх князёў смерды-абшчыннікі абкладваліся данінай, якую складалі прадукты земляробства, палявання, бортніцтва. У «Аповесці мінулых гадоў» гаворыцца аб устанаўленні даніны на радзімічаў, крывічоў, драўлян і іншыя плямёны[3].

Славянскія паселішчы называліся «погостами», «весями», «сёламі», «деревнями». У Іпацьеўскім летапісе апавядаецца, што збор даніны («полюдье») спачатку насіў нерэгулярны характар і ажыццяўляўся шляхам паездак князя з дружынай па славянскіх паселішчах, а затым быў заменены «повозом» — дастаўкай даніны ў вызначаны час у пэўны пагост[4]. Даніна размяркоўвалася па пагостах і бралася з «двара», «дыму», «рала», «плуга» — гэта значыць, з асобных сялянскіх гаспадарак[5].

Далейшае гістарычнае развіццё прадукцыйных сіл, удасканаленне прылад працы і пашырэнне ворнага земляробства, узнікненне рамёстваў і гандлю стварылі перадумовы для фарміравання класаў і развіцця працэсу феадалізацыі. Аб распадзе абшчыны сведчаць і археалагічныя помнікі Беларусі. Так, гарадзішча Хотамель (Столінскі раён Брэсцкай вобласці) у VII ст. было невялікім паселішчам радавога калектыву, але ў X ст. яно ўжо ўяўляла сабой добра ўмацаванае буйное гарадзішча, дзе жылі дружыннікі, а па-за яго сценамі размяшчаліся напаўзямлянкі простых абшчыннікаў, гаспадарчыя заняткі якіх складалі земляробства, жывёлагадоўля і промыслы[6].

Сацыяльная структура земляробчага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых землях Старажытнай Русі, у раннефеадальны перыяд складалася з асобных груп, якія характарызаваліся розным сацыяльна-эканамічным і прававым становішчам. Асноўную яго катэгорыю складалі смерды, якія плацілі даніну спачатку дзяржаве, а потым баярам-вотчыннікам[7]. Тагачасныя пісьмовыя крыніцы даюць гісторыкам падставу сцвярджаць, што смерды былі асабіста вольныя людзі, якія карысталіся прававой абаронай князя. Але побач з вольнымі існавалі і смерды, якія страцілі па розных прычынах сваю асабістую свабоду.

Шырокае кола залежных ад феадала людзей, якія жылі ў яго ўладанні і двары, называлася «чэлядзь». Яны выконвалі сельскагаспадарчыя, прамысловыя і іншыя работы на гаспадара і знаходзіліся ў рознай ступені залежнасці ад яго[8].

Самай бяспраўнай групай феадальна-залежнага насельніцтва былі халопы, якія не мелі асабістай маёмасці і поўнасцю залежалі ад гаспадара. Пераважную большасць халопаў складалі ваеннапалонныя, злачынцы або тыя, хто ўзяў шлюб з асобай, якая знаходзілася ў рабстве. Вядомы два віды халопства: абельнае (поўнае) і няпоўнае[9]. Калі халопа або чалядзіна надзялялі ўчасткам зямлі, то ён пераходзіў у катэгорыю «вотчыча»[10].

З развіццём буйнога ўласнага землеўладання кола залежных ад феадалаў людзей пашыралася. З XII ст. сярод сялян з'яўляецца і да XVI ст. хутка павялічваецца група часова залежных ад феадала людзей, якія ў дакументах таго часу называюцца «закупні» або «закладні». Яны мелі сваю гаспадарку, але трапілі на пэўны тэрмін у залежнасць ці рабства да феадала за грашовы доўг ці матэрыяльную дапамогу. Тэрмін і ўмовы закупніцтва і закладніцтва вызначаліся дагаворам. Па закону закупні і закладні лічыліся вольнымі людзьмі, але за доўг павінны былі адпрацаваць пэўны час у гаспадарцы феадала на апрацоўцы зямлі або ў якасці слуг[11].

У канцы XIII — першай палове XIV ст. беларускія землі ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Асноўная маса феадалаў княства належала да вайскова-служылага саслоўя. Вялікія князі, вымушаныя абапірацца ў сваёй знешняй і ўнутранай палітыцы на феадалаў, пачалі пашыраць іх правы і прывілеі, раздаючы ў пажыццёвае або вечнае ўладанне населеныя землі, а таксама пусткі з правам засяляць іх. Менавіта рост прыватнай зямельнай уласнасці складаў галоўную тэндэнцыю развіцця феадалізму ў XIV—XVI стст. у ВКЛ і пазней Рэчы Паспалітай.

Прыкладна да сярэдзіны XV ст. асноўную катэгорыю сялянскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі складалі «даннікі», асабіста вольныя людзі. Іх галоўнай павіннасцю была даніна незалежна ад таго, на якой зямлі — дзяржаўнай ці прыватнаўласніцкай — яны вялі сваю гаспадарку[12].

Даннікі жылі сялянскімі грамадамі. Кожная грамада мела ў агульным карыстанні пэўную колькасць ворнай зямлі і розныя ўгоддзі: выганы, бортныя дрэвы, бабровыя гоны, лясы, вадаёмы, сенажаці. Другая частка ворнай зямлі дзялілася паміж сялянскімі сем'ямі, якія валодалі ёю на правах уласнасці[13]. Грамада збірала ў пэўных выпадках свой уласны суд — капу, рабіла раскладку (разруб) падацей і павіннасцей, якія на яе накладаліся агульнай сумай[14].

Феадалы часта атрымлівалі ад князя ці магнатаў у падараванне ненаселеныя землі з правам «людей на новом корене посадить»[15]. Каб прывабіць на гэтыя землі людзей, яны вызвалялі перасяленцаў на пэўны тэрмін ад часткі падаткаў і надзялялі некаторымі іншымі льготамі. Засяляць землі, якія пуставалі, імкнулася і дзяржава, таксама вызваляючы перасяленцаў ад часткі павіннасцей. Павелічэнне агульнай плошчы апрацоўваемай зямлі суправаджалася ўзнікненнем новых паселішчаў.

Паселішчы складаліся з «дымоў» і «дворышчаў». Дымам называўся двор, у якім пражывала сялянская сям'я са сваёй маёмасцю. Дым з'яўляўся і адзінкай падаткаабкладання, яго жыхары плацілі падаткі і выконвалі павіннасці на карысць землеўладальніка[16]. На паўднёва-заходнім Палессі былі пашыраны больш складаныя гаспадарчыя адзінкі — «дворышчы», якія складаліся з некалькіх сем'яў, звязаных сваяцкімі сувязямі. Часам у склад дворышчаў уваходзілі і дольнікі, прысёрбы, прымакі, якія там пражывалі. Сем'і ў дворышчы жылі асобнымі дварамі, хаця карысталіся агульным інвентаром, сумесна апрацоўвалі зямлю і вялі гаспадарку, дзялілі паміж сабой ураджай і ўсе прыбыткі. Аднак дворышчы не былі ўстойлівымі ўтварэннямі і з цягам часу распадаліся на «дымы».

Праявай непаўнапраўнасці сялян, звязанай з іх статусам плацельшчыкаў падацей, стала абмежаванне на свабоду пераходу ад аднаго феадала да другога, якое з цягам часу перарасло ў прыгон. Пачаткам афіцыйнага запрыгоньвання сялян лічыцца прывілей вялікага князя Казіміра IV ад 2 мая 1447 г., які забараняў пераходы з дзяржаўных уладанняў у прыватныя і наадварот. У прывілеі фармальна не гаварылася аб пераходах сялян паміж рознымі шляхецкімі або царкоўнымі маёнткамі. Іх магчымасць вырашалася самімі землеўласнікамі.

З XV ст. пашырыліся гандлёвыя сувязі Вялікага Княства Літоўскага з заходнееўрапейскімі дзяржавамі і павялічыліся патрэбы прывілеяванага саслоўя ў грашах, неабходных для набыцця замежнай вопраткі, каштоўнай зброі, тканін і ўпрыгажэнняў. Хуткі рост попыту і цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю на рынках Заходняй Еўропы з сярэдзіны XV ст. стаў галоўным фактарам інтэнсіўнага развіцця ў басейнах сплаўных рэк Заходні Буг, Нёман, часткова Заходняя Дзвіна і на прылеглых да іх тэрыторыях панскай гаспадаркі, накіраванай на пашырэнне ворнай зямлі і яе эксплуатацыю ў форме фальварка (гэта значыць, з таварным характарам вытворчасці, заснаванай на працы прыгонных сялян). У гэтым рэгіёне Беларусі феадалы пачалі пераходзіць ад збірання даніны да «адработачнай» і (у значна меншай меры) грашовай рэнты, што суправаджалася ператварэннем асноўнай масы даннікаў Пабужжа, Панямоння і часткова Падзвіння ў дзве катэгорыі: цяглых сялян, галоўнай павіннасцю якіх стала паншчына, і людзей «осадных», «чиншевиков», «куничных», галоўнай павіннасцю якіх стала грашовая рэнта[17].

Як указвае У. І. Пічэта, аналізуючы юрыдычнае становішча сялянства ў Вялікім Княстве Літоўскім у пачатку XVI ст., паншчына (служба цяглая) існавала ў некаторых панскіх маёнтках здаўна і была для сялян звыклай, традыцыйнай з'явай, аб чым сведчаць шматлікія дакументы[18]. Аднак да сярэдзіны XVI ст. яна ў пераважнай большасці выпадкаў выяўлялася

ў нефіксаванай і нерэгулярнай форме («рабіць калі скажуць», «колькі двару трэба») і хутчэй за ўсё была не вельмі цяжкай для сялян[19]. На думку В. Ф. Голубева, рэнта ў выглядзе нерэгулярных адработкаў была для адносна шматлікай сям'і селяніна менш цяжкай, чым пастаянна ўзрастаючая даніна і асабліва чынш, выплаце якога павінна была папярэднічаць рэалізацыя на рынку таго ці іншага тавару з сялянскай гаспадаркі[20] ва ўмовах недастаткова развітых на Беларусі таго часу таварна-грашовых адносін[21].

Да сярэдзіны XVI ст. цяжка выявіць адрозненні ў землеўладанні і землекарыстанні дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх і царкоўных сялян Беларусі, бо яны былі нязначнымі[22]. Больш істотнымі, на думку даследчыкаў, былі адрозненні паміж Усходняй Беларуссю і яе цэнтральнай і заходняй часткамі. Гаспадарскія (вялікакняжацкія) землі ў XVI ст. займалі амаль палову тэрыторыі дзяржавы, бо да 1560–1570-х гг. не існавала падзелу зямель на ўласнадзяржаўныя і вялікакняжацкія. Калі ў Заходняй Беларусі вялікакняжацкія землі перамяжоўваліся з прыватнаўласніцкімі, то на ўсходзе краіны ў пачатку XVI ст. уся зямля была вялікакняжацкай[23]. Дамен Вялікага князя Літоўскага, у які ўваходзілі асабіста вялікакняжацкія і дзяржаўныя землі, у сярэдзіне XVI ст. займаў амаль палову тэрыторыі княства[24]. Памер велікакняжацкага дамена пастаянна змяншаўся з прычыны продажу часткі зямель на пакрыццё як дзяржаўных, так і асабістых патрэб вялікага князя і яго двара, раздачы іх за службу феадалам, падараванняў цэрквам, манастырам і інш.[25] Адбывалася паступовае пераразмеркаванне дзяржаўнай зямельнай уласнасці на карысць феадалаў. У XVI ст. прыватнае землеўладанне складала каля 65 працэнтаў усёй зямельнай уласнасці Вялікага Княства Літоўскага, дзяржаўнае — 30, царкоўнае — 5 працэнтаў[26].

Напрыканцы XVI ст. масавыя падараванні зямель ва ўласнасць феадалам спыніліся. У сувязі з падзелам казны ў 1590 г. на дзяржаўную і каралеўскую адпаведна на дзве часткі быў падзелены і дамен вялікага князя. Адна частка маёнткаў была пакінута за дзяржаўнай казной, а іншыя маёнткі, так званыя «сталовыя», якія пазней сталі называцца «эканоміямі», павінны былі сваімі даходамі забяспечваць патрэбы вялікакняжацкага двара. Пры гэтым маёмасць і тых і другіх маёнткаў захоўвалася за дзяржавай[27].

Маёнткі ў распараджэнні дзяржаўнай казны не мелі адзінай назвы. Яны называліся «староствамі», «дзяржавамі», «каралеўшчынамі»[28].

Па старадаўняй традыцыі пры вымярэнні плошчы ворнай зямлі ў Вялікім Княстве Літоўскім карысталіся аб'ёмам збожжа («бочкай сяўбы»[29]; неабходнага для засеву ўчастка[30] («на шесть бочекъ севбы заорати», 1540 г.)[31], «… ямъ вжо ему на полъ четверти бочки зоралъ и ещо дей хочу ему полторы бочки зорати…», 1540 г.[32]), а плошча сенажацяў вызначалася па колькасці вазоў накошанага сена.

Паводле падлікаў гісторыкаў, адной бочкай збожжа можна было засеяць прыблізна адзін морг ворыва, ці 0,71 га, а дзялянка сенажаці, з якой можна было накасіць адзін воз сена, складала прыблізна 0,5 га[33].

Шматлікія дакументы сведчаць, што ў XVI ст. сяляне лічылі сябе фактычнымі ўладальнікамі зямлі, якую яны апрацоўвалі. У «Наказе старостам і дзяржаўцам», прынятым у першай палове XVI ст., гаворыцца, што на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага сяляне глядзяць на сваю зямлю як на спадчынную («дзедзічную») і лічаць яе сваёй уласнасцю («айчызнасцю»)[34].

Аб замацаванні за селянінам пэўнага зямельнага надзелу сведчаць і інвентарныя вопісы феадальных маёнткаў, дзе канстатаваліся надзелы ўсіх сялянскіх сем'яў. Супастаўленне інвентароў аднаго і таго ж уладання за розныя гады дазволіла гісторыкам сцвярджаць, што наследаванне сялянамі надзелу і гаспадаркі ў XVI—XVIII стст. было на Беларусі правілам[35]. Звычайна зямельным надзелам, выдзеленым феадалам, селянін карыстаўся і распараджаўся згодна са звычаёвым правам, калі сваімі дзеяннямі не наносіў шкоды землеўладальніку[36]. Такім чынам, сутнасць зямельных здзелак сялян заключалася ў тым, што яны перадавалі ў спадчыну толькі права валодання і карыстання зямлёю, а не права ўласнасці, якога не мелі[37]. Аднак да сярэдзіны XVI ст. здзелкі аб заставе-закупе зямлі былі звычайным спосабам пераразмеркавання зямлі ў сялянскім асяроддзі. А дзяржаўныя сяляне не толькі «застаўлялі зямлю» дзяржаўным сялянам, прадстаўнікам прывілеяванага саслоўя і іх падданым, але і куплялі яе ў іх [38].

Попыт на збожжа на замежным рынку і цяжкі фінансавы стан дзяржавы ў першыя дзесяцігоддзі XVI ст. патрабавалі правядзення шырокіх аграрных пераўтварэнняў з мэтамі дакладнага ўліку зямель і вызначэння іх якасці, упарадкавання і ўніфікацыі сялянскіх павіннасцей, далейшага замацавання сялян за зямлёй, пашырэння фальварачнай гаспадаркі, што ў выніку павінна было прывесці да значнага росту прыбыткаў казны і землеўладальнікаў. Найбольш простым шляхам павелічэння вытворчасці таварнага збожжа для феадалаў было павелічэнне памераў панскага ворыва шляхам рэарганізацыі сістэмы землекарыстання і абкладання сялянства павіннасцямі ў суадносінах з памерамі надзелаў і якасцю зямлі.

На перабудову сельскай гаспадаркі Вялікага Княства Літоўскага, якая ўключала рэформу панскай гаспадаркі, рэарганізацыю сістэмы землекарыстання і абкладання сялянства павіннасцямі прапарцыянальна велічыні і якасці зямельнага надзелу, быў накіраваны комплекс тэхнічных, эканамічных і сацыяльных мерапрыемстваў сярэдзіны XVI ст. — валочная рэформа вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста.

У каралеўскіх уладаннях парадак правядзення ўліку зямлі вызначаўся асобай інструкцыяй ад 1 красавіка 1557 г. пад назвай «Устава на волоки господаря его милости у во всемъ великомъ князстве Литовскомъ»[39]. Асноўнымі мерапрыемствамі рэформы былі вымярэнне зямлі валокамі і стварэнне ў прыдатных для гэтага мясцовасцях фальваркаў[40].

Разам з поўным вымярэннем ворнай сялянскай зямлі на валокі праводзілася ўвядзенне іх як асноўнай адзінкі падаткаабкладання. Пры гэтым вымяраліся ўсе сялянскія землі, у тым ліку купленыя ці набытыя ў якасці залогу, на якія страчвалася права ўласнасці[41]. Валока складала плошчу ў 21,36 га і змяшчала 30 моргаў, або 19,4 дзесяціны.

Найважнейшай задачай рэформы з'яўляліся таксама поўная рэарганізацыя архаічнай сістэмы землекарыстання сялян і падзел сельскага насельніцтва каралеўскіх уладанняў на тры катэгорыі: «службовыя людзі», «цяглыя» і «асадныя» сяляне. Пры гэтым прадугледжвалася абкладанне іх павіннасцямі прапарцыянальна велічыні ворнага зямельнага надзела і якасці зямлі. У залежнасці ад якасці вымераная зямля падзялялася на чатыры катэгорыі: «добрую», «сярэднюю», «кепскую» і «вельмі кепскую».

Службовымі людзьмі былі путныя баяры, сяляне-слугі, бортнікі, стральцы, асочнікі, вясковыя войты, рамеснікі. Путныя баяры выконвалі падводную павіннасць, а некаторыя жылі пры панскіх дварах і развозілі пісьмы, грошы, пасылкі. Яны атрымлівалі бясплатна па дзве валокі зямлі,

а частка рамеснікаў і слуг — па адной — пры гэтым ім трэба было працягваць выконваць свае службовыя абавязкі.

Для цяглых сялян асноўнай формай зямельнай рэнты была ўстаноўлена паншчына ў фальварку «съ сохою, съ серпом, съ косою, съ топоромъ» і іншая «тягль» па два дні ў тыдзень з валокі зямлі, акрамя трох тыдняў рэлігійных зімовых і веснавых свят, калі на паншчыну не хадзілі, але за гэта адбывалі чатыры талокі летам.

«Устава» вызначала расклад работы на паншчыне: «А становиться къ работе подданнымъ якъ слонце всходитъ, а сойти зъ работы якъ слонцу заходити. А отпочивку тымъ, што съ быдломъ робятъ, передъ обедомъ година, въ полудню година, надъ вечеромъ година; а которые пешо робятъ, тымъ отпочивку въ тыежъ часы, одно по полгодины маетъ быти...»[42].

«Устава на волокі» вызначала і пакаранні сялян за нявыхад на працу: «... и который человекъ не выйдетъ на работу, ино за первый день огурного заплатитъ грошъ, а за другий день барана; а коли и въ третий разъ огурится або за пьянствомъ не выйдетъ, ино бичомъ на лавце скарати, а дни повинные велети зарабити... а не откупатися отъ работы никому»[43].

Акрамя адбывання паншчыны, цяглыя сяляне плацілі «цыншу зъ волоки кгрунту добърого — 21 гр [ошъ], зъ середнего — 12 грошей, съ подлого — 8 грошей, а зъ вельми подлого, песъковатого альбо блотливого — 6 грошей» (1557 г.)[44]. Адрозненні ў якасці глебы нівеліраваліся ў надзелах цяглых (паншчынных) сялян не прырэзкамі зямлі да вымеранай валокі, а дыферэнцыяцыяй пазямельнай рэнты.

Асадныя (асаднікі, чыншовыя) сяляне былі ў землеўладальнікаў на аброку, і галоўнай іх павіннасцю замест паншчыны лічылася «осада» — грашовая плата, якая складала за карыстанне адной валокай зямлі 30 грошаў незалежна ад яе якасці. Акрамя таго, чыншоваму селяніну трэба было адбыць у феадала 12 талок або заплаціць за іх 12 грошаў і 10 грошаў за «гвалты».

З цяглых і асадных валок сяляне павінны былі даваць яшчэ на карысць землеўласніка падаці натурай (дзякла) аўсом, сенам, гусямі, курамі, яйкамі, а таксама «невадоўшчыну» (на невады) — па 2 грошы і стацыю (збор на выпадак праезду князя, біскупа, паслоў і розных ганцоў) — па 2,5 гроша.

Згодна з «Уставай на валокі», у каралеўскіх уладаннях на кожную валоку фальваркавага ворыва патрабавалася мець не менш як сем валок у карыстанні сялян — гэта значыць, сяляне, якія мелі ў карыстанні сем валок зямлі, павінны былі апрацоўваць валоку зямлі ў фальварку.

Адначасова з увядзеннем валокі як адзінкі пазямельнай меры і павіннага абкладання сялян ставілася мэта пашырэння фальваркаў, пад якія адводзіліся лепшыя па якасці і размяшчэнні землі. Пры гэтым усе вясковыя надзелы зводзіліся ў адзін абруб, а затым у адпаведнасці з патрабаваннямі рэгулярнай трохпольнай сістэмы земляробства падзяляліся на тры роўныя палі. Кожнае поле ў сваю чаргу дзялілася на ўчасткі ў 10 моргаў. Так, у апісанні літоўскай валокі ў падскарбнічых кнігах за 1576–1586 гг. адзначана, што валока павінна змяшчаць у сабе 30 моргаў «на тры поля, у кожным полі па моргаў 10»[45].

Валокай зямлі, падзеленай на тры часткі, якія знаходзіліся ў розных палях, магла карыстацца адна сялянская сям'я або некалькі. Цэлая валока не была абавязковым зямельным надзелам сям'і, а толькі вымераным участкам зямлі для вызначэння павіннасцей. Для феадала было

галоўным усе свае валокі размеркаваць паміж сялянамі, каб з іх яму паступалі ўстаноўленыя павіннасці. На агарод і сядзібу да валокі прыразалася яшчэ тры моргі, у склад якіх уваходзіла і сенажаць.

На сярэдняе поле ссялялі сялян у вёску. Зводзячы сялян у вёскі, урад ствараў новы адміністрацыйны падзел: некалькі вёсак складалі войтаўства (300–400 валок зямлі), а некалькі войтаўстваў — воласць. У новых вёсках жыллёвыя пабудовы сялян размяшчаліся на адным баку вуліцы, а гаспадарчыя — на другім[46], што на стагоддзі вызначыла планаванне вясковых пасяленняў Беларусі.

Каб апрацаваць цэлую валоку зямлі і выканаць з яе павіннасці, патрэбна было мець значную колькасць рабочых рук і цяглавай жывёлы. Як правіла, пасля рэформы на адной валоцы вялі гаспадарку ў сярэднім прыкладна дзве сялянскія сям'і, якія былі сваякамі[47].

Валока як адзінка падаткаабкладання і зямельны надзел не ўлічвала няўдобіцы, якія перамяжалі ўчастак. Павіннасцямі абкладвалася толькі валока ворнай зямлі плошчай у 30 моргаў[48]. Склад валокі характарызуе купчыя, выдадзеныя ў 1585 г. князем Ф. І. Масальскім святару Парфену Федаровічу: «... на всю тую волоку вышъ помененую Зубриковщину, такъ... всю окгуломъ, зъ навозами[49], съ поплавами, зъ гаями, лесами и кустовями, сеножатьями, зъ болотами и багнами и зо всякими зарослями, зъ водами, крыницами и зо всякими пожитками...»[50].

У падаравальным запісу Івана Храптовіча на карысць царквы Прачыстай Багародзіны ў Ліпску, зробленым у 1585 г. у кнізе гродзенскага земскага суда, гаварылася, што ён дарue царкве зямлю «зъ будованьемъ дворнымъ и зо всими кгрунтами оремыми и неоремыми, зъ огороды овощовыми, зъ сады, зъ погноями[51], зъ навозами, зъ гаи и сеножатьми, зъ болоты, покосами и выпустами...»[52].

Такім чынам, пасля рэформы сялянскія сем'і, акрамя ворнага надзелу, звычайна мелі яшчэ дадаткова агароды, сады, сенажаці, карысталіся рыбнымі ловамі, уваходамі ў лясы і пушчы, бортнымі ўгоддзямі[53]. Аднак у хуткім часе рэформа, у цэлым праведзеная па заходне-еўрапейскіх узорах, сутыкнулася з мясцовымі культурнымі традыцыямі і сялянскім светапоглядам, згодна з якімі кожны нашчадак мужчынскага полу меў права на частку бацькоўскай маёмасці, што непазбежна вяло да драблення сялянскіх надзелаў[54].

Ва ўладаннях, дзе была праведзена валочная памера, трывала захоўвалася трохполле з прымусовым севазваротам. Напрыклад, пры правядзенні перамеру сялянскіх зямель на валокі ў маёнтку Койданава ў 1588 г. Устава воласці прадпісвала: «Падданыя ў адным полі павінны сеяць жыта, у другім — ярыны, а трэцяе поле павінны пакінуць на парэніну; у гэтым полі могуць наладжваць сабе выган. А хто пасее не ў тым полі, дзе іншыя сеялі, і з-за гэтага панясе ўбытак ад жывёлы суседзяў, апошнія не абавязаны вяртаць такому гэты ўбытак»[55].

Калі ў сям'і не хапала рабочых рук, то для апрацоўкі ўсяго надзелу ворнай зямлі сяляне здаўна бралі супольніка, які «з долі ўраджаю» ці за грошы дапамагаў у правядзенні сельскагаспадарчых работ: «пашу съ нимъ пашенку его, мое насенье, а его работа; ино того лета съ тое пашни поставили есмо жита два стожки, въ кождомъ по шестьнадцати копъ» (1540)[56].

Да канца XVI ст. у самых буйных гаспадарчых уладаннях Беларусі — Гродзенскай, Берасцейскай, Кобрынскай эканоміях, Ашмянскім і Слонімскім староствах, Ляхавічах, Ліпнішках — рэформа была праведзена ў адпаведнасці з «Уставай на валокі»[57].

На ўсходзе Беларусі, у Падняпроўскіх гаспадарскіх валасцях, валочная памера не праводзілася з прычыны пастаяннай ваеннай пагрозы з боку Маскоўскай дзяржавы і падзей Лівонскай вайны (1558–1583). Але, каб павысіць даходнасць размешчаных тут гаспадарскіх уладанняў, у іх у 1560–1561 гг. было праведзена «поравнение грунтов и платов»[58], якое заключалася ў тым, што каралеўскія рэвізоры перамерылі сялянскія надзелы на «службы» — аднолькавыя па плошчы ўчасткі зямлі, роўныя пасеву 30 салянак (бочак) збожжавых, што адпавядала па плошчы 30 моргам, ці валоцы зямлі[59].

Да сярэдзіны XVI ст. тэрмін «служба» азначаў сукупнасць цяглых і іншых павіннасцей, якія выконвалі сяляне за карыстанне зямлёй[60]. Д. Л. Пахілевіч лічыць, што службы да правядзення «параўнання» грунтаў «не ўяўлялі сабой пазямельнай меры і не былі вызначаны ў якіх-небудзь мерах плошчы»[61]. Так, у інвентары Мядзельскай воласці за 1545 г. у склад службы ўключаны яе насельніцтва, цяглавая жывёла, зямля, вымераная ў бочках сяўбы і сенажаці: «Ходор Круты сыны мает два — Алексей, Амельян, а брат у него Прокоп, сыны у него два — Василь, Ивашко, служба; статку у них волы двое, кляч трое, земли под ними навоза на 3 бочки, простое на 20 бочек, сеножатей на 10 воз ... Мартин Мехович, сын у него Грышко, а браты у него два, Степан и Иван, у Степана сыны два, Микита, Левон, служба, статку у них волы, кляч двое, земли под ними навоза на 2 бочки, простое на 10 бочек, сеножатей 10 воз»[62]. Тут пад службай паказана розная колькасць зямлі, што пацвярджае меркаванне Д. Л. Пахілевіча. Уведзеная пры «параўнанні грунтаў» на ўсходзе Беларусі служба, як адзінка падаткаабкладання, абапіралася на стандартную плошчу вымеранага надзела з вызначанай якасцю зямлі («добрая», «сярэдная», «кепская»).

У выніку аграрных мерапрыемстваў 1560–1561 гг. у гаспадарскіх валасцях Падняпроўя быў праведзены дакладны ўлік колькасці і якасці зямельных надзелаў сялян і для іх былі ўведзены адзіныя віды і нормы павіннасцей з новай адзінкі абкладання — службы. Прычым у структуры іх пазямельнай рэнты пачалі выключна пераважаць грашовыя плацяжы, што ператварала іх з сялян-даннікаў у сялян-чыншавікоў[63].

Істотныя змены ў землеўпарадкаванні, сістэме землекарыстання, абкладання сялян павіннасцямі адбыліся таксама ў прыватнаўласніцкіх і царкоўных маёнтках, дзе была праведзена валочная памера. Аднак уведзеныя ў іх нормы падаткаабкладання сялян звычайна былі значна вышэйшымі, чым у дзяржаўных уладаннях, бо Устава на валокі 1557 г. была абавязковай толькі для гаспадарскіх валасцей.

Пасля дакладнага ўліку зямель пры правядзенні «валочнай памеры» па-за надзеламі засталося шмат «засценкаў», «пустых» ці непрынятых валок, таму што да правядзення рэформы звычайна сялянскія надзелы былі большымі[64]. На гэтых землях, што раней пуставалі, сталі ўзнікаць невялікія пасяленні хутарскога тыпу — засценкі, якія спачатку засяляліся свабоднымі сялянамі, але з цягам часу ператварыліся ў паселішчы дробных прадстаўнікоў служылага саслоўя — шляхты, зямян, путных і панцырных баяр.

Па меры развіцця шляхецкага права ўсё большыя масы сялянства траплялі ў асабістую залежнасць ад феадалаў. Адным з пашыраных юрыдычных прынцыпаў пазбаўлення феадаламі пахожых людзей волі з'яўлялася «даўнасць» — працяглы час пражывання сялян у маёнтку феадала. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529 і 1566 гг. устанаўлівалі

дзесяцігадовы тэрмін «давности земской», пасля якога селянін фактычна страчваў права пераходу ад аднаго феадала да другога. Паводле Статуту 1588 г., вольны пахожы чалавек, «заседзеўшы» за феадалам дзесяць гадоў, мог пайсці ад яго толькі пры ўмове выкупу ў 10 коп грошаў і вяртання «запамажэння» (гэта значыць дапамогі інвентаром, збожжам, жывёлай, грашыма), якое звычайна бралі навапасяленцы ў пана.

Несанкцыяванае запрыгоньванне людзей «извечных», «дедичей» або «отчичей», як адзначаў В. Л. Насевіч, у прыватных уладаннях не сустракала сур'ёзнага супраціўлення з іх боку, таму што ў нармальнай сітуацыі яны не думалі аб пераходзе на новае месца. Немалаважным было і гарантаванае права на надзел у роднай вёсцы, якое не ставілася пад сумненне ні сельскай грамадой, ні землеўладальнікам[65].

Буйныя землеўладальнікі ўсімі сіламі імкнуліся, нягледзячы на законы, да запрыгоньвання не толькі пахожых сялян, але і дробнай шляхты. Варта было панцырнаму баярыну прапусціць ваенную службу або не з'явіцца на попіс, як яму прад'яўляўся судовы іск аб «привернении» яго ў разрад цяглых сялян[66].

Адносная нівеліроўка памераў феадальнай эксплуатацыі сялянства на тэрыторыі амаль усёй дзяржавы ў выніку правядзення валочнага памеру мела вялікае значэнне ў працэсе ўмацавання прыгонніцтва. Пасля заканчэння аграрных рэформ асноўную масу сельскага насельніцтва Беларусі з канца XVI ст. складалі дзве катэгорыі феадальна залежнага сялянства: цяглыя, галоўнай павіннасцю якіх была паншчына, і асадныя, асноўнай павіннасцю якіх была грашовая рэнта.

У выніку поўнага і дакладнага ўліку зямлі, стандартнага абкладання павіннасцямі ўсіх крыніц даходаў сялянства, увядзення трохпольнай сістэмы севазвароту, дзейснай сістэмы кіравання і кантролю аграрная рэформа прывяла да павелічэння ў некалькі разоў прыбыткаў з дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх землеўладанняў і амаль на тры стагоддзі вызначыла напрамак развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі.

Пасля ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў, звязаных з валочным памерам, на тэрыторыі Беларусі панавала ўжо папаравае ворыўнае земляробства, аснову якога складаў трохпольны севазварот, хаця ў некаторых раёнах Падняпроўя і на Палессі ён суіснаваў з двухполлем і лясным пералогам.

Зямля, падзеленая на валокі і дадзеная ў карыстанне сялянам, называлася «кгрунтомъ волочнымъ», а зямля, якая не ўвайшла ў сялянскія надзелы пасля ўвядзення валочнага памеру,— «кгрунтомъ застенковымъ». У актавых матэрыялах сустракаюцца і іншыя старажытныя назвы зямельных надзелаў: «реза» («а попова реза скраю отъ самое стены» (1599 г.))[67], «саха», «плуг», «рала», «грунт на каня»[68].

Старцы (старышні) вясковай грамады і сялянскія сходы наглядалі за захаваннем межаў зямель асобных сёл і ўвогуле валасцей. Разам з межаўшчыкамі старцы раз у год акрэслівалі межы сялянскіх валок і агульных угоддзяў вёсак, а раз у тры гады аглядалі і ўдасканальвалі межы зямель усёй воласці. Межы абавязкова абазначаліся межавымі знакамі (капцамі) або прасекай, баразной[69].

Мяжа вакол надзельнай зямлі называлася «стеною». Абвесці ўчастак мяжой называлася «заложить стену», «заграничить стеною»[70]. На межах насыпаліся земляныя межавыя («граничные») знакі — малыя і вялікія земляныя капцы. Капец ад капца насыпаўся звычайна на адлегласці шасці шнуроў («идучи ажъ до реки Вешнее копцовъ усыпано двадцать

два, а одинъ одъ другого въ шести шнуровъ мерничихъ» (1602 г.))[71]. На вуглах надзелу насыпаліся вялікія «нарожныя» капцы («а третий у того верха леса Грабова нарожный копецъ усыпано» (1586 г.))[72]. Зверху ў капец укопваўся «паль» (кол), на якім вычэсваўся межавы знак.

Калі мяжа надзела праходзіла праз лес, то вакол капца лес высякаўся, што называлася «копецъ обрубомъ обвести» («на болотехъ копцы старые, безъ обрубовъ одержатисе дей не могутъ» (1586 г.))[73].

З цягам часу капцы зарасталі кустамі і дрэвамі, тады межавыя знакі высякаліся на гэтых дрэвах («в дубе великомъ старомъ знакъ граничный старый вырубанъ» (1586 г.))[74]. Межавыя знакі звычайна мелі выгляд крыжоў («крижи»), або вуглоў («граней») («только для знаковъ граничныхъ у дереве у восьми вольхахъ крижи починено» (1592 г.))[75].

У час зямельных спрэчак межавыя знакі вычэсвалі або выпальвалі, а капцы раскопвалі («губечи знаки граничные подданные его милости пана воеводы витебского тые сосны вырубали» (1592 г.))[76]. Сапсаваць мяжу называлася «стену запсовать»[77].

Пры феадалізме прамысловасці не існавала і зямля з'яўлялася найвялікшай каштоўнасцю, таму зямельныя спрэчкі былі вельмі частай і звыклай з'явай, што знайшло адлюстраванне ў беларускай вусна-паэтычнай творчасці: «Не можна і брату верыць, калі зямлю мерыць»[78]. Зямельныя спрэчкі за межы, захоп чужога ўраджаю, заворванне суседніх пасеваў суправаджалі жыццё сялян, шляхты і мяшчан («тую землю у него отнялъ, жита и овесъ пожалъ, а сеножати покосилъ» (1510 г.)[79], «... всходы пшеницы, конопель, овсовъ и иныхъ яринъ поорали» (1514 г.)[80], «Игнатъ Ходковичъ... на той ниве его ярицу, овесъ и ленъ засееный пооралъ и гъредчыною своею посеялъ» (1582 г.))[81]. Актавыя матэрыялы паказваюць, што не толькі псавалі межавыя знакі і заворвалі чужую зямлю, але і шкодзілі адзін аднаму рознымі іншымі метадамі.

Зямельныя спрэчкі разбіраў падкаморскі суд у складзе адной асобы — падкаморыя, якога выбіраў і зацвярджаў кароль з чатырох кандыдатаў, прадстаўленых яму ваяводствам або паветам. Падкаморый вырашаў спрэчкі аб пазямельнай маёмасці менавіта на спрэчнай зямлі паміж прыватнымі асобамі і прыватнымі асобамі і казной. Атрымаўшы скаргу, падкаморы пасылаў позвы спрачальнікам і прызначаў час іх яўкі на спрэчную мяжу. Там ён разглядаў прывілеі, межавыя лісты і іншыя дакументы на зямлю, прыводзіў спрачальнікаў да прысягі і дапытваў сведак.

Абмер («обводъ») межаў спрэчнай зямлі падкаморы заўсёды пачынаў з «граничной пяты» («петы») — гэта значыць, з аднаго з вуглоў поля. Стаўшы на «пяту», падкаморы часта вызначаў адлегласць паміж меткамі ў старажытных мерах даўжыні — «стаях», «гонах», «страляннях з лука» («далей на двои стаи... отъехавши далей съ четверти стай... недалеко на полстаи» (1586 г.)[82]; «... могло быть съ осьмеро стрелянья съ лука» (1586 г.))[83].

З дапамогай сваіх памочнікаў (каморнікаў) падкаморы ўзнаўляў на мясцовасці старыя межы землеўладання або вызначаў новыя землянымі капцамі і іншымі межавымі знакамі. Сваё пісьмовае рашэнне з уласнай пячаткай і подпісам падкаморы паведамляў земскаму ці гродскаму суду, з якога справа была адаслана яму на разгляд. Рашэнне падкаморага незадаволены бок мог абскардзіць у кашталянскім судзе або ў Галоўным трыбунале Вялікага Княства Літоўскага.

Старажытныя меры даўжыні надзелаў захоўваліся ў беларускіх сялян яшчэ ў пачатку XX ст. Як адзначаў П. В. Шэйн, «меры зямлі ў нашых сялян — гэта «гоны», «стаі», а ў некаторых месцах яшчэ «верацень». Усе тры назвы азначаюць адно і тое ж — $^3/_4$ даўжыні морга, а шырыня надзелу не прымаецца ў разлік[84]».

Звычайны сялянскі надзел у канцы XVI ст. складаў 1–0,5 валокі зямлі. Так, згодна з інвентаром 1580 г., у маёнтку Свяцічоўскім надзел у 1 валоку апрацоўвалі адна або дзве роднасныя сям'і: «Марцінъ Ганічъ — волоку, соха и кляча; Карпъ Марковичъ — волоку, соха и кляча; Василь Шеметовичъ — волоку, соха и кляча ... Хотимъ зъ Трохимомъ Нестеровичомъ — волоку, сохъ две, клячъ две»[85]. За карыстанне зямлёй яны павінны былі даваць землеўласніку «зъ волоки по двадцать грошей, а по чотыри бочки жыта, по бочце овса и по возу сена» (1580 г.)[86].

Аб дастаткова вялікіх сялянскіх надзелах гавораць значныя запасы збожжавых культур у сялянскіх гаспадарках. Пры разбойным нападзе запарожскіх казакоў у 1590 г. на сяло Халстова Аршанскага павета казакі «подданых всихъ зъ жонами и зъ детьми съ села прочь разогнали и село все спустошили», забраўшы ў доме селяніна Цярэшкі Аўдзеевіча, акрамя адзежы і рэчаў хатняга начыння, «збожа дей... жита бочокъ одинадцать, пшеницы бочокъ осмъ, гречихи бочокъ одинадцать, овса бочокъ двадцать пять, гороху бочокъ две и семеня ильненого чвертка»[87].

У канцы XVI — першай палове XVII ст. шляхецкія маёнткі ўсё больш набываюць таварны характар, пра што сведчаць шматлікія дакументы. Пры наездзе на маёнтак шляхцянкі Апалоніі Копцевай у 1577 г. у яе было забрана «въ шпихлеру (свірне. — *Аўт.*) гуменномъ жита, што дей наготовано на спустъ (продаж. — *Аўт.*), Берестейское меры бочокъ пятьсотъ; овса Берестейское меры бочокъ триста; пшеницы тоежъ меры бочокъ пятьдесятъ; гороху белаго бочокъ тридцать»[88].

Акрамя таго, з гумна Копцевай у час наезду рабаўнікі вывезлі: «жита дей побрано обороговъ [89] въ гумне пять — въ кождомъ оборогу по тридцати и по три копы (капа — 60 снапоў. — *Аўт.*); пшеницы обороговъ три — въ кождомъ дей оборогу по пятьдесятъ копъ; оркишу (дзікі гладказерны ячмень. — *Аўт.*) обороговъ три — въ кождомъ оборогу по шестьдесятъ копъ; ечменю обороговъ два — въ кождомъ оборогу по семьдесятъ копъ; овса обороговъ три — въ кождомъ оборогу по деветьдесяъ копъ; гречихи обороговъ два — въ кождомъ оборогу копъ по сту; гороху стырта (стог. — *Аўт.*), въ которой копъ сто; ярицы (яровога жыта. — *Аўт.*) оборогъ, въ которомъ дей копъ осьмъ» (1577 г.)[90].

Па рэках збожжа вывозілі ў Заходнюю Еўропу. Так, «Шиман Нахимовичъ, жидъ Кгроденский, проводилъ до Кролевца жита бочокъ 400 и насенья ильняного бочокъ 36», а «на двухъ вицинахъ Яцско Богдановичъ, жидъ Кгродненский, проводилъ до Кролевца жита бочокъ осьмьсотъ»[91]. Пан «Богданъ Михайловичъ, войтовичъ Слуцкий», разам са скураным таварам вёз у Кролевец «пшоно» (1569 г.)[92].

З павелічэннем у канцы XVI — пачатку XVII ст. панскіх ворных зямель і ростам таварнасці памеснай вытворчасці збожжавых культур ва ўсіх рэгіёнах Беларусі сталі пераважаць цяглыя сялянскія гаспадаркі, дзе галоўнай пазямельнай рэнтай была паншчына. У цэнтры Беларусі цяглыя сялянскія гаспадаркі складалі 54,5 працэнта, на захадзе — 62,3, на ўсходзе Беларусі — 57,6 працэнта[93].

У першай палове XVII ст. у сялян на Беларусі сталі пераважаць надзелы ад $^1/_3$ да $^1/_4$ валокі[94], што было абумоўлена дзвюма прычынамі. Па-першае, параўнанне інвентароў адных і тых жа маёнткаў за розныя гады паказала, што пры нязменным зямельным фондзе значна ўзрасла колькасць сялянскіх дымоў, што звязана з падзелам вялікай сям'і на малыя нуклеарныя; па-другое, у гэты перыяд назіраўся значны прырост насельніцтва Беларусі[95].

Аднак сялянскі надзел, як правіла, дапаўнялі яшчэ пазанадзельныя прыёмныя землі, за якія сяляне не адбывалі паншчыны, а толькі плацілі аблегчаны чынш або аддавалі землеўласніку долю ўраджаю. Акрамя ворнай зямлі, кожная сялянская гаспадарка мела агароды і сенажаці, а некаторыя — і сады.

У другой палове XVII — пачатку XVIII ст. сельская гаспадарка Беларусі двойчы зазнала жудасныя разбурэнні. З 1654 па 1667 г. на тэрыторыі Беларусі адбываліся асноўныя баявыя дзеянні вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй. У месцах баёў руйнаваліся гарады і вёскі, вынішчалася насельніцтва. Колькасць жыхароў у шасці беларускіх ваяводствах скарацілася больш чым на 50 працэнтаў[96]. З 1087 дымоў, якія былі перад вайной у 16 вёсках маёнтка Смалявічы, у 1664 г. засталося толькі 216. З сялянскіх гаспадарак былі разрабаваны ці загінулі 87,6 працэнта коней і 97,4 працэнта валоў. Колькасць запусцелых валок за вайну ў маёнтку павялічылася з 9 да 362[97].

Не паспела сельская гаспадарка аднавіцца пасля вайны 1654–1667 гг., як Усходняя Беларусь стала асноўным тэатрам ваенных дзеянняў у час Паўночнай руска-шведскай вайны (1700–1721). У выніку ваенных спусташэнняў у многіх уладаннях рэзка скараціліся колькасць насельніцтва, пагалоўе цяглай жывёлы і плошча пасеваў[98]. Каб утрымаць сялян у разбураных маёнтках, землеўласнікі вымушаны былі даваць сялянам ільготы ў павіннасцях і выкарыстоўваць іншыя магчымасці для больш хуткага ўзнаўлення сваіх маёнткаў. Запусцелыя землі здаваліся ў апрацоўку сялянам на параўнальна лёгкіх умовах, без адпрацоўкі паншчыны. Удзельная вага чыншавых сялян у першай палове XVIII ст. стала складаць у вотчынах заходняй і цэнтральнай частак Беларусі $^1/_3$, а на ўсходзе краіны — $^4/_5$ усяго сялянскага насельніцтва прыватнаўласніцкіх уладанняў[99].

Масавы характар набыло пераманьванне сялян з дзяржаўных уладанняў у свае памесці шляхам розных «слабод» і «запамажэнняў»[100]. Адметнай рысай у развіцці зямельных адносін у першай палове XVIII ст. стала развіццё розных формаў пазанадзельнага землекарыстання. Апрацоўка зямлі «з долі ўраджаю» і розных ільгот, якую селянін прымаў зыходзячы са сваіх фізічных і матэрыяльных магчымасцей і якая не ўключалася ў асноўны надзел, была выгадная як селяніну, так і землеўласніку, бо служыла сродкам узнаўлення вотчыннай гаспадаркі і атрымання прыбытку з надзелаў, якія пуставалі.

Спрыяльныя ўмовы сялянскага землекарыстання станоўча паўплывалі на аднаўленне феадальных уладанняў. Ужо к канцу першай паловы XVIII ст. у асобных маёнтках даваенны ўзровень эканамічнага развіцця быў перавышаны. Напрыклад, у час разбойнага наезду атрада Марціна і Фаддзея Агінскіх у 1735 г. на маёнтак Свадковічы мсціслаўскага канюшага Уладзіслава Свадкоўскага камандзір атрада Чарняўскі, «выбирая же изъ амбаровъ и сараевъ разный хлебъ — рожъ, пшеницу, ячмень, овесъ, яровую рожъ, приказалъ сыпать на землю, подъ ноги лошадямъ ...

въ одномъ только дворе Свадковичахъ, потопталъ лошадьми разного хлеба на тысячу Литовскихъ бочекъ, не считая хлеба, забранного имъ особо»[101].

Узнаўленне землеўласніцкай і сялянскай гаспадарак у XVIII ст. ішло ва ўзаемасувязі з прыростам насельніцтва, якое з 1,5 млн чалавек у 1717 г. павялічылася на Беларусі да 3,6 млн у 1790 г.[102] Станоўчы ўплыў на вытворчасць сельскагаспадарчых прадуктаў аказвалі рост гарадоў і іх насельніцтва, пашырэнне ўнутранага і замежнага гандлю, умацаванне і развіццё ўсебаковых сувязей пануючага класа з Заходняй Еўропай.

Аднак большасць дзяржаўных уладанняў, у тым ліку найбуйнейшыя каралеўскія сталовыя эканоміі — Гродзенская, Берасцейская і Кобрынская, пастаянна знаходзіліся ў трыманні (арэндзе) прыватных асоб, якія выплачвалі скарбу толькі пэўную частку даходаў з іх. Каб павялічыць прыбыткі з дзяржаўных зямель, каралеўская адміністрацыя Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. пайшла на шэраг аграрных пераўтварэнняў шляхам аднаўлення і пашырэння на дзяржаўных землях фальварачнай сістэмы і павышэння рэнтааддачы сялянскіх гаспадарак у гэтых уладаннях.

Ініцыятарам і арганізатарам новых аграрных рэформ стаў надворны падскарбій Вялікага Княства Літоўскага Антоній Тызенгаўз. Дамогшыся вяртання каралеўскіх эканомій у распараджэнне скарба, ён у 1765 г. прыступіў да перабудовы там землекарыстання. З гэтай мэтай у сялян была забрана зямля, якая ў другой палове XVI — XVII ст. складала фальваркавае ворыва, і на гэтай аснове былі зноў адроджаны фальваркі. Сялянская зямля была падзелена на сядзібную і прынятую, а сяляне — на дзве катэгорыі: цяглых і зямян (чыншавых сялян). Кожная сялянская гаспадарка ў абавязковым парадку павінна была ўзяць $^1/_4$ валокі сядзібнай зямлі. Памеры прыёмнай зямлі не абмяжоўваліся, і кожная сям'я магла браць яе столькі, колькі магла апрацаваць. Цяглыя сяляне за карыстанне $^1/_4$ валокі сядзібнай зямлі былі абавязаны адпрацаваць у фальварку два дні паншчыны ў тыдзень, а зямяне — плаціць грашовую рэнту. Памеры выплат з прыёмных дзялянак устанаўліваліся ў адпаведнасці з якасцю зямлі[103]. Рэформа павялічыла паншчыну і прывяла да значнага павышэння даходнасці каралеўскіх эканомій[104].

Спрыяльная для сельскагаспадарчай прадукцыі кан'юнктура на знешнім і ўнутраным рынку ў другой палове XVIII ст. стымулявала пашырэнне фальварачнага ворыва ва ўсіх тыпах феадальных уладанняў на тэрыторыі Беларусі. Пад уздзеяннем працэсу развіцця фальваркаў значна змянілася структура землекарыстання сялян заходняй і цэнтральнай частак Беларусі, дзе сталі пераважаць гаспадаркі, у якіх мелася цяглая доля, хоць многія, акрамя сядзібнага надзелу, апрацоўвалі прыёмную зямлю[105]. Напрыклад, у маёнтку Панікві Гродзенскай губерні 48 сялян мелі ў другой палове XVIII ст. па $^1/_4$ валокі цяглай і $^1/_4$ валокі прыёмнай зямлі, за якую плацілі грашыма[106]. Гэта было выгадна землеўладальніку, які атрымліваў грашовы даход і меў рабочую сілу для апрацоўкі незанятых валок.

У магнацкіх уладаннях захаду Беларусі цяглыя сялянскія гаспадаркі ў другой палове XVIII ст. складалі 80–90 працэнтаў ад агульнай колькасці ўсіх сялянскіх дымоў[107]. Пры гэтым фальваркава-паншчынная сістэма гаспадарання стала ўводзіцца і на ўсходзе Беларусі, дзе з прычыны нізкай урадлівасці глеб і аддаленасці ад асноўных транспартных артэрый да 1770-х гг. грашовая рэнта пераважала ў структуры сялянскага падаткаабкладання[108].

На Беларусі ў другой палове XVIII ст. у параўнанні з другой паловай XVII — першай паловай XVIII ст. паншчына павялічылася на 27 працэнтаў у магнацкіх вотчынах і на 11 працэнтаў ва ўладаннях дробнай і сярэдняй шляхты на захадзе і ў цэнтры, а ва ўсходнім рэгіёне — на 75 працэнтаў у магнацкіх і на 21 працэнт на землях дробнай і сярэдняй шляхты[109].

У канцы XVIII ст. у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя Беларусі з насельніцтвам каля 3 млн чалавек (сярод якога сяляне складалі 93,5 працэнта)[110] была далучана да Расійскай імперыі.

Самай шматлікай катэгорыяй сялянства на Беларусі былі памешчыцкія сяляне, якія разам са сваёй маёмасцю знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад землеўласніка. Акрамя паншчыны, яны выконвалі шэраг павіннасцей на карысць памешчыка і дзяржавы. Руская адміністрацыя ў сваёй палітыцы на далучаных землях патрабавала, каб сяляне працягвалі выконваць усе павіннасці, плацяжы і слухаліся сваіх уласнікаў[111].

Пасля далучэння да Расіі дзяржаўныя землі і маёнткі на тэрыторыі Беларусі Кацярына II і царскі ўрад пачалі раздаваць ва ўласнасць рускім памешчыкам і чыноўнікам, у выніку чаго рэзка скарацілася колькасць дзяржаўных сялян, якія складалі асноўную масу насельніцтва каралеўскіх староstваў і дзяржаў, а новай уладай былі пераведзены ў прыгонных рускіх памешчыкаў.

Уключэнне Беларусі ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму значна пашырыла рынак збыту сельскагаспадарчай прадукцыі, што выклікала рост плошчы пад збожжавыя культуры. Узмацненне долі панскага ворыва ў зямельным фондзе маёнткаў выклікала не толькі павелічэнне дзён паншчыны, але і пераход ад падымнага вылічэння нормаў паншчыны



На паклон да памешчыка

да падушнага, што вяло да росту адработачных павіннасцей[112]. Паводле даных беларускіх гісторыкаў, у чатырох беларускіх губернях (Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай) агульная плошча ворнай зямлі ўзрасла з 7,3 млн дзесяцін у канцы XVIII ст. да 8,2 млн дзесяцін у 1861 г.[113]

Гаспадарчая газета «Эканамічныя запіскі» пісала ў 1862 г. аб былых прыгонных сялянах Беларусі, што пры мясцовых мізэрных ураджаях «рэдкі з гаспадароў абыходзіцца сваімі хлебнымі запасамі да пачатку лета; большая частка з іх ужо ў канцы зімы адпраўляецца натоўпам да памешчыка «прасіць гарцаў», гэта значыць звычайна прызначаемай ім порцыі збожжа на тыдзень: па два, а зрэдку па тры гарцы сумесі жыта з аўсом»[114]. У муку з гэтага зерня сяляне дабаўлялі амаль палавіну мякіны. Хлеб атрымліваўся дрэннай якасці, надзвычай чорны і сыпкі. Упэўненасць селяніна ў неабходнасці дабаўлення мякіны ў хлеб і яе пажыўнасці не адпавядала рэчаіснасці, а толькі павялічвала аб'ём ежы[115].



Члены Мінскай губернскай па сялянскіх справах установы. Пачатак XX ст.

У сярэдзіне XIX ст. гаспадарка, заснаваная на працы прыгонных сялян, вычарпала ўсе рэзервы развіцця і страціла сваю жыццяздольнасць. У сувязі з гэтым 19 лютага 1861 г. імператар Аляксандр II выдаў Маніфест аб скасаванні прыгоннага права і Палажэнні аб рэформе, якія складаліся з шэрагу асобных законаў. Паводле Агульнага палажэння, сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і права распараджацца сваёй маёмасцю.

Для практычнага ажыццяўлення рэформы ў паветах уводзіліся пасады міравых пасрэднікаў. На працягу двух гадоў пасля выдання маніфеста яны павінны былі скласці ўстаўную грамату на кожны маёнтак. Устаўная грамата змяшчала імянны спіс сялян, колькасць і памеры іх надзелаў, вызначала парадак паступовага пераходу надзелаў ва ўласнасць сялян на ўмовах выкупу зямлі ў памешчыкаў.

На Беларусі рэформа праводзілася на падставе Агульнага палажэння аб рэформе і двух мясцовых палажэнняў (Мясцовага палажэння для вялікарасійскіх, новарасійскіх і беларускіх губерняў і Мясцовага пала-

жэння для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і часткі Віцебскай губерняў). У Магілёўскай і васьмі паветах Віцебскай губерні найвялікшы памер сялянскага надзелу павінен быў складаць $4–5^1/_2$ дзесяцін на рэвізскую душу, найменшы — адпаведна 1 дзесяціну 800 кв. сажняў — 1 дзесяціну 2000 кв. сажняў. Калі дарэформенны надзел селяніна быў большы за найвышэйшую норму і калі ў памешчыка заставалася менш за $^1/_3$ прыдатнай зямлі, Палажэнне давала права адразаць зямлю ў сялян[116].

У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і так званых інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні за сялянамі замацоўваліся іх зямельныя надзелы па стане на 1861 г. Надзелы падлягалі абавязковаму выкупу сялянамі ў растэрміноўку на працягу 49 гадоў. Да поўнага выкупу надзела сяляне лічыліся часоваабавязанымі.

Асаблівасцю сялянскай рэформы на Беларусі было тое, што ў цэнтральных і заходніх губернях надзельныя землі былі адразу замацаваны ў падворнае валоданне, як пры прыгоне. Пры гэтым у распараджэнні вясковай грамады заставаліся толькі паша, выганы і няўдобіцы, а ўся ворная зямля і сенажаці належалі кожнай гаспадарцы асобна і пераходзілі ў спадчыну.

Ва Усходняй Беларусі (Магілёўская губерня і паветы Віцебскі, Суражскі, Гарадоцкі, а таксама частка Полацкага павета Віцебскай губерні) надзельная зямля паступала ў распараджэнне сялянскай грамады. Пры гэтым, як указвалі М. М. Улашчык і В. У. Чапко, абшчыннае землекарыстанне ва Усходняй Беларусі не было прадстаўлена ў чыстым выглядзе, як у расійскіх губернях, паколькі тут не існавала перыядычных перадзелаў надзельнай зямлі[117]. Аб'ектам падаткаабкладання на гэтай тэрыторыі з'яўлялася сялянская грамада, якая несла калектыўную адказнасць за выплату падаткаў з кожнай гаспадаркі.

Аднак раней чым сяляне прыступілі да выкупных плацяжоў, пачалося паўстанне 1863 г., якое прымусіла царскі ўрад змяніць ход рэформы ў беларускіх і літоўскіх губернях. Пасля падаўлення паўстання дзеля заахвання лаяльнасці сялянства да ўрада імператарскім указам ад 1 сакавіка 1863 г. «адработачныя» павіннасці сялян памешчыкам былі скасаваны, сяляне пераводзіліся на грашовы аброк, сума якога была зніжана на 20% у параўнанні з 1861 г. Акрамя таго, з 1 мая таго ж года сяляне прызнаваліся ўласнікамі зямельных надзелаў. Яны атрымлівалі і права карыстацца некаторымі панскімі ўгоддзямі, і права ўваходу ў лес.

З 1 лютага 1866 г. царскі ўрад абвясціў аб выкупе надзельных сялянскіх зямель у памешчыкаў, якія атрымлівалі ўсю выкупную суму аднаразова з казны, а сяляне павінны былі з гэтага часу выплачваць выкупныя плацяжы павятоваму казначэйству, што канчаткова ліквідавала асабістую залежнасць сялян ад сваіх былых памешчыкаў.

Дзяржаўныя сяляне, якія знаходзіліся на аброку, у 1867 г. былі таксама пераведзены на выкуп і пераходзілі ў склад сялян-уласнікаў, што канчаткова ўраўноўвала іх статус з былымі памешчыцкімі сялянамі[118].

Паводле сведчання сучаснікаў, сяляне, якія адчулі сябе вольнымі ад бяспраўя і самавольства былой панскай адміністрацыі, у першыя дні аддаваліся непрабуднаму сну, так што паверачныя камісіі, якія прыязджалі толькі ў вёскі, к абеду маглі склікаць некалькі заспаных гаспадароў[119].

У першыя часы пасля рэформы, як пісаў А. Я. Багдановіч, у прававых адносінах сялянам наўрад ці было лепш. Улада пана і падпанкаў была



Мясцовая ўлада – памешчык, святар і паліцэйскі ўраднік. Пачатак XX ст.



Валасны старшыня. Вёска Марочна. Заходняя Беларусь. Пачатак XX ст.

заменена ўладай валаснога праўлення, гэта значыць пісара і валаснога старшыні, міравога пасрэдніка і паліцэйскіх чыноў — ад станавога[120] да засядацеляў і спраўнікаў[121]. Да іх паслуг быў валасны суд, які пастанаўляў тое, што гэтыя ўлады хацелі. Цялесныя пакаранні сялян былі звычайнай з'явай, розгі прыпасалі вазамі. Некаторыя валасныя старшыні здаваліся страшней за ўсякага пана і ўсякага войта. Секлі бязлітасна за нядоімку ў падушнай подаці і за нядоімку ў выкупных плацяжах, за сваркі, бойкі, супраціўленні. Жанчын усё ж не секлі — для іх больш выкарыстоўвалася «халодная» (памяшканне для трымання арыштаваных)[122].

Адмена прыгоннай залежнасці дазволіла сялянам значна больш часу аддаваць уласнай гаспадарцы і свабодна прымаць гаспадарчыя рашэнні. Дзякуючы гэтаму на працягу другой паловы XIX ст. сялянская гаспадарка ў Беларусі дасягнула значных поспехаў. Паводле падлікаў В. П. Панюціча, у 1860–1890-я гг. штогадовы збор збожжа на сялянскіх надзелах у Беларусі павялічыўся болей як у два разы[123], а сярэдняя ўраджайнасць узрасла з 24 да 36 пудоў з дзесяціны, або ў 1,5 разы[124]. У значнай ступені гэтаму садзейнічалі пашырэнне ў беларускай вёсцы прылад працы прамысловай вытворчасці, пераход ад традыцыйнага трохполля да чатырохполля і травасеяння. У пачатку XX ст. ураджайнасць збожжавых культур на надзельных сялянскіх землях працягвала імкліва ўзрастаць. Так, калі ў 1907—1908 гг. яна ў сярэднім складала 37,4 пуда з дзесяціны, то ў 1912—1913 гг. — ужо 47 пудоў з дзесяціны[125].

Праявай паляпшэння гаспадарчага становішча сялян у другой палове XIX ст. стаў даволі імклівы дэмаграфічны рост у беларускай вёсцы. Паводле звесткак В. П. Панюціча, з 1858 па 1897 г. колькасць вясковых жыхароў у Беларусі вырасла болей чым у два разы і дасягнула 4962,5 тыс. чалавек[126].

Інтэнсіўны дэмаграфічны рост у беларускай вёсцы працягваўся ў пачатку XX ст. У Гродзенскай губерні, напрыклад, паводле даных дзяржаўнага статыстычнага ўліку, колькасць вясковага насельніцтва ў 1913 г. складала 110,9 працэнта ў параўнанні з 1897 г., а ў Мінскай губерні за гэты перыяд яна павялічылася на 26,2 працэнта[127].



Вясковы староста з жонкай. Мястэчка Любашоў Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

Набыць грошы, неабходныя для пакупкі прылад працы прамысловай вытворчасці, фабрычнага адзення і выплаты падаткаў, большасць сялян магла толькі шляхам наёмнай працы па-за межамі ўласнай гаспадаркі. Напрыклад, паводле даных на 1907 г., каля 75 працэнтаў сялян Гродзенскай губерні не маглі пражыць без дадатковых заробкаў[128].

Пры паншчыне паляшук, як пісаў Ч. Пяткевіч, меў у сваім карыстанні столькі зямлі, колькі мог апрацаваць у вольны ад працы на памешчыка час, карыстаўся сенажацямі на балотах і дубровах, меў права пасвіць жывёлу без абмежавання яе колькасці на панскіх палях і лугах пасля сенакосу і жніва. Атрымліваў будаўнічы матэрыял на рамонт жылля і гаспадарчых пабудоў, драўніну на ацяпленне. Сялянам не забаранялася секчы маладыя парасткі ліпы (луццё) на лыка для пляцення лапцей, выдзёўбваць у панскіх соснах борці і ставіць іх на дрэвах сярод панскага лесу без усялякай даніны або грашовай аплаты. Грыбоў, ягад і арэхаў паляшук збіраў колькі хацеў, а за дастаўку іх у панскі двор сялянам залічвалі адпаведную колькасць дзён паншчыны[129].

Пасля скасавання паншчыны палескія сяляне пры павелічэнні сям'і павінны былі шукаць арэнды дворскай зямлі на адработак, касіць сена на так званы «трацяк» (два вазы сена памешчыку, а трэці сабе), штогод дамаўляцца з землеўласнікам пра выпас жывёлы на яго выганах, іржышчах, скошаных лугах за адпрацоўку падчас жніва (пэўная колькасць дзён за адну жывёлу). Вельмі распаўсюджанымі былі грашовыя пазыкі і выдзяленне сялянам розных прадуктаў за адпрацоўку. Таму для сялян становішча мала палепшылася, бо цяжкую прыгонную залежнасць змяніў клопат пра пашу, касьбу і ацяпленне[130]. Паводле успамінаў А. Я. Багдановіча, у 1890—1900-х гг. яму даводзілася сутыкацца з такім фактам, як значнае змяншэнне колькасці жывёлы ў сялян у гэты час у параўнанні з 1850-і гг. А рост бясконных сялян — гэта была з'ява агульнавядомая[131].

Шмат хто зарабляў грошы на гаспадарчыя патрэбы, наняўшыся да мясцовага памешчыка парабкам або на сезонныя работы. У лясістых раёнах сяляне займаліся рознымі дрэваапрацоўчымі і лесахімічнымі промысламі, вывазам лесу, у вёсках, размешчаных на суднаходных рэках, наймаліся на сплаў розных тавараў і г.д. Але мясцовы рынак працы не мог у дастатковай ступені забяспечыць патрэбу сялян у грашах.

Разам з тым будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі Рыга-Арлоўскай, Маскоўска-Брэсцкай, Лібава-Роменскай, Палескай чыгунак, развіццё і добраўпарадкаванне сухапутных шляхоў зносін давалі сялянам магчымасць накіроўвацца на часовыя работы ў даволі аддаленыя гарады і раёны. Сяляне з Віцебшчыны часта наймаліся на лета чорнарабочымі ў парты Рыгі і Санкт-Пецярбурга, з Магілёўшчыны пашыралася адыходніцтва на шахты Данбасу, з Гомельшчыны выязджалі на заробкі ў Кіеў і іншыя буйныя ўкраінскія гарады.

Сялянскі фонд надзельнай зямлі пасля рэформы 1861–1866 гг. ужо істотна не мяняўся. Папраўіць сваё гаспадарчае становішча сяляне маглі толькі з дапамогай купленай зямлі, а такую магчымасць мелі нямногія. Традыцыйны шлях падзелу бацькоўскіх зямельных надзелаў паміж нашчадкамі вёў да малазямелля. Таму ў канцы XIX — пачатку XX ст. варыянтамі выжывання для многіх сялян актыўнага ўзросту сталі адыходніцтва, заробкавая эміграцыя, пераход у статус наёмнага работніка (парабка), перасяленне ў горад ці ў іншыя рэгіёны імперыі, атрыманне адукацыі і набыццё новай прафесіі.

Разам з малазямеллем вялікую нязручнасць у сялянскім землекарыстанні ў Беларусі складала цераспалосіца, якая перашкаджала ўвядзенню перспектыўных метадаў гаспадарання. Вырашыць гэтую праблему спрабавала сталыпінская рэформа, якая прадугледжвала перавод сялян на надзел зямлі ў адным месцы.

У 1907–1915 гг. у пяці беларускіх губернях было створана 113,8 тыс. хутарскіх і водрубных гаспадарак. У Віцебскай губерні на хутары і адрубы выйшла 23,3 працэнта сялянскіх двароў, Магілёўскай — 12,3, Мінскай — 4,6, Гродзенскай — 5,8 працэнта[132]. Пераход на хутар патрабаваў ад сялян вялікіх сродкаў, звязаных з паслугамі каморнікаў і пераносам сядзібы на новае месца. Таму гэта было па сілах толькі заможным сялянам. Многія гаспадары, усведамляючы нязручнасць цераспалосіцы, усё ж не згаджаліся перасяляцца на хутар, бо баяліся, што замест сваіх апрацаваных і ўгноеных шнуроў ім патрапіць у надзел кепская зямля[133].

Значная роля ў ажыццяўленні сталыпінскай рэформы належала сялянскаму пазямельнаму банку, які прадаваў сялянам у крэдыт землі памешчыкаў. Але ў Беларусі зямля каштавала дорага, паколькі многія памешчыкі добра прыстасаваліся да рынкавых умоў і дваранская зямельная ўласнасць на Беларусі скарачалася больш павольна, чым у Цэнтральнай Расіі. Па гэтых прычынах выкарыстанне крэдытаў сялянскага пазямельнага банка было даволі рэдкай з'явай[134].

Важнейшым мерапрыемствам палітыкі расійскага ўрада па рэалізацыі сталыпінскай рэформы стала перасяленне беззямельных і малазямельных сялян у Сібір і іншыя ўсходнія рэгіёны імперыі. За 1907—1914 гг. з пяці беларускіх губерняў у Сібір перасяліліся 335 366 чалавек, сярод якіх мігранты з Магілёўскай губерні складалі 48,8 працэнта, Віцебскай — 25,3, Мінскай — 18,5, Віленскай — 5,3, Гродзенскай — 4,1 працэнта[135]. Як паказваюць гэта даныя, у Сібір найбольш перасяляліся сяляне з усходніх губерняў — Магілёўскай і Віцебскай.

Сяляне Заходняй Беларусі лічылі за лепшае паехаць на заробкі ў Амерыку на два-тры гады, сабраць грошы і пасля вяртання прыкупіць зямлі. У далёкую і суровую Сібір яны перасяляліся толькі ў крайнім выпадку, калі зусім не было надзеі неяк уладкавацца ў сваёй мясцовасці[136].

Такім чынам, па-ранейшаму пераважная большасць сялян у пачатку XX ст. традыцыйна трымалася за сваю гаспадарку і адлучалася з дому толькі на кароткачасовыя або сезонныя заробкі. Нягледзячы на ўсе намаганні сялян і распачатыя шырокія ўрадавыя меры, накіраваныя на вырашэнне праблемы сялянскага малазямелля, на Беларусі і наогул у Расійскай імперыі яна так і не была вырашана.

У 1880–1910 гг. рост прадукцыі расійскай прамысловасці перавышаў 9 працэнтаў у год. Па тэмпах росту прамысловай вытворчасці і прадукцыйнасці працы Расійская імперыя выйшла на першае месца ў свеце, апярэдзіўшы Злучаныя Штаты Амерыкі. Яна ператварылася ў галоўнага экспарцёра найважнейшых сельскагаспадарчых прадуктаў, вырошчваючы на сваёй тэрыторыі больш як палову жыта, больш як чвэрць пшаніцы і аўса, каля чвэрці бульбы, $^{2}/_{5}$ ячменю сусветнай вытворчасці [137].

Даволі значная частка агульнарасійскага экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі была выраблена на Беларусі, чаму садзейнічалі яе блізкае знаходжанне адносна заходнееўрапейскіх рынкаў збыту і добрыя шляхі

зносін. Згодна з афіцыйнымі данымі, у 1913 г. па насычанасці чыгуначнымі шляхамі на 1000 км$^2$ Беларусь у 1,8 разоў перавышала сярэдні паказчык па еўрапейскай частцы Расіі[138]. Экспарт лёну з Беларусі складаў $^1/_6$ частку ад агульнарасійскага, шмат вывозілася збожжа і іншых прадуктаў сельскагаспадарчай вытворчасці[139].

Сярод губерняў Еўрапейскай Расіі Гродзенская губерня займала першае месца па ўраджайнасці жыта, Мінская — трэцяе, Віленская — пятае, Магілёўская — адзінаццатае[140]. Адбываўся рост капіталаў у створаных сялянамі таварыствах узаемнага крэдытавання, колькасць якіх у 1913 г. складала больш за дзве тысячы з сумай укладаў 53 млн рублёў[141].

У гады рэформы паслядоўна павялічвалася колькасць заможных сялянскіх, хутарскіх і адрубных гаспадарак з прыватным валоданнем зямлі, якія ўсё больш выконвалі ролю вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі для рэалізацыі яе на рынку. Такія гаспадаркі не маглі існаваць і развівацца сіламі сваёй сям'і, а вялі вытворасць прадукцыі з удзелам наёмных рабочых, колькасць якіх у перыяды палявых работ значна ўзрастала.

На надзелах заможных сялян хуткімі тэмпамі пашыралася травасеянне і прымяняліся мінеральныя ўгнаенні, уводзіліся шматпольныя севазвароты, выкарыстоўваліся сельскагаспадарчыя машыны. Адначасова набіраў сілу працэс сацыяльнага расслаення сялян. Гаспадарка малазямельных вяскоўцаў усё больш выразна набывала статус парцылярнай: яна забяспечвала сем'і харчаваннем, але страціла здольнасць быць вытворцам таварнай прадукцыі.

Умацаванне заможнага сялянства, колькасны рост вясковага пралетарыяту, развіццё рынкавых сувязей у галіне сельскай гаспадаркі былі яркім сведчаннем капіталістычнай эвалюцыі беларускай вёскі, але, нягледзячы на правядзенне шырокіх урадавых мер, зямельнае пытанне на Беларусі, як і наогул у Расійскай імперыі, так і не было вырашана.

[1] Шчарбакоў С. А., Штыхаў Г. В. Формы феадальнай залежнасці і катэгорыі сялянскага насельніцтва // Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997. С. 36.

[2] Повесть временных лет / пер. Д. С. Лихачева и Б. А. Романова; под ред. В. П. Адриановой-Перетц. М.; Л., 1950. Ч. 1. С. 237; Памятники русского права. Вып. 1. : Памятники права Киевского государства. X–XII вв. / сост. А. А. Зимин. М., 1952. С. 117, 179.

[3] Там же. Ч. I. С. 20–21, 31, 43, 47.

[4] ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. М., 1998. С. 71.

[5] Шчарбакоў С. А., Штыхаў Г. В. Формы феадальнай залежнасці і катэгорыі сялянскага насельніцтва. С. 42.

[6] Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961. С. 22–26.

[7] Шчарбакоў С. А., Штыхаў Г. В. Формы феадальнай залежнасці і катэгорыі сялянскага насельніцтва. С. 38.

[8] Тамсама. С. 39–40.

[9] Зимин А. А. Холопы на Руси (с древнейших времен до конца XV в.). М., 1973. С. 76.

[10] Довнар-Запольский М. В. Очерки по организации западно-русского крестьянства в XVI в. Киев, 1905. С. 142.

[11] Шчарбакоў С. А., Штыхаў Г. В. Формы феадальнай залежнасці і катэгорыі сялянскага насельніцтва. С. 39–40; Спиридонов М. Ф. Крестьянство Белоруссии в конце 15 – первой пол. 16 в. // Франциск Скорина и его время: энцикл. справ. / рэдкал.: И. П. Шамякин [і інш.]. Мінск, 1990. С. 395.

[12] Довнар-Запольский М. В. Очерки по организации западно-русского крестьянства в XVI в. С. 78.

[13] Любавский М. К. Областное деление и местное управление в Литовско-Русском государстве ко времени издания первого Литовского Статута: исторические очерки. М., 1892. С. 408.

[14] Довнар-Запольский М. В. Очерки по организации западно-русского крестьянства в XVI в. С. 57–91.

[15] АЗР. Т. 1. СПб., 1846. С. 48 (1438 г.); Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 3. Вильна, 1867. С. 247 (1560 г.).

[16] Спиридонов М. Ф. «Дым» – единица хозяйства крестьян Белоруссии в XVI в. // Тез. докл. и сообщ. XV сессии Межресп. симпоз. по аграрной истории Вост. Европы. М., 1974. С. 73.

[17] Спірыдонаў М. Ф. Сялянства ў перыяд усталявання паншчыны і прыгонніцтва // Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1. Мінск, 1997. С. 72.

[18] Пичета В. И. Юридическое положение сельского населения на частновладельческих землях ко времени издания Литовского Статута 1529 г. // Белоруссия и Литва XV–XVI вв. М., 1961. С. 321–322.

[19] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. Мінск, 1992. С. 40.

[20] Тамсама.

[21] Лойка П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI – XVIII ст. Мінск, 1991. С. 97.

[22] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 28–29.

[23] Пичета В. И. Юридическое положение сельского населения на частновладельческих землях ко времени издания Литовского статута 1529 г. С. 360.

[24] Похилевич Д. Л. Статус домена Великого князя Литовского и его населения в XV–XVI вв. // Тез. докл. и сообщ. XV сессии Межресп. симпоз. по аграрной истории Вост. Европы. М., 1974. С. 52.

[25] Любавский М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1915. С. 95, 154.

[26] Ochmański J. Historia Litwy. Wroclaw; Warszawa; Kraków; Gdańsk; Lodź, 1982. S. 85.

[27] Козловский П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. Минск, 1982. С. 19.

[28] Там же.

[29] Паводле падлікаў В. Л. Насевіча, аб'ём "бочкі сяўбы" складаў прыблізна 154 л і змяшчаў каля 94 кг азімага жыта, 114 кг пшаніцы, 87,5 кг ячменю, 72 кг аўса. Гл.: Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск, 2004. С. 78.

[30] Довнар-Запольский М. В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. СПб., 1904. С. 268.

[31] АВАК. Т. XVII. С. 142.

[32] Там же.

[33] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 31.

[34] Тамсама. С. 25.

[35] Козловский П. Г. Правовое положение крестьян Белоруссии // Социально-политическое и правовое положение крестьянства в дореволюционной России. Воронеж, 1983. С. 123; Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі. С. 25.

[36] Спиридонов М. Ф. Застава-закуп земли государственными крестьянами Белоруссии в XVI в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1971. Вильнюс, 1974. С. 62.

[37] Спірыдонаў М. Ф. Сялянства ў перыяд усталявання паншчыны і прыгонніцтва // Гісторыя сялянства Беларусі: в 3 т. Т. 1. Мінск, 1997. С. 62.

[38] Спиридонов М. Ф. Застава-закуп земли государственными крестьянами Белоруссии в XVI в. С. 58.

[39] АЗР. Т. 3. СПб., 1848. С. 72–92.

[40] Копысский З. Ю. Новые документы об аграрном строе Белоруссии в XVI – первой половине XVII века // Советское славяноведение. 1980. № 1. С. 61.

[41] Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док. и мат. Минск, 1959. Т. 1. С. 224.

[42] АЗР. Т. 3. С. 77.

[43] АВАК. Т. XIV. С. XIII.

[44] Литовская метрика. Книга публичных дел // РИБ. Юрьев, 1914. Т. 30. С. 551.

[45] Zródła dziejowe. T. 9. Księgi podskarbinske z czasów Stefana Batorego (1576–1586). Warszawa, 1897. S. 300. Цыт. па: Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 49.

[46] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры белорусов XVI – XVIII вв. Минск, 1981. С. 14–15.

[47] Спірыдонаў М. Ф. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. // Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 1. С. 81.

[48] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 49.

[49] Навоз – прысядзібная дзялянка зямлі, добра ўгноеная і вырабленая.

[50] АВАК. Т. I. С. 9.

[51] Пагной – угноены ўчастак надзельнай зямлі.

[52] АВАК. Т. 1. С. 4.

[53] Спірыдонаў М. Ф. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. Т. 1. С. 81; Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 49–50.

[54] Носевич В. Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск, 2004. С. 102.
[55] Цыт. па: Капыскі З. Ю. Сяляне Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. // Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 1. С. 111.
[56] АВАК. Т. XVII. С. 67.
[57] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 52.
[58] Пичета В. И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве: в 2 ч. М., 1958. С. 243–244.
[59] АСД. Т. 3. Вильно, 1897. С. 262–263; Спірыдонаў М. Ф. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. С. 84–85.
[60] Владимирский-Буднов М. Ф. Формы крестьянского землевладения в Литовско-Русском государстве XVI в. Киев, 1892. С. 369–374.
[61] Похилевич Д. Л. Землеустройство и поземельный кадастр в Белоруссии, Литве и Украине в XVI–XVII вв. // Материалы по истории земледелия СССР. М., 1952. Сб. 1. С. 330.
[62] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мінск, 1936. Т. 1: IX–XVIII стст. С. 110–111.
[63] Спірыдонаў М. Ф. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. Т. 1.С. 85.
[64] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 50.
[65] Носевич В. Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. С. 91–92.
[66] Довнар-Запольский М. В. Очерки по организации западно-русского крестьянства в XVI в. С. 302–306.
[67] АВАК. Т. VI. С. 184–185.
[68] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 32.
[69] АВАК. Т. XXV. С. 114–131; 330–331.
[70] Там же. Т. VI. С. 162, 165, 174.
[71] Там же. С. 145.
[72] Там же. С. 157.
[73] Там же. С. 146.
[74] Там же. С. 145.
[75] Там же. С. 157.
[76] Там же. С. 156–157.
[77] Там же. С. 165.
[78] Ляцкий Е. А. Материалы для изучения творчества и быта белорусов. 1. Пословицы, поговорки, загадки. М., 1898. С. 30.
[79] Литовская метрика. Книга судных дел // РИБ. СПб., 1903. Т. XX. С. 35.
[80] Там же. С. 192.
[81] АВАК. Т. XXXVI. С. 135.
[82] Там же. Т. VI. С. 144.
[83] Там же. С. 143.
[84] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка населения Северо-Западного края: в 3 т. СПб., 1902. Т. 3. С. 371.
[85] АВАК. Т. II. С. 220–221.
[86] Там же.
[87] АСД. Т. 1. Вильно, 1867. С. 180.
[88] АВАК. Т. II / Т. III. С. 289.
[89] Лёгкае збудаванне для захоўвання збожжавых культур і сена. Рухомая на чатырох слупах стрэшка з саломы або дранкі над памостам з жэрдак, на які клалі снапы.
[90] АВАК. Т. III. С. 288.
[91] Там же. Т. XIV. С. 652.
[92] Там же. С. 651.
[93] Капыскі З. Ю. Сяляне Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. // Гісторыя сялянства Беларусі. Т. I. С. 109.
[94] Копысский Ю. З. Хозяйство белорусского крестьянина в конце XVI – первой половине XVII в. // История СССР. 1984. № 2. С. 152.
[95] Юргинис Ю. М. Изменения в аграрном строе Литвы в эпоху феодализма // Вопросы истории. 1976. № 9. С. 41.
[96] Мялешка В. І. Сялянская гаспадарка ў час войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. і яе аднаўленне // Гісторыя сялянства Беларусі. Т. I. С. 140.
[97] Тамсама.
[98] Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. (по материалам магнатских вотчин). Минск, 1969. С. 22; Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI–XVIII вв. Львов, 1957. С. 13, 115, 126, 134, 137; Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII – XVIII в.). Минск, 1975. С. 27–28.
[99] Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. С. 83.
[100] Лойка П. А., Голубеў В. Ф. Сялянскія павіннасці. Змены ў землеўладанні і землекарыстанні // Гісторыя сялянства Беларусі. Т. I. С. 155.
[101] ИЮМ. Вып. 17. Витебск, 1888. С. 243.

[102] Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. С. 24–25.

[103] Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. С. 123.

[104] Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века. Вильнюс, 1966. С. 57–63.

[105] Голубеў В. Ф., Лойка П. А. Сялянскае землеўладанне і феадальная рэнта // Гісторыя сялянства Беларусі. Т. I. С. 195–197.

[106] АВАК. Т. XXXV. С. 252–254.

[107] Козловский П. Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. Минск, 1974. С. 109.

[108] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. С. 95–96.

[109] Голубеў В. Ф., Лойка П. А. Сялянскае землеўладанне і феадальная рэнта. С. 203.

[110] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 2. Мінск, 1972. С. 478.

[111] Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-Западного края при императрице Екатерине II (1792–1796). Вильна, 1903. С. LII.

[112] Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Минск, 1996. С. 17.

[113] Основные этапы развития сельскохозяйственного производства в Белоруссии во второй половине XVIII – начале XX в. / П. Г. Козловский [и др. ] // Проблемы аграрной истории (XIX – 70-е гг. XX в.). Минск, 1978. Ч. 2. С. 8.

[114] Быт белорусского крестьянина, его средства и потребности // Экономические записки. Хозяйственная газета. Еженедельное прибавление к журналу «Труды Императорского вольного экономического общества». 1862. № 21. С. 163.

[115] Там же.

[116] Савіцкі Э. М. Сялянская рэформа 1861 г. // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. X. Мінск, 1974. С. 165.

[117] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 306; Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. Минск, 1966. С. 139, 140, 141.

[118] Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Минск, 1990. С. 31.

[119] Миловидов А. Устройство общественного быта крестьян Северо-Западного края при графе М. Н. Муравьеве (оттиск из «Виленского календаря» за 1903 год). Вильна, 1903. С. 26.

[120] Начальнік паліцэйскага ўчастка.

[121] Начальнік паліцыі павета.

[122] Богданович Адам. Мои воспоминания // Неман. 1994. № 5. С. 57–58.

[123] Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мінск, 2002. С. 168.

[124] Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1890 гг. С. 353.

[125] Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 2. С. 386.

[126] Тамсама. С. 132.

[127] Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. Мінск, 2007. С. 45–46.

[128] Тамсама. С. 51.

[129] Пяткевіч Ч. Грамадская культура Рэчыцкага Палесся / пер. з пол. У. Васілевіча і Л. Салавей. Мінск, 2015. С. 78–81.

[130] Тамсама.

[131] Богданович Адам. Мои воспоминания. С. 58.

[132] Ліпінскі Л. П. Сталыпінская аграрная рэформа // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. X. С. 35.

[133] Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. С. 50.

[134] Тамсама. С. 48.

[135] Ліпінскі Л. П. Сталыпінская аграрная рэформа. С. 35.

[136] Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. С. 52–55.

[137] Большая книга мира. М., 2010. С. 154.

[138] Шымуковіч С. Ф. Гісторыя Беларусі: курс лекцый. Ч. 2. 2-е выданне. Мінск, 2004. С. 80.

[139] Тамсама. С. 81.

[140] Тамсама. С. 79.

[141] Тамсама. С. 79–80.



# ПАЛЯВЫЯ ХАРЧОВЫЯ КУЛЬТУРЫ



Са старажытнасці чалавек вырошчвае злакі — важнейшыя харчовыя культуры. З іх атрымліваюць муку, крупы і іншыя прадукты. Людзі не могуць абыходзіцца без гэтых раслін, бо яны надзвычай багатыя пажыўнымі рэчывамі — бялкамі, вугляводамі, вітамінамі і мінеральнымі салямі, якія поўнасцю задавальняюць патрэбы чалавека ў ежы і садзейнічаюць назапашванню энергіі для нармальнага жыцця.

Зерне хлебных збожжавых культур утрымлівае 60–80 працэнтаў вугляводаў, 7–20 працэнтаў бялкоў, 2–5 працэнтаў тлушчаў, вітаміны, карацін; зерне зернебабовых культур утрымлівае 20–40 працэнтаў бялка, у складзе якога неабходныя для чалавека і жывёл амінакіслоты. Крупяныя збожжавыя культуры таксама з'яўляюцца для чалавечага арганізма важнай крыніцай карысных рэчываў.

Склад палявых харчовых культур беларусаў, а таксама спосабы іх вырошчвання ў розныя гістарычныя перыяды залежалі перш за ўсё ад клімату і сацыяльна-эканамічных умоў жыцця сялян.

Тэрыторыя Беларусі адносіцца да арэала з вільготным умерана кантынентальным кліматам. Цеплавы рэжым характарызуецца паступовым паніжэннем тэмпературы паветра з паўднёвага захаду на паўночны ўсход. У сярэднім за год на большай частцы Беларусі выпадае 600–700 мм асадкаў, аднак паўднёвая і паўднёва-ўсходняя часткі яе тэрыторыі адносяцца да зоны няўстойлівага ўвільгатнення. Пачатак цёплага перыяду з сутачнымі тэмпературамі паветра вышэй 0° прыпадае на другую-трэцюю дэкады сакавіка, а яго канец надыходзіць у першую-трэцюю дэкады лістапада.

Цеплавы рэжым Беларусі дастатковы для вырошчвання жыта, азімай і яравой пшаніцы, ячменю, грэчкі, лёну і іншых сельскагаспадарчых культур. Аднак на іх развіццё згубны ўплыў часам аказваюць замаразкі ў канцы мая — пачатку чэрвеня, у выніку ўварвання на беларускую тэрыторыю мас арктычнага паветра. Максімум ападкаў (звыш $^2/_3$ гадавой сумы) прыпадае на вегетацыйны перыяд, што садзейнічае развіццю пасеваў. Разам з тым самыя дажджлівыя месяцы — ліпень і жнівень, калі ідзе ўборка збожжавых культур, а ў маі, калі многія сельскагаспадарчыя расліны маюць найбольшую патрэбу ў вільгаці, звычайна адчуваецца яе недахоп[1].

Вялікі ўплыў на клімат Беларусі аказвае Атлантычны акіян. Паветраныя масы з захаду прыносяць летам хмурнае і дажджлівае надвор'е, зімой — пацяпленне і адлігу, што адмоўна ўздзейнічае на перазімоўку азімых культур. У асобныя гады кантынентальнасць клімату павялічваецца: зіма больш халодная, лета — больш гарачае, ападкаў выпадае менш. Бываюць гады, калі тэмпература як летніх, так і зімовых месяцаў рэзка адрозніваецца ад сярэдніх шматгадовых. Так абсалютныя максімумы тэмператур часам падымаюцца да 34—35°, а як выключэнне — да 38°. Што тычыцца абсалютных тэмпературных мінімумаў, то яны на поўначы і паўночным усходзе Беларусі дасягаюць -42° і ніжэй, у сярэдняй частцы рэспублікі — да -39°, на поўдні і захадзе — да -35°. Такія моцныя маразы выклікаюцца арктычным паветрам антыцыклонаў[2].

Ураджайныя гады на беларускіх землях спрадвеку чаргаваліся з неўрадлівымі, што знайшло неаднаразовае адлюстраванне ў летапісах. Вось як апісваюцца прыродныя катаклізмы, што адбываліся на Беларусі ў канцы XVI — пачатку XVII ст., у Баркулабаўскім летапісе, помніку беларускай гістарычна-мемуарнай літаратуры другой паловы XVI — пачатку XVII ст., напісаным у вёсцы Баркулабава на Магілёўшчыне. У 1585 г., адзначае летапісец, «перуны и грады великия, сухость, морозы маль не через всё лето были у Литве. От великого морозу на поли у колосьи жито посохло...»[3]

Асабліва цяжкім і неўраджайным на Беларусі быў 1601 год. Летапісец з пачуццём болю і спагады апісваў напаткаўшае беларускіх земляробаў няшчасце. У той год 10 кастрычніка пачаўся моцны снегапад з бурай, які



Гербарый збожжавых культур. Узлянскі агранамічны камбінат Узлянскага агранамічнага ўчастка Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

ішоў цэлы тыдзень. Яравую пшаніцу, авёс, грэчку, усю гародніну, вялікае мноства ярыцы (яравога жыта. — *Аўт.*), непажатай або ў копы зложанай, мяцеліца замяла снегам. «Было жаласна і страшна, — пісаў летапісец, — глядзець і распавядаць плач і ўздыханні ўбогіх людзей і бедных аратых». Снег ляжаў два тыдні аж да Змітраўскай суботы (восеньскія Дзяды, дзень памінання памерлых продкаў. — *Аўт.*). З вялікіх марозаў Днепр замерз і па ім ездзілі як сярод зімы. Людзі пачалі ў сцюжу па снегу жаць. Марозы былі моцныя, таму распальвалі агонь, грэліся. Два-тры чалавекі за дзень ледзьве нажыналі снапоў сорак аўса або ярыцы, бо збожжа было вельмі прылеглае да зямлі. Потым снег растаў і рака Днепр «расплынулася». Людзі па вясне ярыну жалі-гаравалі, але ўжо толькі на корм для жывёлы, а многія гаспадары няжатае сваё збожжа статкамі патравілі, а «маки, горохи, бобы, проса, репа — то всё згола погинуло. А которые молотили ярь, зерня толко знак, а коли змелет, спечет — то у печи испечется, а з лопаты у печ не зложит; с печи аж ополоником выберет. Также и жито велми было не умолотно; а коли муку житную у хлебе спекут, то тесто печеное солодко, а за скорину хоть ложки клади...»[4]; «... непогода, почавши от Менска до Полоцка к Витебску, до Орши, до Мстиславля, до Пропойска, до Рогачова, Могилёва, Любошаны потом много множества людей убогих з голоду на Низ [ушло] з жонами и детками и зъ семею, што иж страшно было не только видети, але трудно было и выписати, то ест з верху з волости Шкловское, з Друцка, з Дубровны, з Круглого, з Бобря, з Витебска, с-под Полоцка, с-под Менска и инших многих украин»[5]. У 1603 г. «Народ божий до домов своих назад пошол — великое множество мужей, жон, детей, но еще болши тех было, которые на Низу померли»[6].

А. Мейер пісаў, што вельмі неўраджайным на Беларусі быў 1785 год, калі ад пастаяннай вільгаці ў збожжы зарадзілася шмат косцера і чорнанасеннага кукаля, а ў пшаніцы галаўні (раслінная хвароба. — *Аўт.*). Раптоўна наступіўшыя марозы амаль усё збожжа ў палях захвацілі[7].

У XIX ст. паўсюдныя неўраджаі ў беларускіх губернях здараліся даволі рэдка, але былі вельмі спусташальнымі. Памятнымі былі галодныя гады 1844—1846 і 1850—1851[8].

То моцныя дажджы, то засухі ставілі пад пагрозу сялянскі дабрабыт і часам вызывалі голад. Так, восень 1844 г. на Беларусі была надзвычай дажджлівай. Азімыя пасевы былі праведзены пазней звычайнага часу, а нізкія палі з глiністаю глебаю і зусім засталіся незасеянымі. Сялянскія палі, засеяныя зернем гэтага года, далі рэдкія і слабыя ўсходы, бо вясна 1845 г. спачатку была халоднай, а потым з канца мая і да апошніх дзён чэрвеня стаяла моцная гарачыня і засуха. Гэта спыніла рост і кушчэнне як азімага, так і яравога хлеба.

На большай частцы Гродзенскай губерні збожжавыя культуры ледзь змаглі вярнуць насенне, а на тэрыторыі Вілейскага і Ашмянскага паветаў яны зусім прапалі або зараслі травой. Таму камісія народнага харчавання, зыходзячы з таго, што ўраджай 1845 г. не мог забяспечыць жыхароў Гродзенскай губерні харчаваннем да ўраджаю 1846 г., прапанавала генерал-губернатару закупіць да 100 000 чвэрцяў[9] збожжа ў іншых губернях. Кіраўнік Віленскай палаты дзяржаўных маёмасцей таксама лічыў, што і казённыя сяляне маюць патрэбу ў дапамозе ўрада на пасевы і харчаванне ў колькасці 100 000 чвэрцяў збожжа[10].

Нягледзячы на існаванне асобных неспрыяльных фактараў клімату Беларусі — няўстойлівы характар надвор'я вясной і восенню, мяккая, з доўгай адлігай зіма, часта дажджлівае лета, недахоп вільгаці ў пачатку лета, познія веснавыя і раннія восеньскія замаразкі і г. д. — беларускія

сяляне вырошчвалі і атрымлівалі ўстойлівыя ўраджаі зерневых і цэлага шэрагу іншых сельскагаспадарчых культур сярэдняй паласы Еўрапейскай часткі Расіі і часткова больш паўднёвых раёнаў[11].

На падставе палеабатанічных матэрыялаў (зерне, пыльца культурных злакаў, адбіткі на керамічных вырабах зерня і каласоў) археолагі ўстанавілі, што ўжо ў IV—III тысячагоддзях да н. э. на тэрыторыі Беларусі старажытныя насельнікі вырошчвалі харчовыя палявыя культуры. Пшаніца сустракаецца ў археалагічных помніках з эпохі ранняга жалеза. Мяркуюць, што на Беларусь гэта культура прыйшла з Прыднястроўя[12]. Апаленае зерне пшаніцы канца I тысячагоддзя да н. э. — пачатку I тысячагоддзя н. э. было знойдзена пры раскопках на гарадзішчы Збаравічы Мінскага раёна. Пшаніца займала першае месца ў жалезным веку сярод іншых злакавых культур Усходняй Еўропы[13] і на працягу ўсяго I-га тысячагоддзя н. э. служыла важнейшай харчовай культурай[14].




Сарты пшаніцы. Злева — вырашчаныя без мінеральных угнаенняў, справа — з мінеральнымі ўгнаеннямі. Узлянскі агранамічны ўчастак Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Распаўсюджанай палявой культурай было проса, зерне якога сустракаецца амаль ва ўсіх старажытных паселішчах на тэрыторыі Беларусі[15]. Як кашная культура яно прыйшло да славян ад трыпольцаў і скіфаў. На поўдні Верхняга Падняпроўя, па дадзеных археалогіі, шырокае распаўсюджанне меў мяцёлчаты від еўрапейскага проса, які выспявае ў больш кароткі вегетацыйны перыяд. Магчыма, што ён папярэднічаў вырошчванню галазёрнай пшаніцы і ячменю.

Для беларусаў проса з'яўлялася адной з асноўных крупяных культур, і на сямейныя патрэбы яго сеялі ў кожнай сялянскай гаспадарцы. Аднак гэта культура вельмі патрабавальная да цяпла на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяду. Сяўба ў непрагрэтую глебу замаруджвае ўсходы, а пры доўгім ляжанні ў зямлі насенне проса загнівае[16].

Спачатку проса расце марудна і лёгка заглушаецца пустазеллем. Таму яго сеялі на лядах (пасеках, расцяробах) пасля выпальвання лесу, калі ўсё пустазелле было знішчана агнём, або пасля жыта, на ачышчаных ім ад пустазелля палях. За лета проса абавязкова два-тры разы праполвалі. Хаця яно не надта патрабавальнае да глебы, але на цяжкіх глiністых і ўвільготненых глебах расце слаба і не дае добрага ўраджаю.

Кашнае ўжыванне зерневых культур больш старажытнае, чым хлебнае. Старажытныя віды пшаніцы — полба і адназярнякі — спачатку таксама былі кашнымі культурамі[17]. Мяккая пшаніца-полба, якая была менш патрабавальная да глебы і кліматычных умоў, наогул была ў старажытнасці пануючай земляробчай культурай у паўднёвай частцы лясной паласы Еўропы.




Звычайнае проса: а і б – кветка; в– зерне; г – асобная ветка мяцёлкі; д – каласок.

На стаянцы Віта-Літоўская (IV—III тысячагоддзі да н. э.) у паўднёвай частцы Верхняга Падняпроўя археолагамі былі выяўлены астаткі зерня ячменю. Старажытнымі алейнавалакністымі раслінамі з'яўляюцца лён і каноплі, семя якіх знойдзена ў археалагічных пластах першай паловы II тысячагоддзя да н. э.

Па дадзеных Ю. А. Краснова, у лясной паласе Усходняй Еўропы насельніцтва ведала ў раннім жалезным веку чатыры віды пшаніцы, ячмень, проса, жыта, авёс, бабы, гарох, пялюшку, лён, каноплі — гэта значыць, амаль усе зерневыя, бабовыя і тэхнічныя культуры, якія вырошчваюцца тут і ў цяперашні час[18].

Па меркаванні палеабатанікаў, жыта было акультывавана славянамі з пустазелля ў больш позні час, чым пшаніца, але дзякуючы сваёй непатрабавальнасці і зімастойкасці з цягам часу стала найбольш пашыранай зерневай культурай на Беларусі.



Жыта на полі хутараніна. Маёнтак Велень Навасёлкаўскай вобласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.




■ Ячмень з сялянскай гаспадаркі. Дудзічская воласць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Знаходка А. Г. Мітрафанавым на гарадзішчы Свіла 1 у Глыбокскім раёне Віцебскай вобласці азімага жыта (без дамешкаў зерня іншых культур), датаванага IX ст., паказала, што ўжо ў гэтым стагоддзі на поўначы Беларусі азімае жыта з'яўлялася самастойнай палявой куль-



■ Складзеныя ў «бабкі» снапы жыта на гумнішчы селяніна Т. Осіпчыка. Вёска Узляны Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.




Ячмень з сялянскай гаспадаркі. Уздзенская валасць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

турай[19]. Гэта знаходка з'яўляецца самым раннім сведчаннем вырошчвання азімых культур на тэрыторыі Усходняй Еўропы[20]. У наступных стагоддзях жыта сустракаецца ўжо ва ўсіх археалагічных паселішчах на Беларусі і займае ў XI ст. вядучае месца сярод зерневых культур[21]. У масе зерневых знаходак XII—XIII стст. яго ўдзельная вага складала ўжо ад 50 да 98 працэнтаў[22].

Параўнанне свільскага жыта з жытам XI—XIII стст. з Мінска, якое вызначалася больш буйным зернем, дало падставу Э. М. Загарульскаму выказаць думку, што ўжо ў разглядаемы перыяд праводзілася селекцыя збожжавых культур[23].

Структуру палявых сельскагаспадарчых культур, характэрных для канкрэтнага рэгіёна, адлюстроўваюць матэрыялы спаленых свірнаў з ацалелым у іх зернем, выяўленыя пры раскопках у Мінску, Вішчынскім феадальным замку XII—XIII стст., пад Рагачовам і ў іншых месцах[24].

На аснове матэрыялаў больш чым з дваццаці старажытных населеных пунктаў Беларусі археолагі выявілі, што другой па значнасці харчовай культурай пасля жыта з X ст. была пшаніца (асабліва ў Тураве, Мінску, Лукомлі, Ваўкавыску, Клецку, Крычаве)[25].

Наступнай культурай пасля пшаніцы па ўдзельнай вазе ў масе зерневых знаходак з археалагічных помнікаў X—XIII стст. быў ячмень. Сярод прыгатаванага для Мінска зерня ячмень складаў 15,5 працэнта, што адпавядае яго ўдзельнай вазе ў структуры палявых культур у іншых землях Русі і ў Прыбалтыцы[26]. З X — пачатку XI ст. у археалагічным збожжавым матэрыяле (Строчыцкае гарадзішча) сустракаецца авёс, але яго нязначная ўдзельная вага ў агульнай масе збожжавых культур сведчыць аб тым, што ў фуражных мэтах ён яшчэ не выкарыстоўваўся[27]. Асноўныя харчовыя палявыя культуры ў X—XIII стст. на Беларусі дапаўнялі грэчка, палявыя (конскія) і гароднінныя бабы, гарох, віка, сачавіца, чына[28].

Вывучэнне зерневага матэрыялу з археалагічных раскопак дае магчымасць сцвярджаць, што ў Старажытнарускай дзяржаве вырошчвалася даволі шырокае кола зерневых, бабовых і алейна-валакністых культур: пшаніца (цвёрдая і мяккая), ячмень (шасцірадны, двурадны і галазёрны), проса, авёс, жыта, грэчка, мак, сачавіца, гарох, конскія бабы, віка яравая (як харчовая зерневая культура), лён і каноплі[29]. Склад зерневых культур на Беларусі ў IX—XIII стст. адпавядаў структуры культурных раслін у іншых старажытнарускіх рэгіёнах[30].

З. Ю. Капыскі пісаў, што сяляне ў XVI — першай палове XVII ст. на сваіх надзелах сеялі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, гарох, грэчку, а з тэхнічных культур — лён і каноплі. Ураджай зерневых культур быў невысокі, у сярэднім сам — 2,5—3[31] (гэта значыць, збіралі ў 2,5—3 разы больш, чым пасеялі). Аднак трэба адзначыць, што склад культур, якія вырошчвалі сяляне ў гэты перыяд, быў, безумоўна, значна шырэйшым. Так, проса і дробныя палявыя бабы (конскі зуб), якія прысутнічаюць у археалагічных зерневых знаходках на тэрыторыі Беларусі са старажытных часоў[32] і займалі значнае месца ў структуры палявых культур у XIX ст.,[33] несумненна, сеяліся сялянамі і ў XVI—XVIII стст. Даволі значнае месца займалі і пасевы сачавіцы. У апісанні маёмасці земяніна Марціна Падбярэзскага (1599) упамінаецца «чецевицы бочка»[34].

Конскія бабы адносяцца да кармавых бабовых культур і вырошчваліся выключна на зерне, бо іх высокія і тоўстыя сцёблы не маглі ісці ў корм для жывёлы. У параўнанні з агароднымі бабамі яны маюць больш дробнае зерне цёмна-бурага або шэрага колеру. Выкарыстоўваліся ў якасці дзерці для пасыпкі непажыўнога корму для жывёлы. Часцей за ўсё іх сеялі на цяжкіх пладародных глебах або пасля азімых культур. Конскія бабы з'яўляюцца буйнымі раслінамі, таму іх сеялі пад саху радамі з наступным праворваннем міжраддзяў.

У канцы XVIII ст. сярод пашыраных на Крычаўшчыне сельскагаспадарчых культур А. К. Мейер у «Апісанні Крычаўскага графства або былога старостава 1786 г.» назваў пшаніцу-лядзянку, пшаніцу яравую, жыта, ячмень, гарох, грэчку, авёс, проса, лён, каноплі, сачавіцу, мак. Ураджай быў невялікі, бо пасевы часта вымакалі, зарасталі пустазеллем — званцом і кукалем[35].

У XIX ст. беларускія сяляне сеялі тыя ж культуры, што і ў папярэднія стагоддзі. Разам з тым спачатку ў панскіх, а з цягам часу і ў сялян усё большае пашырэнне атрымлівалі сартавыя культуры.

Самай каштоўнай культурай сярод збожжавых у сялян лічылася пшаніца, але для вырошчвання яна патрабуе найлепшай глебы і добрага догляду.



Палявы боб («Конскі зуб»)



Ячмень з сялянскай гаспадаркі. Вёска Грэбень Дудзічскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Амаль увесь сабраны ўраджай пшаніцы сяляне звычайна прадавалі, пакідаючы сабе толькі невялікую колькасць збожжа на насенне і на «булкі», што пяклі да вялікіх святаў.

У сярэдзіне XIX ст. у памешчыцкіх маёнтках на Аршаншчыне была распаўсюджана пшаніца «Ангелька» і «Арнаутка», а сяляне сеялі дрэнную «Ярушку» і «Сцелюху»[36].

У канцы XIX ст. у памешчыцкіх маёнтках на Беларусі найбольш пашыраным сортам азімай пшаніцы заставалася тая ж «Арнаутка», а таксама «Сандамірка», «Кастромка» і «Банатка» («Бязвосьцевая Польская»), а з яравых сартоў — «Гірка», «Белакалоска».

Пераважная большасць сялян працягвала сеяць мясцовыя сялянскія сарты пшаніцы, пры неабходнасці купляць насенне ў знаёмых, у якіх яна добра радзіла, ды старанна яго ачышчаць ад пустазелля.

У пачатку XX ст. найбольш пашыранымі сартамі пшаніцы на Беларусі былі «Данькоўская», «Высока-літоўская», «Плоцкая» і сялянская «Сабешынская» з Люблінскай губерні[37].

Самай распаўсюджанай і шануемай збажынай на Беларусі са старажытных часоў было жыта — «жыццо», як ласкава называлі яго сяляне. Ураджай жыта гарантаваў гаспадару-беларусу і яго сям'і выжыванне і харчовы дастатак.

У вусна-паэтычнай творчасці і народнай абраднасці дабрабыт сям'і беларуса таксама перш за ўсё звязваўся з асноўным прадуктам яго харчавання да сярэдзіны XIX ст. — жытам. Ужо на куццю перад Раством сяляне сачылі за небам: калі было шмат зорак, то можна было чакаць добрага ўраджаю жыта. У гэты вечар гаспадар хаваўся за гаршком з куццёй і пытаў гаспадыню: «Ці бачыш ты мяне?» І калі ў адказ чуў: «Не, не



Жыта з гаспадаркі селяніна-хутараніна І. Хлапіцкага. Шацкая воласць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

бачу!», то гаварыў: «Дай жа, Божа ласкавы, каб ты не бачыла мяне летам за густымі снапамі жыта і пшаніцы». Пасля вячэры ўсе члены сям'і па чарзе выцягвалі па сцяблінцы з сена, пакладзенага пад абрус, і глядзелі, доўгае ці кароткае выцягвалася сцябло. Доўгае абяцала высокае жыта на ніве, кароткае — наадварот[38].




Жыта з гаспадаркі селяніна К. Шычко. Злева – вырашчанае з мінеральнымі ўгнаеннямі, справа – без іх. Клінокская воласць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Матывы земляробчай працы, пажаданні багатага ўраджаю жыта займалі значнае месца ў калядных віншаваннях шчадравікоў, якія жадалі сялянам:

*У чыстым полі — буйна жыта,*
*Буйна жыта каласіста, ядраніста.*
*Кладзіце копачкі, як у небе зорачкі,*
*Кладзіце стожкі ў чатыры рожкі…*[39]

Земляробчая тэматыка прысутнічала і ў калядным ваджэнні «Казы», дзе гульнёвыя дзеянні суправаджаліся словамі:

*Дзе каза нагою, там жыта капою,*
*Дзе каза рогам, там жыта стогам,*
*Дзе каза хвастом, там жыта кустом*[40].

Дадзенае пажаданне мае, відаць, язычніцкія карані, бо старажытныя славяне з падобнымі ж словамі звярталіся да язычніцкага бога Ярылы пры веснавым абходзе нівы:

*А дзе ж ён нагою —*
*Там жыта капою.*
*А дзе ж ён ні зірне,*
*Там колас зацвіце*[41].

Аграрна-магічны характар насіла і веснавая паэзія беларусаў. У цыкле юраўскіх песняў святы Юры маляваўся як просты працаўнік, памочнік селяніна:

*Юр'я, Юр'я па полі ходзіць,*
*Юр'я, Юр'я да бога просіць:*
*«Урадзі, урадзі жыта — пшаніцу,*
*Пабі, пабі кукаль — мятліцу*[42].

14—18 лютага 1913 г. у Вільні праходзіла Першая выстава насення сельскагаспадарчых культур. На выставе Беняконская і Бейсагольская пробныя сельскагаспадарчыя станцыі прадставілі лепшыя сарты збожжа, раяніраваныя для Беларусі. Сярод сартоў жыта найбольш ураджайным было прызнана «Петкускае», якое дало 157 пудоў зерня з дзесяціны. За ім па ўраджайнасці ішлі «Шампанка», «Высока-літоўскае», «Мікуліцкае», «Святаянскае».

Сярод сялянскіх сартоў жыта лепшымі былі прызнаны «Сабешынскае», «Падольскае», «Загніцкае», «Маліноўскае», «Фінляндскае»[43]. Сорт «Сабешынскае» быў узяты з польскіх сялянскіх гаспадарак, дзе ён мала баяўся кепскай пагоды. Па словах агранома, які працаваў на выставе, яно не баялася макраты, рэдка вылягала, расло на ўсіх глебах. Сорт «Маліноўскае» быў з маёнтка памешчыка Свентаржэцкага з-пад мястэчка Гарадок Вілейскага павета Вілейскай губерні і сеяўся там здаўна[44].

Тутэйшае сялянскае жыта пры выпрабаванні ў Бейсагольскай пробнай сельскагаспадарчай станцыі заняло другое месца па ўраджаю зерня (156 пудоў з дзесяціны) пасля «Петкускага», а па ўраджаю саломы — першае месца (320 пудоў). Гэты сорт заўсёды радзіў, не баяўся дрэнных кліматычных умоў, але меў тонкую салому, колас няроўны, пастрэляны, зерне дробнае, шылаватае, якое лёгка высыпалася[45]. Астатнія сарты жыта былі яшчэ дрэнна выпрабаваны ў мясцовых умовах Беларусі.

Адной з найбольш вырошчваемых на Беларусі харчовых і фуражных культур быў авёс. У некаторых паветах пад яго займалі ўсё яравое поле пры трохпольнай сістэме земляробства[46].



Поле аўса ў сялянскай гаспадарцы. Дудзічская вобласць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак ХХ ст.

У адносінах да глебы авёс з'яўляецца самым непатрабавальным хлебным злакам. Толькі на пясчаных глебах ён менш ураджайны за жыта. На балоцістых, тарфяністых глебах, на якіх другое збожжа не расце, авёс дае сярэднія ўраджаі.

Непатрабавальны ён і да апрацоўкі глебы: пры раннім пасеве дружна ўсходзіць і менш іншай збажыны заглушаецца пустазеллем. Таму сяляне адводзілі пад авёс звычайна самыя горшыя палі або нівы, абясплоджаныя іншымі хлебнымі пасевамі.




Авёс з паказальнага ўчастка селяніна В. Дземідовіча. Злева – вырашчаны з мінеральнымі ўгнаеннямі, справа – без іх. Магільнянская воласць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак ХХ ст.




Авёс з сялянскай гаспадаркі. Злева – вырашчаны з мінеральнымі ўгнаеннямі, справа – без іх. Уздзенская воласць Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.




Лён з сялянскай гаспадаркі. Вёска Узляны Узлянскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Сеялі авёс як мага раней, бо яго насенне патрабуе для прарастання шмат вільгаці, а перыяд вегетацыі даўжэйшы за іншыя збожжавыя культуры. Авёс менш адчувальны да халадоў і лёгка пераносіць веснавыя замаразкі. Пры ранняй сяўбе яго ўраджай павышаецца, што адлюстравана ў народнай прыказцы: «Сей авёс у гразь — будзеш князь». Аднак пры надзвычай ранняй сяўбе ў вельмі вільготную глебу на яе паверхні ствараецца скарынка, якую прыходзілася «ламаць» баранаваннем поля.

Паколькі авёс адносіцца да найбольш познапаспяваючых злакаў, то яго часта ўбіралі пасля жыта і яравых хлябоў. Калі пасевы аўса былі моцна заросшыя пустазеллем, то яго не жалі, а касілі касой і перад вязкай у снапы пакідалі на полі ў пракосах на некалькі дзён, пакуль добра не высахне трава. Авёс менш за іншае збожжа баіцца дажджу і можа без шкоды для зерня знаходзіцца на полі ў вільготнае надвор'е больш тыдня[47].



Селянін на полі капусты каля канапляніка. Вёска Осава Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

У пачатку XX ст. на Беларусі сеялі шведскія сарты аўса «Лігава», «Гальдрэген» і новы на той час «Пераможца», а таксама чорны сорт «Волат». З іх найбольш быў пашыраны сорт «Лігава», які даваў добрыя ўраджаі на ўсіх глебах. Падобны на «Лігава» быў сорт «Волат», вельмі ўраджайны, меў поўнае, белае зерне, невысокую, але спружыстую салому. «Гальдрэген» меў жоўтае зерне, але з тонкай луской. «Велікан» — сорт з чорным цяжкім зернем, быў вельмі прыдатным на корм жывёле. Ураджайны на любой глебе, ён не вылягаў, але даспяваў позна. У мястэчку Рось Гродзенскай губерні «Волат» даваў большыя ўраджаі за іншыя сарты[48]. Найбольш пашыранымі сартамі аўса на Беларусі ў пачатку XX ст. былі «Рыхлік Сабешынскі» і «Залаты дождж»[49].

З крупяных культур на невялікіх плошчах сяляне вырошчвалі грэчку. Пасевы яе былі найбольш распаўсюджаны ў паўднёвых, заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі і зусім мала сеялі яе на поўначы. Зерне грэчкі было знойдзена археолагамі ў Браславе, Гродне, Друцку, Віцебску, Крычаве ў пластах X—XI стст., што адхіляе меркаванне, нібы яна была завезена ў Еўропу арабамі ледзь не ў XV ст.[50] Звычайна пад грэчку выдзялялі



Сланечнік. 1920–1930-я гг.

супясчаныя і пясчаныя ўчасткі, бедныя перагноем. Грэчка з'яўляецца каштоўнай меданоснай раслінай. З аднаго гектара пасева пчолы збіраюць ад 2 да 4 цэнтнераў мёду. Пры гэтым пчолаапыленне значна павышае ўраджайнасць грэчкі[51].

Галоўнай прадзільна-алейнай культурай на Беларусі быў лён. Радзімай лёну з'яўляецца Заходняя Азія. Сведчанні аб яго выкарыстанні ўтрымліваюць ужо старажытныя егіпецкія помнікі. Ільняное валакно знойдзена і ў тканінах на егіпецкіх муміях. Ролю важнай прадзільнай расліны лён адыгрываў у грэкаў. Здаўна займаліся ільнаводствам і славяне[52]. Амаль усё адзенне беларусаў многія стагоддзі выраблялася з лёну, таму яго сеялі ў кожнай сялянскай гаспадарцы. У пачатку XIX ст. лён з'яўляўся на Беларусі найбольш пашыранай сельскагаспадарчай культурай пасля збожжавых. Іншы раз ён даваў большы даход, чым жыта і пшаніца. Распаўсюджанымі сартамі лёну былі ранні «Прагалец», пазнейшы «Арловен», і самы лепшы — «Велькалён», высокі, з буйнымі галоўкамі[53].

У многіх мясцовасцях Беларусі лён складаў важную крыніцу даходаў сялянскай гаспадаркі. Таварным вырошчваннем лёну ў Віленскай губерні сяляне займаліся пераважна ў Віленскім, Свянцянскім, Лідскім і Дзісненскім паветах. У Гродзенскай губерні яго шырока вырошчвалі на продаж амаль ва ўсіх паветах, таксама як і ў Ковенскай губерні, асабліва ў паўночнай яе частцы, дзе лён надзвычай добра радзіў як на гліністых, так і на пясчаных глебах, асабліва на навіне. Шырока славіўся ракішскі лён з Нова-Аляксандраўскага павета Ковенскай губерні, з маёнтка графа Тызенгаўза. Ракішскі лён быў вядомы нават за мяжой пад назвай «карона». Галоўнымі пунктамі збыту льну былі Рыга, Лібава, Мемель і Кёнігсберг[54].

Распаўсюджанай таварнай культурай лён быў і на Віцебшчыне. В. М. Севяргін у «Запісках падарожжа па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы» ў пачатку XIX ст. пісаў пра Сенненшчыну: «Хоць збожжа ў гэтых краях расце добра, аднак жыхары больш займаюцца вырошчваннем лёну, як па даўнейшай да таго звычцы, так і таму, што ў некаторыя гады бывае ён у добрай цане»[55].

Пасевы льну моцна спусташалі і абясплоджвалі палі, але прыносілі даход, які акупаў угнаенне[56].

Другой валакніста-алейнай сельскагаспадарчай культурай на Беларусі былі каноплі. Радзімай іх з'яўляецца Азія, дзе яны сустракаюцца ў дзікім стане. У культуру каноплі ўведзены вельмі даўно, бо яшчэ старажытныя грэкі і рымляне выраблялі з іх тканіны[57].

Каноплі — двухдомная расліна. Мужчынскія калівы на Беларусі называюцца «посканні», «поскань», «плоскуні». Яны адметныя ад жаночых асобін больш тонкім сцяблом, малым пакрыццём лісцеў і больш хуткім дасягненнем валакном гаспадарчай спеласці. Жаночыя расліны маюць многа пакрытых лісцем бакавых парасткаў, на якіх, як і на вярхушцы сцябла, густа скручаны кветкі.

Найбольш вядомыя ў свеце сарты канапель — «Кітайская», «Звычайная», «Індыйская», «П'ямонцкая», «Савойская[58]». На Беларусі сяляне здаўна вырошчвалі «Звычайныя» каноплі, вышыня якіх была 1,5 м і болей. Выкарыстоўвалі як самі расліны, так і насенне. Мужчынскія расліны выбіралі з пасеваў канапель раней і пасля апрацоўкі ткалі з іх зрэбнае палатно. Валакно з жаночых асобін — пянька — ішло на віццё вяровак, вожжаў, канатаў. З насення ціснулі алей (часта разам з ільняным насеннем), у пост каноплі таўклі і прыпраўлялі імі розныя стравы.




Плантацыя тытуню. Слуцкі раён Мінскай вобласці. 1922 г.



Уборка хмелю ў калгасе імя Сталіна Койкаўскага сельсавета. 1939 г.



Бульба з тэрыторыі Узлянскага агранамічнага ўчастка. Вёска Узляны Узлянскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Каноплі не патрабавальныя да клімату, але для іх вырошчвання неабходны добра ўгноеная, глыбока разрыхленая вільготная глеба і абарона ад вятроў. На Магілёўшчыне каноплі вырошчвалі ў вялікай колькасці на продаж[59], а на астатняй тэрыторыі — у асноўным толькі на ўласныя патрэбы.

Для атрымання насення, якое ішло на ласунак, сяляне вырошчвалі на агародах сланечнік. Радзіма яго — Мексіка і Перу, адкуль ён быў вывезены іспанцамі, а затым хутка распаўсюдзіўся па ўсёй Еўропе[60]. Садзілі яго рана, звычайна пасля сяўбы аўса, бо ён не баіцца веснавых замаразкаў.

Яшчэ адной сельскагаспадарчай культурай для вырошчвання на агародзе быў тытунь. А. Башняк, які прыязджаў на тэрыторыю Беларусі са Смаленшчыны, пісаў у «Дзённых запісках падарожжа ў розныя вобласці Заходняй і Палудзеннай Расіі» (1820—1821), што за Духаўшчынай «усё гаварыла ўжо аб хуткім набліжэнні да краіны, не зусім рускай. Мова жыхароў была больш змешана з польскай; люлька, такая ненавісная рускім сялянам, была ў роце кожнага; у адзенні таксама назіралася перамена»[61]. Курэнне тытуню было здаўна вельмі распаўсюджана на Беларусі. Археолагі знаходзяць люлькі ў культурных слаях XI—XIII стст., але курыць, мець люльку, насіць у кісеце трут і крэсіва дазвалялася толькі жанатым, самастойным гаспадарам. Падлеткам і юнакам курыць забаранялася.



Бульба цвіце. Вёска Сямёнаўка Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. 1965 г. Фота П. М Захаранкі

У кожным павеце Мінскай губерні, пісаў І. Зяленскі, знойдзецца некалькі сялян, якія займаюцца развядзеннем тытуню. Паколькі курэнне махоркі надзвычай распаўсюджана, асабліва на Палессі, дзе люлька зрабілася неадлучным спадарожнікам селяніна, то вырошчванне простых сартоў тытуню павінна прыносіць вялікія выгады тым, хто ўмее даглядаць за гэтай раслінай. Але занятак гэты пакуль што рэдкі. Больш усяго вырошчваўся тытунь у Пінскім, Рэчыцкім, Слуцкім і Навагрудскім паветах, дзе сяляне выручалі з кожнага пуда ад 2 руб. 40 кап. да 4 руб. серабром. У губерні было нават некалькі памешчыкаў, якія разводзілі тытунь[62]. На перапрацоўчых прадпрыемствах бадылле тытуню ішло на выраб махоркі,



Кукуруза. Ігуменскі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

а з лісцяў выраблялі папяросы. Акрамя свайго прамога прызначэння — на курэнне — тытунь шырока прымяняўся сялянамі як інсектыцыд. Яго настоем апрысквалі капусту і іншую гародніну ад вусеняў.

У некаторых мясцовасцях, якія прылягалі да піваварных і портэрных заводаў, сяляне на агародах вырошчвалі хмель, які збывалі па 4 і 5 руб. за пуд. Аднак займаліся гэтым адзінкі, бо для мясцовых патрэб было дастаткова той колькасці хмелю, што збіралася сялянамі ў лясах па нізінных зараслях[63].



Харчовыя прадукты сялянскай гаспадаркі.
Ігуменскі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Да 1840-х гг. бульба ў гаспадарцы беларускіх сялян была ў асноўным яшчэ агароднай культурай, але ў некаторых мясцовасцях яна ўжо стала ўвайшла ў харчаванне. Памешчык Тасакоўскі ў складзеным ім у 1839 г. гаспадарча-этнаграфічным апісанні Ашмянскага павета сцвярджаў, што бульбу садзілі ўсе гаспадары, і не толькі на агародах, але некаторыя сяляне і ў полі. Яна ўжывалася ў ежу, дадавалася ў цеста пры выпяканні хлеба[64].

Бульбу «пад шнур» (па-цяперашняму «квадратна-гнездавым спосабам) у сярэдзіне XIX ст. садзілі ў маёнтку Бешанковічы графа Храптовіча на Віцебшчыне. Па апрацаванаму полю сахой рабілі баразны ўздоўж і ўпоперак поля, а ў месцах іх перакрыжавання садзілі бульбу. Тады яе можна было абворваць з усіх чатырох бакоў[65].



Кукуруза, бручка, гарбузы, кармавыя буракі і капуста, якія выкарыстоўваліся сялянамі на корм хатняй жывёле. Сельскагаспадарчая выстава на Узлянскім агранамічным участку. Вёска Узляны Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Частыя неўраджаі прымусілі расейскі ўрад прыймаць меры да пашырэння пасеваў бульбы ў памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарках. У цыркуляры Міністэрства дзяржаўных маёмасцей у 1840 г. прадпісвалася ва ўсіх паселішчах, дзе маюцца абшчынныя запашкі, прыступіць да развядзення бульбы, адвёўшы для гэтага пэўную колькасць зямлі на кожным полі. Па тых жа валасцях і паселішчах, дзе не было абшчынных запашак, пасадку бульбы прадпісвалася рабіць пры валасных праўленнях.

Для заахвочвання сялян да пасадкі бульбы і за поспехі ў яе развядзенні ім назначаліся як грашовыя, так і іншыя ўзнагароды і адзнакі[66]. У цыркуляры Міністэрства дзяржаўных маёмасцей ад 1 студзеня 1841 г. начальнікам губерняў даручалася прадставіць звесткі аб дваранах і асобах іншых саслоўяў, якія мелі поспех ў вырошчванні бульбы на палях,

потым данесці аб гэтым міністру дзяржаўных маёмасцей за подпісам прадвадзіцеляў дваранства для хадайніцтва перад імператарам аб узнагароджанні іх залатымі і сярэбранымі медалямі з надпісам «За карыснае» для нашэння на шыі і ў пятліцах або грашовымі ўзнагародамі[67].

З 1843 г. урад дазволіў свабодную выкурку віна з бульбы на ўсіх вінакурнях і прыём яго ў казну нароўні з хлебным без абмежавання колькасці, а таксама выраб з бульбы гарэлкі і спірту[68]. З развіццём вінакурэння бульба хутка заняла вялікія плошчы ў панскай гаспадарцы, а потым і ў сялян. Гродзенская губерня ў 1860-х гг. займала ўжо першае месца ў Расійскай імперыі па колькасці перапрацаванай на спірт бульбы[69].

Недастатковая ўгноенасць палёў, старажытныя прылады працы і спосабы апрацоўкі глебы абмяжоўвалі ўраджайнасць. У сярэдзіне XIX ст. сярэдні ўраджай азімых у Гродзенскай губерні прыблізна складаў сам — 3; яравых сам — 2,5; бульбы сам — 3,5[70].

У другую палову XIX ст. бульба паступова стала для сялян «другім хлебам». Наступнае па ўдзельнай вазе месца пасля жыта ў гэты час займаў авёс, трэцяе — ячмень.

У канцы XIX — пачатку XX ст. на Беларусі вырошчвалася шмат сартоў бульбы, але не ўсе яны былі прыдатныя да мясцовых умоў. Так, шырока разрэкламаваны сорт «Мікадо» пры выпрабаванні аказаўся вадзяністым, нясмачным, разам з вельмі буйнымі клубнямі меў шмат дробных. У той жа час мясцовы, пашыраны ў сялян сорт «Заўжды добры» быў далікатным, смачным, рассыпчатым[71]. На Міншчыне ў гэты час поруч з «Мікадо» былі пашыраны сарты бульбы «Белы волат», «Вольтман», «Меркер». Асаблівай ураджайнасцю ў Ігуменскім павеце ў 1914 г. вызначаліся сарты «Мікадо» і «Меркер», аб клубнях якіх сяляне гаварылі, што яны «як гарбуз»[72].

Даволі пашыранай на Беларусі культурай, асабліва ў паўднёвых раёнах, з'яўлялася ў канцы XIX — пачатку XX ст. кукуруза. Радзіма яе — Мексіка, Перу, Антыльскія астравы. Кукуруза непатрабавальная да глебы і ўстойлівая супраць засухі. Акрамя зерня яна дае вялікую колькасць пажыўнага і смачнага корму для свойскай жывёлы ў выглядзе лісцяў і сцёблаў. (У якасці корму для свойскай жывёлы сяляне поруч з кукурузай шырока выкарыстоўвалі гарбузы, бручку, кармавую моркву, кармавыя і цукровыя буракі, турнэпс, конскі зуб, авёс, бульбу.)

Пад кукурузу зямлю аралі ўвосень, а вясной перад пасевам баранавалі. Сеялі радамі пад саху праз баразну. Перад з'яўленнем усходаў поле баранавалі да поўнага знішчэння пустазелля. Затым, калі ўсходы дасягалі аднаго вяршка, акучвалі іх сахой або акучнікам і адразу баранавалі лёгкай драўлянай бараной упоперак барознаў амаль да выраўнівання поля. Пры гэтым усё пустазелле знішчалася, а вяршкі кукурузы, засыпаныя рыхлай зямлёй, самі прабіваліся наверх да святла. У далейшым кукурузу толькі акучвалі два-тры разы за лета[73].

Акрамя неспрыяльных умоў надвор'я пасевы зерневых культур моцна цярпелі ад разнастайных шкоднікаў. Вялікія страты панесла Вялікае Княства Літоўскае і ўся Рэч Паспалітая ў 1690 г. ад саранчы, якой было такое мноства, што яна зацямняла паветра і пакрывала зямлю накшталт чорнага сукна. У месцах, дзе яна адмірала, на зямлі заставаўся слой у чатыры футы[74] таўшчыні. Калі ў той год саранча садзілася на дрэвы, то так абляпляла сукі, што пад іх цяжарам яны гнуліся да зямлі. Стала яшчэ горш, калі ад моцных дажджоў уся саранча загінула і гніючы так заразіла паветра і зямлю, што амаль увесь хатні скот загінуў. Услед за гэтым насталі страшэнны голад і спусташэнне[75].

Ад нашэсцяў саранчы больш за ўсё пакутвалі паўднёвыя паветы Мінскай і Гродзенскай губерняў. У чэрвені і ліпені 1815 г. у Пінскім павеце Мінскай губерні была выяўлена не акрыліўшаяся («пешая») саранча. Акрыліўшыся, яна пераляцела ў Слонімскі, Кобрынскі, Пружанскі, Ваўкавыскі і Брэсцкі[76] паветы і на некалькі міляў пакрыла збожжавыя пасевы, наносячы ім велізарную шкоду.



Узлянскі агранамічны кабінет Узлянскага земскага агранамічнага ўчастка. Вёска Узляны Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак ХХ ст.

Весці барацьбу з саранчой было вельмі цяжка, бо яна валодала велізарнай пражэрлівасцю і пладавітасцю. Кожная самка рабіла сабе ў рыхлай ці пясчанай зямлі ямку вяршкі[77] ў два глыбінёй і пакідала там свой хвост з двума або трыма слаямі прадаўгаватых яек белаватага колеру велічынёй з анісавае зерне. Слаі гэтыя былі пакрыты клейкай вадкасцю, якая зацвердзявала і захоўвала яйцакладку ад холаду і дажджоў.

Перазімаваўшы ў зямлі, вясной, у канцы красавіка з нагрэтых сонцам яйцакладак выходзілі чарвячкі, падобныя да маленькіх мурашак, у якіх можна было разгледзець крылы. Затым яны станавіліся чырванаватымі, набывалі выгляд дарослай саранчы і пачыналі спрытна скакаць[78]. Стаўшую на крыло саранчу сяляне адпугвалі ад пасеваў збожжавых культур шумам, звонам або апырсквалі палі тытунёвай вадой, якую атрымлівалі, абдаючы кіпнем лістовы тытунь[79].

Практыка барацьбы з саранчой паказала, што самым важным момантам з'яўляецца выяўленне месцаў яе знаходжання да вылуплівання з яек. У гэты час, прыблізна ў другой палове мая або ў пачатку чэрвеня, саранча жыве на невялікіх участках і яе няцяжка знішчыць. Пазней, пад канец лічыначнага перыяду, яна пачынае раніцамі разбягацца, а вечарамі збірацца ўжо ў другіх месцах. У крылатым стане саранча становіцца вельмі рухавай і ўстойлівай супраць розных мер барацьбы з ёю[80].

У 1827 г. Мінскае губернскае праўленне і губернатар прадпісалі ў сваім цыркуляры ніжэйшым земскім судам абвясціць па ўсіх населеных пунктах сваіх акруг аб неабходнасці інфармаваць суды, дзе і ў якой колькасці заўважана саранча. Ніжэйшыя земскія суды, апавяшчаючы адзін аднаго, павінны былі назіраць, у якіх месцах яна спынілася класці яйкі.

Калі саранча залятала ў лес, то туды накіроўвалі конных аб'ездчыкаў, каб назіраць, пераляцела яна лес ці засталася там для кладкі яек. Аб гэтым аб'ездчыкі павінны былі збіраць весткі ў ваколічных сялян. Калі саранча спынялася ў лесе для кладкі яек, то неабходна было гэта месца знайсці і не перашкаджаць ёй, бо хутка пасля кладкі яек саранча гінула сама. Кладку яек затым выкапвалі і зарывалі ў глыбокую яму ў сырым месцы або кідалі ў ваду.

Калі восенню не змаглі знайсці месца кладкі яек, то ўжо вясной патрэбна было знайсці месца, дзе саранча вылупілася з яек (там яна шчыльным слоем пакрывала зямлю). Раніцай да ўсхода сонца яна ад холада зляпляецца ў кучы і пакрытая расой ляжыць нерухома. Тады гэтае месца акопвалі канавамі, клалі ў канавы салому і мётламі змяталі туды саранчу. Затым закрывалі яе зверху саломай і падпальвалі[81].

Значную шкоду прыносілі палявым пасевам збожжа суслікі. У XIX ст., калі не ўжывалі хімічных сродкаў барацьбы са шкоднікамі і захворваннямі раслін, яны вадзіліся на палях у вялікай колькасці. Тады з імі змагаліся шляхам заліўкі іх нораў вадой.

Існавала легенда, нібыта камусьці з Радзівілаў у час падарожжа па Еўропе спадабаліся сімпатычныя звяркі і ён прывёз пару іх у Нясвіж, адкуль яны ўцяклі і ў хуткім часе размножыліся ў нясвіжскіх ваколіцах у такой колькасці, што пагражалі збожжавым пасевам вялікім злом. Так ці не, але сапраўды каля Нясвіжа іх вялося больш за ўсё. Там за сем гадоў, працуючы пяццю падводамі з вадой, на дзесяці моргах зямлі вылаўлівалі да 3 тысяч суслікаў[82].

У 1844 г. медыцынскі дэпартамент Міністэрства ўнутраных спраў пісаў гродзенскаму цывільнаму губернатару: «Халоднае і сырое надвор'е спрыяе зараджэнню ў жыце ражкоў ці спарынні, а так як сёлетнее лета неспрыяльна надвор'ем, то жыта будзе багата прымессю ражкоў». Выкарыстанне ў ежу хлеба з мукі з прымессю ражкоў (спарыні) вызывала злую корчу, захворванне нярэдка смяротнае. Таму медыкі патрабавалі загадзя прыняць меры па апавяшчэнні насельніцтва аб неабходнасці аддзяляць ражкі ад здаровага зерня, прасейваючы яго скрозь рэдкае рэшата, перш чым змалоць на муку[83].

У некаторых месцах на пасевах збожжавых культур развівалася хвароба пад назвай «амора» — іржаўчына, якая разлагалася ў ліпкі парашок і не толькі знішчала зерне, якое завязвалася, але пашкоджвала нават салому[84]. Ад яе збаўляліся, старанна прасейваючы насеннае збожжа.

Захворваннем збожжавых культур з'яўляецца снежная цвіль, якая развіваецца з-за вялікага снежнага покрыву зімой. Калі снегу многа, то азімыя пашкоджваюцца снежнай цвіллю паўсюдна. Аднак выпадзенне азімых ад захворвання звычайна ачаговае. Захворванне праяўляецца ў страце раслінамі значнай часткі ніжніх лісцяў. Пры моцным пашкоджанні расліны поўнасцю гінуць. Для барацьбы са снежнай цвіллю вясной пры падсыханні глебы праводзілі баранаванне азімых[85].

Значную шкоду сялянскім пасевам ільну наносіла трава чарвец, якая звязвала расліны лёну і прыгінала іх да зямлі. Пазбаўляліся ад яе толькі шляхам праполкі, прапалваючы лён два-тры разы за лета[86].

Указам ад 14 сакавіка 1911 г. у шасці заходніх губернях было ўведзена Палажэнне аб земскіх установах. Закон аб заходнім земстве прадугледжваў саюз рускіх памешчыкаў з беларускім і ўкраінскім (ва ўкраінскіх губернях) заможным сялянствам супраць польскіх памешчыкаў і з'яўляўся звяном у эканамічнай палітыцы П. А. Сталыпіна. Ліберальны па форме закон (бессаслоўнасць, удвая зніжаны маёмасны цэнз у параўнанні з расійскімі губернямі і з прычыны гэтага ўзросшая вага сялянскага элемента) быў кансерватыўным па сваёй сутнасці[87]. Адкрыццё губернскага земскага сходу ў Віцебску адбылося 14 жніўня, у Магілёве — 12 жніўня, у Мінску — 21 верасня 1911 г.[88]

Земствы атрымлівалі ад дзяржавы грашовыя сродкі, што садзейнічала пашырэнню маштабаў іх дзейнасці. У 1911 г. была адчынена Мінская вопытная балотная станцыя, на арганізацыю якой мінскае губернскае земства адпусціла 21,5 тыс. рублёў[89]. Шырокі размах набылі мерапрыемствы земстваў па развіццю і паляпшэнню сельскагаспадарчай адукацыі і распаўсюджванню сельскагаспадарчых ведаў, стварэнню сельскагаспадарчых выстаў, складоў і таварыстваў.

Земскія статыстычныя камітэты, створаныя пры павятовых і губернскіх земскіх управах у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях, праводзілі абследаванні сялянскай гаспадаркі і сялянскіх промыслаў, улік надзельнай зямлі, эканамічных умоў і гаспадарчага становішча сялянства. Галоўнымі метадамі збору звестак служылі падворны перапіс і выбарачныя абследаванні тыповых для дадзеных мясцовасцей сялянскіх гаспадарак.

Губернскія і павятовыя земствы мелі пасаду агранома, які непасрэдна займаўся мерапрыемствамі па паляпшэнні стану земляробства на падведамнай тэрыторыі і аказаннем эканамічнай дапамогі насельніцтву. У задачы павятовых аграномаў уваходзіла прапаганда правільных севазваротаў і травасеяння па надзелах сялян; правядзенне агітацыйнай работы па паляпшэнні апрацоўкі глебы; арганізацыя сеткі складоў земляробчых машын і прылад, зернеачышчальных пунктаў і пракатных станцый, якія дазвалялі вясковым жыхарам шырока карыстацца фабрычнымі прыладамі апрацоўкі глебы, жняяркамі і малацілкамі.

Для дэманстрацыі сялянам прасцейшых сельскагаспадарчых паляпшэнняў павятовыя аграномы закладвалі і даглядалі невялікія вопытныя палі, якія служылі праверкай прапагандуемых імі лепшых сартоў сельскагаспадарчых культур і перадавых прыёмаў земляробства.

З мэтай абуджэння інтарэсу вяскоўцаў да пытанняў удасканалення сваёй гаспадаркі аграномы праводзілі чытанні з паказам «туманных карцін»[90], бяседы, курсы, аказвалі садзеянне па набыццю палепшаных сартоў насення, пародзістай жывёлы і г. д.[91]

Улічваючы, што плошча губерняў і паветаў вельмі вялікая, а кожнае пасяленне, кожная гаспадарка маюць свае індывідуальныя асаблівасці, патрэбы і запатрабаванні, земствы ў 1910-х гг. сталі дзяліць тэрыторыі паветаў на ўчасткі і запрашаць для кожнага ўчастка агранома. Заснаванне пасад участковых аграномаў забяспечвала набліжэнне агранамічнай работы да сялян і магчымасці дапамогі ім у рацыянальнай арганізацыі гаспадаркі.

Плошча Мінскай губерні складала 80 тыс. квадратных вёрст, гэта значыць, у тры разы больш за Швейцарыю. У гэтай губерні было створана 16 агранамічных участкаў. Узлянскі агранамічны ўчастак Ігуменскага павета, напрыклад, уключаў 12 валасцей плошчай больш за 4000 квадратных вёрст. Магільнянская і Амельянская валасці былі размешчаны ў 50–70 вярстах ад Узлян — агранамічнага пункта ўчастка.

У агранамічным пункце быў абсталяваны агранамічны кабінет, дзе мелася бібліятэка, якая ўтрымлівала шэраг даведачных кніг і энцыклапедый па сельскай гаспадарцы, а таксама перыядычныя сельскагаспадарчыя выданні.

Пры кабінеце існавала маленькая лабараторыя з наборам прыбораў і рэактываў для выпрабавання насення і тлумачэння сялянам элементарных фізічных і хімічных з'яў.

У агранамічным кабінеце былі прадстаўлены ўзоры глеб з тэрыторыі ўчастка, насенне вырошчваемых культур і ўзоры жыта, ячменю, пшаніцы, аўса ў снапах, калекцыі шкоднікаў, гербарыі, картаграмы і дыяграмы, якія давалі поўную агранамічную характарыстыку ўчастка[92].

Узлянскі агранамічны пункт меў у сваім складзе зернеачышчальны пункт з веялкай «Ауля» № 2, «змейкай» № 2, трыерам «Маро» № 4, веялкай-сартыроўкай «Трыумф» брацціў Рэбер.

Восенню 1913 г. у Ігуменскім павеце было закладзена 810 паказальных палёў сельскагаспадарчых культур, якія знаходзіліся пад наглядам участковых аграномаў. Восенню 1914 г. ва Узлянах была арганізавана сельскагаспадарчая выстава прадуктаў з сялянскіх гаспадарак.

Такім чынам, земствамі была праведзена вялікая работа па арганізацыі агранамічнай дапамогі сялянскім гаспадаркам шляхам адкрыцця сельскагаспадарчых складоў і зернеачышчальных пунктаў, перасовачных зернеачышчальных абозаў, распаўсюджання сартавога насення, прапаганды сельскагаспадарчых ведаў.

Да пачатку XX ст. яскрава прасочваецца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі, што з'яўлялася адным з вышэйшых фактараў развіцця капіталізму ў земляробстве. Развіццё рыначных сувязей і паляпшэнне шляхоў зносін садзейнічалі пашырэнню пасеваў тэхнічных культур: ільну, канапель, бульбы. У залежнасці ад кліматычных умоў, складу глебы і эканамічных сувязей на Беларусі пачалі вылучацца раёны з акрэсленай сельскагаспадарчай спецыялізацыяй. Падзвінне стала адрознівацца ад іншых рэгіёнаў пасевамі ільну, канапель, гандлем ільняным і канапляным семем, а паўднёвыя паветы Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў — вырошчваннем цукровых буракоў.

На поўдні Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымала грэчка, у Мазырскім і Рэчыцкім паветах Мінскай губерні і Гомельскім павеце Магілёўскай губерні прамысловае значэнне атрымалі пасевы канапель, дзе з іх выраблялі пяньку і прадавалі ў Заходнюю Еўропу. У заможных сялянскіх гаспадарках сталі карыстацца штучнымі ўгнаеннямі, высяваць на зялёнае ўгнаенне люпін.

На прысельных яравых палях сяляне сталі вырошчваць лён і бульбу, якія раней былі агароднымі культурамі. З развіццём капіталістычных адносін іх таварнае значэнне хутка расло. У Віцебскай губерні з 1889 па 1907 г. збор ільнянога валакна падвоіўся[93]. У канцы XIX ст. Беларусь па льнаводству займала трэцяе месца ў Расіі[94], забяспечваючы не толькі ўнутраныя патрэбы, але і экспартуючы значную колькасць ільновалакна за межы краіны. Хутка раслі плошчы зямель, занятыя пад бульбу, чаму ў значнай меры садзейнічала развіццё вінакурэння.

Такім чынам, беларусы на сваёй тэрыторыі вырошчвалі шмат збожжавых, зернебабовых, прапашных культур, а таксама прадзільна-валакністыя і тэхнічныя культуры сярэдняй паласы Еўрапейскай часткі Расіі і часткова больш паўднёвых раёнаў.

Асаблівасць развіцця парэформеннай Беларусі заключалася ў спецыялізацыі сельскай гаспадаркі і фарміраванні раёнаў таварнага земляробства, што было вызвана ростам унутранага і знешняга рынкаў, а таксама колькасці прамысловых прадпрыемстваў, якія працавалі на сельскагаспадарчай сыравіне.

[1] Экономическая география Белоруссии : учеб. пособие / В. И. Гладкий, Е. В. Гринчук, Е. Г. Гуцев [и др.]; под общ. ред. С. М. Мельничука. 3-е изд., Минск, 1982. С. 19–20.
[2] Шкляр А. Х. Климат Белоруссии и сельское хозяйство. Минск, 1962. С. 52.
[3] ПСРЛ: в 43 т. Т. 32. Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. М., 1975. С. 176.
[4] Там же. С. 187.
[5] Там же. С. 188.
[6] Там же. С. 189.
[7] Мейер А. К. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 г. // Могилевская старина. 1901. Вып. 2. С. 116.
[8] Киркор А. К. Народный труд // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье: репринт. воспроизведение. Изд. 1882. Минск, 1994. С. 210.
[9] Чвэрць – мера аб'ёму сыпучых рэчываў, галоўным чынам збожжа, роўная 208,8 літра або каля 8 пудоў жыта.
[10] НГАБ у г. Гродна. Ф. 12. Воп. 1. Спр. 406. Арк. 84.
[11] Шкляр А. Х. Климат Белоруссии и сельское хозяйство. С. 53.
[12] Якубцинер М. М. К истории культуры пшеницы в СССР // Материалы по истории земледелия в СССР. М.; Л., 1956. Т. 2. С.22.
[13] Ісаенка У. Ф., Каробушкіна Т. М. Земляробства // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993. С. 275; Краснов Ю. А. Раннее земледелие и животноводство в лесной полосе Восточной Европы. М., 1971. С. 14.
[14] Коробушкина Т. Н. Земледелие на территории Белоруссии в X–XIII вв. Минск, 1979. С. 184–185.
[15] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. Мінск, 1998. С. 133.
[16] Шкляр А. Х. Климат Белоруссии и сельское хозяйство. С. 323.
[17] Синская Е. Н. Историческая география культурной флоры (на заре земледелия). Л., 1969. С. 183.
[18] Краснов Ю. А. Раннее земледелие и животноводство в лесной полосе Восточной Европы. С. 19.
[19] Коробушкина Т. Н. Земледелие на территории Белоруссии в X–III вв. С. 73; Ісаенка У. Ф., Каробушкіна Т. М. Земляробства. С. 275.
[20] Мітрафанаў А. Г., Каробушкіна Т. М. Археалагічны помнік расказвае // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1975. № 4. С. 38–40.
[21] Тамсама.
[22] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. С. 132.
[23] Тамсама.
[24] Тамсама.
[25] Коробушкина Т. Н. Земледелие на территории Белоруссии в X–XIII вв. С. 184–185.
[26] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. С. 133.
[27] Тамсама.
[28] Коробушкина Т. Н. Земледелие на территории Белоруссии в X–XIII вв. С. 89; Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. С. 133.
[29] Синская Е. Н. Историческая география культурной флоры (на заре земледелия). С. 183.
[30] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX–XIII стст. С. 133–134.
[31] Капыскі З. Ю. Сяляне Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. // Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997. С. 111.
[32] Ісаенка У. Ф., Каробушкіна Т. М. Земляробства. С. 275.
[33] НГАБ у г. Гродна. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 253. Арк. 28 (1863 г.); Ф. 868. Воп. 1. Спр. 33. Арк. 219 адв. (1909 г.).
[34] АВАК. Т. VIII. С. 486.
[35] Мейер А. К. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 г. С. 98.
[36] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мінск, 1980. С. 194.
[37] Бруновский В. Х. Альбом Узлянского агрономического участка // Фонды Национального исторического музея Республики Беларусь. КП 11878. С. 64.
[38] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: в 3 т. СПб., 1902. Т. 3. С. 246–247.
[39] Там же. Т. 1. Ч. 1. С. 82.
[40] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. Вильна, 1911. С. 108.
[41] Фаминцын А. С. Божества древних славян. СПб., 1884. С. 221.
[42] Анталогія беларускай народнай песні / уклад. і камент. Г. І. Цітовіча. Мінск, 1975. С. 48.

[43] Саха. 1913. № 11. С. 1.
[44] Тамсама. С. 4.
[45] Тамсама.
[46] Голубеў В. Гаспадарча-этнаграфічнае апісанне Ашмянскага павета 1839 г. // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Ашмяны і Ашмянскі рэгіён: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2015. С. 271.
[47] Полная энциклопедия русского сельского хозяйства и соприкасающихся с ним наук. Т. 1. СПб., 1900. С. 89.
[48] Саха. 1913. № 11. С. 4.
[49] Бруновский В. Х. Альбом Узлянского агрономического участка. С. 64.
[50] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX—XIII стст. С. 133.
[51] Шкляр А. Х. Климат Белоруссии и сельское хозяйство. С. 317.
[52] Полная энциклопедия русского сельского хозяйства и соприкасающихся с ним наук. Т. 4. СПб., 1901. С. 1264—1265.
[53] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. С. 195.
[54] Киркор А. К. Народный труд. С. 211.
[55] Цыт. па кн.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. С. 195.
[56] Киркор А. К. Народный труд. С. 211.
[57] Полная энциклопедия русского сельского хозяйства и соприкасающихся с ним наук. Т. 4. СПб., 1901. С. 446—447.
[58] Там же. С. 446.
[59] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. С. 195.
[60] Полная энциклопедия русского сельского хозяйства и соприкасающихся с ним наук. Т. 7. СПб., 1902. С. 394.
[61] Цыт. па кн.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. С. 159.
[62] Зеленский И. Материалы для географии и статистики России. Минская губерния. Ч. 2. СПб., 1864. С. 82.
[63] Там же. С. 83.
[64] Голубеў В. Гаспадарча-этнаграфічнае апісанне Ашмянскага павета 1839 г. С. 271.
[65] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. С. 197.
[66] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 5. Спр. 117. Арк. 3.
[67] Тамсама. Арк. 2.
[68] Тамсама.
[69] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 165.
[70] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. СПб., 1863. Ч. 2. С. 21.
[71] Земледельческая газета. 1913. № 10. 14 декабря.
[72] Бруновский В. Х. Альбом участкового агронома Игуменского уезда Минской губернии // Фонды Национального исторического музея Республики Беларусь. КП 11878. С. 45.
[73] Земледельческая газета. 1885. № 14. 2 апреля. С. 298.
[74] Фут – руская і англійская мера даўжыні, роўная 30,48 см.
[75] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 1772. Арк. 33.
[76] Тамсама.
[77] Вяршок — мера даўжыні, роўная 4,4 см.
[78] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 544. Арк. 9.
[79] Тамсама. Воп. 2. Спр. 1772. Арк. 33.
[80] Земледельческая газета. 1915. № 30. С. 847.
[81] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 544. Арк. 33, 34 адв.
[82] Тамсама. Ф. 12. Воп. 2. Спр. 548. Арк. 15.
[83] Тамсама. Ф. 2. Воп. 21. Спр. 794. Арк. 1.
[84] Киркор А. К. Народный труд. С. 210—211.
[85] Занальны дзяржаўны архіў у Пінске. Ф. 273. Воп. 4. Спр. 13. Л. 34.
[86] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Л. 14.
[87] Слобожанин В. П. Земское самоуправление в Беларуси (1905—1917 гг.). Минск, 1994. С. 26.
[88] Там же. С. 34.
[89] Там же. С. 61.
[90] Дэманстрацыя на экране з дапамогай праекцыйнага ліхтара дыяпазітываў.
[91] Бруновский В. Х. Альбом участкового агронома Игуменского уезда Минской губернии. С. 2–4.
[92] Там же. С. 61.
[93] Хозяйственное положение и промыслы сельского населения Витебской губернии. Витебск, 1910. С. 132.
[94] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў / рэд. В. К.Бандарчык. Мінск, 1974. С. 14.



# Сяўба і догляд за пасевамі



Вясна для беларусаў была вельмі адказнай парой. Трэба было ўзараць і ўгноіць палі, дакладна вызначыць найлепшы час для сяўбы той ці іншай сельскагаспадарчай культуры, выбраць момант, калі зямля ўжо дастаткова цёплая, але не страціла яшчэ вільгаць, неабходную для прарастання насення. Таму ў беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці вясна звязвалася з надыходам гарачай земляробчай працы:

*Едзіць вясна, едзіць*
*На залатом кані*
*У зялёным саяні,*
*На сасе седзючы,*
*Сыру зямлю аручы,*
*А смыком скародзячы*[1].

Да веснавой сяўбы сяляне рыхтаваліся ўжо зімой: рамантавалі і падганялі хамуты, сядзёлкі, аброці і іншую конскую вупраж, латалі і шылі мяшкі, плялі карабы і кошыкі, правяралі захаванасць прызначанага да сяўбы зерня, якое было прыгатавана і старанна прасеяна яшчэ восенню. З сярэдзіны сакавіка пачыналі гатаваць прылады працы да апрацоўкі глебы. У гэты час куплялі або замаўлялі ў кавалёў новыя сашнікі, тачылі старыя, замянялі ненадзейныя драўляныя часткі сох, ладзілі бароны.

З прычыны прыродна-гістарычных умоў глебаўтварэння на тэрыторыі Беларусі найбольш распаўсюджаны розныя віды дзярнова-падзолістых глеб. Сярод іх шмат дзярнова-падзолістых забалочаных і тарфяна-балотных глеб, а ў далінах рэк — алювіяльна-лугавых. Амаль усе віды глеб характарызуюцца нізкай натуральнай урадлівасцю і патрабуюць адпаведнай апрацоўкі і ўнясення дастатковай колькасці ўгнаення[2].

Веснавыя работы пачыналіся з вывазу на палі гною — ён многія стагоддзі заставаўся для сялян адзіным прыродным угнаеннем зямлі, бо дзейнічае хутка, добра растрэсваецца, паляпшае фізічныя якасці любой глебы і прыдатны для ўсіх без выключэння раслін.

Звычайна сяляне вывозілі пад пасевы гной, які праляжаў у хляве год. Лічылася, што менавіта такі гной змяшчае найбольшую колькасць пажыўных рэчываў для збожжа і гародніны, а пустазелле ад яго не разводзіцца. Свежы, неперапрэлы гной у глебу стараліся не ўносіць, бо ён аказвае несспрыяльнае ўздзеянне на расліны[3].

Накопванне ў хлявах зляжалага і моцна ўтаптанага жывёлай за зіму гною і накідванне яго на воз было вельмі цяжкай мужчынскай працай, якую выконвалі пры дапамозе ручных прылад — сахароў (двухрогіх драўляных вілаў), часта з акаванымі жалезам вострымі канцамі рагоў, або прадаўгаватай драўлянай рыдлёўкай (мач). У час работы трэба было з вялікай сілай убіваць сахор у спрасаваны гной, а потым цяжкія яго кавалкі ўздымаць на ўзровень грудзей і ўскідваць на воз.

Для вывазу гною сяляне ладзілі асобыя вазы, у якіх дашчаныя бакі колаў не мелі верхніх злучэнняў, што дазваляла скідваць гной спераду і ззаду колаў. Звычайна гэта рабілі двухзубым жалезным крукам, раскладваючы па полі невялікімі кучкамі на роўнай адлегласці адна ад адной[4].

Растрэсвалі гной жанчыны віламі або проста рукамі, без прымянення якіх-небудзь прылад, бо лічылася, што гной нічым так добра не растрасеш, як рукамі[5]. Раскідаўшы гной, трэба было неадкладна яго заараць, каб ад сонца і ветру ён не страціў пажыўных якасцей і каб зямля, перамяшаўшыся з ім, разрыхлялася і тлусцела. Таму стараліся не растрэсваць па полі гною больш, чым араты мог у той жа дзень заараць. Калі гной быў недастаткова перапрэлы (шумясты), жанчына заграбала яго граблямі ў папярэдне прааранаю баразну, ідучы перад сахой[6].

Колькасць гною, які выводзіўся на палі, залежала ад яго назапашвання за зіму, ад віду культуры, якую збіраліся сеяць, і ад адлегласці поля ад сядзібы. Лічылася, што на кожны морг ворнай зямлі неабходна пакласці ад 150 да 180 сялянскіх вазоў гною[7]. Вываз яго на аддаленыя палі звычайна зацягваўся. Сялянская практыка паказала, што крайняя адлегласць палявых дзесяцін ад сядзібы, далей якой вазіць гной неймаверна цяжка, роўная прыблізна адной вярсце[8]. Без дапамогі радні і аднавяскоўцаў управіцца з гэтай працай у тэрмін было амаль немагчыма, таму на Віцебшчыне для гэтага часцей за ўсё збіралі талаку[9].

Талака з'яўлялася даўнім народным звычаем калектыўнай дапамогі ў тэрміновых ці працаёмкіх работах, якія вымагалі шмат работнікаў і цяглавай сілы: зрубіць хату, выбраць бульбу, вывезці гной і г. д. У такіх выпадках для бясплатнай дапамогі на адзін дзень запрашалі на талаку суседзяў, сваякоў і аднавяскоўцаў. У час талакі работа ішла з песнямі, жартамі, прыслоўямі. Пасля заканчэння працы гаспадар ладзіў застолле, а затым усе ўдзельнікі талакі весяліліся, спявалі, танцавалі («гралі талаку»)[10].

Частку пасеваў сяляне ўгнойвалі «ў прысцілку», не заворваючы гной у глебу, а тонкім слоем растрэсваючы яго па засеяным ячмені або яравой пшаніцы. Нягледзячы на тое, што пры такім спосабе гной траціць шмат



Мач і двухрогія сахары. Прылады для накопвання гною і растрэскі яго на полі. Малюнак С. Ц. Гунько

сваіх карысных якасцей, гэты спосаб меў і моцны дадатны бок, аберагаючы парасткі яравых, якія толькі што ўзышлі, ад ранішніх маразоў і зберагаючы ў глебе вільгаць, неабходную збожжавым усходам у час веснавой засухі[11].

Карэспандэнт «Эканамічных запісак», дадатку да «Прац Вольнага эканамічнага таварыства», у 1862 г. пісаў, што сялянскія надзелы дрэнна ўгнойваюцца. Амаль палову нарыхтаванага гною кожную вясну сяляне вывозяць на агароды, потым угнойваюць поле пад пшаніцу, а астатняе ідзе пад жыта, так што беларускі селянін спрадвечна жыве ў беднаце. Узмёт поля восенню пад яравыя культуры ў часы прыгону сяляне амаль ніколі не паспявалі рабіць, а пакідалі да вясны, калі коні, як і іншая жывёла, ад беднасці зімовага кармлення былі зусім знясіленыя і пры ўсім жаданні аратага пусціць саху глыбей зрабіць гэта было немагчыма, бо каню не пад сілу[12].

Пачатак веснавых палявых работ звязваўся ў беларусаў з рэлігійным святам — Дабравешчаннем[13]. На Дабравешчанне дзяўчаты заклікалі (гукалі) вясну, спяваючы вяснянкі, вадзілі карагоды.

Асноўнымі цяглавымі жывёламі ў сялянскай гаспадарцы былі конь або пара валоў. Працоўны конь у 1839 г. каштаваў ад 10 да 20 руб. срэбрам[14]. Вол цаніўся дзешавей за каня, і валовая запрэжка была дзешавейшай за конскую. Вол слабейшы за каня, але на яго харчаванне ішоў горшы корм і догляд яго быў больш просты, чым догляд каня.

Тэрміны сяўбы кожнай палявой культуры сялянская вытворчая традыцыя цесна ўвязвала з рэальнымі кліматычнымі сітуацыямі года, станам навакольнага асяроддзя, найбольш спрыяльным прагрэвам глебы і паветра для той ці іншай збажыны. Народны земляробчы каляндар беларусаў увасобіў шматлікія назіранні за паводзінамі звяроў, птушак, насякомых, свойскай жывёлы, красаваннем розных раслін, станам надвор'я ў пэўныя дні, якія ўвязваліся ў адзіны рытм з земляробчымі работамі і змяшчалі мноства карысных парад і прагнозаў, неабходных у паўсядзённых гаспадарчых занятках сялян. Гэтыя назіранні і прыкметы знайшлі сваё яскравае праяўленне ў прымаўках і прыказках: «Сей ячмень, як загудзіць сляпень»[15], «Калі суніца красна, не сей аўса напрасна»[16], «Пасееш буйным зярном, будзеш з хлебам і вінoм»[17], «Саламяным валом не араць, сянным канём не ваяваць»[18] і г. д.



Сахор (вілы драўляныя) для накопвання і накідвання гною на воз. Вёска Плетнішча Віцебскага павета Віцебскай губерні. Пачатак XX ст. Малюнак С. Ц. Гунько

Непасрэдная залежнасць вынікаў земляробчай працы селяніна ад знешніх прыродных з'яў, патрыярхальны лад жыцця, прыхільнасць да даўніны абумовілі захаванасць у традыцыйным светаўяўленні беларусаў устойлівай сістэмы звычаяў, абрадаў, культаў, магічных дзеянняў, вытокі якіх паходзілі з дахрысціянскай эпохі.

«Увесь гаспадарчы год, — пісаў у пачатку XX ст. Ф. Кудрынскі, — ва ўсведамленні беларуса да гэтага часу яшчэ асветлены моцным міфічным светам. Беларус не проста апрацоўвае зямлю, а амаль што свяшчэннадзейнічае ў кожным сваім земляробчым акце. Вясновая апрацоўка зямлі, ачышчэнне глебы ад наносных элементаў, пачатак сяўбы, пасадка агародніны, уборка збожжа з палёў, травы з лугоў ... усё суправаджаецца адпаведнымі абрадамі, песнямі, прымаўкамі, у якіх разам з хрысціянскім пачаткам дзіўным чынам яшчэ гучаць старажытнаязычніцкія паданні»[19].



Ворыва, сяўба, баранаванне. Малюнак з інвентара маёнтка Бранчыцы Слуцкага княства. 1682 г.

Нават увесь пантэон хрысціянскіх святых у народнай вусна-паэтычнай творчасці беларусаў быў прымеркаваны да цыкла земляробчых работ, і пры гэтым вобразы святых у традыцыйным светаўяўленні сялян набылі побытавае асэнсаванне і ўспрымаліся як памочнікі ў гаспадарчай дзейнасці, засцерагальнікі і даглядчыкі ніў і хатняй жывёлы, ахоўнікі ўраджаю:

*Святы Аляксей сохі чэшэць,*
*Святое Благавешчанне заорываець,*
*Святы Вярбіч вярбу пасвяцаець,*
*Чысты Чацвер ячмень засяваець,*
*Святое Вялічка з красным яечкам.*
*Першы дзень пірагі маюць,*
*А сярэдні дзень пагуляюць,*
*А паследні дзень выпраўляюць.*
*Святы Юр'я божы пасол,*
*Божы пасол да Бога пашоў,*
*А ўзяў ён ключы залатыя,*
*Адамкнуў зямлю сырусенькую,*
*Пусціў расу цяплюсенькую*
*На Белую Русь і на ўвесь свет.*
*Святы Барыс бабы сеіць,*
*Святы Мікола па межах ходзіць,*
*Па межах ходзіць, жыта родзіць,*
*Урасіўся, умачыўся,*
*Пад залаты пояс падаткнуўся.*
*Святы Ушэстнік жыта выплываець,*
*Святая Сёмуха навозы возіць,*
*Навозы возіць і Бога просіць.*
*Святы Дзявятнік жыта раўнуець,*
*Святая Дзесятуха жыта красуець,*
*Святы Іван пчолы садзіць*
*Пад пералазам па шэсцера разам,*
*Святы Пятро жыта родзіць,*
*Святы Кузьма сярпы робіць*
*Залатыя, новыя і сталёвыя;*
*Святы Паўлюк граблі робіць,*
*Святы Дзям'ян сена грабіць,*



«Рвач» для ўзрывання гною ў хляве і скідвання яго з калёс на полі. Вёска Брынёва Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько

*Святы Ілля — слаўная жняя,*
*Святы Барыс снапы зносіць,*
*Святы Ганны дамоў возіць,*
*Святы Спас жыта пасвяцаець,*
*Святая Прачыстая папары мешаець,*
*Святое Узвіжанне з поля збіраець*[20].

Сахой сяляне ўзворвалі поле баразна да баразны, бо рухомая паліца магла перамяшчацца з сашніка на сашнік. Плуг жа мае пастаянны, нерухомы адвал, які адвальвае пласт зямлі толькі ў правы бок. Таму сяляне звычайна аралі плугам ці «ў склад», ці «ў разор».

Пры першым узворванні зямлю аралі «ў развал» («у роскід», «у разор», «у разгон»), пачынаючы араць ад краёў паласы, і паступова набліжаліся да сярэдзіны, дзе атрымлівалася раз'ёмная баразна. У час другога ўзворвання, каб пазбегнуць хвалістасці, загон, які раней узворвалі «ў разор», аралі «ў склад»[21].

Пры ўзворванні «ў склад» араць загон пачыналі ад сярэдзіны, дзе пры заканчэнні ўзворвання атрымліваўся грэбень, а па краях утвараліся палавінныя раз'ёмныя барозны.

Перад пачаткам веснавых палявых работ у многіх месцах Гродзенскай губерні селянін стараўся даведацца, памяць якога святога адзначалася ў той дзень, калі ён меркаваў прыступіць да апрацоўкі зямлі: прападобнага, апостала, прарока ці пакутніка. Калі дзень выпадаў на дзень святога пакутніка, то работ на зямлі не пачыналі, каб яны не былі пакутлівымі[22].

Лічылася, што першы раз выязджаць араць трэба ў суботу ці ў чацвер. У гэты дзень араты апранаў чыстую бялізну, браў у кашолку «просвірку, што асвячалася на Дабравешчанне, свечку, якую свяцілі ў Грамніцы (або асвечаную ў Вербную нядзелю за тыдзень перад Вялікаднем), крыжык з мукі, спечаны на Сяродпосце і пасвечаны на Вялікдзень[23].

Першы выезд селяніна ў поле з сахою называўся ў беларусаў «заворваннем» і суправаджаўся шэрагам магічных дзеянняў. У Вілейскім павеце Віленскай губерні перад выездам у поле на заворванне гаспадар маліўся перад абразамі, браў у рукі «повад» (вяроўку) і ішоў у хлеў, дзе стаялі рабочыя валы. Калі гаспадар, узяўшы валоў на повад, выводзіў іх з хлява, гаспадыня апырсквала іх свянцонай вадой. Прыехаўшы на поле, гаспадар запрагаў валоў у саху і яшчэ раз асвячаў іх свянцонай вадой. Пасля гэтага ён праводзіў сахой некалькі baroзнаў і вяртаўся дадому, бо асноўны сэнс заворвання быў у тым, каб толькі распачаць земляробчыя работы[24].

У Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні сяляне ехалі заворваць поле вечарам на захадзе сонца, узяўшы з сабой хлеб і соль. Калі хтосьці пераходзіў дарогу, то бралі камень і перакідвалі цераз яго след, каб нейтралізаваць небяспеку ад гэтай сустрэчы. На полі выбіралі месца, дзе зямля лепш прасохла, узворвалі дзве-тры баразны і вярталіся дадому. Вечарам заворвалі для таго, каб не займацца іншай работай і не пашкодзіць будучаму ўраджаю[25].

На паўночным усходзе Беларусі існаваў земляробчы абрад, звязаны з пачаткам веснавых палявых работ, — «провідкі» (правідкі). За некалькі дзён да першага выезду ў поле з сахой на заворванне селянін ішоў у поле, узяўшы з сабой загорнутыя ў чысты ручнік хлеб, соль і асвечаныя ў царкве на Вербніцу галінкі вярбы. Паклаўшы на мяжы хлеб і соль, ён абыходзіў палетак і ўтыкаў па краях галінкі вярбы з мэтай асвячэння і засцерагання поля. Калі провідкі прыпадалі на час пасля Вялікадня, то селянін браў з сабой яшчэ і чырвоныя велікодныя яйкі[26].

Да веснавога заворвання сяляне ніколі не ўбівалі ў зямлю ніякіх калоў, каб «не забіць зямлю», — лічылася, што пасеянае пасля гэтага дзеяння насенне не дасць усходаў[27].

Ніхто з сялян не пачынаў араць і асабліва сеяць у маладзік (першую квадру месяца) або ў той дзень тыдня, на які ў тым годзе прыпадала свята Грамніц, таму што ад гэтага магла назаўжды сапсавацца ніва[28]. Не сеялі збожжавыя і ў апошнюю квадру месяца: «Пасеяўшы на сходу, не ажыдай харошага плоду»[29]. Векавыя назіранні за прыродай, паводзінамі жывёл, птушак, вопыт стагоддзяў земляробчай працы пераканалі селяніна, што «сей у добрую пару — збярэш хлеба гару»[30].

У Мазырскім павеце Мінскай губерні ў дзень, калі першы раз ехалі ў поле араць або сеяць, ніхто не пазычаў суседзям з дому ніякай рэчы і агню, бо ў першым выпадку лічылі, што на ніве будзе неўраджай, а ў другім, што пасевы прападуць ад засухі[31].

На Віцебшчыне першы выезд у поле з сахой адбываўся абавязкова пасля першага веснавога грому, які «адмыкаў зямлю»[32].



Парнае ярмо для валовай запрэжкі. Фота Д. Мазаніка

У Мсціслаўскім павеце Магілёўскай губерні, пачынаючы першы дзень араць, селянін выводзіў свайго каня ў поле, запрагаў яго ў саху і перад пачаткам работы качаў па ім курынае яйка, прыгаворваючы: «Будзь, мой конь, так гладак і повін, як ето яйцо». Пасля гэтае яйка аддаваў старцу, каб той памаліўся аб здароўі яго каня[33].

Е. Р. Раманаў пісаў, што беларус, едучы першы раз араць, браў з сабой пасвечаную на Вербніцу вярбу. На полі ён выпрагаў каня з калёс і запрагаў у саху, затым надзяваў на плечы сявалку, браў у рукі вярбу і тры разы абыходзіў вакол каня, молячыся Богу: «Благаславі, Госпадзі, да памагі нам!». Потым з вярбой і сявалкай селянін араў тры баразны з аднаго краю поля і тры з другога; пасля гэтага клаў сявалку і вярбу ў воз, а сам пачынаў араць. Некаторыя, выходзячы першы раз араць поле, бралі з сабой косткі ад пасвечанага на Вялікдзень мяса і заворвалі іх у баразну каля мяжы[34].

У многіх вёсках Гродзенскай губерні сяляне ніколі не пачыналі араць зямлю чорным валом, а прасілі суседа пазычыць для гэтага вала іншай масці. Не пачыналі араць поле і сівым валом, бо лічылася, што тады памрэ хтосьці з сям'і[35].



Ярмо для парнай запрэжкі валоў на сцяне хлява. Мястэчка Рэмень. Заходняе Палессе. 1920–1930-я гг.

Земляробства з'яўлялася галоўным сродкам існавання беларусаў і задавальнення іх важнейшых жыццёвых патрэб. Сяляне любоўна адносіліся да зямлі і вельмі старанна апрацоўвалі свае палеткі. Пад засеў кожнай збожжавай культуры яны звычайна ўзворвалі і баранавалі палі ад трох да пяці разоў.

Глыбіня і час узворвання зямлі, а таксама колькасць узворванняў залежалі ад глыбіні ворнага слоя глебы, ад якасці і складу глебы і падглебы, ад вільготнасці ці сухасці зямлі, ад ступені засмечанасці травамі і прыроды збожжавых культур, якія высяваліся[36].

Каб узараць дзесяціну поля сахой за адзін дзень, патрэбны былі тры двухваловыя запрэжкі і трое работнікаў або дзве запрэжкі коней і двое аратых. На пясчаных глебах можна было ўправіцца з гэтай працай раней, а на глебах глiністых, асабліва пасля засухі, патрабавалася больш працоўнай жывёлы і працоўных рук[37].

Першае ўзворванне навіны (аблогі), або папару (узгору), называлася «пад'ёмам», пры заворванні ржышча — «узмётам»[38]. Другое ворыва называлася «мешанню», а калі поле меркавалася араць тры разы, то «падтройкай». Трэцяе ўзворванне («траенне») сяляне практыкавалі толькі на глiністых і цяжкіх глебах або моцна ўгноеных палях, таму што трэцім ворывам дасягалася лепшае рыхленне і праветрыванне глiністых глеб, а моцна ўгноеныя палі ачышчаліся ад пустазелля[39]. Трохразовае ворыва поля да сяўбы значна павышала ўраджайнасць: «Хто поле троіць, той хлеб кроіць»[40], «Хто тры разы арэ, той тры снапы больш бярэ»[41].

На добра ўгноеных прысельных палях пры значнай глыбіні ворнага слоя звычайна аралі глыбей, а на аддаленых, слаба ўгноеных землях, дзе ўрадлівы слой быў вельмі тонкі і не перавышаў 20–30 см, сахой уздымалі



Веснавая праца на хутары. Ігуменскі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

прыблізна 2–3 вяршкі глебы (9–13 см), каб не выварочваць наверх падглебы, якая шкодзіла ўраджаю. Боязь закрануць неўраджайную светлую падглебу адлюстравалася ў народных прыказках: «Па чорнай зямельцы жыта сеюць, а па белай сабакі бегаюць»[42], «Як гары, так гары, абы чорным дагары»[43] і інш.

Пры шматразовым узворванні цяжкая гліністая глеба разрыхляецца і ствараюцца спрыяльныя ўмовы для росту і развіцця раслін. Наадварот, пры частым узворванні лёгкіх пясчаных зямель глеба страчвае звязнасць і выветрываецца. Пры баранаванні ворыва пасля дажджу глеба не разрыхляецца, а замазваецца бараной, пасля высыхання на паверхні ствараецца корка, таму сяляне баранавалі палі толькі ў сухое надвор'е, бо пры гэтым яшчэ высыхаюць і знішчаюцца карані пустазелля[44].

Баранавалі палі з рознымі мэтамі: выраўнаваць паверхню ўзаранай глебы, перамяшаць яе часткі, разбіць, расцерабіць пласты і камякі, разрыхліць корку, якая атрымліваецца на паверхні глебы пасля моцных дажджоў, знішчыць пустазелле і г. д. Сяляне стараліся схапіць момант, калі зямля слабавільготная, крышыцца пад бараной, не наліпае на яе. Асабліва важна было ў час пабаранаваць палі з цяжкай гліністай глебай. Іх баранавалі адразу пасля ўзворвання, таму што пры высыханні на іх ствараліся вельмі цвёрдыя глыбы і камякі, якія цяжка было разрыхліць.

Значна лягчэй было баранаваць пясчаныя глебы, якія пры высыханні не ўтваралі глыб і камякоў, а калі іх баранавалі ў сухім стане, не так моцна распыляліся, як гліністыя[45].

Узаранае поле заўжды пачыналі баранаваць упоперак адваленых сахой або плугам пластоў глебы, якія барана пераразала і крышыла сваімі зубамі. Баранаванне ўпоперак пластоў на Магілёўшчыне называлася «ламаць поле». Калі пласты глебы былі дастаткова расцярэблены папярочным баранаваннем, поле пачыналі баранаваць уздоўж, што называлася «перахаджываць» поле[46].

Пэўных, канкрэтна вызначаных тэрмінаў сяўбы той ці іншай палявой культуры не існавала, таму што гэта ў значнай меры вызначалася ўмовамі года: ранняя ці позняя была вясна, сухі ці мокры выдаваўся год, снеж-

ная або маласнежная была зіма і г.д. Звычайна тэрміны сяўбы збожжавых у сялян падзяляліся на раннія, сярэднія і позні. У залежнасці ад канкрэтных умоў надвор'я і мноства прыкмет і назіранняў, назапашаных на працягу многіх стагоддзяў сельскагаспадарчай дзейнасці, сяляне вырашалі, у раннія, сярэднія ці позні тэрміны пачынаць сяўбу.

Позні, ранні і сярэдні тэрмін сяўбы яны вылічвалі тыднямі назад ад свята святога Іллі. Звычайна раннія пасевы ярыцы (яравога жыта), яравой пшаніцы і ячменю праводзілі на 12–11-ы тыдзень да Іллі, аднак бывалі выпадкі, як адзначаў М. Я. Нікіфароўскі, што сеялі за 13 і нават за 14 тыдняў да Іллі, але пры такіх тэрмінах існавала непасрэдная пагроза гібелі пасеваў ад марозаў[47]. З восьмага тыдня да Іллі пачыналіся ўжо позні пасевы[48].

На Палессі, у паўднёвых паветах Мінскай губерні (Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім) на ўзвышаных месцах сяўба яравых пачыналася ў канцы сакавіка, адразу пасля Дабравешчання (25 сакавіка / 7 красавіка), і заканчвалася да 15 (28) мая, а на нізкіх палях яна праводзілася з паловы мая да паловы чэрвеня[49].

Яравыя збожжавыя культуры вельмі цяжка пераносяць засуху. Авёс нават пры самых добрых усходах у засушлівы год ледзь вяртае пасеянае насенне[50]. Аднак неўраджай у сухое лета толькі змяншае колькасць сабранага збожжа, але якасць яго бывае лепш за звычайную. У яравых збожжавых, якія перанеслі засуху, зерне звычайна больш мучністае і лепш захоўваецца[51].

На нізкіх землях звычайна сеялі ячмень, пшаніцу, лён і гарох, а пад авёс адводзілі больш узвышаныя або недастаткова ўгноеныя палі. Пшаніцу і ячмень стараліся пасеяць далей ад сядзібы, каб на іх менш залятаі вераб'і, а гарох — далей ад дарогі, каб не прыцягваць увагі дзяцей, для якіх зялёны гарох быў любімым ласункам[52].

Сяляне ўлічвалі і фазы развіцця пустазелля, якое звычайна суправаджала рост збожжавых культур. Напрыклад, калі сеялі ў вільготную зямлю, то першымі ўзыходзілі каласоўнік і куколь, якія забівалі збожжа, а пры сяўбе ў сухое надвор'е першым узыходзіла збожжа і прыгняталала пустазелле. Пры позняй сяўбе збожжавых культур пустазелле таксама значна зніжала ўраджай: «На ранняй раллiцы родзіць жыта ды пшаніца, а на позняй раллiцы родзіць куколь ды мятліца»[53].

Сеялі палявыя культуры мужчыны. Пры сяўбе карысталіся спецыяльна прызначанымі для гэтай мэты featрознага тыпу сявалкамі, якія ў розных рэгіёнах Беларусі называліся «сяўнёй», «лубкай», «сеўныком», «сявенькай», «каробкай», «кашэлем» і інш.

Найбольш пашыранай была лёгкая плеценая з саломы сявалка, аснову якой рабілі з тонкіх, часцей за ўсё лазовых прутоў. Такія сявалкі пераважалі ў паўднёва-заходніх, заходніх, цэнтральных і паўночных паветах Беларусі. На Магілёўшчыне і ва ўсходняй частцы Міншчыны ўжываліся пераважна лубяныя сявалкі (лубкі), матэрыялам для якіх служыў луб ліпы ці вязу або тонкая дранка з сасны і іншых парод дрэва. Поруч з сявалкамі гэтых тыпаў сустракаліся сявалкі з вельмі тонкіх драўляных клёпак, абцягнутыя палатном па аснове з драўляных дубцоў. Зрэдку сеялі проста з мяшка ці фартука[54].

Сявалкі былі самых розных форм і значна розніліся па аб'ёме. Іх умяшчальнасць вагалася ад 10 да 20 кг[55]. Сярэдняя ёмістасць складала прыблізна адзін пуд збожжа[56].

Перад выездам на сяўбу ярыны або жыта сяляне па старажытнаму звычаю рыхтаваліся як да вялікага свята. Напярэдадні ўсё чысцілі і прыбіралі. Мылі падлогу, вокны, лавы і стол, які засцілалі чыстым абрусам. Двор і хату падмяталі чацвярговым[57] венікам, каб у пасеве не было пустазелля. Перад выездам з двара сейбіт абавязкова заходзіў у хату, маліўся і тройчы кланяўся перад абразамі[58].

«На поле з засевам выязджаюць досвіткамі, — пісаў пра палянпалешукоў І. А. Сербаў, — каб не сустрэцца на шляху з якім-небудзь дрэнным чалавекам — ведзьмаром альбо сурочлівым, хворым альбо пляшывым. Калі ж пры ўсёй засцярозе нешчаслівай сустрэчы нельга было абмінуць, дык стары палянін абавязкова плюне, паверне назад і праедзе ўжо крадучыся вакольнымі пуцінкамі на сваю паласу. Тут ён зусім спакойна адпрагае калёсы, насыпае зернем поўную «севэньку», перакідае яе праз плячо і, перахрысціўшыся на ўсход сонца, пачынае сеяць»[59].

Са старажытнасці збожжавыя сеялі жменямі ўроскід адной або дзвюма рукамі. Пры такой сяўбе расліны раўнамерна размяркоўваюцца па пасяўной плошчы, маюць аднолькавыя ўмовы развіцця, росту, вентыляцыі, добра асвятляюцца, больш устойлівыя да захворванняў і палягання. З прычыны адсутнасці міжрадкоўяў у такіх пасевах слаба развіваецца пустазелле.

Як яравыя, так і азімыя збожжавыя сеялі двума спосабамі: «цераз крок» і «за кожным крокам». Самым пашыраным спосабам быў спосаб сяўбы «цераз крок». Пачынаючы сеяць, селянін станавіўся ў пачатку сваёй паласы, хрысціўся, маліўся Богу і першыя дзве або тры[60] жмені зярнят сыпаў крыжападобна, а затым пачынаў павольна, з левай нагі крочыць па ніве, правай рукой рассыпаючы цераз крок перад сабой насенне. Каб не было незасеяных або занадта загушчаных месц, сейбіт стараўся рабіць аднолькавыя крокі і браць з сявалкі аднолькавую колькасць зерня. Пры сяўбе «цераз крок» насенне рассыпалася па раллі аднолькавымі паўкружжамі[61].



«Лубка» для сяўбы з лубу ліпы. Магілёўшчына. 1950-я гг. Фота І. П. Корзуна



«Сявалка». Вёска Гараны Полацкага раёна Віцебскай вобласці. 1950-я гг. Фота Л. А. Малчанавай

У паўночнай частцы Віцебшчыны[62] і некаторых паветах Гродзенскай губерні[63], на Палессі[64] сеялі «за кожным крокам», у дзве рукі. Пры такім спосабе сяўбы, калі сейбіт наступаў правай нагой, то жменя насення веерам рассыпалася ўперад і направа, калі левай — зерне рассыпалася ўперад і налева. Зерне клалася на зямлю як бы сашчэпленымі паўкружжамі і займала ўшырыню паласу, прыблізна роўную 3–4 аршынам[65]. Каб не залезці на чужое поле, межы акуратна падсявалі.

Калі сеялі авёс, ячмень, пшаніцу або белы гарох, то мяжу россыпу зерня было ясна відаць, а пры сяўбе жыта і грэчкі за сейбітам абавязкова ішоў хто-небудзь з сям'і і «тычкамі» (вехцікамі саломы або галінкамі) адзначаў мяжу засеянай плошчы[66].

Апошнія дзве жмені насення, як і пры пачатку засеву, сейбіт раскідваў крыжападобна на канцы загона і тут жа на мяжы ставіў сявалку. Ён не кранаў з месца пустых мяшкоў з-пад насення, якія ляжалі там-сям на раллі, а толькі перакідваў іх, калі пры загортванні насення даходзіў да іх з канём і бараной[67].

Па традыцыі было прынята засяваць у адзін прыём такую плошчу поля, якую можна было б да вечара яшчэ забаранаваць. Сяляне лічылі, што не забаранаванае на ноч зерне губляла палову ў росце і ўраджаі. Таму аб засеяным, але не забаранаваным да ночы ўчастку навакольныя людзі меркавалі як аб няшчасці[68].

Сяляне Слонімскага павета лічылі, што калі мужык засявае сваю паласу і тут жа побач сее яго сусед, то нельга сеяць яму насустрач, бо хлеб не ўродзіць[69].

На пясчаных і супясчаных глебах пасеянае насенне заворвалі сахой (што называлася «сеяць пад саху»), а потым поле баранавалі[70]. Глыбокае загортванне насення на лёгкіх глебах забяспечвала яго вільгаццю, давала раслінам магчымасць лепш укараніцца, развіць моцнае сцябло і вялікі колас.

На гліністых глебах сеялі звычайна пасля другога або трэцяга ўзворвання і толькі забараноўвалі насенне («сеялі пад барану»), таму што заглыбленае ў цвёрдай глебе зерне не магло б узысці[71].

Пасля загортвання насення сейбіт з канём, запрэжаным у барану, спускаўся з раллі, бласлаўляючы, хрысціў ніву і толькі тады лічыў сяўбу скончанай[72]. На Палессі пасля заканчэння сяўбы селянін, паводле дзедаўскага звычаю, абавязкова раскідаў пры дарозе тры жмені зерня — «дзеду палявому на пырог, або на кашу»[73].

Сяляне асцерагаліся сеяць у ветраны дзень, бо тады зерне не клалася раўнамерна на раллі. Ніколі не сеялі адразу за аратым, давалі час зямлі крыху зляжацца[74]. Лічылася прыкметай добрага ўраджаю, калі пры загортванні насення за бараной уздымаўся лёгкі пыл, а потым на свежы засеў праходзіў дождж: «Калі пыл на баране, дак і блін на рэшаце»[75].

У тым выпадку, калі пасеянае зерне яшчэ не ўзышло, а праліўныя дажджы моцна размачылі верхні слой глебы, які прасох і ператварыўся ў гладкую цвёрдую корку, праз якую не маглі прабіцца зерневыя расткі, поле баранавалі («ламалі»).

Раней за ўсё пачыналі сеяць авёс, ярыцу і яравую пшаніцу. Глебу пад авёс у Гродзенскай губерні стараліся ўзараць восенню спосабам «ва ўрэх». Пры такім спосабе паміж двума загонамі пакідалі тры неўзараныя баразны. За зіму пад снегам загоны зліваліся ў адную гладкую паверхню. Яна

пасля сходу снегу ператваралася ў суцэльную масу, якую вельмі цяжка было б расцерабіць бараною, калі не пакінуць палосак неўзаранай зямлі. Пасля баранавання поля авёс сеялі ў яшчэ халодную зямлю («у зябла»)[76].

На нізкіх, цвёрдых, гліністых глебах поле пад авёс першы раз аралі восенню, вясной каля свята Дабравешчання баранавалі і ў пачатку красавіка аралі другі раз («дваілі»), а праз два тыдні пасля дваення сеялі пад барану[77].

У сваёй землябробчай практыцы сяляне моцна трымаліся старажытнага правіла: даць раллі час перад сяўбой 1,5–2 тыдні адпачыць і зляжацца, бо насенне, кінутае ў сухую, незляжалую зямлю, не можа прыцягнуць да сябе вільгаць з ніжніх слаёў глебы і пусціць расткі.

Сухія пясчаныя палі, на якіх было зжата жыта, пад авёс аралі толькі вясной у палове красавіка, а ў канцы месяца засявалі. Так апрацоўвалі палі і ў тыя ж тэрміны сеялі яравое жыта (ярыцу). Плошчы пасеваў аўса ў сялянскім надзеле займалі значнае месца, бо, акрамя зерня, давалі добрую кармавую салому для хатняй жывёлы.

У XIX ст. лепшымі сартамі аўса ў Магілёўскай губерні лічыліся «Тульскі», «Каліфарнійскі» і аднастрочны «Усходні»[78]. У Заходняй Беларусі сеялі поруч са звычайным аўсом авёс «Венгерскі» з высокім сцяблом і насеннем, якое вісела на адзін бок, што давала больш саломы для хатняй жывёлы, але менш зерня. Сеялі таксама чорны авёс або асцісты, з чорнымі або цёмна-чырвонымі зярнятамі[79].

Ячмень сеялі на сугліністых і пясчаных глебах, добра ўгноеных з восені. Сяляне адводзілі пад яго лепшыя палі, звычайна там, дзе ў мінулым годзе было пасеяна жыта на ўгноенай глебе. Часцей за ўсё яго сеялі на



Сейбіт. Пінскі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст.




Тыпы сявалак:

а – вёска Латыгава Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці;
б – вёска Чартава Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці;
в – вёска Замосце Слуцкага раёна Мінскай вобласці;
г – вёска Асташкавічы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці;
д – вёска Радня Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці;
е – вёска Грыцэвічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці;
ж – вёска Рагозна Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.
Малюнак С. Ц. Гунько

прысельных землях, бо ён заглушаўся пустазеллем і патрабаваў праполкі. Ячмень добра пераносіць веснавыя замаразкі[80], але пакутуе ад засухі. Таму пасля запашкі насення і баранавання сяляне прысцілалі яго гноем[81]. У памешчыцкіх гаспадарках для захавання вільготнасці глебы пасевы ячменю ў засушлівае надвор'е прыкатвалі лёгкімі каткамі[82].

На Беларусі ў XIX ст. былі распаўсюджаны два віды ячменю: двухрадковы і чатырохрадковы. Двухрадковы ячмень мае больш буйное зерне і больш працяглы вегетацыйны перыяд, чым чатырохрадковы, або просты, ячмень. Ён менш патрабавальны да глебы, і яго пасевы займалі значную плошчу ў сялянскіх надзелах. Звычайна ячмень сеялі ў красавіку — пачатку мая (да свята Міколы 9(22) мая). На пясчаных глебах сеялі «пад саху», а на цяжкіх, гліністых — «пад барану». Пры ранняй сяўбе ў пачатку мая просты ячмень паспяваў разам з азімым жытам[83]. Лепшыя сарты чатырохрадковага ячменю «Каліна» і «Шэвалье» ў XIX ст. былі пашыраны паўсюдна[84]. У Віленскай губерні раннюю сяўбу ячменю праводзілі разам з аўсом, а сяўбу ў канцы красавіка — пачатку мая (ст. ст.) лічылі позняй[84]. На Магілёўшчыне ў Чэрыкаўскім павеце ячмень пачыналі сеяць тады, калі на дрэвах з'яўляліся майскія жукі[85].

Пшаніцу як яравую, так і азімую сяляне сеялі ў абмежаванай колькасці з-за яе высокай патрабавальнасці да якасці глебы. Добрыя ўраджаі яна давала толькі на моцна ўгноеных сугліністых або гліністых глебах. Пад пшаніцу звычайна адводзілі лепшыя добра ўгноеныя, старанна апрацаваныя і ачышчаныя ад пустазелля палі[87]. Але і на самых добрых палях азімая пшаніца незаўжды давала добрыя ўраджаі, таму што дрэнна пераносіла вялікія маразы і часта вымярзала. Лепшым сортам азімай пшаніцы ў сярэдзіне XIX ст. лічылася «Сандамірка», насенне якой выпісвалі з Польшчы[88].

У сялянскіх гаспадарках больш пашыранай была яравая пшаніца, якую сеялі на ўгноеных прысельных палях[89]. Пад яравую пшаніцу поле звычайна ў верасні аралі і ўгнойвалі. Калі глеба была супясчанай, то яе дваілі ў тую ж восень, а вясной баранавалі і сеялі «пад саху» ў халодную яшчэ зямлю («у зябла»). Сугліністыя глебы другі раз аралі (дваілі) вясной у пачатку красавіка, каля 15 красавіка баранавалі і сеялі «пад барану»[90].

Яравое жыта, проса, гарох і сачавіцу сяляне сеялі ў невялікіх аб'ёмах, толькі для патрэб сям'і. Ярыца (яравое жыта) не мела шырокага распаўсюджання, бо па ўраджаі і якасці зерня яна далёка ўступала азімаму жыту.

Гарох сеялі на лепшых месцах у прысельных палях, але ў абмежаванай колькасці, таму што ў час засухі ён гінуў раней за іншыя культуры, а на ўгноеных землях палягаў і згніваў. Сеялі яго ад пачатку красавіка да сярэдзіны мая. Больш познія тэрміны сяўбы не давалі добрага ўраджаю. У Гродзенскай губерні зямлю пад гарох угнойвалі авечым гноем у верасні, а ў кастрычніку заворвалі[91]. На Віцебшчыне гарох сеялі на 10-м тыдні ад свята святога Іллі (11–18 мая ст. ст.)[92]. На Беларусі былі пашыраны два сарты гароху: белы і шэры.

Каб пасевы гароху не палягалі, па ўсёй плошчы поля ўтыкалі сухія бярозкі з аголенымі ад лісця сукамі, вакол якіх гарох пачынаў віцца. Але такі спосаб догляду пасеваў з'яўляецца больш агародным, бо ўваткнутыя ў зямлю бярозкі абцяжарвалі ўборку. Пасевы гароху часта, асабліва ў гарачае лета, пашкоджваліся чарвякамі і рознымі насякомымі[93].

Лепшыя ўраджаі пшаніцы і ячменю атрымлівалі на палях, дзе восенню ўбіралі бульбу. Зямля ад бульбы разрыхляецца так, што, толькі садзячы пад саху, без угнаення, атрымлівалі ўраджаі сам-10, а нярэдка і сам-20[94].

У невялікай колькасці сяляне сеялі сачавіцу, пад якую адводзілі няўгноеныя месцы на прысельных яравых палях[95].

Проса, грэчка, лён і каноплі з'яўляюцца цеплалюбівымі раслінамі, таму іх сеялі ў познія тэрміны, калі зямля добра прагравалася і не існавала пагрозы вясенніх замаразкаў. Проса сеялі ў адносна невялікай колькасці, звычайна толькі на сямейныя патрэбы. На Магілёўшчыне найбольш пашыраныя пасевы проса былі ў Гомельскім, Рагачоўскім і часткова ў Быхаўскім і Клімавіцкім паветах, дзе яго часцей за ўсё сеялі на лядах і расцяробах «першым корнем», гэта значыць у першы год на расчышчаных ад лесу ўчастках[96]. На стараворных землях у Гродзенскай губерні поле пад проса ўгнойвалі восенню свіным гноем і заворвалі. Вясной аралі і сеялі «пад барану» 10—15 мая (ст. ст.). Навіну (аблогу) пад проса аралі восенню, вясною зямлю «дваілі» і проса сеялі без угнаення[97].

Даволі вялікія плошчы палёў займалі ў сялянскім надзеле пасевы грэчкі, якая малапатрабавальная да якасці глебы. Пад яе сяўбу сяляне адводзілі палі, непрыдатныя для іншых збожжавых культур, бо на ўгноенай глебе сцябло грэчкі вырастае доўгім і разгалінаваным, яна позна зацвітае і зерне дрэнна завязваецца. У Барысаўскім павеце Мінскай губерні сяляне назіралі ў дзень святога Юр'я за расой — калі яна была вялікай, то, паводле павер'я, у гэты год чакалі добры ўраджай грэчкі[98]. Сеялі яе ў маі і да 10 чэрвеня (ст. ст.), але найбольшыя ўраджаі давалі майскія пасевы, калі не пашкоджваліся замаразкамі[99]. Калі глеба была гліністай, сеялі грэчку звычайна па ўзараным з восені полі, якое аралі і баранавалі вясной. На пясчаных глебах зямлю аралі вясной, не барануючы сеялі і затым забараноўвалі[100].

Шчаслівым днём для сяўбы грэчкі лічыўся дзень 12 чэрвеня (ст. ст.) — свята святога Ануфрыя: «Хто на Ануфрыя пасее грэч, той будзе бліны есць!», а таксама 13 чэрвеня — свята «Акуліны-грачышніцы»[101]. У Слонімскім павеце лічылі, што наступала пара сеяць грэчку, калі зацвітала каліна[102].

Каб пасевы грэчкі не загінулі ад дрэннага надвор'я, а зярняты былі поўныя і чорныя, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні ў першы дзень Раства ніхто з сям'і не надзяваў чыстай белай кашулі, а хадзілі ў брудных («чорных»)[103].

Лён, акрамя звычайнай апрацоўкі глебы, патрабуе добрага яе разрыхлення і ачысткі ад пустазелля і камянёў. Таму сяляне выдзялялі пад яго ўчасткі з мяккай глебай на прысельных палях. Сеялі з пачатку да канца мая (ст. ст.). Але ў паўднёвых паветах Гродзенскай губерні (Кобрынскім і Брэсцкім) лён сеялі ўжо ў пачатку красавіка (ст. ст.) і, калі яго не губілі веснавыя замаразкі, ён паспяваў у канцы чэрвеня, да пачатку жніва[104].

Спрыяльным днём для сяўбы лёну лічыўся дзень 21 мая (ст. ст.), асабліва калі ён прыпадаў на панядзелак. Каб лён быў чыстым, сейбіт абавязкова павінен быў надзець чыстую бялізну. Акрамя таго, у сявалку з насеннем клалі курыныя яйкі. На ніве перад пачаткам сяўбы селянін падкідваў іх угору — каб лён рос высокім і з буйнымі галоўкамі[105]. Сеяць лён было вельмі цяжка, бо ён раскідваўся па раллі не жменямі, а шчэпцем («нюшком») і тут патрабавалася вялікае майстэрства. Таму часта для сяўбы лёну звярталіся да аўтарытэтных у гэтай справе сялян і тых, хто меў, паводле меркавання аднавяскоўцаў, «шчаслівую, лёгкую руку»[106]. Ільняное семя, якое заставалася ў сялян звыш неабходнага на насенне, перараблялі на алей або прадавалі[107].

Ні адна сялянская гаспадарка не абыходзілася без пасеваў канапель. З канаплянага валакна (пянькі) вілі вяроўкі, аборы для лапцей, плялі шлеі для коней. Больш мяккая пянька з мужчынскіх раслін канапель

ішла разам з ільнянымі ачосамі на выраб тоўстага «зрэбнага» палатна, з якога шылі мяшкі і дзяругі. У пост канапляны алей, тоўчаныя каноплі і канаплянае малако (разведзеныя ў вадзе тоўчаныя каноплі) ужываліся сялянамі як заправа да посных страў[108]. Пад каноплі звычайна адводзілі ўчасткі за агародамі, дзе вырошчвалі розную гародніну. Гэта так званыя «канаплянікі», на якіх іх сеялі з году ў год. У другой палове XIX ст. пад канаплянікамі ў Магілёўскай губерні было занята 2 працэнты ўсёй ворнай надзельнай зямлі[109].

Каноплі вельмі патрабавальныя да ўгнаення глебы. Звычайна пад іх сяляне клалі праз год не менш як 400 вазоў гною на дзесяціну. З гэтай прычыны ні адна палявая культура не магла чаргавацца з коноплямі. Ад празмернага ўгнойвання ўсе збожжавыя і гарох, калі сеяліся пасля канапель, палягалі і замест ураджаю атрымлівалася адна падапрэлая салома, а бульба ішла ў нaцiну. Гэта прымушала сялян сеяць каноплі на адным і тым жа месцы. Часам каноплі сеялі на агародах, дзе яны з'яўляліся цудоўнай папярэдняй раслінай для любой агароднай культуры, бо заглушалі пустазелле і пакідалі пасля сябе чыстую і добра разрыхленую глебу для гародніны[110].

Бульбу сяляне садзілі за сахой праз дзве баразны ў трэцюю недалёка ад сядзібы на прысельных палях. У канцы XIX — пачатку XX ст. бульбу садзілі ўжо за плугам праз баразну, а для абворвання выкарыстоўвалі спецыяльныя сошкі[111].

Клубні бульбы пры пасадцы клалі не на дно баразны, а збоку ў разрыхленую зямлю, каб аблегчыць прарастанне і пранікненне ў глебу каранёў. У канцы XIX ст. быў пашыраны спосаб пасадкі бульбы «пад нагу», калі саджальшчык, паклаўшы бульбіну ў рыхлую зямлю, наступаў на яе нагою. За саджальшчыкам ішоў араты з сахою і злёгку завальваў пасаджаную бульбу зямлёй[112]. Другім спосабам была пасадка бульбы «пад шапку», пры якім саджальшчык ішоў за аратым і кідаў у разрыхленую зямлю баразны бульбу, а за ім другі работнік граблямі заграбаў на клубні гной[113].

Пасля заканчэння сяўбы яравых культур і пасадкі бульбы ўсе свае сілы сяляне накіроўвалі на вываз гною на папар і яго апрацоўку пад сяўбу азімага жыта. Сялянскі, або выганны, папар — поле пасля ўборкі яравых культур, якое да сярэдзіны лета наступнага года служыла пашай для свойскай жывёлы.

Сялянскі папар меў значныя недахопы. Па-першае, глеба моцна ўшчыльнялася восенню пасля ўборкі яравых пасеваў і зімой пад ціскам снегу, а асабліва вясной і летам утоптваннем жывёлы. Па-другое, на ім бесперашкодна расло пустазелле, значная частка якога да паловы лета паспявала і абсемянялася, павялічваючы ў зямлі і без таго яго велізарны запас.

На пачатку XIX ст. большасць памешчыкаў таксама вялі трохпольную збожжавую гаспадарку, але многія з іх замест выганнага папару засявалі ўчастак кармавымі травамі, якія касілі ў час красавання, што не давала магчымасці абсеменіцца пустазеллю. Пасля касьбы ўчастак некалькі разоў пераворвалі пад сяўбу азімага збожжа. Сцёблы і карэнне скошаных пасяўных траў і пустазелля ад некалькіх перапашак драбіліся, змешваліся з зямлёй і, перагніваючы, рабілі глебу больш рыхлай[114]. Выганны папар утрымліваўся ў сялянскай гаспадарцы амаль да пачатку XX ст. выключна з прычыны недахопу сенажацяў і выганаў, каб мець хоць якую кармавую плошчу для жывёлы.

Паводле сведчання П. Баброўскага, у Гродзенскай губерні папар першы раз аралі і баранавалі каля сярэдзіны мая (ст. ст.)[115], а на Віцебшчыне — з пачаткам Пятроўскага посту, калі на «парыну» (папар) вывозілі гной і сахой «узнімалі» яго, заворваючы гной і пераварочваючы ўніз і на бок леташні дзёран. У такім стане папар пакідалі да канца першых сенакосаў. За гэты час дзёран разам з гноем «падаправаў» і разбураўся, а з ім згнівала і трава, што вырасла на папары.

Управіўшыся з сенакосамі на балоцістых месцах, папар баранавалі, расцярэбліваючы «ўзмёты» і прыводзячы поле ў стройную «раўнядзіну». Пасля папар зноў пакідалі на тры-чатыры тыдні, пакуль займаліся другім сенакосам. У канцы ліпеня папар другі раз аралі («мяшалі») сахою. «Мяшанне» рабілі на большую глыбіню, чым заворванне гною, бо пры мелкім ворыве не адбывалася перамешванне зямлі і згніўшага гною, а пры



Пасадка бульбы спосабам «пад шапку»: селянін арэ зямлю на валах, жанчына кідае ў баразну бульбу, хлопчык зграбае на бульбу гной.
Пачатак XX ст. Заходняе Палессе. Фота Э. Яленскай

аднолькавай глыбіні «мяшання» з узмётам папару часткі гною, ржышча, травы, якія не паспелі згніць, былі б вывернутыя наверх. Дзякуючы таму, што зямля добра «ўпрэла» і была дастаткова разрыхленай першым ворывам і баранаваннем, «мешань» ішла ўдвая хутчэй і яе звычайна заканчвалі за адзін-два тыдні да Спаса. Па гэтай «мешані», даўшы зямлі «адляжацца», сеялі азімае жыта ў тры паўсюдна вядомыя тэрміны: ад 7 да 15 жніўня па старым стылі (ранняя сяўба), ад 16 да 29 жніўня (сярэдняя) і ад 1 да 14 верасня (позняя сяўба)[116]. Сярэдні і позні тэрміны сяўбы лічыліся ненадзейнымі і называліся «хвашчавымі». Сяляне казалі: «Ранняя сяўба часам падманяе, а позняя — ніколі: ураджай ад яе заўжды кепскі».

Выключная шкоднасць позніх тэрмінаў сяўбы жыта заключалася ў тым, што яно не паспявала восенню прайсці ўсе належныя фазы развіцця і праходзіла іх вясной. Гэта адсоўвала час надыходу жніва, якое ў такім выпадку супадала з уборкай яравых культур і лёну, выклікаючы напружанне з чаргаваннем работ і размеркаваннем працоўнай сілы.

У Барысаўскім павеце Мінскай губерні сяляне ніколі не сеялі жыта пасля 15 верасня, хаця ў паўднёвых паветах гэтай жа губерні рабілі гэта да пачатку кастрычніка[117]. На Магілёўшчыне галоўная, найбольш масавая сяўба жыта адбылася пасля 15 жніўня паміж святамі Спас і Прачыстая [118]. Але пачатак і заканчэнне сяўбы шмат у чым залежалі ад кліматычных умоў года, таму сяляне гаварылі: «Хто з календара сеіць, той мала веіць, а хто глядзіць на месяц, той у дяжыня месіць»[119].

Для сяўбы жыта выкарыстоўвалі насенне з найлепшага ўчастка поля з апошняга ўраджаю. Яго часта не сушылі ў ёўні (асеці), а вымалочвалі акалотам (хвастаннем) аб край бочкі або спецыяльнай рашоткі, бо пры малацьбе цэпам частка зерня драбілася. На Спаса ў царкве асвячалі дажынкавы вянок або каласы з дажынкавага снапа, зерне з якіх абавязкова змешвалі з насенным жытам.




Сяўба жыта. Аляксандр Тарасевіч. «Кастрычнік».
Ілюстрацыя да кнігі «Малітвы Маці Боскай Марыі...». 1672–1677 гг.

Сяўба азімага жыта, якое з'яўлялася галоўным прадуктам харчавання і асноўнай збожжавай культурай сялянскай гаспадаркі цягам многіх стагоддзяў, суправаджалася ў беларусаў асабліва шматлікімі элементамі земляробчай магіі. Засеўкі жыта адбываліся ўрачыста.

Ехалі на «засеўкі» як мага раней, калі вёска яшчэ спала, таму што баяліся, каб хто-небудзь не перайшоў дарогі, не сустрэлася баба з пустым вядром, бо тады на ніве будзе шмат прагалін, пустых, незасеяных мясцін.

Пасля заканчэння першага дня сяўбы («засевак») спяшаліся дадому, дзе гаспадыня ладзіла святочную вячэру, на якую запрашалі радню і суседзяў. Гаспадары стараліся, каб на стале ўсяго было ўдосталь дзеля таго, каб ніва была ўраджайнай[120].

На Гродзеншчыне, перад тым як ехаць сеяць жыта, селянін мыўся, надзяваў чыстую кашулю (каб жыта было чыстае), еў кашу (каб жыта было густое), браў з сабой ў поле хлеб, які называўся «засеванным» і які пасля прыезду з нівы дадому з'ядаўся ўсёй сям'ёй, клаў у калёсы мяшок з зернем, невялікі пучок саломы і кошык гною.

Падрыхтаваўшы ўсё, селянін ішоў у хату, маліўся Богу і ад’язджаў у поле. На сваёй паласе ён зноў маліўся і са словамі «Благаславі, Божа!» прыступаў да сяўбы.

Пасеяўшы і забаранаваўшы насенне, сейбіт рассцілаў прывезеную салому ўпоперак сваёй паласы («каб жыта расло-гнулася»), а па краях разасланай саломы раскідваў прывезены ў кошыку гной («каб ён краў ад Бога ўраджай»). Затым сахой ён праворваў невялікі крыж на ніве, маліўся зноў Богу і вяртаўся дадому, дзе гаспадыня прыгатавала святочную вячэру, на якой абавязкова павінен быў быць курыны суп, бульбяная каша, гарэлка і сыр на закуску. Такім жа чынам, як і «засеўкі», адзначалі і канец сяўбы — «дасеўкі»[121].

На Віцебшчыне поле, на якім збіраліся сеяць жыта, ніколі не аралі ў пятніцу. Паводле сведчання М. Я. Нікіфароўскага, збіраючыся сеяць жыта, селянін гатаваў насенне (сёміны) з вечара і ўкладваў яго разам з «сівалкый» і адным-двума кулямі саломы на калёсы; выязджаў на поле на досвітку ваколічнай дарогай, каб пазбегнуць непажаданых сустрэч. Прыехаўшы на сваю паласу, ён азіраўся, ці няма сведкаў, і, пераканаўшыся, што паблізу нікога няма, хуценька ставіў мяшкі з насеннем на мяжу ці на самай сярэдзіне нівы, насыпаў з мяшка першую сявалку, разбавіўшы «зярняты» жменяй-дзвюма пасвечанага на Спаса жыта, якое прывозіў з сабою ў вузельчыку за пазухай[122].

Змяшаўшы ў сявалцы пасвечанае зерне жыта з насенным, сейбіт прыгладжваў яго рукой і перахрышчваў. Потым прывязваў да вушка сявалкі загорнуты ў палатно кавалачак артаса (царкоўнага хлеба) або дабравешчанскую просвіру. Калі паблізу нікога не было, надзяваў пачопку ад сявалкі праз галаву на шыю і ішоў да месца пачатку сяўбы. Першыя дзве жмені насення ён раскідваў крыжападобна ў вуглу поля, а потым пачынаў сеяць, ідучы раўнамерным крокам прама па загону і кідаючы зерне жменяй правай рукі то направа, то налева, стараючыся не зрабіць прабелу (абсеву) на якім-небудзь месцы поля[123].

Сеялі жыта звычайна ў поўню, каб каласы былі поўнымі. Асабліва спрыяльнымі днямі для сяўбы ў Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні лічыліся субота і аўторак. Тут існаваў звычай, што першым ў вёсцы павінен быў пачынаць сеяць жыта гаспадар, у якога, паводле меркавання аднавяскоўцаў, была «лёгкая рука». Той, каго прасілі гэта зрабіць, ехаў у поле з боханам хлеба, чыстым абрусам і часта з бутэлькай гарэлкі. На полі ён рассцілаў абрус, клаў на яго хлеб і, стаўшы на калені, маліўся Богу, потым асяняў крыжам раллю і са словамі: «Божа, радзі!» пачынаў сеяць[124]. Лічылася, каб прыцягнуць ураджай на сваё поле, трэба сеяць пасля суседзяў. Таму на Віцебшчыне сяляне часта выходзілі сеяць жыта разам з суседзямі[125].

Калі на Віцебшчыне ніколі не сеялі жыта ў пятніцу, то на Гродзеншчыне, наадварот, сеялі па панядзелках, пятніцах і суботах. У сераду, чацвер і аўторак не сеялі, таму што ў назвах гэтых дзён ёсць літара «р» і лічылася, што рунь будзе есці чарвяк[126]. Не сеялі і ў дні, калі вечарам і раніцай на небе паказваўся месяц, бо лічылі, што пасеянае пры месяцы насенне не ўзыдзе або ўзыдзе вельмі рэдка[127].

На добра ўгноенай глебе сеялі больш рэдка, лічачы, што зерне на ёй хутка кусціцца, а на няўгноеных палях сеялі гусцей у перакананні, што бедная на спажыўныя рэчывы глеба не можа добра забяспечыць усім

раслінам паўнацэннае развіццё і частка з іх гіне: «Рэдка сеяць — лёгка веяць»[128], «Каб не было пуста, трэба сеяць густа»[129]. Выходзячы з гэтых меркаванняў, сяляне высявалі на сваіх палетках значна больш насення, чым на памешчыцкіх землях[130].

Колькасць збожжа, якое неабходна было для сяўбы, залежала і ад уласцівасцей глебы. На лёгкіх глебах высявалі менш насення, на цяжкіх — больш. Напрыклад, на пясчанай глебе на 1 морг высявалася 1 асьміна жыта (18 гарцаў), а на чарназёме і гліне — да 2 асьмін і васьмі гарцаў[131].



Гаспадар з сявалкай на шыі са жмені кідае перад сабой насенне. Фота Э. Яленскай

Завяршальным этапам сяўбы азімага жыта лічылася «ляшэнне» — правядзенне сахою баразнаў то ўздоўж, то ўпоперак поля і абвод поля ўкругавую ўздоўж межаў глыбокай баразной для стоку вады. На нізкіх месцах «лехі» праворвалі больш густа, на пагорках — толькі па схіле зверху ўніз. Закончыўшы араць глыбокую кругавую (па перыметры поля) «леху», сейбіт праводзіў у вуглу поля дзве кароткія (каля сажані) крыж-накрыж «лешкі», хрысціў рукою засеянае поле і толькі тады лічыў сяўбу закончанай[132]. Да свята Багача трэба было, паводле існаваўшай у сялян традыцыі, закончыць апрацоўку зямлі пад сяўбу азімых культур: «Прыйшоў Багач — кідай рагач (саха. — *Аўт.*), бяры сявеньку ды сей памаленьку».

Пры прыгоннай залежнасці многім сялянам, занятым на памешчыцкіх работах, даводзілася адкладваць сяўбу азімых на сваіх надзелах да кастрычніка. Але пасеянае ў гэты час жыта ўзыходзіць не раней

як праз 16 дзён, а пасеянае своечасова пры цёплым надвор'і і на добра змочанай даждж ом зямлі — праз чатыры дні[133].

Пасеяць у найбольш спрыяльны тэрмін было вельмі важна, бо часам ранішняя і вячэрняя сяўба ў адзін і той дзень давалі значную розніцу ва ўраджаі[134]. Сяляне былі ўпэўнены, што «днём раней пасееш — тыднем раней сажнеш»[135].

У канцы XIX ст. на складах земляробчых машын і прылад з'явіліся ў продажы некалькі відаў ручных і конных сеялак. Аднак большасць ручных сеялак не адпавядалі патрабаванню раўнамернасці сяўбы: іх работа залежала ад велічыні і вагі зерня, сілы ветру і г. д. Лепш сябе зарэкамендавала радковая конная сеялка Экерта[136].

Пасля зімы селянін увесь час сачыў за станам жытняй нівы. Калі ў нізінах застойвалася вада, то па вырытых канаўках яе спускалі за межы поля. Месцы, дзе жыта ўсё ж такі гінула ад вымакання, засявалі іншымі культурамі, каб зямля не зарастала пустазеллем.

Догляд за палявымі збожжавымі культурамі заключаўся ў праполцы пасеваў па меры іх зарастання пустазеллем. Гэта быў цалкам абавязак жанчын і дзяўчат-падлеткаў. І. А. Сербаў пісаў: «З ранняй вясны і да самага жніва «поркаюцца» яны з рання да вечара то ў гародзе на градах, то на полі на палосах. Поліва лічыцца адной з самых цяжкіх і марудных работ, таму што пры гэтай працы работніца ўвесь час знаходзіцца ў згорбленым, альбо паўзучым, стане, амаль без жаднага руху»[137]. Работа гэтая была сапраўды катаржная, але жанчыны, змалку ўцягнутыя ў яе, заўжды чыста выполвалі лён, проса, бульбу, а часам і ўсе яравыя пасевы[138].

Догляд за бульбай заключаўся з праворванні акучнікам міжраддзяў для вынішчэння пустазелля і рыхлення глебы. Калі бульба вырастала вяршкі на чатыры, акучвалі яе сахой, у якой паліцу здымалі з сашніка і ўціскалі паміж сашнікамі. Саху пускалі паміж двух радоў бульбы. Каб конь пры працы не забіраў у бок і не псаваў бульбяных радоў, яго за повад вёў хлопчык.



З абедам да бацькі ў поле. Вёска Капліцы Мінскай губерні. 1905 г. Фота В. К. Косткі

Аралі неглыбока, сочачы, каб зямля з баразны прывальвалася да кустоў бульбы, але не завальвала іх зусім. Кусты, абваленыя зямлёй, апраўлялі рукамі. Другое такое ж праворванне рабілі праз два тыдні пасля дня Святога Пятра, калі зноў пачынала расці трава, але на гэты раз яго рабілі глыбей і шырэй. За лета акучванне паўтаралі тры або чатыры разы. Прыблізна за месяц да ўборкі, як толькі бульба зацвітала, яе пакідалі ў спакоі[139]. У канцы XIX — пачатку XX ст. на большай частцы тэрыторыі Беларусі сяляне садзілі бульбу ўжо за плугам праз баразну, а для абворвання выкарыстоўвалі спецыяльныя сошкі[140].

Для аховы жытняга пасеву ад непажаданых кліматычных умоў сяляне на Віцебшчыне на Вербніцу хадзілі на жытняе поле і ўтыкалі ў зямлю асвечаную галінку вярбы. На Фамін тыдзень закопвалі на ніве рэшткі «свянцонага» на Вялікдзень: косткі, фарбаваныя яечныя лушпайкі і крошкі. Потым хадзілі паглядзець, «ці хуваіцца варона ў жыці на Міколу, ці ўзнялося яно па калені на Узнясенне, ці каласіцца на Сёмуху, ды як красуіцца, ці ядрона наліваець?». Калі ў такім выпадку ў селяніна пыталіся, дзе ён быў, то ён адказваў: «Жыццо праведаў, у госці к жыццу хадзіў»[141].

Сяляне Гродзенскай губерні таксама на Вялікдзень не выкідвалі косткі, якія засталіся ад святочнага стала, а захоўвалі іх да свята Юр'я. У гэты дзень гаспадар на золаку загортваў іх у чысты ручнік і па расе абыходзіў сваю жытнюю ніву. Ва ўсіх чатырох вуглах поля ён утыкаў косткі, хрысціўся і прыгаворваў: «Дай жа, Божа, і святы Еры, каб ніва мая ў гэтым року ня бачыла граду, ні навальнага дажджу! Ай, святы Еры, памагай мне!»[142].

Абход жыта меў на мэце усталяванне вакол свайго поля магічнай мяжы (магічнага кола), якая выконвала апатрапейныя функцыі. Абход адбываўся з хлебам у руках, што таксама мела магічны сэнс дабратворнага ўплыву на ніву, аховы яе ад высыхання, граду. Гэтай мэце служыла і абрадавае качанне па жыце. М. В. Доўнар-Запольскі ў сваёй працы «Заметкі з падарожжа па Беларусі» прыводзіць цікавую размову старога палешука, які павучаў сына, што збожжа дало высокую і тоўстую салому і ломкае зерне з прычыны таго, што перасталі выконваць стары звычай у дзень святога Юр'я — выходзіць на досвітку ўсёй сям'ёй на поле і качацца па жыце[143].



Смычковая сеялка-шпурлялка ў час працы



Жанчына ў полі на праполцы проса. Вёска Вічын Пінскага павета Мінскай губерні. Фота І. А. Сербава

Паводле меркавання Г. А. Барташэвіч, веснавыя песні юраўскага цыкла «Дзе ты, Юр'я, расіўся» і «А ты, Юр'я, Мікола, абыдзі жыта паўкола» былі звязаны з гэтым абрадавым абходам і жаданнем забяспечыць ураджай:

*У роўным полі капамі,*
*У цёмным гумне тарпамі,*
*А ў свірне засякамі,*
*А на стале баханамі*[144].

Наогул ва ўсіх абрадавых песнях кожнага веснавога цыкла — юраўскіх, велікодных, траецкіх — пажаданы ўраджай гіпербалізуецца, у чым яскрава праяўляюцца элементы аграрнай магіі[145]:

*Радзі, божа, жыта*
*Чыста, ядраніста,*
*Ядро з вядро,*
*Каласок з піражок.*
*Да з каласочка*
*Будзе жыта бочка,*
*Да [з] каласінкі*
*Будзе ў паўасьмінкі*[146].

Вельмі важным і адказным для сялян быў перыяд красавання (цвіцення) жыта. Калі ў гэты час некалькі дзён запар не было ветру і жыта не апылялася, то, каб не дапусціць пустакалосіцы, гаспадар з кім-небудзь з сям'і ў сонечны дзень пасля знікнення расы хадзіў па полі і працягваў па каласах нацягнутую вяроўку, якая страсала пыльнікі жыта і апладняла расліны[147].

У час красавання жыта на Палессі жанчыны не бялілі палотны і не мылі адзення, «коб кожны жытні колос бэз поры не побэлеў і не посох»[148].

[1] Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этнографический очерк. Гродно, 1895. С. 103.

[2] Цытрон Г., Шибут Л., Матыченкова О. Плодородие почв Беларуси // Белорусское сельское хозяйство. 2015. № 9. С. 76–77.

[3] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 137а. Арк. 18.

[4] Тамсама. Арк. 19.

[5] Пяткевіч Ч. Грамадская культура Рэчыцкага Палесся / пер. з пол. У. Васілевіча і Л. Салавей. Мінск, 2015. С. 48–50.

[6] Тамсама. С. 48.

[7] Зеленский И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Минская губерния. Ч. 2. СПб., 1864. С. 9. (Далее: Зеленский И. Минская губерния.)

[8] Село Климово и его хутора Бельского и Духовщинского уездов Смоленской губернии // Сельское хозяйство и лесоводство. СПб., 1891. Т. 168. С. 22.

[9] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности (этнографические данные). Витебск, 1895. С. 440.

[10] Валодзіна Т. В., Кухаронак Т. І. «Ядронае жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях. Мінск, 2015. С. 214–215.

[11] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом ... состоянии: в 3 кн. / сост. по программе и под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 2. Могилев, 1884. С. 819.

[12] К. Д. Быт белорусского крестьянина, его средства и потребности // Экономические записки. Хозяйственная газета. Еженедельное прибавление к журналу «Труды Императорского Вольного экономического общества». 1862. № 21. С. 164–165.

[13] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2. СПб., 1863. С. 29. (Далее: Бобровский П. Гродненская губерния.)

[14] Голубеў В. Гаспадарча-этнаграфічнае апісанне Ашмянскага павета 1839 г. // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Ашмяны і Ашмянскі рэгіён: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі; Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2015. С. 273.

[15] Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник. СПб., 1894. Ч. 3: Пословицы. С. 136.

[16] Сборник белорусских пословиц, составленный И. И. Носовичем. СПб., 1874. С. 65.

[17] Ахрыменка П., Буцько М. Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі. Гомель, 1957. С. 97.

[18] Federowski M. Lud Białoruski na Rusi Litewskiej. T. IV. Warsawa, 1935. S. 149; Сборник белорусских пословиц, составленный И. И. Носовичем. С. 153.

[19] Кудринский Ф. Белорусы (Общий очерк) // Виленский календарь на 1905 г. Вильно, 1905. С. 106.

[20] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края...: соч. в 3 т. Т. 1. Ч. 1. СПб., 1887. С. 140–141.

[21] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 7. Воп. 2. Спр. 58. Арк. 7.

[22] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. СПб., 1902. С. 227.

[23] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Быт белоруса. Вильно, 1912. Вып. 8. С. 179.

[24] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. М., 1874. С. 91.

[25] Там же. С. 92.

[26] Цітоў В. С. Провідкі // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 411–412.

[27] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. С. 91.

[28] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 228, 243.

[29] Сборник белорусских пословиц, составленный И. И. Носовичем. С. 135.

[30] Прыказкі і прымаўкі: у 2 кнігах / рэд. А. С. Фядосік. Кн. 1. Мінск, 1976. С. 126.

[31] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 227.

[32] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 445.

[33] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 228.

[34] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 179.

[35] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 243.

[36] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 829.

[37] Корева А. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Виленская губерния. СПб., 1861. С. 438. (Далее: Корева А. Виленская губерния.)

[38] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 831.

[39] Там же. С. 832.

[40] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 2. С. 483.

[41] Там же.

[42] Прыказкі і прымаўкі. Кн. 1. С. 115.

[43] Тамсама.

[44] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 830.
[45] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 29.
[46] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 832.
[47] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 446.
[48] Там же.
[49] Зеленский И. Минская губерния. Ч. 1. С. 338.
[50] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 44.
[51] Там же. С. 78.
[52] Там же. С. 79.
[53] Прыказкі і прымаўкі. Кн. 1. С. 124.
[54] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў / рэд. В. К. Бандарчык. Мінск, 1974. С. 47–49.
[55] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 5. Воп. 11. Спр. 225. Арк. 10.
[56] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 49.
[57] Венік, звязаны ў Чысты чацвер перад Вялікаднём.
[58] Сербаў І. А. Вічынскія паляне: матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся. Мінск, 1928. С. 61.
[59] Тамсама.
[60] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 228.
[61] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 46.
[62] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 443.
[63] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 12.
[64] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 12.
[65] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 46.
[66] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 443, 447.
[67] Там же. С. 443.
[68] Там же. С. 444.
[69] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 349.
[70] Зеленский И. Минская губерния. Ч. 2. С. 12; Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палессе / пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. Мінск, 2004. С. 87.
[71] Зеленский И. Минская губерния. Ч. 2. С. 12.
[72] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 445.
[73] Сербаў І. А. Вічынскія паляне... С. 61.
[74] Афанасьев Д. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Ковенская губерния. СПб., 1861. С. 371. (далее: Афанасьев Д. Ковенская губерния.)
[75] Сборник белорусских пословиц, составленный И. И. Носовичем. С. 65.
[76] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 31.
[77] Там же.
[78] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 1. С. 424.
[79] Афанасьев Д. Ковенская губерния. С. 215.
[80] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 32.
[81] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 854; Корева А. Виленская губерния. С. 435.
[82] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 854.
[83] Там же.
[84] Там же. Кн. 1. С. 423.
[85] Корева А. Виленская губерния. С. 435.
[86] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. С. 96.
[87] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 44; Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 854.
[88] Афанасьев Д. Ковенская губерния. С. 215.
[89] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 854.
[90] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч.2. С. 31.
[91] Там же. С. 32.
[92] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 446.
[93] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 855.
[94] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 32.
[95] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 855.
[96] Там же.
[97] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 34.
[98] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 350.
[99] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 34.

[100] Корева А. Виленская губерния. С. 435.
[101] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 207.
[102] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. С. 96.
[103] Там же.
[104] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 34.
[105] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 190.
[106] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 447.
[107] Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 859.
[108] Там же. С. 862.
[109] Там же. С. 861.
[110] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 859.
[111] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 14.
[112] Земледельческая газета. 1885. № 11. 16 марта. С. 222–223.
[113] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 12. Спр. 22а. Арк. 21.
[114] Шелехов Д. О паре или гулевой земле в полеводстве. СПб., 1813. С. 12.
[115] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 29.
[116] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 441–442.
[117] Зеленский И. Минская губерния. Ч. 1. С. 341.
[118] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 59.
[119] Там же.
[120] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. С. 93.
[121] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 245.
[122] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 442.
[123] Там же. С. 442–443.
[124] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. С. 93.
[125] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 229.
[126] Там же. С. 245.
[127] Там же. С. 229.
[128] Прыказкі і прымаўкі. Кн. 1. С. 129.
[129] Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры / склад. В. А. Захарава; пад рэд. Р. Р. Шырмы. Мінск, 1973. С. 250.
[130] Афанасьев Д. Ковенская губерния. С. 371.
[131] Корева А. Виленская губерния. С. 436.
[132] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 444–445.
[133] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 30.
[134] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 442.
[135] Прыказкі і прымаўкі. Кн. 1. С. 124.
[136] Земледельческая газета. 1886. № 8. 22 февраля. С. 152.
[137] Сербаў І. А. Вічынскія паляне... С. 62.
[138] Тамсама.
[139] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 3 (1841 г.).
[140] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 14.
[141] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 445.
[142] Шейн П. В. Материлы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 247.
[143] Запольский М. Заметки из путешествия по Белоруссии // Виленский вестник. 1891. № 28.
[144] Барташэвіч Г. А. Веснавыя абрады і песні // Веснавыя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, В. І. Ялатаў; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. Мінск, 1979. С. 22.
[145] Тамсама. С. 17.
[146] Тамсама. С. 168.
[147] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 112. Арк. 49.
[148] Сербаў І. А. Вічынскія паляне... С. 62.



# УБОРКА, АПРАЦОЎКА І ЗАХАВАННЕ ЎРАДЖАЮ



Да ўборкі збожжавых сяляне прыступалі ў залежнасці ад ступені спеласці той ці іншай культуры, стану надвор'я і занятасці іншымі неадкладнымі работамі, бо сенакос, жніво і сяўба азімых часткова ішлі паралельна.

У розных геаграфічна-кліматычных рэгіёнах Беларусі існавалі мясцовыя, найбольш рацыянальныя тэрміны пачатку і заканчэння ўборкі кожнай палявой культуры, выпрацаваныя стагоддзямі земляробчай практыкі сялян.

Першым са збожжавых культур паспявала жыта. На поўдні Беларусі да яго жніва звычайна прыступалі з дня святых апосталаў Пятра і Паўла (29.06/12.07)[1], а ў цэнтральных і паўночных раёнах — на некалькі дзён пазней. Калі надвор'е не дазваляла пачаць жніво раней, то апошнім тэрмінам пачатку жніва лічыўся дзень святога прарока Іліі (Ілля) (20.07/02.08), аб чым сведчаць народныя прыказкі і прымаўкі: «Святая Ілля — слаўна жняя», «Ілля жніво пачынае, а лета канчае»[2].

Да жніва сяляне рыхтаваліся з урачыстасцю і стараннасцю, бо спакон веку жыццё беларусаў і іх дабрабыт былі звязаны з ураджайнасцю жытняга палетка.

Перад пачаткам жніва гаспадыня прыбірала хату, як перад вялікім святам: вымывала падлогу, бажніцу, вокны, лавы, стол засцілала белым абрусам і клала на яго хлеб. Гаспадар чысціў і наводзіў парадак на двары і ў гумне. Жанчыны спяшаліся вымыць і прыгатаваць да жніва сабе і мужу лёгкае адзенне, новыя лапці і белыя анучы, бо выходзіць на жніво па старадаўняй традыцыі трэба было ва ўсім чыстым і па-святочнаму апранутымі.

Перш чым прыступіць да жніва селянін абходзіў сваю ніву і пільна ўглядаўся, ці няма на ёй «залому» («завіткі», «закруцеі») — жмені закручаных, звязаных і таму высахшых каласоў. Лічылася, што заломы рабілі на ніве «ліхія» людзі, якія падчас іх «завівання» вымаўлялі заклінанне або праклядце. Па народным павер'і, калі не знайсці дасведчанага чараўніка, які можа зняць праклён, то «залом» прынясе найвялікшае няшчасце[3]. Знаходжанне ў жыце залома прадвяшчала смерць гаспадару або гаспадыні нівы, падзеж жывёлы ці іншую якую-небудзь вялікую бяду, зробленую ведзьмаром.

Спробы прычынення шкоды суседзям пры дапамозе заломаў вядомы на Беларусі здаўна. Так, згодна дакументам, яшчэ ў 1687 г. прыгонныя людзі памешчыкаў Прысецкіх «во ржи местах въ двадцати с лишкомъ поделали заломы» ў полі Хрызастома Нямiравiча Шчыта, у сувязі з чым быў скліканы народны суд навакольных сялян — капа[4].

Сяляне вельмі баяліся заломаў. Ужо ў купальскіх абрадавых песнях абаронцам жытніх ніў ад ведзьмароў-шкоднікаў выступаў святы Ілля:

*Звала Купала Ільлю на ігрышча:*
*«Хадзі, Ільлішча, ка мне на ігрышча».*
*«Не маю часу, Купалічка,*
*У гэту ночку мне не спаці,*
*Нада жыта ўсяго пільнаваці,*
*Каб змія заломаў не ламала,*
*У жыці карэння не капала...»*[5]

Пры выяўленні на ніве залому звярталіся за дапамогай да святара або знахара. Святар па просьбе селяніна надзяваў эпітрахіль, браў крыж, ішоў у поле, дзе знаходзілася «завітка», і там чытаў належныя малітвы, акрапляў «завітку» святой вадой і, абгарнуўшы руку эпітрахіллю, пры дапамозе крыжа вырываў «завітку». Потым ён зноў чытаў малітвы і спальваў яе[6]. Некаторыя сяляне прасілі мясцовага знахара за пэўную плату «адрабіць» залом. Знахар на полі каля залому крычаў, свістаў, вымаўляў спецыяльныя замовы, а затым з дапамогай асінавага кала[7] вырываў яго з зямлі са словамі: «Няхай у таго чалавека, які зрабіў закруцень, раскідаецца гаспадарка, як я раскідаю закруцень!»[8]

Пакуль шукалі «моцнага ведзьмака», які ўзяўся б адрабіць заклядце, жняя абжынала залом, пакідаючы наўкол яго каля двух аршынаў нязжатых жытніх сцяблоў. «Часам, — пісаў А. К. Сержпутоўскі, — да позняй восені ў полі віднеюцца такія шматкі нязжатага збожжа»[9]. У некаторых месцах сяляне абкладалі «заломку» сухой саломай і спальвалі яе на месцы ў полі[10].

Яшчэ адной небяспекай, «зробленай» чараўнікамі і ведзьмамі, жыхары Кобрынскага павета Гродзенскай губерні лічылі «абжатыя» загоны. Нібыта ў пару красавання жыта ноччу аголеныя ведзьмы і чараўнікі хадзілі па палях і на кожным зжыналі па некалькі сцяблін, якія хавалі ў сваіх гумнах. Дзякуючы гэтаму нячыстая сіла ў час перавозкі снапоў з поля пераносіла ў гумно чараўніка значную частку чужога ўраджаю. Калі ж неспрактыкаваны чараўнік ноччу замест жыта абжынаў куст, то восенню яго гумно напаўнялася лісцем і галінкамі[11].

Па меркаванні сялян жаць жыта трэба было пачынаць, калі колас і верхнія калены саломіны былі яшчэ пругкімі. Пры гэтым верхняе калена захоўвала зеленаватую афарбоўку, а калены ніжэй верхняга пераходзілі ўніз ад жоўта-зялёнага колеру да абсалютна жоўтага каля зямлі.



Жніво ў ваколіцах Навагрудка. 1887 г. Малюнак Ф. Бжазоўскага

Зжатае ў такім стане спеласці і пакінутае на пожні ў бабках для дасушкі жыта не асыпалася. Але пры сухім спякотным надвор'і такі стан спеласці жыта за пяць-сем дзён пераходзіў у «поўную» спеласць і нават у «пераспеласць», што суправаджалася частковым асыпаннем зерня[12].

Пры недахопе працоўных рук жыта або пшаніцу прыходзілася жаць у перастоеным стане, тады жняя старалася вязаць снапы па магчымасці буйнай вязі, а гаспадар спяшаўся ў той жа дзень пад вечар, калі выпадзе раса, або на наступны дзень зранку, пакуль зжатае збожжа не абсохла ад расы і захоўвала «вахкасць», звезці яго ў гумно, заслаўшы посцілкамі калёсы, каб не траціць зерне, якое высыпалася са снапоў па дарозе[13].

Прыладай для ўборкі збожжавых культур (жыта, пшаніцы, ячменю, аўса, проса і інш.) у беларусаў, як і ва ўсіх славянскіх народаў, на працягу многіх стагоддзяў служыў жалезны серп з выгнутым паўкруглым або авальным лязом. Рабочы край ляза зазубрываўся. На тонкі завостраны стрыжань у канцы ляза насаджвалі кароткую драўляную ручку. Сярпы выкоўвалі мясцовыя кавалі[14]. З канца XIX ст. большасць сярпоў, якімі карысталіся сяляне, была выраблена ўжо на заводах, шмат іх завозілася на Беларусь з Расіі[15]. Жніво было жаночай працай. Мужчыны браліся за серп толькі ў выпадку хваробы гаспадыні або адсутнасці яе ў сям'і.



Хлебная ніва

Для сялян гэта была доўгачаканая і адказная пара. Ад таго, наколькі паспяхова селянін спраўляўся са жнівом, залежала забяспечанасць яго сям'і ў зімовы перыяд асноўнымі прадуктамі харчавання, а хатняй жывёлы — кормам. Вырашчаны ўраджай трэба было ўбраць так, каб не высыпалася долу пераспелае зерне, па надвор'і высушыць снапы і скласці ў гумне. Сяляне гаварылі: «Не той хлеб, што на полі, а той, што ў гумне»[16], «Жнуць парой, а жуюць зімой»[17].

Ва ўборцы ўраджаю прымалі актыўны ўдзел усе групы вясковага насельніцтва: мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці. Жанчыны звычайна жалі, старыя і падлеткі вязалі снапы і складалі ў копы, а мужчыны звозілі іх у гумно. Калі ў гэты час стаяла добрае надвор'е, то за тры-чатыры тыдні ўсё поле зжыналася[18].

На Беларусі жніво жыта ўключала тры паслядоўныя этапы: зажынкі, жніво і дажынкі, якія суправаджаліся комплексам разнастайных поліфункцыянальных абрадаў і звычаяў. Пачатак жніва («зажынкі», «зажон») і яго заканчэнне («дажынкі», «дажон») сяляне абавязкова ўрачыста адзначалі святочнымі абедамі і вячэрамі, суправаджалі разнастайнымі абрадамі з выкарыстаннем аграрнай магіі.



Жнеі. Мястэчка Любашоў Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

Зажынаць жыта сялянкі ішлі па традыцыі заўжды ў суботу ці аўторак у святочным адзенні, памаліўшыся дома перад іконай. На ніве яны прасілі боскага благаслaverення на пачатак работы[19] і абстаўлялі зажынкі рознымі абрадамі, карані якіх ішлі ад сівой даўніны. Калі жняя, ідучы зажынаць жыта, сустракала па дарозе чалавека з балячкамі або з касою, то трэба было «зачураваць» сябе ад бяды, інакш, лічылі палешукі, у час жніва часта будуць здарацца парэзы рук з гнілымі ранамі[20].



Жнеі. Вёска Вуйвічы Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава



Заточка (зубрэнне) сярпоў. Пачатак XX ст.



Асноўныя тыпы сярпоў. Малюнак С. Ц. Гунько

У Гомельскім павеце Магілёўскай губерні ў дзень зажынак жняя нажынала толькі адзін сноп жыта, які прыносіла дадому і ставіла на покуці пад іконамі як ахвяру Богу. На світанні наступнага дня яна зноў ішла на ніву ў святочным адзенні і, прыступаючы да жніва, малілася Богу: «Госпадзі, благаславі пачаць жаць і памажы ў добрым здароўі кончыць»[21]. Першы «зажыначны» сноп жыта стаяў у хаце да таго часу, пакуль не стануць звозіць жыта ў гумно[22]. Зерне з яго потым прымешвалі да насеннага жыта[23].

У Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні перад пачаткам жніва гаспадыня засцілала стол чыстым белым абрусам і клала на яго хлеб і соль, запальвала перад іконай свечку і з зямнымі паклонамі малілася Богу. Ідучы на ніву зажынаць жыта, брала з сабою «ў ношку» лусту хлеба, соль, кавалак сала і свечку. На полі, памаліўшыся Богу, віталася з нівай: «Добры дзень, ніўка, ядранае жыта! Я к табе прышла!» А нажаўшы першы сноп, гаварыла: «Стаўлю сноп на сто коп, на тысячу мерак!» Затым клала зажыначны сноп на зямлю і падкладвала пад яго сваю «ношку» з ежай. Пасля гэтага прыступала да жніва[24].

На Палессі, ідучы зажынаць жыта, жняя набірала чыстую вярэньку хлеба-солі, кусок сыру і з сярпом на плячы накіроўвалася на поле. Там яна займала «па коласу постаць»[25], нажынала першую жменю і рабіла з яе «перавясла», якое клала на мяжы каля вярэнькі. Перахрысціўшыся на ўсход, жняя бралася за работу. Звязаўшы першы сноп, яна ставіла яго перад сабою, прыказваючы: «Стой, мой сноп, на дзесяць коп і на сорак мэрок!» Затым нажынала яшчэ 60 снапоў і складала іх у тры «бабкі». Закончыўшы працу, першы сноп загортвала ў чысты ручнік і несла да хаты, дзе ставіла яго на куце. Увечары за вячэрай хлеб-соль і сыр, якія жняя насіла на поле, дзяліліся паміж усімі членамі сям'і[26].



Сялянская сям'я ідзе ў поле на жніво. Вёска Старыя Коні Пінскага павета Мінскай губерні. 1933 г. Фота Д. Георгіеўскага

На Віцебшчыне на «зажон» (зажынкі) жыта жняя ішла ў суботу пад вечар, апрануўшыся ў чыстае адзенне і ў святочным абутку. З сабою брала што-небудзь з ежы, сярод якой абавязкова быў сыр. На ніве, зрэзаўшы сярпом першыя «каліў дзесяць Богу», яна клала іх крыжападобна і тут жа садзілася, каб крыху падсілкавацца. Затым бесперапынна нажынала цэлую «бабку» (дзесяць снапоў), ставіла іх на зжатым участку і на месцы, дзе ляжалі «каліў дзесяць Богу», зноў падсілкоўвалася. Рэшткі ежы яна клала на «матку» (верхні пакрышны сноп «бабкі») і, забраўшы «калівы», са жніўнай песняй вярталася дадому. Прынесеныя «калівы» памяшчаліся ў хаце на покуці «ў бажніцы»[27].

Першыя зжатыя ў час зажынак каласы жнеі клалі крыж-накрыж у зажыначным вугле нівы, выражаючы ўдзячнасць Богу за ўраджай і веру ў засцерагальную моц крыжа супраць выкрадання злымі людзьмі «спора»[28].



На працу ў поле. Канец XIX – пачатак XX ст.



Жніво. Мужчына вяжа для жней «вязьмо» для снапоў. Заходняе Палессе. 1930-я гг.
Фота Ю. Абрэмбскага



Сялянкі ў час палявых работ каля калыскі, падвешанай у полі на «пяло» (трох жэрдках). Вёска Бучын Пінскага павета Мінскай губерні

У Слонімскім павеце Гродзенскай губерні, калі ў сям'і была нявестка, якая ўпершыню ішла з гэтай хаты жаць, то ў дзень зажынак, апрануўшыся па-святочнаму, яна брала з сабою ў поле ў падарунак свякрусе два-тры аршыны палатна, а таксама бутэльку гарэлкі і закуску. На ніве ўся сям'я чакала, пакуль яна нажне першы сноп і пакрые яго прынесеным падарункам. Затым нявестка падыходзіла да свякрухі, кланялася ёй, прасіла благаславіць яе і зняць са снапа падарунак. Благаславіўшы нявестку, свякроў здымала са снапа палатно, усе садзіліся вакол снапа, выпівалі і закусвалі, адзначаючы пачатак жніва[29].



Дзеці ў полі ў час жніва. Палессе. Пачатак ХХ ст.

У Рагачоўскім павеце зажынаць жыта ішла пад вечар старэйшая ў сям'і жанчына і брала з сабою лусту хлеба, Благавешчанскую прасфору, Грамнічную свечку, кавалак артаса або пасвечанай «паскі» і асвечаную соль. Памаліўшыся Богу з зямнымі паклонамі, яна нажынала адзін сноп, які стаячым пакідала на полі. На наступную раніцу жаць ішла ўжо ўся сям'я[30].

Зажынкі заўжды адзначала ўся сям'я святочным абедам або вячэрай, на якой абавязковым блюдам была густая каша як сімвал дабрабыту і пажадання добрага ўраджаю ў будучым[31].

Першы зжаты сноп жыта або «калівы» ставілі ў покуце пад абразамі, а другі і наступны снапы сушылі ў печы, расціралі каласкі або абвівалі аб ступу ці калоду і малолі зерне на жорнах, каб спячы хлеб з новага ўраджаю.

Аднак, як адзначаў М. Я. Нікіфароўскі, беднасць і нястача вымушалі многіх сялянак, не чакаючы жніва, тайком аджынаць і насіць дадому зялёныя снапкі жыта, каб скарэй адведаць «аржанінкі», калі жыта толькі падыходзіла да спеласці[32].



Жніво ў ваколіцах Слуцка. 1912 г.

Для звязвання снапоў выкарыстоўвалі «перавясла» («вязьмо»), зробленае са сцяблоў таго збожжа, якое жалі. Скручвалі яго з двух пучкоў зжатага збожжа каласамі адзін да аднаго, атрымоўваючы жгут даўжынёй $1^1/_2$—2 аршыны, дастатковы для вязкі снапа.

Моцнасць перавясла залежала ад ступені спеласці саломы, бо пры пераспеласці яна рабілася ломкай, і ўменне жняі скруціць перавясла так, каб у месцы злучэння двух пучкоў, дзе знаходзіліся каласы (самая слабая частка сцяблоў), вязьмо не было занадта тонкім і каб адзін пучок не надта заходзіў за другі, укарочваючы перавясла. Скруціўшы перавясла і паклаўшы яго на зямлю, жняя левай рукой захоплівала жменю сцяблоў жыта бліжэй да кораня (каб больш саломы засталося пасля малацьбы), а правай рукой зразала іх сярпом. Кожную зжатую жменю каласоў яна клала на перавясла. Пры жніве нізкарослых проса, грэчкі, ячменю перавясла для снапоў рабілі з іншых збожжавых культур, часцей за ўсё з леташняй жытняй саломы.

Жніво было жаданай, але фізічна вельмі цяжкай працай у полі пад спякотным сонцам. М. Я. Нікіфароўскі са спачуваннем апісваў, як, аднастайна прыгнуўшы галовы на аршын ад зямлі і адхватваючы сярпом каласы «жменьку за жменькай», жнеі рухаліся па ніве, калі сонца ў гарызантальна падстаўленыя спіны і галовы даймала «пікельнымі данімамі». У жней «чоха носам кроў», трасліся «паджылкі», гарэлі твары, буйнымі кроплямі капаў пот... Пры «задзеле вязма» жняі патрэбна было выпраміцца ва ўвесь рост і скруціць салому на адлёце, затым сагнуцца і раскласці вязьмо на зямлі. Потым кожны раз неабходна было згінацца, каб пакласці зжатую жменьку каласоў на вязьмо. Зусім нізка яна прыпадала да зямлі, каб націснуць каленам звязваемы сноп. Праца была яшчэ цяжэйшай, калі прыходзілася жаць рэдкую або нізкарослую збажыну, пабітыя градам «прыбоі» і жывёльныя «вытапты»[33].



Гаспадар. На покуці пад абразамі стаіць зажынкавы сноп жыта. 1930-я гг. Палессе. Фота Ю. Абрэмбскага

Напружаная і цяжкая праца жней з асаблівай эмацыянальнай афарбоўкай адлюстравалася ў беларускіх жніўных песнях:

*Ой, закаціся, сонейка,*
*Усё з гары ў далінку,*
*Ой, зрабі нам вечарынку.*
*Нехай вечар бардзей будзе,*
*Майму сэрцу лягчэй будзе:*
*Нахадзіліся ножанькі,*
*Ой, нарабіліся ручанькі,*
*Серп'е не жнуць, нажаліся,*
*Ручкі не ймуць, наймаліся,*
*Насвяціліся вочанькі*
*Аж да цёмныя ночанькі*[34].

Жыта праз жніўныя песні стагоддзямі жывіла вусную народную творчасць беларусаў. Жнеі пелі жніўныя песні ў час нядоўгага адпачынку на ніве і асабліва ідучы пасля працы дадому. Старыя людзі ўспамінаюць, што ад песень жней увечары «аж лес разлягаўся», а здалёк, з усіх бакоў было чутна, як спявалі жнеі з суседніх вёсак[35].

За адзін дзень жняя магла нажаць каля двух коп жыта (120 снапоў), таму пры найме звычайна ставілі на дзесяціну шэсць або восем жней, а пры добрым ураджаі — дзесяць і нават дванаццаць[36].

У панскіх гаспадарках Віленскай губерні было прынята за норму, што сем з паловай работнікаў павінны былі зжаць 1 дзесяціну (5 чалавек — морг). Работа размяркоўвалася наступным чынам: пяць або шэсць жанчын жалі, а мужчыны вязалі снапы і зносілі іх у копы. Гэты разлік адносіўся як да азімых, так і да яравых пасеваў[37].

Памешчыкі стараліся зжаць жыта раней за сялян, каб мець магчымасць наняць работніц. Ідучы на жніво, як падзёншчыкі, так і падзёншчыцы апраналіся ў чыстае адзенне[38].

Для хуткасці і мацнейшага звязвання снапоў на тэрыторыі паўднёвых і паўднёва-заходніх паветаў Гродзенскай губерні, паўднёвых паветах Мінскай губерні жнеі карысталіся «цуркай» («дзерава», «кныбель») — невялічкай палачкай з цвёрдых парод дрэва, якой падтыкалі ўнутр снапа канцы перавясла. Звычайна цуркі рабілі даўжынёй 28—30 см і дыяметрам каля 3 см. З аднаго канца цурка была да паловы гладкай, а на другой палове рабілі насечкі або ўпрыгожвалі яе розным арнаментам[39].



Селянін скручвае перавясла («вязьмо») для звязвання снапа. Заходняе Палессе. 1920—1930-я гг.

Цяжкасць работы жнеі стараліся аблегчыць пры дапамозе малітваў і магічных прыёмаў. Пачынаючы жаць, у малітве прасілі: «Дай жа, Божа, штоб лёгка жалась! Сярэдзінка ні балела, ручынькі ні млелі, ножынькі ні дзірвянелі, галава ні гарэла!»[40]

У Мазырскім павеце Мінскай губерні жняя, зжаўшы першыя каласы трыма захопамі рукі, зразала затым левай рукой адно сцябло і затыкала яго пад пояс, каб не балела спіна, а гнулася так лёгка, як і сцябло жыта[41]. З гэтай жа мэтай у Быхаўскім павеце жняя першую зжатую жменю жыта скручвала і падпяразвалася ёю[42].

Разам з тым цяжкасць жніўнай пары ўспрымалася сялянкамі як доўгачаканая радасная праца, звязаная з забеспячэннем дабрабыту:

*Расці, жыта, караністае,*
*Караністае, каласістае.*
*Каб у трубы пакачалася,*



Жніво. Вёска Рудня Бабруйскага павета Магілёўскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава



Скручванне перавясла («вязьма»). Мястэчка Тураў Мазырскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

*Каб я, молада, зажалася,*
*А носячы [снапы] ўмарылася,*
*А ставячы павалілася,*
*А лічачы не злічылася*[43].

Пры жніве сярпом снапы вязалі звычайна ў абхваце каля аршына і састаўлялі на іржышчы для першаснай сушкі. Беларусы ўкладвалі снапы для часовай сушкі ў полі двума спосабамі: вертыкальным і гарызантальным. Найбольш распаўсюджаным быў вертыкальны спосаб устаноўкі снапоў. Так прасушвалі ў полі жыта, азімую і яравую пшаніцу, ячмень, авёс, радзей грэчку. Гарызантальны спосаб ужываўся галоўным чынам для грэчкі, часам для ячменю і аўса і адзінкава — для жыта і пшаніцы.

Сярод разнастайных форм малой вертыкальнай укладкі снапоў найбольш пашыранай была ўкладка «ў бабкі»[44], якія звычайна налічвалі дзесяць снапоў. Спачатку ставілі тры снапы, нахіленыя адзін да аднаго каласамі, затым каля іх прыстаўлялі яшчэ шэсць снапоў і раскрыленым накшталт парасона дзясятым снапом («пакрышным», «маткай») камлём угору накрывалі.

Пакрышны сноп («матка») захоўваў каласы астатніх снапоў у выпадку дажджу і адначасова прыдаваў бабцы ўстойлівасць пры ветры. Складзенае ў бабкі жыта пакідалі ў полі для сонечна-паветранай сушкі на пяць-восем дзён. Пры добрым надвор'і за гэты час яно высыхала[45].

Па-іншаму складалі жыта ў бабкі на Віцебшчыне. Там спачатку адзін сноп, які называлі «стаяном», ставілі вертыкальна. Вакол яго на значнай адлегласці адзін ад аднаго ставілі камлём уніз восем снапоў і нахілялі іх да стаяна, злучаючы з ім каласамі. Дзясятым, раскрыленым снапом, камлём угору накрывалі[46].

У некаторых паветах Заходняй і Цэнтральнай Беларусі бабкі называлі «мэдлямі», «мэндлікамі», «лешкамі», а ў некаторых вёсках на ўсходзе



Сялянка вяртаецца з палявых работ. Вёска Столін. 1929 г. Фота Гохмана

і паўднёвым усходзе — «дзясяткам», «стаякамі», «стаўкамі»[47]. Калі снапы былі дробнай вязі, то ў бабкі складалі часам па 12 або 15 снапоў, называючы іх «дванаццаткамі», «пятнаццаткамі»[48].

На колькасць снапоў, састаўляючых бабку, значны ўплыў аказвалі прыродна-кліматычныя ўмовы. На поўначы і паўночна-ўсходняй частцы тэрыторыі Беларусі, дзе клімат больш халодны і вільготны, сяляне складалі бабкі з пяці-шасці снапоў, называючы іх «пяцёркамі», а на поўдні, дзе клімат больш сухі і цёплы, у бабкі састаўлялі па 10—12 снапоў[49].

Калі зжатае жыта пападала пад дождж, то пры наступленні добрага надвор'я бабкі «ўскрывалі» — здымалі з іх пакрышачны сноп і адхілялі ад стаяна акружаючыя яго снапы.

У цяні бабкі-жнеі захоўвалі ваду і ўзятыя на абед прадукты, пакідалі малых дзяцей, адпачывалі ў час невялікіх перапынкаў паміж работай, падсілкоўваліся. Пад бабкай часам хаваліся ад дажджу[50].

Жніво ішло ў паслядоўнасці, засвоенай ад дзядоў і прадзедаў. Спачатку на іржышчы былі бачныя то паваленыя, то стаймя стаячыя снапы, якія ўвечары зносілі ў доўгія рады, а потым расстаўлялі ў бабкі, якія ў сваю чаргу выцягваліся на ніве ў стройныя «карагоды»[51]. У карагод звычайна састаўлялі дзве капы[52] снапоў — тую колькасць збожжа, якую можна было ўскласці на сялянскі воз[53].



Снапы жыта, складзеныя на полі «ў бабкі». 1950 г. Фота М. Я. Грынблата

Амаль адначасова з уборкай жыта ўбіралі ранні ячмень, потым азімую пшаніцу і позні ячмень, затым авёс. Усё жалі пераважна сярпом, вязалі ў снапы і складвалі ў розныя формы дробнай вертыкальнай укладкі снапоў. Адначасова з уборкай аўса касілі гарох і сачавіцу, якія часта сеялі сумесна з аўсом[54].

Калі жытняя бабка, як правіла, складалася з дзесяці снапоў, то яравыя культуры звычайна складвалі ў бабкі з шасці снапоў, лічачы і пакрывачны[55]. Акрамя бабак снапы грэчкі і аўса для прасушкі ў полі на ўсёй тэрыторыі Беларусі клалі каласамі ўверх, у «кучкі», якія ўтрымлівалі розную колькасць снапоў і мелі конусападобную форму, як і бабкі[56].

У Ваўкавыскім, Кобрынскім, Брэсцкім і Гродзенскім паветах Гродзенскай губерні вялікія па аб'ёму снапы грэчкі, аўса і ячменю састаўлялі для прасушкі ў полі камлём уніз, шчыльна прыціскаючы іх адзін да аднаго, у форме чатырохвугольніка: чатыры снапы ўдаўжыню і тры ўпоперак. На кожны рад снапоў зверху клалі гарызантальна адзін сноп (шапку). Такая форма ўкладкі снапоў яравых культур называлася ў гэтых паветах «копачкамі»[57].



Пераноска снапоў жыта.
Вёска Харобічы Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. 1912 г.
Фота Сімпляксевіча



Складванне снапоў жыта «ў бабкі».
Палессе. 1935 г.

Яшчэ адной формай малой укладкі снапоў для першаснай сушкі ў полі з'яўляліся так званыя «хахалкі», у якія ў Ашмянскім і Брэсцкім паветах Гродзенскай губерні ставілі для прасушкі снапы ячменю і аўса. Такую форму сушкі ўжывалі, калі сярод збожжа было шмат травы. У хахалкі ставілі снапы па аднаму па меры жніва камлём уніз, а перавясла ссоўвалі амаль да самых каласоў і раскрылялі салому каля камля, каб трава і салома хутчэй высыхалі[58].

У Навагрудскім павеце была зафіксавана форма часовай укладкі снапоў у полі, якая называлася «котарам». Пры такой укладцы снапы ставілі каласамі ўгору парамі ў адзін рад па восем-дзесяць пар. Зверху рада клалі гарызантальна некалькі накрывальных снапоў[59]. Лакальнай формай малой укладкі снапоў з'яўляліся «шары», калі два снапы ставілі каласамі ўгору, а трэцім пакрывалі[60].



Цуркі для замацавання перавясла ў снапах.
1950-я гг.
Малюнак С. Ц. Гунько



Кароткі адпачынак каля калыскі з дзіцем у час жніва. Заходняе Палессе. 1935 г. Фота Ю. Шыманчыка

Для сушкі ў полі снапы яравых збожжавых культур часта ўкладвалі гарызантальна. Найбольш пашыранай формай гарызантальнай укладкі снапоў былі «крыжы» («прасты»), вядомыя на ўсёй тэрыторыі Беларусі[61]. Пры такой форме ўкладкі чатыры снапы клаліся на зямлю крыжападобна каласамі адзін да аднаго. На першы рад снапоў шчыльна клалі другі, затым трэці і г.д. Звычайна крыж складаўся з шасці — дзевяці радоў гарызантальна пакладзеных крыжападобна каласамі ў цэнтр снапоў і аднаго накрывальнага снапа, які ставіўся на каласы ляжачых снапоў камлём угору і як парасон захоўваў іх ад дажджу[62]. Этнолагі лічаць такую форму ўкладкі снапоў у полі для сушкі найбольш старажытнай, шырокавядомай рускім[63] і ўкраінцам[64].

Дажынкі (дажон) спраўляліся сялянамі ў дзень заканчэння жніва жыта, хаця ў некаторых мясцовасцях Беларусі паўтаралі іх і пасля ўборкі яравых збожжавых культур[65]. Адзначалі дажынкі больш урачыста, чым зажынкі, шчодра частуючы найманых на жніво работнікаў, суседзяў.

Дажыначныя песні беларусаў ужо іскрыліся весялосцю, а пры жніве яравых разам з дажыначнымі жнеі пелі вясельныя песні[66].

Для дажынак звычайна пакідалі невялікі ўчастак жытняй нівы. У гэты дзень жнеі апраналіся ў святочнае адзенне і выконвалі пры дажынках шэраг абрадаў утылітарна-магічнага характару. Пры заканчэнні жніва жыта ў Мінскай губерні было прынята, каб тры дзяўчыны вілі вянок: адна выбірала самыя вялікія каласы, другая віла з іх вянок, а трэцяя падтрымлівала яго. Закончыўшы жаць, жнеі надзявалі гэты вянок на адну з дзяўчат і з песнямі ішлі да двара гаспадара нівы. Ля варот іх сустракала гаспадыня, брала з галавы дзяўчыны вянок і давала ёй сярэбраную манету. Затым жней частавалі святочным абедам, а яны пелі і танцавалі[67].

У дахрысціянскі перыяд у свядомасці старажытных насельнікаў Беларусі склаліся вобразы жытняй бабы (маці жыта), жыценя (гаспадара жытняга поля), зерневых палявых духаў, якія аберагалі пасевы і напаўнялі каласы зернем. Па старажытнаму светаўяўленню гэтыя духі заставаліся зімаваць у нязжатых каласах. Каб задобрыць духаў поля і забяспечыць іх спрыяльны ўплыў на ўраджай наступнага года, ва ўсходніх славян склаўся звычай «завівання барады», які з цягам часу стаў цесна звязваццa з хрысціянствам.

Па народным павер'і, што шырока бытавала сярод беларускіх сялян у пачатку XX ст., жменька каласоў на зжатай ніве пакідалася жнеямі птушкам і звярам у падзяку за тое, што яны выпрасілі ў Бога для людзей і распаўсюдзілі збожжавыя расліны[68].



Укладка снапоў у полі для першаснай сушкі «котарам». Вёска Засець Навагрудскага павета Гродзенскай губерні.
Малюнак С. Ц. Гунько



Укладка снапоў у полі для першаснай сушкі спосабам «крыжы» («прасты»). Вёска Кашэвічы Мазырскага павета Мінскай губерні.
Малюнак С. Ц. Гунько

У Быхаўскім і іншых паўднёвых паветах Магілёўскай губерні пры заканчэнні жніва жнеі пакідалі некалькі каласоў жыта «на бараду Богу» і звязвалі іх уверсе стужкай або саломінкай. Рукой, загорнутай у рукаў сарочкі, бараду чыста палолі ад пустазелля, рассцілалі сярод каласоў кавалачак чыстага палатна, з малітвамі і зямнымі паклонамі клалі на яго лусту хлеба з соллю. Затым кожная жняя павінна была тры разы пакаціцца па полі і сказаць:

*Ніўка, ніўка, аддай маю сілку*
*На другую ніўку!*
*На коніка лой, на ніўку гной,*
*А мне здароўя!*
*Судзі, Божа, налета жаці*
*І ядранейшая і гусцейшая!*

Толькі пасля гэтага абраду ішлі дадому, дзе быў прыгатаваны святочны абед з абавязковымі блінамі і крутой кашай[69].

На апошняй паласе ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні на бараду пакідалі самы лепшы куст жыта і чырвонымі ніткамі вязалі з каласоў крыж, а потым плялі гаспадару нівы вянок. Каб у наступным годзе жыта было чыстае, бараду палолі, а каб не было засухі, палівалі вадой. Разаслаўшы сярод нязжатых каласоў белую хустачку і паклаўшы на яе пасыпаны соллю акрайчык хлеба, збіралі палявыя кветкі і ўпрыгожвалі імі

бараду. Пасля гэтага жнеі лажыліся на зямлю (каб на будучы год быў багаты ўраджай і каласы гнуліся да зямлі). Устаўшы з зямлі, мылі рукі (каб на наступны год жыта было чыстае) і перавязвалі сярпы травой і саломай (каб на наступны год не парэзаць рук у час жніва). Выканаўшы ўсе гэтыя магічныя дзеянні, з вянком і крыжам з каласоў ішлі дахаты. Вянок і крыж з каласоў разам з нованамалочаным жытам свяцілі ў царкве на Першую Прачыстую 15/28 жніўня[70].



Дзяўчына ў дажынкавым вянку. Вёска Парэчча Ігуменскага павета Мінскай губерні. 1904 г.

Праполваючы бараду, у Мсціслаўскім павеце Магілёўскай губерні жнеі пелі:

*Да зелен наш баркун*
*Над усімі баркунамі!*
*Да багат наш пан*
*Над усімі панамі!*
*Пасаджаў жанцэ*
*Да ў новай каморе —*
*Пасаджаў ратком,*
*Частаваў мядком*
*Частаваў мядком,*
*Да віном зеляным.*

Потым абкладвалі бараду каменьчыкамі, паклаўшы ў сярэдзіну большы камень (стол), а на яго — кавалачак хлеба і соль як залог будучага ўраджаю. Пасля адна з жней, пакрыўшы руку хусткай, зжынала бараду, і гэтыя каласы клалі ў прыгатаваны вялікі сноп. З яго вілі вянок і, усклаўшы яго на галаву адной са жней, з песнямі неслі да пана. Памешчык выходзіў насустрач жнеям, здымаў з галавы дзяўчыны вянок і адорваў жней грашыма[71].

У Віцебскім павеце бараду называлі «кустом», пакідаючы на яго дзесяць каласоў. Полючы куст, пелі песню «Спорыш»:

*Край поля шырокага,*
*Пысярёд мора глыбокыга,*
*А йшоў спорыш ды па вуліцы.*
*Ніхто спорыша ў хату ні завець.*
*Вышла, выплыла вумныя жына Андрэіва:*
*«А хадзі, спорыш, ка мне ў хату,*
*А садзісь, спорыш, ды на покуці,*
*На покуці ды на золыці,*
*А еш, спорыш, сыхарный кус,*
*А пі, спорыш, зілянд віно!»*

Паклаўшы ў куст хлеб з соллю, завівалі каласы справа налева і кожная жняя некалькі разоў перакатвалася па кусту, каб у наступным годзе быў добры ўраджай. Затым вілі вянок і неслі да гаспадара з той жа песняй «Спорыш». Гаспадыня брала вянок і адорвала жней грашыма, а потым частавала[72].

Апошні дажыначны сноп жыта ў Мінскай губерні называлі «бабай». На яго надзявалі жаночую сарочку, абвязвалі хусткай і ставілі ў канцы зжатага поля. Затым жнеі садзіліся вакол бабы і ладзілі сумеснае часта-

ванне. Адзначыўшы такім чынам заканчэнне жніва, з песнямі ішлі да гаспадара поля, несучы наперадзе сноп-бабу. Гэты сноп гаспадар ставіў у хаце на куце, пад абразамі[73].

У Себежскім павеце Віцебскай губерні дажынкі было прынята адзначаць у канцы жніва яравых збожжавых культур, звычайна аўса. З яго таксама плялі вянок, і жнеі неслі яго з песнямі гаспадару, які адорваў жней грашыма і частаваў іх, а прынесены вянок клаў на бажніцу[74].

У беларусаў лічылася вельмі вялікім грахом пакінуць на полі нязжатую збажыну. Калі па нейкай прычыне хтосьці з сялян спазняўся са жнівом, то суседзі заўжды прыходзілі на дапамогу і ўбіралі збожжавыя талокай не за плату, а за пачастунак[75]. Таму на Беларусі ў сялян ніколі не заставалася ў зіму нязжатых палос збожжа.



«Барада» на зжатым полі. Шумілінскі раён Віцебскай вобласці. 1980-я гг. Фота Т. І. Кухаронак

Лічылася, што толькі сярпом можна акуратна і чыста ўбраць збожжа[76]. У паўднёвых раёнах Беларусі пры недахопе часу або вялікіх плошчах пасеваў яго касілі касой, у якой каля ляза прымацоўвалі зробленыя з лазы «грабелькі». Уборка жыта касой ішла ў два-тры разы хутчэй, чым сярпом, давала больш саломы. Аднак касіць жыта можна было толькі тады, калі яно яшчэ крыху недаспела. Пры касьбе спелага жыта многа зерня высыпалася і трацілася, а салома путалася і не падыходзіла для прыгатавання кулёў для пакрыцця стрэх[77].

Многія гаспадары наогул лічылі, што касіць жыта касой недапушчальна, бо жняя, складаючы сноп, звычайна выкідала з яго пустазелле. Такі сноп, складзены жняёй, выглядаў прыгожым, прывабным і толькі такі мог быць пастаўлены ў покуце пад абразамі. Толькі зжатыя жняёй снапы выкарыстоўваліся для атрымання «кулявой» саломы, якая ішла для пакрыцця стрэх хат і гаспадарчых пабудоў. Пры гэтым пуд (16 кг) кулявой саломы каштаваў не меней, чым пуд жыта[78].

Зжатыя збожжавыя культуры ў многіх мясцовасцях Беларусі адразу звозілі да сядзібы і дасушвалі на «азяродах» («пераплотах», «азяродах» і «нератах»)[79], вядомых на Беларусі з сярэднявечных часоў.

Азярод — укапаныя ў зямлю на адлегласці некалькіх метраў адзін ад аднаго высокія драўляныя слупы (два, тры і больш), умацаваныя з абодвух бакоў падпоркамі. Гэтыя слупы злучалі некалькімі гарызантальнымі перакладзінамі і паміж імі ўцісквалі сноп каля снапа каласамі ўніз. Будавалі азяроды на прыгуменні. Снапы віселі на азяродах і не баяліся ні грызуноў, ні збожжавай молі, ні сырасці, бо дажджавыя кроплі саслізгвалі па каласах, амаль не датыкаючыся да зерня, птушкі не маглі ўсесціся на снапы, а рух паветра падтрымліваў свежасць зерня, не дазваляючы яму ні надта перасохнуць, ні адсырэць. Збожжа з азяродаў малацілі ў пераважнай большасці сырамалотам[80].

Найбольшае распаўсюджанне азяроды атрымалі на Віцебшчыне (Гарадоцкі, Лепельскі, Полацкі паветы), Міншчыне, усходняй Гродзеншчыне, паўднёва-ўсходняй Гомельшчыне (Рэчыцкі, Гомельскі, Мазырскі паветы), Брэстчыне (Ваўкавыскі, Пружанскі, Брэсцкі паветы)[81]. Так, у Лепельскім павеце Віцебскай губерні зжатае жыта сяляне не пакідалі сохнуць на полі, як гэта рабілі памешчыкі, а адразу везлі да гумна і дасушвалі ў азяродах, уздзеўшы ў пераплоты — прадольныя жэрдзі, прадзетыя скрозь стаўбы, бо на ржышча адразу выпускалі жывёлу на пашу[82].

У паўночных раёнах Беларусі жэрдзяныя збудаванні называліся «пераплотамі», «астроўкамі», «астроўем», але яны выкарыстоўваліся ў пераважнай большасці для прасушвання клевера, гароха, бульбоўніка, сена. Невядомыя азяроды былі на Магілёўшчыне і ў тых раёнах, дзе зерневае збожжа сушылі ў сушнях (асецях і ёўнях).

Мясцовы клімат з частымі зацяжнымі дажджамі прымушаў сялян узводзіць спецыяльныя гаспадарчыя пабудовы для захавання і апрацоўкі збажыны. Гэтай пабудовай з'яўлялася гумно, якое ў некаторых мясцовасцях Беларусі насіла назвы «ток», «клуня» і было неабходнай прыналежнасцю амаль кожнай сялянскай гаспадаркі.

Узгадванні пра гумно сустракаюцца ў рускіх пісьмовых помніках XI—XII стст., у тым ліку ў «Аповесці мінулых гадоў» і ў «Праўдзе Рускай»[83].

Тэрмін «гумно» ў сваім гістарычным развіцці карэктаваўся і змяняў сэнс. У старажытнасці ён азначаў месца, дзе з дапамогай жывёлы мялі, вымалочвалі зерне[84]. У актавых матэрыялах XVI—XVIII стст. часцей за ўсё пад гумном разумелі агароджаную тэрыторыю са спецыяльнымі пабудовамі для захоўвання і апрацоўкі неабмалочанай збажыны ў комплексе з пляцоўкамі, дзе можна было сушыць і складаць прывезеныя



Уборка аўса на полі селяніна. Вёска Бокуць Перажаырскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Захаванне абмалочаных снапоў жыта («кулёў») для пакрыцця страхі



Азярод каля гумна. Вёска Вялікія Аўцюкі Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Касец вострыць мянташкай касу. 1920-я гг.



Каса з грабелькамі для ўборкі збожжа. Малюнак С. Ц. Гунько



Азяроды для сушкі сена і снапоў. Вёска Вуйвічы Пінскага павета Мінскай губерні. Канец XIX – пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава



«Астроўе» з закладзенымі для прасушкі снапамі. Вёска Янкавічы Расонскага раёна Віцебскай вобласці. 1954 г. Фота М. Я. Грынблата

з поля снапы. Інвентар маёнтка Андрэя Бабраўніцкага (1582 г.) гумном называе месца, на якім размяшчалася «озередовъ переплотовъ пятьдесятъ, между переплотами одрина саломай крыта и саломай напхана; у канцы одрины осети две противъ себе, между ними токъ, двое воротъ до него, накрыта саломай; у концы тыхъ осетей клетка саломой накрыта где ссыпаютъ мякину; пасяродъ гумна токъ великий зъ засеками, до него двое воротъ...; у воротъ другихъ житники два, одзинъ накрыты саломай, а други лубамъ зъ драницами»[85].

На працягу XIX ст. тэрмін «гумно» на большай частцы тэрыторыі Беларусі замацаваўся толькі за пабудовай для захоўвання і абмалоту збожжа. Аднак паўсюднага пашырэння ён не атрымаў. У Віцебскай і на поўначы Магілёўскай абласцей такі гаспадарчы будынак называлі «токам», у многіх раёнах Брэсцкай і на захадзе Гомельскай абласцей — «клуняй», на памежжы з Латгаліяй — «рыгай»[86], у Мінскім павеце — «сырабойняй», бо тут малацілі збожжа сырамалотам, без папярэдняй сушкі ў сушыльні[87].

Гумно ўяўляла сабой вялікае зрубнае збудаванне з высокай страхой у форме падоўжанага прамавугольніка (шырынёй 5,5—18,5 м, даўжынёй 7—23 м), квадрата, зрэдку мнагагранніка[88]. У Магілёўскай, Віцебскай, на поўначы Гомельскай і часткова Мінскай абласцей яно мела ўнутры або знадворку агнявую сушню для снапоў (асець, ёўню). З мэтай процілажарнай бяспекі гумно выносілі ў канец сядзібнай зямлі, а па магчымасці — і за яе межы.

Страха гумна часцей за ўсё мела сошную канструкцыю, з адносна пастаянным прагонам паміж сохамі ў 3–4 м. Сохі — высокія слупы з развілкай уверсе — ставілі ўнутры ўздоўж усёй пабудовы папарна двума радамі. Верхнія іх канцы злучаліся ўздоўж шлегамі («кладзь», «правілы»), пакладзенымі ў развілкі, а ўпоперак — бэлькамі, на якія ставілі дзядзькі («чапёлкі», «казлы»), звязаныя зверху цэнтральнай шлегай — асновай будучага вільчыка.

На вільчыкавую шлегу навешвалі кручча (доўгія жэрдкі з крукамі). Ніжнія канцы крукоў апускаліся на верхні вянец сцяны. Уздоўж схіла страхі, які ўтваралі крукі, прывязвалі радамі паплёт (тонкія жэрдкі).

Крылі гумны саломай, прывязваючы снапкі да паплета каласамі ўніз («пад колас»), або каласамі ўверх («пад шчотку», «пад грабёнку»). Стрэхі звычайна былі чатырохсхільныя, радзей — з усечаным зверху франтонам. Сошная канструкцыя страхі гумна (клуні) на Заходнім Палессі ў пачатку XX ст. пачала замяняцца стрпільнай, прайшоўшы прамежкавы этап паўсошкавай канструкцыі[89].

Бярвёны вянцоў зруба гумна злучалі вуглом «з астаткам». На прагонах сцен праз кожныя 2,5—3 м ставілі шулы. Бярвёны закладвалі ў шулы ў закід і не падганялі шчыльна адно да аднаго, што забяспечвала ў гумне свабодную цыркуляцыю паветра і значна паскарала сушку неабмалочанага збожжа.

Уязныя аднастворкавыя або двухстворкавыя дашчаныя вароты ў гумне рабілі з тарца, а выязныя — у сярэдзіне падоўжанай сцяны, каб калі згрузяць з воза снапы, не трэба было разварочвацца. Гэта таксама дазваляла веяць збожжа пры любым напрамку ветра пры двух адкрытых варотах. К. Машынскі апісаў клуню (гумно) на Палессі з чатырма варотамі[90].

У цэнтры гумна паміж сох рабіўся ток — глінабітная пляцоўка для малацьбы. Справа і злева ад тока ўздоўж гумна цягнуліся застаронкі (староны), якія служылі для складвання прывезеных з поля снапоў. Часта

застаронкі ад тока аддзяляліся невысокім, у некалькі бярвёнаў, зрубам[91]. Слова «ток» мае старажытнае паходжанне. У «Слове аб палку Ігаравым» яно ўжываецца ў вобразным апісанні бітвы: «На Немизе снопы стелют головами … на тоце живот кладут, веют душу от тела»[92].

Для захавання ніжніх снапоў ад вільгаці ў застаронках на 20—30 см над зямлёй масцілі падлогу з няшчыльна прылягаючых адна да адной жэрдак[93].

На Беларусі былі пашыраны гумны двух тыпаў: з сушняй для збожжа і без сушні. У Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і часткова Мінскай абласцях перад малацьбой збожжа сушылі ў сушнях — асецях і ёўнях[94]. Асець (восець) — старажытная гаспадарчая пабудова для сушкі збажыны, канапель, лёну. Згодна інвентарам маёнткаў асеці ставілі асобна ад будынка, дзе малацілі збожжа, або прыбудоўвалі да яго глухой тарцовай сцяны.

Гэта было квадратнае ў плане двух'яруснае збудаванне, рубленае ў просты вугал з астаткам. Упоравень з глінянай падлогай ніжняга яруса рабілі невялікую квадратную адтуліну, праз якую выграбалі выпаўшае пры сушцы зерне. Замест дзвярэй на ўзроўні 7—8 вянца рабілі вялікую адтуліну ў верхні ярус, праз якую залазілі ў асець, падавалі снапы і ўстанаўлівалі іх для сушкі на каласнікі («цапкі»). Пад асеццю выкопвалі яму, у якой знаходзілася печ, абкладзеная каменнем. Пры топцы нагрэтае паветра праз люхты трапляла ў верхні ярус, дзе знаходзілася збожжа. У час сушкі верхняя і ніжняя адтуліны шчыльна зачыняліся[95].



Асець. Вёска Вялікія Хутары Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. 1955 г. Фота Л. А. Малчанавай

З сярэдзіны XIX ст. двух'ярусныя асеці сталі паступова выцясняцца ёўнямі, што, відаць, было звязана з ростам насельніцтва і драбленнем сялянскіх зямельных надзелаў. У гэтых умовах ёўня як збожжасушыльня стала цалкам задавальняць патрэбы дробнай сялянскай гаспадаркі. Але ў многіх вёсках на Магілёўшчыне і Гомельшчыне па традыцыі ёўня захавала назву «асець».

Ёўня — больш простая і значна меншая па памеру сушня для збожжавых культур, лёну і канапель. Гэта квадратнае ў плане (звычайна 2,5×2,5 м) аднаярускае зрубнае збудаванне з тонкіх бярвенняў з імшанымі сценамі, плоскай столлю, зверху засыпанай слоем зямлі, і шчыльна падагнанымі дзвярамі. Будавалі яе ўнутры гумна на адлегласці 1—1,5 м ад тарцовай сцяны, процілеглай уязным варотам. У правым ад уваходу кутку ёўні выкопвалі неглыбокую яму, дзе складалі з камення або збівалі з гліны печ, якая тапілася па-чорнаму. Злева ад уваходу на вышыні прыблізна 1 м ад глінянай падлогі на сценах былі ўмацаваны дзве бэлькі, па якіх свабодна перамяшчаліся жэрдкі («цапкі», «цапнікі», «каласнікі»). На цапкі камлём уніз ставілі для сушкі снапы збожжа. Калі снапы насаджвалі на цапкі ў два рады, то верхні рад снапоў ставілі каласамі ўніз, а камлём угору.[96]



Гумно. Вёска Гваздовічы Пастаўскага раёна Маладзечанскай вобласці. 1954 г. Фота М. Я. Грынблата

Амаль на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей і ў паўднёвых раёнах Мінскай вобласці, дзе клімат дазваляў высушваць збожжа ў полі і круглы год захоўваць яго ў стагах (скірдах), гумны былі значна меншымі па памерах, бо прызначаліся толькі для абмалоту зерневых культур. На гэтай тэрыторыі гумны называлі «клунямі» і будавалі без сушняў, а збожжа ў іх малацілі сырамалотам. Клуня часам непасрэдна прымыкала да іншых гаспадарчых пабудоў сялянскага двара[96].

З поля збожжа звозілі ў гумно на калёсах з высокімі бартамі-рашоткамі («мажары», «драбіны», «рэды»). Звычайна снапы на возе ўкладвалі радамі каласамі ўсярэдзіну. Каб не абіваць зерне, снапы ніколі не ўтоптвалі. Накладзены воз зверху прыціскалі жэрдзю («рублём»), якая была даўжэйшай за калёсы і мела на канцах зарубкі. У гэтыя зарубкі закладвалі вяроўкі і, моцна нацягнуўшы іх, спераду і ззаду прымацоўвалі рубель да калёс. На воз можна было ўскласці прыблізна дзве капы снапоў. Па сведчанні П. Баброўскага, у Гродзенскай губерні ў сярэдзіне XIX ст. сяляне пры перавозцы збожжа з поля трацілі каля 1 працэнта зерня[97], але ў пачатку XX ст., калі зямельныя надзелы зменшыліся, калёсы пры перавозцы снапоў з поля звычайна засцілалі посцілкай, а ў гумне з яе вытрасалі зерне, якое высыпалася з каласоў па дарозе[98].



Гумно. Вёска Угарэвічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. 1968 г. Фота І. М. Браіма



Копкі і снапы збожжа каля хлява. Вёска Якімава Слабада Рэчыцкага павета Мінскай губерні. 1912 г. Фота І. А. Сербава

Закладка снапоў у гумно суправаджалася ў беларусаў шэрагам магічных дзеянняў. У Слонімскім павеце Гродзенскай губерні ў дзень, калі пачыналі звозіць у гумно снапы, гаспадар браў з сабой бохан хлеба, загортваў яго ў чысты абрус, клаў на таку каля дзвярэй з мэтай, каб у хаце ніколі не пераводзіўся хлеб («Каб новы хлеб заўжды ўязджаў на старым»), і каля яго правозіў у гумно першы воз жыта. Затым асвячаў месца для кладкі снапоў вадохрышчанскай вадой і клаў туды камень (каб мышы не



Гумно. Вёска Вялікія Хутары Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. 1955 г. Фота Л. А. Малчанавай

елі збожжа) і медную манету (каб у сям'і заўсёды былі хлеб і грошы). Затым першы сноп развязваў і, раздзяліўшы надвая, клаў у застаронак крыжападобна. Астатняе збожжа складаў без усялякіх абрадавых дзеянняў[99].

У іншых месцах Беларусі сяляне запаміналі, у які дзень тыдня было свята Благавешчання і першы воз снапоў жыта стараліся прывезці ў гумно менавіта ў гэты дзень тыдня. Калі складалі снапы ў гумне, то не размаўлялі паміж сабой, каб мышы не заводзіліся і не елі збожжа[100].

Сяляне Пружанскага павета Гродзенскай губерні нічога не елі ў клуні (гумне), бо тады, па існуючым тут павер'і, мышы будуць цэлую зіму есці «сторону»[101].

У паўднёвых раёнах Беларусі заможныя сяляне звозілі снапы на прыгуменне (якое тут насіла назву «гумно», «гумніско») і складвалі іх там у стагі. Тэрыторыю прыгумення абносілі плятнём, а часам яшчэ абкопвалі ў проціпажарных мэтах канавай.

З мэтай засцярогі ад грызуноў хлебныя стагі ставілі на памост («под», «падок») — укапаныя ў зямлю чатыры дубовых слупкі, якія больш за аршын выступалі над зямлёй. Надземную частку слупкоў старанна і гладка саскаблівалі, каб грызуны не маглі дабрацца да снапоў. Зверху слупкоў клалі шырокія чатырохкутныя кускі дошак («кружкі»), а на іх — два драўляных брускі, якія сваім цяжарам прыдаўлівалі «кружкі» да слупкоў. На брускі клалі тоўстыя аднолькавай даўжыні жэрдзі і прыкрывалі іх хворастам, каб каласы не звешваліся пад стог. На такі падок клалі прывезеныя з поля снапы. Не кожны селянін мог добра «скідаць стажка», і старыя ганарыліся гэтым уменнем[102].

Закладку стажка звычайна рабіў сам гаспадар: узлезшы на падок, ён клаў крыжападобна чатыры снапы на самай сярэдзіне пад каласамі ўсярэдзіну. Затым крапіў іх святой вадой і, зняўшы шапку, прыгаворваў:



Укладванне снапоў на воз у полі. Рэчыцкі павет Мінскай губерні. Палессе. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

«Дай, Божа, у добры час скідаць стажка, спажыць яго ў добрым здароўі, каб хлеб у нас нігды не пераводзіўся і каб яшчэ на рух (за рік) прыждаць»[103].

Пасля гэтага гаспадару «сахорам» — двухрогімі драўлянымі віламі падавалі снапы, якія ён старанна раскладваў каласамі ўсярэдзіну, а камлямі («гузырамі») наверх такім чынам, што верхні рад снапоў да сярэдзіны



Замацаванне снапоў на возе. Рэчыцкі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава



Селянін увязвае воз снапоў пры дапамозе жэрдзі («рубля») і вяроўкі. Заходняе Палессе. 1920–1930-я гг.

вышыні стажка некалькі выступаў пад ніжнім. На сярэдзіне сваёй вышыні стажок прымаў самыя шырокія памеры. Пасля гэтага пачыналі класці снапы, паступова звужаючы стажок, і вярхушку завяршалі конусападобна.

Па сярэдзіне вышыні стажка на адлегласці адна ад адной прыблізна ў аршын утыкалі тонкія завостраныя з двух бакоў палачкі («тычачкі») каля 0,5 аршына даўжынёй, каб палова іх выступала наверх. Затым



Каб не абіваць зерне, воз са снапамі збожжа гаспадар заўсёды звозіў у гумно, ведучы каня за повад. Пачатак XX ст.



Хлебны стог на гумнішчы. Вёска Вуйвічы Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

стажок накрывалі тоўстым слоем камячанай саломы, якой тычачкі не давалі абсоўвацца, а каб не размятаў яе вецер, зверху накладвалі 12—15 пар «апоўзікаў» — ссечаных пад корань тонкіх гонкіх бярозак, звязаных вершалінамі і перакінутых цераз стажок так, што яны шчыльна прыціскалі салому і аблягалі стажок, звешваючыся камлямі ўніз. Добра зложаны стажок мог прастаяць гадоў 30, пры гэтым зерне не псавалася і не траціла ўсхожасці[104].

У пачатку XX ст., калі жытам на поўдні Беларусі засявалі вялікія плошчы, на «под» звычайна клалі дзесяць коп жыта (600 снапоў). Складзенае вельмі шчыльна, жыта не псавалася, бо было сухое. Кругом пода траву абкашвалі, каб не было вільгаці і не маглі залезці мышы. Зімой з пода бралі снапы і малацілі на ежу. Акрамя жыта на под складалі і захоўвалі снапы пшаніцы і ячменю.

У Кобрынскім і Брэсцкім паветах у гумны з поля звозілі не ўвесь хлеб, а толькі частку, прымеркаваную на насенне і харчаванне. Астатняе збожжа ўкладвалі і захоўвалі на полі ў скірдах (стагах). Падобныя скірды захоўваліся дзясяткі гадоў і служылі лепшай прыкметай багатага і заможнага гаспадара[105].

Як сведчаць актавыя матэрыялы, такім спосабам на доўгі тэрмін захоўвалі збожжа на Беларусі яшчэ ў XVI стагоддзі: «и вжо дей тому семъ годъ, яко я тую стирту жита своего въ гумне моемъ поставилъ» (1541 г.)[106]

На Палессі жыта ў стажках, складзеных на подах, захоўвалі амаль да пачатку 1970-х гг., пакуль вясковае насельніцтва не пачало забяспечвацца хлебам з хлебазаводаў.

Доўгай і вельмі цяжкай сялянскай працай была малацьба. Звычайна займаліся ёю позна восенню, пасля заканчэння палявых работ, і працягвалі

зімой. Узімку пачыналі малаціць амаль у другой гадзіне ночы пры святле лучыны або ліхтара і з перапынкам на снеданне працавалі прыкладна да поўдня, а затым трэба было намалочанае збожжа[107] звеяць і ўбраць салому. Адразу пасля жніва малацілі толькі на насенне, для выпечкі хлеба, ці збожжа, прарослае ад дажджоў[108].

Асноўнай прыладай малацьбы ў беларусаў з глыбокай старажытнасці служыў цэп, які складаўся з доўгай палкі-трымальніка («цаўё», «цэпавіла», «цапільня») і прымацаванай да яе пры дапамозе раменнай або вяровачнай прывязкі больш кароткай палкі («біч», «бічук»).

Цапільня — круглая, гладка абструганая палка з арэшыны або іншых лёгкіх парод дрэва даўжынёй 1,5—2 м і дыяметрам 3—4 см. Даўжыня цапільна рабілася па росту малацьбіта, каб можна было малаціць стоячы, крыху схіліўшыся ўперад, але не згінаючыся. Біч — круглая (зрэдку чатырохгранная) цурка даўжынёй 50—80 см і дыяметрам 4—5 см з цвёрдых парод дрэва (дубу, грабу, яблыні-дзічкі) з закругленым ніжнім краем. На Палессі біч рабілі з патаўшчэннем у ніжнім канцы. Пры дапамозе сырамятных раменьчыкаў або вяроўкі цапільна і біч рухома злучалі паміж сабой рознымі спосабамі прывязкі такім чынам, каб пры рабоце біч свабодна круціўся вакол цапільна і біў па каласах рассцеленых на таку снапоў. Цэпам паўсюдна на Беларусі малацілі жыта, ячмень, авёс, грэчку.



Стагі збожжа на прыгуменні («гумніско»). Вёска Вуйвічы Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

«Добры гаспадар, — пісаў А. Я. Багдановіч, — насаджваючы ў асець снапы першы раз у гаду, каб прасушыць іх для малацьбы, звычайна кідае сноп жыта ў асетны агонь. Гэта, несумненна, адгалосак першабытных ахвяр агню»[109].



Стагі збожжа на прыгуменні. Рэчыцкі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

Сушка снапоў збожжа ў ёўні (асеці) патрабавала вялікай асцярожнасці і вопыту. Трэба падтрымліваць полымя ў печы ёўні пастаянна невысокім і роўным, каб зерне і салома не пракапціліся. Таму топкай печы займаліся звычайна старыя вопытныя людзі, да таго ж праца гэтая была няцяжкай. Тапілі звычайна невялікімі бярозавымі чурбачкамі, якія пры гарэнні не давалі паху. Звычайна снапы сушылі ноччу, а на досвітку пачыналі малаціць[110].

Прасушаныя ў асеці (ёўні) снапы збожжавых культур пераносілі на посцілках на ток і для абмалоту раскладалі ў два рады ўздоўж яго камлямі наверх, а каласамі на каласы. Даўжыня радоў залежала ад велічыні тока. Рассціл снапоў для разавай малацьбы называўся «пасад» («пасат», «посцел») і складаў звычайна ад 20 да 200 снапоў[111].



Хлебны стажок на полі зімой. Заходняе Палессе. 1928 г. Фота З. Хамянтоўскай



Перавозка снапоў з поля на валах. Вёска Вялікія Аўцюкі Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.

Малацілі мужчыны, жанчыны і падлеткі з 13—14 гадоў у 2, 4, 6 цапоў. Малацьбіты з цапамі станавіліся з двух бакоў раскладзеных на таку снапоў тварам адзін да аднаго і адначасова пачыналі біць бічамі па каласах, паціху ідучы ўздоўж пасада. Малацілі ў такт, бо іначай бічы чапляліся адзін за адзін і праца замаруджвалася. Прайшоўшы пасад з канца ў канец два разы, перавяслы (вязьмо) снапоў разразалі сярпом і зноў малацілі цапамі пасад яшчэ раз. Пасля гэтага гаспадар ці больш вопытны работнік праходзіў уздоўж па радах і пераварочваў салому на другі бок. Пасля паўторнага перабівання салому вытрасалі драўлянымі віламі з двума-трыма зубамі, звязвалі ў кулі і складалі ў гумне ў застаронкі. Вымалачанае зерне адсоўвалі ўбок граблямі, а ток падмяталі мятлой. Затым пачыналі раскладаць снапы ў другі пасад. Пры малацьбе цапамі пасля выдалення буйнай саломы зерне атрымлівалася змешаным з дробнай саломай, часткамі каласоў (мякінай, паловай), камячкамі зямлі, насеннем пустазелля і г. д.



Беларускі селянін з цэпам для малацьбы. «Паляшук». Малюнак невядомага мастака 2-й паловы XVIII ст.

Пасля абеда вымалачанае зерне старанна пераграбалі граблямі, выдаляючы каласы і дробную салому («згоніны»). Ток падмяталі і каля адчыненых дзвярэй гумна прыступалі да веяння намалочанага зерня. Веялі саўковай ручной веялкай з кароткай ручкай («шуфлікам», «веялкай»), седзячы на нізенькім услончыку ці стоячы на адным калене. Звычайна селянін набіраў зерне шуфлікам з кучы і кідаў яго ад



Цапы для малацьбы збожжавых культур. 1953 г. Фота М. Я. Грынблата



Цэп. Малюнак С. Ц. Гунько

сябе паўкругам уздоўж току так, каб добрае цяжкае зерне ляцела далёка наперад, а дрэннае дробнае разам з пустазеллем падала блізка. Каб атрымаць зусім чыстае збожжа, яго правейвалі некалькі разоў[112]. Закончыўшы веянне, венікам аддзялялі добрае зерне ад дробнага, мякіну і ахвосце — ад камячкоў зямлі і каменьчыкаў. Затым збожжа ў мяшках пераносілі ў клець («клець», «свіран», радзей «амбар»).

Клець з'яўлялася аднакамерным зрубным будынкам у плане блізкім да квадрата, памерам прыблізна 5х6 м[113]. Будаўніцтву клеці сяляне надавалі вялікую ўвагу, бо ў ёй захоўваўся іх найбольш каштоўны набытак: збожжа, адзенне, розныя прадукты харчавання і шмат іншых рэчаў. Звычайна клець рубілі як хату. Ніжні вянец зруба ставілі на дубовыя штандары або камені. Прастора паміж падлогай клеці і зямлёй заставалася адкрытай і служыла для вентыляцыі, якая засцерагала збожжа і муку ад псавання.

Перад уваходам рабілі выступаючую пляцоўку («прыклетнік», «пераклець», «ганак»). Для гэтага бярвенні двух першых вянцоў зруба выпускалі на 0,75—1 м вонкі і на канцах злучалі іх бервяном або тоўстай жэрдзю. Зверху насцілалі дошкі[114]. Часам над прыклетнікам рабілі навес і падпіралі яго двума або чатырма слупамі, урубленымі ў падлогу прыклетніка. Тарцовыя сцены рубілі закотам, страху крылі саломай або чаротам. Падлогу насцілалі з тонкіх бярвенняў або плах. Столь у клеці рабілі рэдка, яе ролю выконвала скляпенне страхі.

Унутры клеці ўздоўж сцен з тоўстых дошак або бярвенняў адгароджваліся «засекі» («аруды»), кожны з якіх меў сваё прызначэнне:

для жыта, пшаніцы, аўса, ячменю, мукі і г. д. Многа збожжа, мукі і круп захоўвалася ў бочках, плеценых з саломы і лазы ёмістасцях («саламяніках»), даўблёных кадках («кадлубы», «калдубцы»), мяшках. У бяднейшых малазямельных сялян месцам захоўвання збожжавых запасаў служыла камора — невялікае, адгароджанае ў сенцах памяшканне.

Дадатным бокам малатьбы цапамі з'яўлялася захаванне саломы, якая пры такім спосабе малацьбы мала путалася і лёгка зноў звязвалася ў снапы, калі для пакрыцця стрэх патрабавалася неперабітая салома. Наогул, трэба адзначыць, што на сенніках, напханых жытняй саломай, многія



Малацьба збожжа цапамі на прыгуменні. Заходняе Палессе. 1920–1930-я гг.

стагоддзі спала вясковае насельніцтва Беларусі. У здробненым выглядзе жытняя салома выкарыстоўвалася на корм для валоў і кароў, як подсціл для жывёлы, як уцяпленне для бульбы ў капцах і буртах. На Віцебшчыне і Магілёўшчыне шчытамі («матамі») з жытняй саломы ўцяплялі на зіму вокны. З жытняй саломы і лазовых прутоў плялі сявенькі, ёмістасці для захавання мукі і круп.

Калі тэрмінова патрэбна была невялікая колькасць зерня, сяляне малацілі жыта хвастаннем каласамі снапа аб спецыяльную рашотку (драбіну) або аб калоду, ступу, бочку, барану. Такім жа спосабам у некаторых раёнах Беларусі малацілі жыта на насенне, лічачы, што зерне пры малацьбе цэпам плюшчыцца, драбіцца і не дае добрай усходжасці[115].

Але пры хвастанні (акалоце) снапоў зерне нельга было цалкам выдаліць з саломы. Таму звычайна пасля хвастання снапы яшчэ малацілі ў гумне цапамі.

У старажытнасці для захавання збожжа славяне звычайна карысталіся жытнымі ямамі, аб чым сведчаць упамінанні аб «житных ямах» у «Праўдзе Рускай»[116].



Сяляне з двухрогімі драўлянымі віламі («сахаром»). Вёска Бучын. Заходняе Палессе. 1920-я гг.



Юнак з двухрогімі драўлянымі віламі («сахаром») каля варот гаспадарчай пабудовы. Вёска Лагішын Пінскага павета Мінскай губерні. 1938 г. Фота Д. Георгіеўскага



Ручны шуфлік для веяння зерня. Мястэчка Крэва Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Фота Л. І. Мінько



Шуфлік («веялка») для правейвання зерня. Вёска Парэ Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Пачатак XX ст.

Выкарыстанне ў старажытнасці на беларускіх землях зернявых ям пацвярджаюць і археалагічныя раскопкі селішч і гарадзішч[117]. А. Гваніні ў XVI ст. пісаў, што беларусы і літоўцы, сабраўшы збожжа і змалаціўшы яго, зберагаюць яго ў ямах пад зямлёй, «старанна для гэтага вырытых пад прыкрыццём лясоў і знутры добра вылажаных карой дрэў»[118].

У час Паўночнай вайны, калі тэрыторыя Беларусі была арэнай барацьбы паміж Швецыяй і Расіяй, армія шведскага караля Карла XII прайшла па тэрыторыі цэнтральнай Беларусі з заха-




Дапаможныя прылады для веяння і малацьбы:
а – граблі з прамой галоўкай, вёска Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці;
б – граблі з выгнутай галоўкай, вёска Акропна Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці;
в – вілы двух- і трохзубыя;
г, д – вілы трохзубыя з процівашыпам, вёска Харомцы Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці



Работнікі з панскімі дзецьмі. Палессе.
Пачатак XX ст.



Свіран. Вёска Зязер'е Лагойскай воласці Барысаўскага павета. 1923 г.
Фота Л. У. Дашкевіча





Стары свіран. Вёска Матылі Васілішкаўскага раёна Гродзенскай вобласці. 1954 г. Фота М. Я. Грынблата

Клець. Вёска Рэчыца Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1953 г. Фота М. Я. Грынблата



Плеценыя ёмістасці з лазы і саломы для захавання збожжа і круп: кораб, Лепельскі раён Віцебскай вобласці; шыян, Слонімскі раён Гродзенскай вобласці

ду на ўсход, рабуючы насельніцтва. Камандуючы рускай арміяй князь А. Меньшыкаў даносіў Пятру І, што шведы падвяргаюць сялян катаванням, патрабуючы паказаць ямы, дзе схавана збожжа[119].

А. К. Мейер у канцы XVIII ст. заўважыў, што мясцовыя сяляне абмалочаны хлеб ссыпаюць для захоўвання ў ямы, а іншыя ў амбары[120].

У гэтых ямах, як адзначаў у сярэдзіне XIX ст. П. Баброўскі, збожжа магло захоўвацца некалькі гадоў без усякай порчы[121]. Захаванне збожжа ў ямах Е. Раманаў тлумачыў не толькі імкненнем захаваць галоўны прадукт харчавання ад пажараў, але і параўнальнай лёгкасцю вырабу ям, бо «дрэва зусім не патрабуецца, што важна пры недахопе лясных матэрыялаў»[122]. Але, на наш погляд, у старажытнасці захаванне збожжа ў ямах перш за ўсё было выклікана імкненнем зберагчы яго ад рабавання, бо, як заўважыў А. Гваніні, капалі іх «пад прыкрыццём лясоў».



Захаванне збожжа і мукі ў клеці. Вёска Паплаўкі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Фота П. М. Захаранкі

Месца для хлебнай ямы выбіралі ўзвышанае. Спачатку капалі круглую шыйку ямы папярэчнікам прыблізна ¾ аршына. Калі пракопвалі шыйку ў 1 ½ аршына глыбіні, пачыналі падварочвацца ў бакі, для ўтварэння самой ямы. Гэта частка работы была самая цяжкая. Калі бакі ямы былі пашыраны так, што чалавек мог у ёй паварочвацца, то работа ішла спорна і два капальшчыкі за два дні маглі выкапаць яму на сто чвэрцяў збожжа. Унутранасць ямы мае від гарлачыка або яйца, пастаўленага тупым канцом уверх, а вострым уніз і ўгары шыйку. Велічыня ямы была адвольная, у залежнасці ад патрэбы.

Калі яма была выкапана, яе гадзіны дзве абпальвалі саломай або сухім галлём для закалкі бакоў ад вільгаці. Часам бакі ямы абмазвалі яшчэ глінай і зноў абпальвалі, што засцерагала яе ад мышэй і іншых земляных жывёл. Затым шыйку ямы закладвалі дошкамі, іх засцілалі слоем саломы, на якую насыпалі зямлю, каб паветра не мела доступу да запаса

збожжа. Над зямлёй для лепшай засцярогі ад вільгаці рабілі невялікі зруб са страхой. У такіх ямах без усякай небяспекі ад марозу, вільгаці і мышэй захоўвалі збожжа і бульбу. Але выймалі збожжа з ямы толькі ў сухое надвор'е[123].

У сярэдзіне XIX ст. зерневымі ямамі для захавання збожжа і бульбы карысталася ўжо невялікая колькасць сялянскіх гаспадарак, але яны сустракаліся яшчэ амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва на поўдні і паўднёвым захадзе. Так, І. Эрэміч у сярэдзіне 1860-х гг. адзначаў, што «зерневы хлеб і бульбу ў многіх месцах Палесся сяляне захоўваюць у земляных ямах»[124].

Думка аб стварэнні запасных хлебных магазінаў упершыню была выказана Пятром І. Кацярына ІІ гэтую ідэю ўвасобіла ў жыццё, заснаваўшы іх у гарадах і дзяржаўных уладаннях. Далейшымі ўрадавымі пастановамі запасныя магазіны былі арганізаваны ва ўсіх расійскіх губернях і ў маёнтках для прыгонных памешчыцкіх сялян. Пасля восеньскай уборкі ўраджаю кожная сялянская гаспадарка адсыпала ў магазін па 4 пуды збожжа на кожнага члена сям'і[125]. Сутнасць іх складалася ў тым, што сяляне засыпалі туды насеннае збожжа. Калі год быў ураджайны, магазіны скуплялі яшчэ ў сялян збожжа, забяспечваючы ім збыт, а пры неўраджаі не давалі цэнам на хлеб падымацца. Наглядаць за станам хлебных магазінаў у маёнтках было даручана наглядчыку, які выбіраўся дваранствам кожнага павета.

У падмацаванне харчовых запасаў на выпадак неўраджаю ў губернях былі створаны грашовыя фонды і грамадскія ворныя землі. Распараджэнне харчовымі запасамі і грашовымі капіталамі было ўскладзена на губернскія камісіі народнага харчавання[126], створаныя пры Міністэрстве ўнутраных спраў.

Павятовыя прадвадзіцелі дваранства штогод да 1 кастрычніка прадстаўлялі ў Камісіі народнага харчавання дадзеныя аб ураджаі зерневых, гародніны і садавіны, а члены камісіі прымалі меры па забеспячэнню насельніцтва харчаваннем да новага ўраджаю[127].

Такім чынам, у XIX ст. грамада буйнай вёскі або сяляне некалькіх больш дробных паселішчаў мелі запасны збожжавы магазін (па-сялянску «гамазею»), заснаваны памешчыкам для сваіх прыгонных сялян. Кожны гаспадар уносіў у яго пэўную колькасць збожжа за ўсіх сваіх сямейнікаў (асяніны). Калі хтосьці не мог унесці ўсю вызначаную колькасць збожжа, то дасыпаў пан[128].



Прыстасаванні для ручной малацьбы (акалоту) збожжавых культур:
– козлы драўляныя для абівання снапоў, вёска Ушчэлёпкі Расонскага раёна Віцебскай вобласці;
– драбіна, вёска Рыскаў Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці.
Малюнак С. Ц. Гунько






Зерневая яма:
а – паверхня зямлі;
б – шыйка ямы ў папярэчніку $^{3}/_{4}$ аршына
і ў глыбіню $1^{1}/_{2}$ аршына;
в – яма ў 2 сажні глыбіні і ў $^{1}/_{2}$ сажня ў папярэчніку;
г – сцены зруба над ямай;
д – страха зруба;
е – бугор зямлі вакол зруба ямы і над дошкамі перакрыцця
ўваходу ў шыйку ямы.
Малюнак Ю. А. Павалія

Зернавая яма. Гомельскі павет
Магілёўскай губерні.
Малюнак С. Ц. Гунько

Напрадвесні кожны з сялян мог пазычыць з ссыпнога магазіна патрэбнае яму зерне, якое мералі спецыяльнай меркай пад брусок (пад шчорк), а пасля жніва павінен быў вярнуць яго той жа мерай, але «з каптуром» (з верхам). Пад наглядам старасты вёскі магазінам загадваў панскі цівун, які, будучы непісьменным, рабіў зарубкі на кавеньцы (бірка) аб прыходзе і выдачы збожжа, а дворны пісар запісваў гэтыя дадзеныя ў кнігу, выдадзеную губернскай камісіяй народнага харчавання на чале з куратарам, які перыядычна рэвізаваў сялянскі ссыпны магазін[129].

Збожжавы магазін размяшчаўся звычайна пасярод вёскі і звонку мала чым адрозніваўся ад свірна ў панскім двары. Будавалі яго звычайна з лепшага будаўнічага матэрыяла на палях (штандарах) паўмятровай вышыні над зямлёй. Падлогу рабілі падвойную са смалістых дошак, крылі драніцамі, гонтам, саломай або чаротам (трыснягом). Унутры знаходзіліся стацыянарна ўбудаваныя вялікія скрыні (засекі) на азімае і яравое збожжа[130].

Пасля рэформы 1861 г. адказнасць за стан ссыпных магазінаў была ўскладзена на валасныя органы сялянскага самакіравання і яго службовых асоб. Валасны грамадскі магазін павінен быў забяспечыць збожжам сялян воласці ў выпадку неўраджаю, вызванага засухай або якім-небудзь іншым прыродным бедствам. Загадваў грамадскім ссыпным магазінам выбраны на тры гады сельскім сходам селянін (гамазейшчык), які пад наглядам валаснога старасты прымаў і выдаваў збожжа. Кантраляваў магазін валасны старшыня. Таму, прымаючы магазін ад свайго папярэдніка, старшыня перамяраў збожжа, а потым зрэдку рэвізаваў магазін пры дапамозе

валаснога пісара. За дзейнасцю валасных службовых асоб сачылі павятовыя і губернскія ўлады, пачынаючы ад міравога пасрэдніка і прадвадзіцеля дваранства да губернскай камісіі народнага харчавання[131].

Для захавання ўсходжасці збожжа ў ссыпных грамадскіх магазінах яго запас сяляне штогод замянялі на свежы (калі збожжа засыпалі сырамалотным), а ў мясцовасцях, дзе збожжа ў ссыпны магазін паступала прасушаным з асецяў (ёўняў), яго замянялі праз два гады. Гэтыя правілы чыталі і тлумачылі сялянам на валасных і вясковых сходах, яны былі вывешаны пад шклом у кожным валасным праўленні[132].

У 1876 г. у запасных хлебных магазінах Гродзенскай губерні былі знойдзены насякомыя, якіх сяляне празвалі «ваўчкамі». Гэтыя шкоднікі знішчалі зерне азімага і яравога збожжа да шкарлупы. Самка «ваўчка» адкладвала па яйку ў кожнае зерне, але не апускалася глыбей 4—6 вяршкоў у кучу збожжа. Праз некалькі дзён з яйка выходзіла лічынка, якая пажырала ўсю ўнутранасць зерня, потым яна ператваралася ў кукалку, з якой праз дзесяць дзён выходзіла ў выглядзе жучка. Перыяд развіцця насякомага працягваўся ад шасці да сямі нядзель. Шкоднік не выносіў святла і холаду, таму яго размнажэнне папярэджвалі праветрываннем зерня ў ясныя і марозныя дні. Знішчыць насякомага можна было і прасушкай збожжа ў печы, але тады зерне станавілася непрыгодным для сяўбы.



Грамадскі хлебны магазін («гамазея»). Вёска Парэчча Ігуменскага павета Мінскай губерні. 1905 г. Фота В. К. Косткі

Калі ў хлебным сялянскім магазіне заводзіліся «ваўчкі», зерне вяршкоў на шэсці здымалі і аддзялялі ад астатняга, яшчэ не пашкоджанага. Знятае зерне сяляне прасушвалі ў печах, а непашкоджанае праветрывалі на сонцы і марозе[133].

Да 1891 г. у пяці беларускіх губернях налічвалася 5546 грамадскіх хлебных магазінаў, у якіх захоўвалася 4406122 асьміны[134] збожжа. На будоўлю і ўтрыманне гэтых магазінаў сяляне выдаткоўвалі значныя сродкі, але лічылі збожжа з гэтых магазінаў дрэнным па якасці і стараліся не выкарыстоўваць яго на пасевы[135].

Старажытнай прыладай для размолу зерня ў муку ў хатніх умовах служыў ручны млын — жорны. Па археалагічных дадзеных, жорны вядомы на тэрыторыі рассялення ўсходніх славян з VIII ст.[136] На Беларусі з даўніх часоў бытавалі круглыя каменныя жорны[137], якія выраблялі з пясчаніку, буйна-зярністага граніту, дыярыту. Яны былі неабходнай прыналежнасцю амаль кожнай сялянскай сям'і яшчэ ў пачатку XX ст. Каменныя жорны складаліся з двух камянёў: ніжняга нерухомага і верхняга, які круціўся вакол жалезнага вертыкальнага штыра, размешчанага ў цэнтры ніжняга каменя. Камяні жорнаў звычайна былі дыяметрам 55—70 см, а вышынёй 15—20 см. Ніжні камень («поднік») быў звычайна таўсцейшы, а верхні («жарнак», «верхавік») — больш лёгкі. Верхні камень меў у цэнтры адтуліну для засыпкі зерня («вока») дыяметрам прыблізна ў 10 см. Каб зерне лепш размяркоўвалася паміж камянямі, ніжні камень меў выпуклую рабочую паверхню, а верхні адпаведна ўвогнутую. Верхавік мог крыху падымацца і апускацца пры дапамозе паўпрыцы — жалезнай крыжавіны, якая круцілася на штыры ніжняга каменя і рэгулявала тонкасць памолу. Верхні камень прыводзіўся ў рух пры дапамозе доўгай ручкі — кія («млён», «мялён», «млін»), адзін канец якога ўстаўляўся ў бэльку ці ў спецыяльную планку, прыбітую да сцяны, а другі — у жалезную скабу на краю верхняга каменя[138]. Значная частка бытаваўшых на Беларусі жорнаў мела кароткую ручку. Часта жорны рабілі без паўпрыцы, тады мука атрымлівалася аднаго памолу.

У мясцовасцях, дзе не было жорных камянёў, жорны рабілі з дзвюх дубовых калодак, на рабочую частку якіх набівалі кавалачкі чыгуну або жалеза. Пры аднатыпнасці прынцыпу работы каменных і драўляных жорнаў падстаўкі для іх рабілі самыя разнастайныя. Часцей за ўсё гэта была дашчаная квадратная скрыня, замацаваная на чатырох драўляных ножках, або драўляны цурбан, зроблены з такім разлікам, каб можна было працаваць стоячы. За дзень на жорнах можна было змалоць дватры пуды мукі, але гэтая праца была вельмі цяжкая і малапрадукцыйная. Звычайна малолі невялікую колькасць зерня на штодзённыя патрэбы па меры неабходнасці.

Традыцыйнай прыладай для апрацоўкі зерня на крупы была ступа. На Беларусі бытавалі ручная і нажная ступы. Ручную ступу рабілі з кавалка тоўстага ствала дрэва цвёрдых парод, часцей за ўсё ў выглядзе вялікага кілішка вышынёй 110—120 см. У верхняй частцы ступы выдзёўбвалі або выпальвалі конусападобную выемку глыбінёй 40—50 см і дыяметрам у верхняй частцы 35—40 см.

Зерне ў ступе таўклі таўкачом — тоўстай гладка выструганай палкай з закругленымі канцамі даўжынёй 90—110 см. Для зручнасці трымання на сярэдзіне таўкача рабілі выемку. Зерне перад таўчэннем сушылі, а ў час працы для таго, каб лепш аддзялялася шалупінне, крыху змочвалі вадой. Часта таўклі ў два таўкачы[139].

На Палессі і ў Паўднёвай Беларусі поруч з ручнымі былі пашыраны і нажныя ступы. Рабілі такую ступу з тоўстага цурбана вышынёй 50—60 см, у якім выдзёўбвалі чашападобнае заглыбленне для засыпкі зерня. Таўкач мацаваўся на канцы доўгага тоўстага бруса-рычага, які падымаўся і апускаўся нагамі чалавека, які на ім стаіць.

У ступах звычайна таўклі авёс, ячмень, проса, каноплі. Стоўчаныя крупы прасявалі праз рэшата або правейвалі («пылалі») у невялікіх драўляных начовачках («апалушках»), падтрэсваючы на ветры.



Жорны драўляныя пачатку XX ст., набітыя кавалачкамі чыгуну. Вёска Мазалава Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. 1955 г. Фота М. Я. Грынблата



Жорны каменныя. Вёска Доўгае Салігорскага раёна Мінскай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько



Жорны драўляныя, набітыя кавалачкамі чыгуну. Вёска Вялікае Стахава Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько



Драўляныя жорны, набітыя кавалачкамі чыгуну. Пачатак XX ст.

У XIX ст. значную частку збожжа сяляне малолі на бліжэйшых вадзяных або ветраных млынах, якія працавалі па прынцыпу жорнаў. Вадзяныя млыны будавалі на берагах рэк, праточных азёр. Сярод іх найбольш распаўсюджанымі былі колавыя млыны, асноўнай часткай якіх з'яўлялася вялікае вертыкальна пастаўленае кола, насаджанае на гарызантальную вось. Звычайна кола прыводзілася ў рух сілай падаючай на яго вады з плаціны запруджанай ракі.

На паўнаводных рэках паўднёвай Беларусі — Гарыні, Прыпяці, Стыры — былі наплаўныя млыны. Платформай для іх служылі паром ці баржа. Колы наплаўных млыноў прыводзіліся ў рух цячэннем вады.

Найбольш багатыя млынары ў канцы XIX — пачатку XX ст. сталі замест колаў прымяняць турбіны, што значна павышала энергетычную магутнасць вадзяных млыноў. Часцей за ўсё такія млыны мелі некалькі каменных паставаў і будаваліся з цэглы двухпавярховымі. Аднак пераважная большасць вадзяных млыноў на Беларусі былі невялікімі, драўлянымі на адзін-два паставы[140].



Ручныя ступы:
– з вёскі Юшкавічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці;
– з вёскі Аніскавічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці;
– з вёскі Рачкавічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці.
Малюнак С. Ц. Гунько



Жанчыны таўкуць ячмень у ступе на крупы. Мястэчка Гародна Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота А. І. Сербава



Нажная ступа. Вёска Дольск Любяшоўскай гміны Пінскага павета. 1936 г. Фота Д. Георгіеўскага

Збудаваныя дзе-небудзь за вёскай на адкрытым узвышшы ветраныя млыны («ветракі») было відаць здалёку, яны ажыўлялі навакольны пейзаж. Ветракі прынята падзяляць на два тыпы: слупавыя (стрыжнёвыя) і шатровыя. Найбольш распаўсюджанымі на тэрыторыі ўсёй Беларусі былі стрыжнёвыя ветракі на адзін каменны пастаў, малай прадукцыйнасці, што тлумачыцца панаваннем на вёсцы натуральнай і паўнатуральнай гаспадаркі. У стрыжнёвым млыне пры працы разам з крыламі па ветры паварочваўся ўвесь корпус, замацаваны на крыжавіне з тоўстага бярвення.



Вадзяны двухколавы (на два паставы) млын ніжняга бою вады. Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько



Начовачкі для правейвання зерня і круп («апалушкі»). Малюнак С. Ц. Гунько



Вадзяны млын. Вёска Крупава Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. 1979 г.



Слупавы (стрыжнёвы) млын («вятрак») 1920-я гг.



Ветраны ступовы млын («казлоўка»). Вёска Лучын Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Малюнак С. Ц. Гунько



Шатровы млын. Палессе. 1920–1930-я гг.



Жняярка на азімым полі. Пачатак XX ст.

З развіццём капіталістычных адносін поруч са стрыжнёвымі ветракамі сталі будаваць шатровыя з двума і больш паставамі, якія ўяўлялі сабой вялікае башнепадобнае збудаванне, усталяванае на шматкутным або круглым зрубе з бярвення. У шатровых млынах па ветру рухалася толькі верхняя частка — шацёр («шапка»), дзе размяшчаўся гарызантальны вал, на канцы якога мацаваліся крылы.

Больш за ўсё ветракоў было ва ўсходніх, паўднёва-ўсходніх і частцы цэнтральных раёнаў Беларусі, тады як на Віцебшчыне, дзе шмат праточных азёр і рэк, былі пашыраны вадзяныя млыны. На Брэстчыне часта сустракаліся невялічкія стрыжнёвыя ветракі вышынёй 4—5 м, якія абслугоўвалі жыхароў аднаго хутара ці двара[141].



Уборка ячменю жняяркай. Фота Латышэўскага

Развіццё капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX ст. выклікала значныя зрухі ў спосабах уборкі і апрацоўкі ўраджаю сельскагаспадарчых культур. Каб справіцца з гэтай працай у найбольш кароткі тэрмін і без страт, заможныя сяляне, асабліва тыя, што выйшлі на хутары, у пачатку XX ст. пачалі купляць жняяркі-лабагрэйкі. Іх вартасцю было тое, што жняярку можна было прымяняць для ўборкі палеглых пасеваў, на ўчастках з нізкім хлебастоем, а таксама на няроўных па рэльефу палях. Лабагрэйка механізавала толькі зрэзку сцёблаў хлебных культур і ўкладку іх у кучкі. Скідванне зрэзанай масы з платформы жняяркі рабілася ўручную. Жняярка прыводзілася ў рух канямі і дазваляла рэгуляваць вышыню ржышча.

М.М. Улашчык пісаў, што ў яго вёсцы, што знаходзілася ў 40 км ад Мінску, жняяркі з'явіліся на пачатку XX ст., а ў 1914 г. іх было ўжо пяць. Усе яны былі сістэмы Мак-Корміка або Дырынга. Але, маючы жняяркі, сяляне ніколі не жалі імі ўсё сваё збожжа. Яны баяліся страціць частку ўраджаю, таму сярпом убіралі пшаніцу і найбольш рослае і каласістае жыта, якое ішло на насенне. Жняяркай баяліся жаць ячмень, бо ў спелага ячменю лёгка адскоквалі каласы[142].

Працуючы ў сярэднім тэмпе, жняяркай можна было зжаць за дзень 2–3 гектары, а дзве-тры жняі без асаблівых намаганняў звязвалі жыта на гэтай плошчы ў снапы[143].

З канца XIX ст. заможныя сяляне сталі актыўна набываць механічныя малацілкі («малатарні»). Найбольшае пашырэнне на Беларусі атрымалі малатарні з конным прыводам. Малатарня складалася з барабана і надбарабання (дэкі), якія былі ўстаноўлены на драўлянай станіне. На барабане і на надбарабанні былі ўмацаваны зуб'і, прычым зуб'і дэкі заходзілі між зуб'яў барабана. У гумне, клуні ці хляве, малатарню ставілі на драўляную раму. Да малатарні прымацоўвалі стол даўжынёй каля 170—180 см і шырынёй каля 85 см.

На гумнішчы рабілі манеж такой велічыні, каб на ім размясціліся прывод і кругавая дарожка для коней, якім пры рабоце завязвалі вочы. Па ўспамінах М. Улашчыка, у драўляную малатарню ўпрагалі трох коней, якіх па кругу ганялі два чалавекі. Гаспадар стаяў за «сталом» і падаваў

Агульны выгляд фабрычнай жняяркі Мак-Корміка. Пачатак XX ст.





Схема работы малатарні

ў барабан развязаныя снапы каласамі ўперад. Звычайна з гаспадаром працавалі яшчэ два-тры чалавекі: адзін падаваў развязаныя снапы, двое іншых адграбалі і адкідвалі ад малатарні салому[144]. За дзесяць гадзін на коннай малатарні можна было змалаціць ад 600 да 1000 снапоў жыта сярэдняй вязкі[145], тады як цэпам адзін чалавек мог змалаціць за дзень толькі 1 капу жыта. Пры малацьбе на малатарні стаяў вялікі шум і было шмат пылу. Але, па ўспамінах старых людзей, ніхто не мітусіўся, былі парадак і дысцыпліна. Камандаваў гаспадар, які стаяў ля стала і падаваў у малатарню снапы. Усе яго слухалі[146].

На Беларусі з 1843 г. існаваў мясцовы выраб сельскагаспадарчых машын. Напрыклад, у мястэчку Ракаў рабілі малатарні, веялкі, сячкарні, якія знаходзілі збыт і за межамі Мінскай губерні.




Конны прывад для малатарні. Ігуменскі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Манеж коннай малатарні. Вёска Павіцце Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. 1920-я гг.

У 1910 г. у Віцебскай губерні адна малатарня прыходзілася на 224 дзесяціны ворнай зямлі ў сялян, у Гродзенскай — на 589 дзесяцін[147]. Аднак калі ў заможнай вёсцы Віцкаўшчына малатарні мелі ўсе гаспадары, апрача аднаго[148], то ў аддаленых ад гарадоў вёсках малатарні былі ў аднагодвух гаспадароў, а ў многіх вёсках іх зусім не было.

Такое ж становішча ў пачатку XX ст. назіралася і з машынамі для веяння зерня. У Віленскай губерні адна веялка прыходзілася на 433 дзесяціны ворнай сялянскай зямлі, у Гродзенскай — на 763 дзесяціны[149]. Веялкі-сартыроўкі (арфы) прызначаліся для ачысткі зерня паветраным патокам вентылятара, а сартаванне праводзілася рэшатамі. Неачышчанае зерне вёдрамі падавалі ў засыпны коўш, з якога яно сыпалася ўніз тонкім слоем і прадувалася паветраным патокам вентылятара, дзякуючы чаму



Мацаванне коннага прываду ў манежы. Ігуменскі павет Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Сялянская малатарня кустарнага вырабу. Вёска Узляны Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

з зерня выдаляліся палова, перабітая салома, пыл і іншыя прымесі, а затым зерне праходзіла далейшую апрацоўку і сартыроўку на рэшатах. На такой веялцы-сартыроўцы працавалі два чалавекі, ды часам хлопчык ці дзяўчынка адграбалі правеянае збожжа. За дзень можна было правеяць 5—8 т збожжа[150].



Фабрычнага вырабу малатарня і саламарэзка (злева). Узлянскі сельскагаспадарчы склад Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Ручная малатарня сістэмы Морыца Вейла, пераробленая ў конную. Пачатак XX ст.



Веялка-сартыроўка

У жніўні і верасні ішла ўборка проса, лёну, канапель, грэчкі і бульбы. Проса і грэчку жалі, лён і каноплі рвалі рукамі, бульбу выкопвалі рыдлёўкай, выворвалі сахой або плугам.

Проса, прасушанае на полі, цэпам не малацілі, а абівалі на посцілцы пранікам (вальком). У многіх мясцовасцях на Палессі зерне проса з мяцёлак выдалялі пераціраннем яго босымі нагамі[151].

Лён убіралі розным спосабам у залежнасці ад таго, на якія патрэбы яго хацелі выкарыстаць. Прызначаны на продаж лён выбіралі (рвалі з коранем) яшчэ зеленаватым, зразалі галоўкі, звязвалі ў снапы і замачвалі ў рэках, азёрах, сажалках або балотах. Калі гэта ўдавалася зрабіць у адзін дзень, не даўшы лёну падсохнуць, то з яго атрымлівалася белае валакно. У вадзе ён мокнуў да таго часу, пакуль пры абкручванні сцябла вакол пальца кастра лёгка не адставала ад валакна. Тады яго выцягвалі з вады і рассцілалі на лузе для сушкі. Прасохлы лён вязалі ў вялікія снапы



Веялка-сартыроўка. Узлянская зернеачышчальная станцыя Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



Уборка (церабленне) льну. Вёска Юравічы Бабруйскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

(кулі) і ставілі пад стрэхі. У вольны час яго мялі на мялках, а затым трапалі і ачышчанае ад кастры валакно складалі ў 25-фунтовыя «пудзікі». 20 пудзікаў састаўлялі беркавец — 500 фунтаў[152].

Для хатняга ўжытку лён выбіралі поўнасцю спелым і развешвалі на плоце або азяродах для прасушкі. Праз некалькі дзён сухі лён абмалочвалі валькам («пранікам») і рассцілалі на нізкіх лугах або на берагах рэк, дзе ён ад расы і вільгаці размякаў і кастра пачынала лёгка аддзяляцца ад валакна. Затым яго высушвалі ў лазні або ў хаце на печы і складалі ў клеці ці гумне. Такі лён называўся сланцам. Па віду ён быў чарнейшы за мочаны, але валакно атрымоўвалася значна мякчэйшым за таварны лён. Толькі сланец ішоў на выраб розных сартоў сялянскага палатна[153].



Сушка снапоў ільну на плоце. Вёска Самаседаўка Крупскага раёна Мінскай вобласці. 1959 г. Фота Н. І. Камсюк



Мялка для лёну. Вёска Лучнікі Слуцкага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст. Фота І. А. Сербава

Сялянка абмалочвае лён пранікам. Заходняе Палессе. 1920–1930-я гг. Фота Ю. Абрэмбскага





Трапанне лёну. Канец XIX – пачатак XX ст.



Дзяўчына за прасніцай. Вёска Шапчыцы Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. 1903 г. Фота В. К. Косткі



Адбельванне льняных палотнішчаў на сонцы. 1930–1935-я гг. Фота З. Хамянтоўскай



Праллі. Ваколіца Янава-Палескага. 1930-я гг. Фота Ю. Абрэмбскага



Капанне бульбы на Палессі. 1932 г. Фота З. Хамянтоўскай

Бульбу сяляне капалі з канца жніўня і да наступлення замаразкаў. Выворвалі яе сахою, а тыя члены сям'і, што ішлі за аратым, збіралі бульбу ў кашы і ссыпалі ў кучу, якую рабілі на ўбраным участку поля. Затым бульбу сартавалі, адбіраючы насенную, для харчавання і на корм жывёле. Пасля гэтага поле баранавалі і зноў аралі, каб выбраць астаткі ўраджаю, якія яшчэ засталіся нявыбранымі ў зямлі[154].

У памешчыцкіх гаспадарках, каб больш чыста выбраць бульбу, работнікі першы раз выкопвалі яе рыдлёўкамі, а затым поле два разы пераворвалі сахой або плугам. У Магілёўскай губерні ў другой палове XIX ст. лепшымі сартамі бульбы лічыліся «Ковенка», «Быхаўскі», «Брокаўка», «Праліфік», «Новы сіні іспалінскі», «Ранні шасцітыднёвы», «Вікторыя»[155]. Пры выкопванні на два рады бульбы станавіўся мужчына са звычайнымі жалезнымі віламі. Ён утыкаў вілы ў зямлю, выварочваў куст бульбы на адным радзе, потым на другім і так да канца дзесяціны. За кожным капальшчыкам звычайна ішлі чатыры чалавекі, па два на кожны рад бульбы. Яны бралі выкапаны куст за бульбоўнік бліжэй да карэння і моцна трэслі. Бульбу, якая абвалілася, збіралі ў кашы. Выкапаная ў сухое надвор'е бульба лепш захоўвалася[156]. На невялікіх плошчах бульбу капалі рыдлёўкай.

Ураджай бульбы толькі ў асабліва неспрыяльных кліматычных умовах складаў менш сам-4, звычайна ж быў не ніжэй сам-6, сам-9. Памешчыкі садзілі вялікія плошчы бульбы ў асноўным на вінакурэнне, а ў сялян яна ішла на харчаванне[157]. Каб выкапаць адну дзесяціну бульбы за дзень, у сярэдзіне XIX ст. патрабавалася дзве сахі, пара коней і прыблізна 40 работнікаў[158].

У XIX ст. сяляне захоўвалі бульбу ў сухіх паграбах, у кучах, уцепленых саломай і засыпаных зямлёй, і зрэдку ў хлебных ямах.

Пры захоўванні бульбы ў сухіх паграбах падлогу ўсцілалі саломай або сухім галлём, на якое сыпалі бульбу, і, каб пазбегнуць распаўсюджання гнілі ад пашкоджаных клубняў, перакладвалі тым жа сухім галлём. Зімой у цёплае надвор'е пограб адкрывалі і перагрaбалі бульбу лапатай.



Закладка бульбы ў капец на зіму. Хутар у Клінокскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

а





б

Кошыкі для пераноскі бульбы, сплеценыя з лазы:
а – вёска Жыдомля Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці;
б – вёска Старыя Дзятлавічы Дзятлавіцкага раёна Гродзенскай вобласці;
в – вёска Рыскаў Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці;
г – вёска Праскурні Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці.
Малюнак С. Ц. Гунько

в



г



У сырых паграбах рабілі дзве падлогі, адна над адной на адлегласці прыблізна двух чвэрцяў. Ніжняя падлога нічым не ўсцілалася, а верхняя засыпалася глінай або бітай цэглай, моцна ўтоптвалася і добра высушвалася. Пад ніжняй падлогай пракопвалі вадасцёкавую канаву для знішчэння сырасці. Бульба перакладвалася сухім галлём, века пограба не зачынялі да наступлення пастаянных маразоў, а ў час адлігі зноў адкрывалі.

У кучах бульбу захоўвалі наступным чынам. На ўзвышаным месцы ўкопвалі высокі кол і з дапамогай вяроўкі і другога калá абмалёўвалі на зямлі круг ад 5 да 7 аршын у радыусе. У гэтым крузе выкопвалі яму ў 1½ аршына глыбіні з плоскім дном. Бакі і дно ямы абкладвалі саломай, а ў сярэдзіне ўбівалі кол і сыпалі бульбу, пакуль пад паверхняй зямлі не атрымоўваўся правільны капец, які не выходзіў за краі ямы. Потым бульбу закрывалі зверху сенам або саломай. На кол у сярэдзіне ямы надзявалі моцназвязаны сноп саломы камлём угару і кучу засыпалі вынятай з ямы зямлёй слоем не меней 1½ аршына, шчыльна ўтрамбоўвалі рыдлёўкай. На выпадак адлігі знізу ямы рабілі адтуліну, якая была закрыта ў моцныя маразы, а ў час адлігі яе адкрывалі, каб засцерагчы бульбу ад перагрэва[159]. Часам у Ігуменскім павеце зверху зямлі яму для цяпла ўкрывалі яшчэ гноем[160].

Такім чынам, традыцыйная земляробчая культура беларусаў была аднатыпнай на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У фарміраванні яе нацыянальнай адметнасці вызначальная роля належала старажытнай этнічнай традыцыі, сягаючай сваімі каранямі ў дахрысціянскія часы.

Па спосабах і прыладах першаснай апрацоўкі ўраджаю, як адзначала Л.А. Малчанава, на Беларусі вылучаюцца дзве гаспадарча-культурныя зоны: паўночна-ўсходняя і паўднёва-заходняя[161].

Для паўночна-ўсходняй зоны — тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай абласцей і ўсходніх раёнаў Гомельскай вобласці — характэрны гумны з вогненай сушняй для снапоў збожжавых культур.

Адметнасцямі паўднёва-заходняй зоны — тэрыторыя Гродзенскай, Брэсцкай, Мінскай абласцей і заходніх раёнаў Гомельскай вобласці — з'яўляюцца значна меншыя па памерах пабудовы для першаснай апрацоўкі збожжавых культур (клуні), якія не маюць агнявой сушні, захаванне збожжа ў стагах і азяродах, малацьба сырамалотам. У фарміраванні гэтых асаблівасцей значную ролю адыгрывалі кліматычныя ўмовы рэгіёнаў. Пры гэтым старажытныя прылады ўборкі зерневых культур (сярпы) і прылады іх першаснай апрацоўкі (цапы, ручныя веялкі) былі аднатыпнымі на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Значны ўплыў на земляробчую культуру беларусаў аказала цеснае ўзаемадзеянне з суседнімі народамі: украінцамі, рускімі, палякамі і прыбалтамі.

Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы актыўна закранула толькі найбольш маёмасных жыхароў вёскі, якія куплялі сельскагаспадарчыя машыны (малатарні, веялкі, жняяркі), уводзілі травасеянне, шматполле. Асноўная маса беларускага сялянства і ў канцы XIX — пачатку XX ст. набывала толькі жалезныя прылады працы (плугі, бароны), працягваючы карыстацца архаічнымі спосабамі ўборкі і апрацоўкі ўраджаю.

[1] Прыпяцкае Палессе: ад старажытнасці да сучаснасці: гісторыя рэгіёна Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» / Ю. М. Бохан [і інш.]; рэдкал. А. А. Каваленя [і інш.]. Брэст, 2013. С. 226.
[2] Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 3: Гродзенскае Панямонне: 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. Мінск, 2006. С. 193.
[3] Сержпутовский А. К. О завитках в Белоруссии // Живая старина. 1907. Вып. 1. С. 33–34.
[4] ИЮМ. Вып. 6. 1874. С. 315.
[5] Кудринский Ф. Белорусы (Общий очерк) // Виленский календарь на 1905 г. Вильна, 1905. С. 107.
[6] Сержпутовский А. К. О завитках в Белоруссии. С. 37.
[7] Асінавае дрэва, па павер'і беларусаў, валодае вялізнай сілай процідзеяння нячыстай сіле.
[8] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. М., 1874. С. 141–142.
[9] Сержпутовский А. К. О завитках в Белоруссии. С. 37.
[10] Там же. С. 38.
[11] Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. С. 143.
[12] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 132. Арк. 43.
[13] Тамсама. Арк. 43–44.
[14] Тамсама. Воп. 11. Спр. 9. Арк. 32.
[15] Мінько Л. І. Серп // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 460.
[16] Сцяшковіч Т. Ф. Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці. Мінск, 1972. С. 602.
[17] Прыказкі і прымаўкі: у 2 кнігах / рэд. А. С. Фядосік. Кн. 1. Мінск, 1976. С. 134.
[18] Сербаў І. А. Вічынскія паляне: матэрыяльная культура : этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся. Мінск, 1928. С. 40.
[19] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 14.
[20] Сербаў І. А. Вічынскія паляне... С. 39.
[21] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Быт белоруса. Вильна, 1912. Вып. 8. С. 239.
[22] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : соч. в 3 т. Т. 3. СПб., 1902. С. 235.
[23] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 240.
[24] Там же. С. 239.
[25] Постаць – паласа жыта, якую жняя захоплівала сярпом пры жніве.
[26] Сербаў І. А. Вічынскія паляне... С. 39.
[27] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности (этнографические данные). Витебск, 1895. С. 448.
[28] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 237.
[29] Там же. С. 234–235.
[30] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 240.
[31] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 16; Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 1. Ч. 1. С. 264; Т. 3. С. 244.
[32] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 449.
[33] Там же. С. 450.
[34] Federowski M. Lud bialoruski. T. IV. Warszawa, 1958. S. 743.
[35] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 132. Арк. 16.
[36] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2. СПб., 1863. С. 37. (Далее: Бобровский П. Гродненская губерния.)
[37] Корева А. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Виленская губерния. СПб., 1861. С. 438. (Далее: Корева А. Виленская губерния.)
[38] Войта В. К. История одного хозяйства северо-западных губерний. СПб., 1880. С. 15.
[39] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 8. Арк. 4; Воп. 14. Спр. 113. Арк. 19.
[40] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 240.
[41] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 237.
[42] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 239.
[43] Веснавыя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, В. І. Ялатаў; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. Мінск, 1979. С. 152.
[44] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў / рэд. В. К. Бандарчык. Мінск, 1974. С. 58. Карта № 9.
[45] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 14.
[46] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 452.
[47] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 57.
[48] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 203. Арк. 3–4; Спр. 455. Арк. 4–5.
[49] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 58. Карта № 9.
[50] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 18.

[51] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 449.
[52] Капа — 60 снапоў.
[53] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 453.
[54] Корева А. Виленская губерния. С. 436.
[55] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 452.
[56] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 455. Арк. 4–5.
[57] Тамсама. Спр. 452. Арк. 8.
[58] Тамсама. Арк. 5, 8.
[59] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 60.
[60] Тамсама.
[61] Дыялекталагічны атлас беларускай мовы. Мінск, 1963. С. 876.
[62] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 453. Арк. 5–6.
[63] Русские. Историко-этнографический атлас. М., 1967. С. 81–82.
[64] Горленко В. Ф., Бойко І. Д., Куницький О. С. Народна землеробська техніка українців. Київ, 1971. С. 91–93.
[65] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 450–451.
[66] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 240.
[67] Там же. С. 260.
[68] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Ч. І. М., 1916. С. 201–202.
[69] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 262.
[70] Там же. С. 263.
[71] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 235–237.
[72] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 265–266.
[73] Земляробчы каляндар (абрады і звычаі). Мінск, 1990. С. 253–254.
[74] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 268.
[75] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 237; Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 263.
[76] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 807. Арк. 6.
[77] Корева А. Виленская губерния. С. 435.
[78] Байрам. 1997. Вып. 3. С. 61–62.
[79] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 11. Спр. 370. Арк. 7.
[80] Эремич И. Очерки Белорусского Полесья. Вильна, 1868. С. 8.
[81] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 60.
[82] Война В. К. История одного хозяйства северо-западных губерний. С. 13.
[83] Повесть временных лет. Ч. 1. М.; Л., 1950. С. 73, 113, 190; Правда Русская. Т. 1 / под ред. Б. Д. Грекова. М., 1940. С. 39, 79.
[84] Черных П. Я. Очерк русской исторической лексикологии. М., 1960. С. 60.
[85] АВАК. Т. XIV. С. 259.
[86] Гуркоў У. Гумно // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 162.
[87] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 506.
[88] Гуркоў У. С. Гумно. С. 162.
[89] Гурков В. С., Гошко Р. Ю. Поселения // Полесье. Материальная культура. Киев, 1988. С. 313.
[90] Moszynski K. Polesie wshodnie. Warszawa, 1928. S. 107–108.
[91] Беларускае народнае жыллё / Э. Р. Сабаленка [і інш.]. Мінск, 1973. С. 86.
[92] Слово о полку Игореве / под ред. В. П. Андриановой-Перетц. М.; Л., 1950. С. 25.
[93] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 21.
[94] Беларускае народнае жыллё. С. 86 (карта № 17).
[95] Гуркоў У. С. Асець // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989. С. 38.
[96] Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае. Из материалов по истории развития славянских жилищ. Вильна, 1907. С. 253.
[97] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 39.
[98] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 112. Арк. 43.
[99] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 235.
[100] Там же. С. 383.
[101] Там же. С. 349.
[102] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 238–239.
[103] Там же.
[104] Там же. С. 383.
[105] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 39.
[106] АВАК. Т. XVII. С. 279.
[107] Улашчык М. Была такая вёска: гістарычна-этнаграфічны нарыс / пераклад з рус. мовы У. Арлова. Мінск, 1989. С. 60; Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 72.
[108] Pietkiewicz Cz. Polesie rzeczyckie. Cz. 1. Kultura materialna. Krakow, 1928. S. 90.
[109] Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / этнографический очерк. Гродно, 1895. С. 17.
[110] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 132. Арк. 55.

[111] Тамсама. Воп. 11. Спр. 9. Арк. 18, 20.
[112] Улашчык М. Была такая вёска. С. 62.
[113] Беларускае народнае жыллё. С. 88.
[114] Тамсама.
[115] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 67.
[116] Правда Русская. Т. 1. С. 126.
[117] Очерки по археологии Белоруссии / редкол.: В. Ф. Исаенко [и др.]. Минск, 1970. Ч. 1. С. 91, 229.
[118] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мінск, 1936. Раздз. 3. № 29. С. 136.
[119] Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997. С. 141.
[120] Мейер А. К. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 года // Могилевская старина. Могилев, 1901. Вып. 2. С. 100.
[121] Бобровский П. Гродненская губерния. Ч. 2. С. 40.
[122] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 22.
[123] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 5. Спр. 117 (1841 г.).
[124] Эремич И. Очерки Белорусского Полесья. С. 8.
[125] Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. Мінск, 2002. С. 170.
[126] НГАБ у г. Гродна. Ф. 12. Воп. 1. Спр. 389. Арк. 68.
[127] Тамсама. Спр. 803. Арк. 50 адв., 172.
[128] Пяткевіч Ч. Грамадская культура Рэчыцкага Палесся / пер. с пол. У. Васілевіча, Л. Салавей. Мінск, 2015. С. 75—76.
[129] Тамсама. С. 76.
[130] Тамсама. С. 75—76.
[131] Тамсама.
[132] НГАБ у г. Гродна. Ф. 12. Воп. 2. Спр. 548. Арк. 12.
[133] Тамсама. Арк. 15.
[134] Асьміна — мера сыпучых рэчываў, роўная 59,04 літраў, або 3 пудам жыта.
[135] Талмачова С. А. Сялянскае самакіраванне ў Беларусі (1861—1901 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мінск, 2002. С. 15.
[136] История культуры Древней Руси: в 2 т. / под ред. Б. Д. Грекова, М. И. Артамонова. Т. 1. М.; Л., 1948. С. 50.
[137] Гісторыя Беларускай ССР / рэдкал.: І. М. Ігнаценка [і інш.]. Т. 1. Мінск, 1972. С. 66, 84.
[138] Мінько Л. І. Жорны // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. С. 195—196; Чарнецкі М. Хата, хатні і гаспадарчы рыштунак // Крывіч. 1924. № 2. С. 68.
[139] Мінько Л. І. Ступа // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. С. 480.
[140] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 84—85.
[141] Тамсама. С. 87—88.
[142] Улашчык М. Была такая вёска. С. 59.
[143] Тамсама. С. 59—60.
[144] Тамсама. С. 61.
[145] Рудаков Г. Ф., Ураевский М. А. Сельскохозяйственные машины и орудия для механизации полеводства. М., 1953. С. 130.
[146] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 132. Арк. 52.
[147] Статистика Российской империи. Сельскохозяйственные машины и орудия в Европейской и Азиатской России в 1910 году. СПб., 1913. С. XIX—XX.
[148] Улашчык М. Была такая вёска. С. 61.
[149] Статистика Российской империи. Сельскохозяйственные машины и орудия в Европейской и Азиатской России в 1910 году. С. XX.
[150] Сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 92.
[151] Эремич И. Очерки Белорусского Полесья. С. 8.
[152] Зеленский И. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Минская губерния. Ч. 2. СПб., 1864. С. 81—82.
[153] Там же. С. 82.
[154] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 113. Арк. 28—29.
[155] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом ... состоянии: в 3 кн. / сост. по программе и под ред. А. С. Дембовецкого. Могилев, 1884. Кн. 2. С. 855—856.
[156] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 5. Спр. 117. Арк. 4 (1841 г.)
[157] Корева А. Виленская губерния. С. 451—452.
[158] Там же. С. 438.
[159] НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 5. Спр. 117 (1841 г.).
[160] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 132. Арк. 51.
[161] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. Минск, 1968. С. 62.

ГЛАВА 2

# БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў ГАДЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ





Дэкрэтам II Усерасійскага з'езда Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў ад 26 кастрычніка (8 лістапада) 1917 г. «Аб зямлі» былі ліквідаваны права прыватнай уласнасці на зямлю, яе купляпродаж і заканадаўча сфармулявана асноўнае палажэнне аб зямлі як усенародным набытку, які знаходзіцца ў выключным карыстанні дзяржавы. Артыкул 3 гэтага Дэкрэта абвяшчаў захаванне прысядзібных участкаў насельніцтва: «Сядзібная гарадская і сельская зямля з дамашнімі садамі і агародамі застаецца ў карыстанні цяперашніх уладальнікаў, прычым памер саміх участкаў і вышыня падатку за карыстанне імі вызначаецца заканадаўчым парадкам»[1].

Палажэнне аб адмене прыватнай уласнасці на зямлю было пацверджана Дэкрэтам Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта ад 18 студзеня 1918 г. «Аб сацыялізацыі зямлі», у якім было абвешчана, што ўсякая ўласнасць на зямлю ў межах РСФСР адмяняецца назаўсёды, а зямля без усялякага (яўнага або скрытага) выкупу з гэтага часу пераходзіць у карыстанне ўсяго працоўнага народа. Права карыстання зямлёй было замацавана за тымі, хто яе апрацоўваў.

Нягледзячы на тое што большая частка тэрыторыі Беларусі была акупаваная нямецкімі войскамі і працягвалася Грамадзянская вайна, у пачатку 1918 г. у Віцебскіх вайсковых майстэрнях быў наладжаны выпуск сельскагаспадарчых машын. Праз некалькі месяцаў на базе гэтых майстэрняў быў створаны завод «Чырвоны металіст», які вырабляў малатарні, сеялкі, плугі, бароны і іншыя сельскагаспадарчыя прылады працы. На выраб сельскагаспадарчых машын быў пераведзены завод «Рухавік» у Гомелі. Ствараліся дзясяткі майстэрняў па вырабе новых і рамонце старых сельскагаспадарчых машын і прылад[2].

Да 1921 г. у новастворанай Гомельскай губерні былі адкрыты 194 пункты пракату, якія налічвалі 7065 сельскагаспадарчых машын і прылад. За невялікую плату яны выдаваліся напракат беднякам і сераднякам[3].

На Беларусі аграрныя пераўтварэнні паводле «Дэкрэта аб зямлі» (нацыянальныя землі, канфіскацыя панскіх зямель, увядзенне ўраўняльнага землекарыстання) пачаліся ўвосень 1917 г. на тэрыторыі неакупаваных немцамі ўсходніх паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў і закончыліся пасля выгнання нямецкіх і польскіх акупантаў у 1921 г.

Да сярэдзіны 1918 г. асноўная маса беларускіх сялян падтрымлівала аграрную палітыку бальшавікоў, бо яна адпавядала іх адвечным імкненням. Аднак вясной 1918 г. савецкі ўрад прадпрыняў шэраг надзвычайных мер у галіне эканамічнай палітыкі, выкліканых Грамадзянскай вайной, ваеннай інтэрвенцыяй і народнагаспадарчай разрухай, якія атрымалі назву «палітыка ваеннага камунізму». Асноўныя прынцыпы гэтай палітыкі — нацыяналізацыя ўсіх форм прамысловасці, дзяржаўная манаполія хлебнага гандлю, жорсткае размеркаванне харчовых і прамысловых тавараў, правядзенне харчовай развёрсткі, усеагульная працоўная павіннасць.

У сваіх крайніх формах палітыка ваеннага камунізму ажыццяўлялася ў галіне сельскай гаспадаркі на тэрыторыі ўсходніх паветаў Віцебскай і новастворанай Гомельскай губерняў, якія падпарадкоўваліся ўраду Савецкай Расіі.

Харчовая развёрстка заключалася ў адабранні ў сялян збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў звыш неабходных для пражытку сям'і за папяровыя грошы або за даўгавыя распіскі, што было фактычнай рэквізіцыяй. Праводзілася харчразвёрстка сіламі спецыяльных харчатрадаў і камітэтаў беднаты, створаных летам 1918 г. для барацьбы з голадам. Камбедам надаваліся неабмежаваныя правы ў адносінах да сялян, якія хавалі збожжа, і права размяркоўваць прадукты харчавання сярод беднаты.

На Беларусі дзейнічала 125 валасных і каля 3250 вясковых камбедаў. Сяляне, якія ўваходзілі ў склад камітэтаў беднаты, былі зацікаўлены ў выкрыцці і адабранні збожжа ў больш заможных вяскоўцаў, бо частка атрыманых сродкаў ішла на іх утрыманне[4].

Аб надзвычайнай цяжкасці харчразвёрсткі яскрава сведчаць наступныя дадзеныя. У 1920 г. жыхарам вёскі Левашы Рэчыцкага павета прадпісвалася здаць дзяржаве 208 пудоў жыта, 50 пудоў круп, 70 пудоў аўса, 2540 пудоў бульбы, 30 пудоў алейнага семя. Развёрстка на хатнюю жывёлу — 17 галоў буйнай рагатай жывёлы, 62 свінні, 103 авечкі, больш як 13 фунтаў мяса птушкі. Даводзілася развёрстка і па масле. Харчовы камітэт Рэчыцкага наркамхарча РСФСР растлумачваў: «За кожны 1 фунт масла спаганяць вядро цэльнага малака. Малако павінна быць добрай якасці, фальсіфікаванае вадой канфіскаваць і здатчыкаў такога масла арыштоўваць і аддаваць пад суд»[5].

Па развёрстцы сяляне павінны былі здаваць скуры буйной рагатай жывёлы, коней і жарабят, конскія грывы і хвасты, рогі кароў. Заданне вёсцы Левашы на 1920 г.— 4 скуры буйной рагатай жывёлы, 6 конскіх скур, 12 скур жарабят, больш як 30 пудоў воўны…[6]

У лістападзе 1920 г. Левашоўскі сельсавет атрымаў перасцярогу старшыні валаснога выканкама: «Загадваю ў неадкладным парадку Рэвалюцыйнага часу выканаць у трохдзённы тэрмін накладзеную на вашу

вёску развёрстку пасля прыезду агента ... Калі яна ва ўказаны тэрмін дабравольна выканана не будзе, то будзе прысланы ўзброены атрад, пры дапамозе якога развёрстка будзе ўзята. У выпадку калі будзе даказана, што сельскія Саветы бяздзейнічаюць і своечасова не прымаюць мер да дабравольнай здачы накладзенай развёрсткі, то такія сельсаветы будуць арыштоўвацца і перадавацца суду як не выконваючыя загады Цэнтральнай улады[7]».

Партыйныя арганізацыі Віцебскай і Гомельскай губерняў пасылалі ў харчовыя атрады сваіх лепшых работнікаў, кіравалі ходам нарыхтовак збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў, праводзілі па вёсках вялікую работу па барацьбе з так званымі «кулакамі». Толькі Гомельскі гарадскі камітэт восенню 1919 г. накіраваў у валасці Гомельскага павета 30 камуністаў. У Віцебскай губерні ў харчатрадах налічвалася каля 600 чалавек, галоўным чынам рабочых-камуністаў[8].

Харчовым органам шмат у чым дапамагалі чырвонаармейцы. У жніўні 1919 г. штаб Заходняга фронту вылучыў 1000 чалавек з запасных і вартавых часцей для працы ў харчатрадах. У 1919 і 1920 гг. нарыхтоўкі збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў на тэрыторыі Беларусі праводзілі ваенныя харчовыя органы Заходняга фронту і харчовыя органы Саветаў Віцебскай і Гомельскай губерняў. Восенню і зімой 1919–1920 гг. імі было нарыхтавана ў сялян шмат збожжа, тлушчу, гародніны, фуражу[10].

Аграрная палітыка дзяржавы падтрымлівала стварэнне розных тыпаў калектыўных гаспадарак (сельскагаспадарчыя камуны, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, сельскагаспадарчыя арцелі). У камунах абагульняліся пабудовы, жыллё, буйная і дробная жывёла, птушка, рабочы інвентар. Пад камуны адводзіліся сярэднія па памеру былыя панскія маёнткі. Да студзеня 1919 г. у 13 паветах Беларусі налічвалася 175 камун, 36 арцеляў і 75 таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі[11].



Эканамічная разруха на чыгунцы. 1917 г.

Сельскагаспадарчыя камуны праіснавалі да часоў масавай калектывізацыі сялянства. Заснаваныя на прынцыпах ураўняльнага размеркавання і забеспячэння жыццёвых патрэб сваіх членаў за кошт грамадскай гаспадаркі, пры нізкім узроўні механізацыі працы яны не карысталіся папулярнасцю сярод насельніцтва, не гатовага да працы на камуністычных асновах і ідэалах.



Адным з найважнейшых мерапрыемстваў партыйных органаў і савецкага ўрада па сацыялістычнай перабудове вёскі была арганізацыя саўгасаў (савецкіх гаспадарак). Першыя саўгасы ствараліся на базе былых памешчыцкіх маёнткаў з высокай культурай гаспадарання, каб паказаць сялянам перавагі калектыўнай вытворчасці. Ствараліся саўгасы на падставе «Палажэння аб сацыяльным землеўладкаванні і мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства» (люты 1919 г.).



Адпраўка харчатрада ў вёску для збору харчразвёрсткі. 1918 г.



Вясковая вуліца. Вёска Даўгінічы Цытвянскай воласці Ігуменскага павета. 1923 г.
Фота Л. У. Дашкевіча



Калодзеж. Паенне каня. Каля калодзежа выдзеўбаная з дрэва «камяга» (карыта-паілка для жывёлы). Вёска Кавалевічы Шацкай воласці Ігуменскага павета. 1923 г.
Фота Л. У. Дашкевіча



Гаспадар з канём. Вёска Сярэдзіна Шацкай воласці Ігуменскага павета. 1923 г. Фота Л. У. Дашкевіча



Вуліца ў вёсцы Лісец Бабруйскай акругі ў будзённы дзень. 1928 г. Фота В. Ластоўскага



Крыж на вясковай вуліцы з атрыбутамі пакутніцтва і ахвярнымі ручнікамі. Фота Ю. Абрэмбскага



Камуна Беларускай ваеннай акругі на асушаным балоце на Палессі. 1920–1930-я гг.

Першыя ў БССР саўгасы — гэта «1 Мая» Дубровенскага раёна, «Крынкі» Лёзненскага, «Побалава» Рагачоўскага, «Індустрыя» Пухавіцкага, «Вішнёўка» Мінскага, «Ціманава» Клімавіцкага раёнаў і інш. У асноўнай масе саўгасы аказаліся нерэнтабельнымі, таму што не хапала сельскагаспадарчай тэхнікі, цяглавай сілы і кваліфікаваных кадраў.

Усерасійскі сельскагаспадарчы перапіс 1920 г. паказаў, што ў калгасах, камунах і арцелях па сумеснай апрацоўцы зямлі Віцебскай і Гомельскай губерняў на 100 працаздольных прыпадала 0,18 паравых малатарняў і 0,004 — у гаспадарках аднаасобных сялян; арф і сартыровак — 1,6 у калгасах і камунах і 0,8 — у аднаасобных гаспадарках[12].



Уборка бульбы на індывідуальных агародах. 1920–1930-я гг.





Сяляне Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ўрачыста сустракаюць першы трактар. 1929 г.

За шэсць гадоў амаль бесперапынных баявых дзеянняў сельская гаспадарка Беларусі была далёка адкінута назад ад паказчыкаў 1914 г. Паводле даных на 1920 г., пасяўныя плошчы сельскагаспадарчых культур складалі $^2/_3$ ад даваенных, рэзка знізілася ўраджайнасць, вялікія страты панесла жывёлагадоўля: колькасць коней скарацілася да 80 працэнтаў, буйной рагатай жывёлы — да 65,8, свіней — да 44 працэнтаў даваеннага ўзроўню[13].



Прыём Слуцкай загатоўчай канторай харчпадатку непасрэдна ў вагоны. 1920-я гг.

Харчразвёрстка, асноўны цяжар якой клаўся на плечы серадняцкіх гаспадарак, выконвалася пад моцным узброеным націскам, аднак вельмі марудна. На месцах чынілася анархія: валрэўкамы, райхарчкамы, ваенкамы — усе прад'яўлялі правы на прадукты сялянскай гаспадаркі. Адбіткам незадаволенасці вёскі аграрнай палітыкай дзяржавы з'явіліся шматлікія антысавецкія выступленні сялян вясной і летам 1921 г.[14]

У гэтых умовах у сакавіку 1921 г. адбыўся X з'езд РКП (б), на якім выступіў У. І. Ленін. Новая эканамічная палітыка (НЭП) была заканадаўча замацавана УЦВК дэкрэтам аб замене харчовай і сыравіннай развёрсткі натуральным падаткам. 28 сакавіка Саўнаркам прыняў дэкрэт аб свабодным абмене, куплі і продажы лішкаў сельгаспрадуктаў у 40 губернях, якія выканалі харчразвёрстку. У іх лік уваходзілі Віцебская і Гомельская губерні. Тады ж з усіх чыгуначных, водных і гужавых шляхоў былі зняты загараджальныя пасты, увядзеныя для барацьбы са спекуляцыяй харчовымі прадуктамі[15].

У «Законе аб працоўным землекарыстанні» (верасень 1922 г.) была абвешчана свабода форм землекарыстання ў форме сельскагаспадарчай арцелі, прыватнай вясковай падворнай гаспадаркі, у выглядзе вотруба і хутара. Дазваляліся арэнда і наёмная праца. Заахвочваліся розныя віды кааперацыі: прамысловыя і збытавыя кааператывы, крэдытныя аб'яднанні і г. д.

Партыйнымі арганізацыямі ў рэспубліцы была разгорнута вялікая работа па падрыхтоўцы да веснавой пасяўной кампаніі 1921 г.; асабліва ўвага ў гэтай дзейнасці надавалася пасяўкамам. З прычыны харчразвёрсткі вясной 1921 г. значная частка сялянскіх гаспадарак адчувала недахоп насеннага збожжа, інвентару, цяглавай сілы. Асабліва востры

быў недахоп насення ў гаспадарках беднякоў, якія значна павялічылі плошчу сваіх надзелаў за кошт памешчыцкіх зямель і зямель заможных сялян. Каб дапамагчы сялянам больш паспяхова правесці пасяўную кампанію 1921 г., Наркамзем БССР выдаткаваў для іх патрэб 65 тыс. пудоў аўса, 10 тыс. пудоў ячменю, 1 тыс. пудоў ільнасемя, 325 пудоў бульбы[16].

Наркамзем рэспублікі ў 1921 г. перадаў калгасам, саўгасам і аднаасобным сялянам 6458 плугоў, 5794 бараны і культыватары, 1200 веялак, 804 касілкі, 15 870 пудоў мінеральных угнаенняў[17].



Падыманне папараў у калгасе на Віцебшчыне



Першы трактар на палях Беларусі. 1924 г.





Першы дзень здачы адзінага харчпадатку ў Бабруйскім павеце. Бабруйск. 11.09.1922

Развіццё гандлю стымулявала рост сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1922 г. пасяўныя плошчы ў рэспубліцы павялічыліся ў параўнанні з 1921 г. на 9,5 працэнта[18], аднак ураджайнасць была ніжэйшай, чым у 1913 г.[19]

У вёсцы працягвалася будаўніцтва саўгасаў і калгасаў. Паводле афіцыйных даных, у 1921 г. у БССР было 740 калгасаў, але ў наступныя два гады іх колькасць зменшылася. Частка сялян у сувязі з пераходам кіраўніцтва дзяржавы да новай эканамічнай палітыкі выйшла з калгасаў[20], якія перажывалі гаспадарчыя і арганізацыйныя цяжкасці і яшчэ не маглі для сялян быць прыкладам перавагі калектыўных форм вытворчасці. Калгасам катастрафічна не хапала тэхнікі, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, у іх пераважала ручная праца.



Першы чырвоны абоз з «Камуны Леніна» з новым ураджаем збожжа да Дня калектывізацыі. Горад Дрыса Полацкай акругі. 01.09.1929

Кіраўніцтва СССР прыкладала значныя намаганні па ўздыму механізацыі вытворчасці калектыўных гаспадарак. У 1926–1927 гг. калгасы і саўгасы Беларусі атрымалі з РСФСР 30 трактараў, 145 сеялак, 7100 веялак і сартыровак, а беларускія заводы выпусцілі 86 100 плугоў[21]. Аднак агульная тэхнічная база сельскай гаспадаркі заставалася вельмі нізкай.

У пачатку — сярэдзіне 1920-х гг. каля 90 працэнтаў насельніцтва Беларусі жыло ў вёсках, дзе назіралася значная перанаселенасць — каля 600 тысяч лішніх працоўных рук[22].

XIV з'езд ВКП (б), які адбыўся ў снежні 1925 г., вызначыў курс на індустрыялізацыю СССР — стварэнне буйной (перш за ўсё цяжкай) прамысловасці для пераўтварэння краіны з аграрнай у прамыслова развітую. Сельская гаспадарка павінна была задаволіць попыт горада і прамысловасці на сельскагаспадарчую прадукцыю і сыравіну, стаць галоўнай крыніцай фінансавання і працоўных рэсурсаў індустрыялізацыі.

У красавіку 1925 г. быў прыняты другі Зямельны кодэкс БССР (першы быў прыняты ў 1923 г. на ўзор Зямельнага кодэкса РСФСР 1922 г.). Кодэкс замацаваў участкова-падворны парадак землекарыстання ў рэспубліцы, захаваў свабоду выбару формы землекарыстання, але з абмежаваннямі для хутароў і вотрубаў, замацаваў нормы зямельнага надзелу працоўных сялян, а таксама льготы калектыўным землекарыстальнікам.

Тагачасны наркам земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпаў быў прыхільнікам «нашаніўскай» тэорыі «самабытнасці беларускай вёскі» і праводзіў у рэспубліцы палітыку стварэння хутароў і дробных пасёлкаў па тыпу вотрубаў. На хутары і пасёлкі агітавалі перасяляцца беззямельных і малазямельных сялян, часта выдзяляючы ім надзелы за кошт адразання зямлі ў заможных сялян. Да 1929 г. на хутары было пераселена 107 267 сялянскіх гаспадарак і ўзнікла 11,5 тысяч дробных пасёлкаў у сярэднім па 13 двароў (прыблізна 30 працэнтаў ад усіх сельскіх пасяленняў)[23].



Агітацыя селяніна за ўступленне ў калгас. 1929 г.

Да пачатку 1927 г. сельскагаспадарчая вытворчасць у агульным дасягнула дарэвалюцыйнага ўзроўню. Яе ўдзельная вага ў народнай гаспадарцы БССР склала 71,6 працэнта, прамысловасці — 22,3, лясной гаспадаркі — 6,1 працэнта. Найбольш шматлікай групай на вёсцы сталі серадняцкія гаспадаркі (65 працэнтаў), якім належала 75 працэнтаў пасяўных плошчаў. Аднак большая частка зямель была нізкай якасці і аднаасобная сялянская гаспадарка была маламоцнай: кожная пятая гаспадарка была бясконнай, з адным канём — 67,8 працэнта; з адной каровай — 58 працэнтаў, бескароўных — 6,1 працэнта[24].

Да 1927 г. задачы развіцця сельскай гаспадаркі вырашаліся пераважна рынкавымі метадамі. Але зімой 1927 г. пачаўся так званы хлебанарыхтоўчы крызіс, прычынамі якога быў зрыў дзяржаўнага плана збожжанарыхтовак па танных дзяржаўных цэнах, што выклікала недахоп сродкаў для індустрыялізацыі. Шляхі выхаду з крызісу кіраўніцтва СССР бачыла ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі і бязлітасным знішчэнні ўнутраных ворагаў савецкай улады, сярод якіх на першым месцы былі кулакі.

Пачаткам палітыкі масавай калектывізацыі прынята лічыць рашэнні IV з’езда Саветаў СССР (красавік 1927 г.). У яго пастанове «Аб асноўных задачах сельскай гаспадаркі ў сувязі з развіццём народнай гаспадаркі і індустрыялізацыяй краіны» падкрэслівалася, што ўздым сялянскай гаспадаркі і паступовае правядзенне ў жыццё рэарганізацыі вёскі на больш высокай тэхнічнай аснове непарыўна звязаны з развіццём



Сяўба ў калгасе. Вёска Грын Мінскай вобласці. 1930 г.

кааператыўных форм гаспадаркі, ростам (на дабравольных пачатках) буйна-калектыўнай сельскай гаспадаркі.

IV з'езду Саветаў СССР папярэднічалі пастановы ЦВК і Савета Народных Камісараў СССР «Аб калектыўных гаспадарках» і «Аб савецкіх гаспадарках», у якіх адзначалася, што калгасы з'яўляюцца найбольш развітай формай калектывізацыі, а саўгасы павінны садзейнічаць перабудове ўсёй сельскай гаспадаркі, што дазволіць укараніць больш перадавыя прыёмы апрацоўкі зямлі, выкарыстаць навейшыя тэхнічныя сродкі, дапамагчы сялянскім гаспадаркам сельскагаспадарчымі машынамі, сартавым насеннем і пародзістай жывёлай.

7 лістапада 1929 г. быў апублікаваны артыкул І. В. Сталіна «Год вялікага пералому», у якім абгрунтоўвалася неабходнасць масавай калектывізацыі сялянскіх гаспадарак. Гэты артыкул з'явіўся падставай для разгортвання масавай работы па суцэльнай калектывізацыі сялянства і ліквідацыі кулацтва як класа.

Студзеньскі (1930 г.) пленум ЦК КП (б) Б прыняў пастанову завяршыць суцэльную калектывізацыю да 1931 г. У вёску былі накіраваны тысячы ўпаўнаважаных, на гарадскіх прадпрыемствах ствараліся «брыгады дапамогі калектывізацыі». Старшынямі і намеснікамі старшынь калгасаў у рэспубліцы працавалі 662 рабочыя-«дваццацітысячнікі», не знаёмыя ні з мясцовымі ўмовамі, ні наогул з сельскай гаспадаркай[25]. Метадамі грубага націску і адміністрацыйнага прымусу ў калгасы было прыцягнута 457,7 тыс. сялянскіх двароў, або 58 працэнтаў ад агульнай іх колькасці[26]. Праводзілася абагульванне жылых будынкаў, прысядзібнай зямлі, свойскай жывёлы, птушкі, сельскагаспадарчага інвентару.

Калектывізацыя суправаджалася раскулачваннем. Па асобных раёнах колькасць раскулачаных сялянскіх двароў, аднесеных да катэгорыі кулацкіх, даходзіла да 10–15 працэнтаў, а месцамі і да 20 працэнтаў, тады

як заможныя сяляне сярод вяскоўцаў перад калектывізацыяй складалі толькі 1,5 працэнта[27].

Гвалтоўныя метады правядзення калектывізацыі выклікалі масавыя сялянскія хваляванні і шэраг узброеных антысавецкіх выступленняў. У сувязі з гэтым у сакавіку 1930 г. быў надрукаваны артыкул Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў», у якім віна за такую сітуацыю ўскладвалася на мясцовыя партыйныя і савецкія органы кіравання.



Сартыроўка збожжа ў калгасе. Вёска Брацькавічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. 1932 г.

У артыкуле Сталіна асуджалася прымусовая калектывізацыя, давалася ўказанне партыйным і савецкім органам весці работу па заахвочванні сялян да добраахвотнага ўступлення ў калгасы. Гэта дало падставу для выхаду з калгасаў. За сакавік—май 1930 г. у БССР са складу калектыўных гаспадарак выйшлі 370,3 тыс. сялянскіх двароў[28]. Аднак адразу пачалася новая хваля прымусовай калектывізацыі і раскулачвання. У выніку за 1930–1931 гг. з 800 тыс. сялянскіх гаспадарак савецкай Беларусі было раскулачана 95,5 тыс., а 600–700 тыс. чалавек саслана[29].

Прымусовая калектывізацыя прывяла да крызісу ў сельскай гаспадарцы. У 1932 г. ураджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур знізілася на 3–23 працэнты і складала ў 1933 г. у сярэднім 6,3 ц/га, рэзка скарацілася пагалоўе свойскай жывёлы. На поўдні Беларусі пачаўся голад. Для ўдасканалення арганізацыі вытворчасці ў калгасах ствараліся брыгады, быў уведзены працадзень, аплата за які ні ў якім разе не адпавядала затрачанай працы.

Восенню 1932 г. ЦВК СССР прыняў пастанову «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці», якая ў народзе атрымала назву



Ссяленне з хутароў у калгасны пасёлак. Калгас «Чырвоны партызан» Мінскага раёна Мінскай вобласці. 1930-я гг.

«закон аб пяці каласках». Пастанова прадугледжвала турэмнае зняволенне тэрмінам не менш як 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці за збіранне сялянамі на калгасных палях нават таго, што засталося там пасля ўборкі ўраджаю[30].

Урад СССР прымаў шэраг мер па гаспадарчым ўмацаванні калектыўных гаспадарак, асабліва ў кірунку механізацыі вытворчасці. У 1929 г. для вытворча-тэхнічнай дапамогі калгасам была створана першая ў рэспубліцы машынна-трактарная станцыя, а з канца 1930 г. яны пачалі арганізоўвацца ў іншых раёнах БССР. МТС сканцэнтроўвалі тэхніку і кадры спецыялістаў сельскай гаспадаркі. На аснове заключаных дагавораў яны выконвалі ў калгасах сельскагаспадарчыя работы і атрымлівалі за іх аплату натурай — збожжам, бульбай і інш.

У канцы 1934 г. калектывізацыя ў БССР у асноўным была завершана. Галоўнай прадукцыйнай сілай у вёсцы стала калгаснае сялянства. Каб прымусіць астатніх аднаасобнікаў уступіць у калгас, у 1937–1940 гг. у рэспубліцы праводзілася ліквідацыя хутароў. За гэтыя гады на цэнтральныя сядзібы калгасаў было перацягнута каля 200 тыс. сялянскіх хутарскіх гаспадарак, што было чарговай буйнамаштабнай ломкай традыцый беларускай культуры і ладу жыцця вясковага насельніцтва.

Пасля ўступлення селяніна ў калгас яму пакідалася магчымасць весці невялікую асабістую гаспадарку на прысядзібным участку. У Прыкладным статуце сельскагаспадарчай арцелі, які быў прыняты Другім Усесаюзным з'ездам калгаснікаў-ударнікаў і зацверджаны СНК СССР і ЦК ВКП (б) 17 лютага 1935 г., былі ўдакладнены нарматыўна-прававыя палажэнні аб прысядзібным участку: «З грамадскіх зямельных угоддзяў вылучаецца ў асабістае карыстанне кожнага калгаснага двара па невялікім участку ў выглядзе прысядзібнай зямлі (сад, агарод і г. д.). Памеры прысядзібнай



Праполка калгаснага аўса. 1930-я гг.



Уборка азімага жыта. Калгас «Світанак» Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Жнівень 1937 г.



Складанне снапоў жыта ў бабкі.
Луггас «Ведрыч». 1939 г.



Намеснік старшыні калгаса правярае якасць рэзкі насеннай бульбы перад пасадкай. Мінская вобласць. 1934 г.





- Сяўба збожжа трактарнай сеялкай. Калгас імя Дзяржынскага Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. 1930-я гг.
- Механізаваная ўборка канапель у Полацкай акрузе. 1930-я гг.
- Выдача натуравансу ў калгасе. Магілёўскі раён Магілёўскай вобласці. 1930-я гг.



зямлі, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснага двара (не лічачы зямлі пад асабістымі пабудовамі), могуць вагацца ад $^1/_4$ да $^1/_2$ гектара, а ў асобных раёнах да 1 гектара ў залежнасці ад абласных і раённых умоў, устанаўліваемых народнымі камісарыятамі земляробства саюзных рэспублік»[31].

Упершыню паняцце «асабістая падсобная гаспадарка калгаснага двара» было заканадаўча сфармулявана ў Канстытуцыі РСФСР ад 21 студзеня 1937 г. У артыкуле № 7 раздзела 1 Асноўнага закона вызначалася: «Кожны калгасны двор, апрача асноўнага прыбытку ад грамадскай калгаснай гаспадаркі, мае ў асабістым карыстанні невялікі прысядзібны ўчастак зямлі і ў асабістай уласнасці падсобную гаспадарку на прысядзібным участку, жылы дом, прадукцыйную жывёлу, птушак і дробны сельскагаспадарчы інвентар — згодна са статутам сельскагаспадарчай арцелі». Канстытуцыя заканадаўча ўсталёўвала падсобныя гаспадаркі вясковых жыхароў і замацоўвала іх аснову — прысядзібнае землекарыстанне.

Паняцце «падсобная гаспадарка», узаконенае Канстытуцыяй, абмяжоўвала права сельскіх жыхароў на індывідуальную працоўную дзейнасць па вырабе сельскагаспадарчай прадукцыі. У выніку гаспадарка сялянскага двара набывала статус спажывецкай, накіраванай у асноўным на задавальненне толькі патрэб сям'і.

Абавязковай умовай карыстання зямельным участкам з'яўляўся ўдзел яго ўладальніка ў грамадскай вытворчасці; гэта значыць, што праца на ім павінна была ажыццяўляцца па прынцыпах другаснай занятасці. Асабістыя падсобныя гаспадаркі дазвалялі выкарыстоўваць для атры-



Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі. Прыём абагульненага сельскагаспадарчага інвентару і коней праўленнем новастворанага калгаса «Перамога». Вёска Слабада Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. 1941 г.



Падыманне аблогі. Калгас «Брыгадзір» Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Верасень 1937 г.



Уборка калгаснага ўраджаю камбайнам. 1936 г.



Уборка збожжа камбайнам. Калгас «Новае жыццё» Тураўскага раёна Палескай вобласці. 1938 г. Фота Кажарынава



Малацьба. Саўгас «10 год БССР» Любанскага раёна Мінскай вобласці. 1936 г.



Малацьба. Калгас «Новае жыццё» Тураўскага раёна Палескай вобласці. 1939 г.



Малацьба. Саўгас «10 год БССР» Любанскага раёна Мінскай вобласці. 1938 г. Фота Кажарынава



Сартыроўка насеннага збожжа. Калгас «Світанак» Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. 1938 г. Фота Ганц

мання дадатковых сельскагаспадарчых прадуктаў рэсурсы, якія не маглі быць задзейнічаны ў грамадскай вытворчасці: прысядзібную зямлю, дробны інвентар, працу членаў сям'і (старых, падлеткаў, інвалідаў), гаспадарчыя пабудовы на сядзібе.

З моманту ўсталявання савецкай улады асабістыя падсобныя гаспадаркі сельскіх жыхароў разглядаліся ўладамі як рэштка аднаасобнай гаспадаркі, пераходная форма станаўлення сацыялістычных адносін на вёсцы. Пры гэтым лічылася, што ў выніку развіцця буйнатаварнай гра-



Калгаснікі калгаса «Чырвоны араты» на жніве. Палеская вобласць. 1940 г.

мадскай вытворчасці большая частка маёмасці, якая заставалася ў асабістай падсобнай гаспадарцы сялян, будзе перадавацца ў агульную ўласнасць.

Асноўнай прычынай захавання і развіцця падсобных гаспадарак у гэты час з'яўлялася іх эканамічная неабходнасць, бо калгасы і саўгасы з прычыны слабай матэрыяльна-тэхнічнай базы не мелі магчымасці задаволіць патрэбы гараджан і вясковых жыхароў у прадуктах сельскагаспадарчай вытворчасці.

У 1932 г. у СССР была ўведзена пашпартная сістэма з прапіскай па месцы жыхарства, аднак сяляне пашпартоў не атрымалі і аказаліся замацаванымі за калгасамі. Калгаснікі не мелі права на аплачваемы бюлетэнь па хваробе, аплачваемы водпуск па цяжарнасці і родах, на штогадовы водпуск, ім не выплачвалі пенсіі.



Моладзь ідзе на перадвыбарны сход па выбарах у Вярхоўны Савет БССР. Віцебская вобласць. Калгас «VI з'езд Саветаў» Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Май 1938 г.

Падсобныя гаспадаркі калгаснікаў у 1937 г. выраблялі 40 працэнтаў усёй валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі СССР[32]. Нягледзячы на гэта, дзяржаўныя і партыйныя органы праводзілі неабгрунтаванае абмежаванне ўмоў функцыянавання асабістых падсобных гаспадарак калгаснікаў і рабочых саўгасаў, служачых і гараджан.

ЦК ВКП (б) у маі 1939 г. прыняў пастанову, згодна з якой праводзіліся абмер усіх зямельных участкаў, якія належалі вясковым і гарадскім жыхарам, і адабранне лішкаў зямлі ў тых, чые надзелы перавышалі вызначаныя нормы. У верасні гэтага ж года быў прыняты Закон «Аб сельскагаспадарчым падатку». Артыкул 8 главы 3 гэтага Закона прадугледжваў з гаспадарак калгаснікаў, якія мелі даходы ад прысядзібнага ўчастка зямлі, з жывёлы, садоў і неземляробчых заробкаў вылічваць падатак у адпаведнасці

з усталяванымі стаўкамі. Гэтыя меры прывялі да таго, што падаткі часта пераўзыходзілі магчымасці прысядзібнага ўчастка вясковых жыхароў і рабілі нявыгадным вырошчванне прадукцыі сельскай гаспадаркі не толькі на продаж, але і для асабістага спажывання.



Сялянская моладзь у вольны час. Калгас «Шлях сацыялізму» Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. 1939 г.



У хаце калгасніцы Н. Р. Цітовай. Калгас імя Валадарскага Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці. 1937 г.



Беларускія сяляне на вызваленай ад немцаў тэрыторыі сустракаюць савецкіх танкістаў. 1944 г.



Жыхары вёскі Слабодка Магілёўскай вобласці сустракаюць воінаў Савецкай Арміі. 1944 г.



Вяртанне мірнага насельніцтва з лесу пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад немцаў. 1944 г. Фота В. Аркашава

У верасні 1939 г. адбылося далучэнне Заходняй Беларусі да БССР. Тэрыторыя рэспублікі павялічылася ў 1,9 разоў, колькасць насельніцтва ўзрасла ў 1,6 разоў. Беларускі народ атрымаў магчымасць развіцця ў межах адзінай дзяржавы. На тэрыторыі Заходняй Беларусі пачала праводзіцца калектывізацыя, але больш мяккімі метадамі, чым ва Усходняй Беларусі. Аднак гэты працэс быў спынены вайной.

У выніку індустрыялізацыі, інтэнсіўнага культурнага будаўніцтва, у якім былі дасягнуты значныя поспехі, рэспубліка ў многім змяніла сваё аблічча. З'явіліся новыя галіны прамысловасці, значна ўзрасла колькасць гарадскога насельніцтва, была сфарміравана новая савецкая інтэлігенцыя.

Калі ў першыя гады калектывізацыі на калгасных палях збожжа ўбіралі сярпамі, косамі, коннымі жняяркамі, а малацілі цапамі, ручнымі і коннымі малатарнямі, то ў 1937 г. на палях БССР працавалі ўжо 674 камбайны, якія вялі ўборку і абмалот збожжавых культур[33]. На 1 студзеня 1940 г. у рэспубліцы налічвалася 316 МТС, на калгасных і саўгасных палях працавала 1700 камбайнаў, 10 400 трактараў (у фізічных адзінках), а на таках — тысячы складаных і напаўскладаных малатарняў з прыводам ад трактара, веялак і інш.[34]

Паводле афіцыйных даных, у 1940 г. на долю грамадскага сектара ў БССР прыпадала 65 працэнтаў усіх нарыхтовак збожжа, 46 працэнтаў бульбы, 77 працэнтаў ільноваланка. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ўзрасла ў параўнанні з 1913 г. у 1,7 разоў. Практычна быў ажыццёўлены ленінскі план кааперавання вёскі. У выніку суцэльнай калектывізацыі адбылася беспрэцэдэнтная дэфармацыя вясковага ўкладу жыцця, змянілася сацыяльна-эканамічная структура вёскі. Былі знішчаны або высланы найбольш гаспадарлівыя сяляне, у выніку чаго Беларусь страціла больш як паўмільёна сельскіх жыхароў.



Вяртанне сялян з лесу ў вёску пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад немцаў. 1944 г.



Жыхары беларускіх вёсак вяртаюцца ў родныя мясціны пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад немцаў. 1944 г. Фота А. Савіна



Вяртанне на родную сядзібу. 1943 г.



Падбіты танк на беларускім полі. 1944 г. Фота А. С. Дзітлава



Вываз на поле ўгнаенняў у сельгасарцелі «17-е верасня» Давыд-Гарадоцкага раёна Пінскай вобласці. 1952 г.



Вываз торфакампосту на палі калгаса імя Молатава Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 1954 г.



Амбар калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Вёска Загалле Любанскага раёна Мінскай вобласці. 1946 г.



Пасляваенны трактарыст. 1945–1946 гг. Фота А. С. Дзітлава







Здача хлеба дзяржаве. Абоз са збожжам калгаса «Чырвоная ніва» Брагінскага раёна Палескай вобласці. 1948 г. Фота Басіна



Малацьба збожжа пасля вызвалення тэрыторыі ад фашысцкіх акупантаў у адным з калгасаў Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці. Ліпень 1944 г.

Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, а затым Грамадзянская вайна замарудзілі пераход вясковага насельніцтва Беларусі да выкарыстання агульнаеўрапейскага касцюма. Скарачэнне вытворчасці прамысловых тавараў, у тым ліку тканін, прымусіла сялянства вярнуцца да хатняга і саматужнага вырабу адзення. У гэты перыяд у адзенне як гарадскога, так і вясковага насельніцтва пранікаюць і ўкараняюцца элементы ваеннай формы: фрэнчы, штаны — галіфэ і напаўгаліфэ, гімнасцёркі, шынялі, шапкі-будзёнаўкі, скураныя курткі і г.д.

Рэзкае зніжэнне дабрабыту насельніцтва, эканамічны заняпад, адсутнасць прадметаў першай неабходнасці адмоўным чынам адбіліся на адзенні і знешнім выглядзе людзей у 1920-я гг. Апісанне тыповага для таго часу мужчынскага касцюма даў Я. Колас у апавяданні «Балаховец»: «З шапкі ён змахваў крыху на даўнейшага чыноўніка акцызнага ведамства. Па гімнасцёрцы яго можна было прыняць за салдата царскай арміі. Зверху гімнасцёркі на шырокіх плячах сядзела ўнакідку бравэрка мешчаніна сярэдняй рукі, а падперазана была гімнасцёрка выцертаю афіцэрскай папругай»[35].

Пасля Грамадзянскай вайны прамысловы спосаб вырабу адзення паступова стаў выцясняць хатні і саматужны, узмацніўся ўплыў гарадскіх стандартаў на традыцыйны касцюм. Нават у глыбіні Палесся (вёска Рычоў каля Турава) кашулі «па паляшуцкай модзе» — значна ніжэй каленяў, падперазаныя вузенькім раменьчыкам, на якім вісела «калітка» з тытунём і люлькай, — насілі ў канцы 1920-х гг. толькі старыя людзі. Часам на палатняную саматканую кашулю зверху апраналі яшчэ адну. Верхняя звычайна рабілася з крамнай тканіны — корту ці саціну. Яна была значна кара-



Калгасны абоз з хлебам дзяржаве. Браслаўшчына. Канец 1940 – пачатак 1950-х гг.



Калгасны абоз з хлебам. Здача збожжа дзяржаве. Калгас «Чырвоны партызан» Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. 1948 г.



Сяўба на Браслаўшчыне. Канец 1940 – пачатак 1950-х гг.



Веснавая сяўба ў калгасе «Бальшавік». Вёска Веляцін Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. 1950 г.




Перадача калгасу акта на вечнае карыстанне зямлёй. Заходняя Беларусь. Браслаўшчына. Пачатак 1950-х гг.



Калгаснікі каля першага калгаснага камбіната. Браслаўскі раён Віцебскай вобласці. 1950-я гг.



Малацьба збожжа ў калгасе. Вёска Замошша Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. 1950-я гг.



Паляводы брыгады калгаса «Чырвоны сцяг» Асіповіцкага раёна Бабруйскай вобласці на закладцы бульбы ў бурты. 1950 г.



Радковая перакрыжаваная сяўба ў калгасе «Світанак» Кіраўскага раёна Бабруйскай вобласці. 1951 г.



Калгасніцы за абрэзкай табакі. Вёска Звяняцкае Хойніцкага раёна Палескай вобласці. 1950 г. Фота М. Я. Грынблата



Жанчыны і дзяўчаты на праполцы калгаснага лёну. Вёска Веляцін Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. 1950 г. Фота М. Я. Грынблата



Калгасніцы ідуць на працу ў поле. Вёска Альшаны Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1953 г. Фота М. Я. Грынблата



Сяўба аўса трактарнымі радковымі сеялкамі. Вёска Веляцін Хойніцкага раёна. Гомельскай вобласці. 1953 г.



Размова пра аграномію. Калгас імя Варашылава Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці. 1951 г.



Каноплі гатунку «Паўднёвыя» ў калгасе імя Молатава Целяханскага раёна Пінскай вобласці. 1953 г.





Замочка маніц (канаплянага поскання) у калгасе імя Молатава Целяханскага раёна Пінскай вобласці. 1955 г.

Праполка кармавых буракоў на тарфяніках калгаса імя Молатава Целяханскага раёна Пінскай вобласці. 1953 г.



Штучнае даапыленне жыта шляхам працягвання вяроўкі па каласах. Калгас «Чырвоны сцяг» Давыд-Гарадоцкага раёна Палескай вобласці. 1954 г.

Уборка збожжавых. Браслаўшчына. 1956 г.



Ручная пасадка кукурузы ў калгасе «Праўда» Высокаўскага раёна Брэсцкай вобласці. 1954 г.



Уборка кукурузы ў калгасе «Світанак» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. 1955 г. Фота П. М. Захаранкі





Уборка збожжа лафетнай жаткай «Віндроўэр». Калгас імя Суворава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Жнівень 1956 г.



Сяўба ў калгасе «Світанак» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. 1958 г.
Фота П. М. Захаранкі



Уборка жыта ў калгасе «Партызанскі край» Мінскай вобласці. 1959 г.
Фота М. Ананіна



Уборка збожжавых камбайнам у саўгасе «Рачновічы» Слуцкага раёна Мінскай вобласці. 1959 г.



Уборка збожжавых раздзельным спосабам. Калгас «XVIII партз'езд» Талочынскага раёна Віцебскай вобласці. 1960-я гг.
Фота П. М. Захаранкі



Вясковы жыхар са Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1990-я гг.
Фота У. М. Меляшэнкі

цейшай за ніжнюю кашулю, якая выглядала з-пад верхняй сантыметраў на 20[36]. Такі спосаб нашэння, калі ніжняе плечавое адзенне выглядае з-пад верхняга, узыходзіць сваімі каранямі да старажытных візантыйскіх традыцый, якія захаваліся да 20–30-х гг. XX ст. толькі на Палессі.

У 1930 г. вясковая моладзь на Палессі насіла ўжо адзенне з «крамя» — пакупной тканіны[37]. Шырокае ўкараненне ў вясковым адзенні фабрычных тканін і гатовых прадметаў гарадскога касцюма прывяло да таго, што дамаканае хатняе адзенне стала выкарыстоўвацца галоўным чынам у якасці бялізны. Фабрычнага вырабу кашулі, пінжакі, штаны, паліто, ватныя сцёганкі спачатку дапаўнялі, а к канцу 1930-х гг. амаль выціснулі традыцыйную вопратку. Вялікі ўплыў на гэты працэс аказала ліквідацыя непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва, пераход да ўсеагульнага пачатковага, а затым усеагульнага сямігадовага навучання, прыток у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы вясковай моладзі, якая пасля завяршэння вучобы вярталася ў вёскі. Прадстаўнікі вясковай інтэлігенцыі сталі насіць у 1930-я гг. двухбортныя фабрычныя касцюмы, фабрычныя чаравікі і туфлі, хоць гальштукаў і капелюшоў амаль не насілі. Такім чынам, касцюм вясковага насельніцтва Беларусі ў даваенны перыяд уяўляў сабой своеасаблівае спалучэнне элементаў традыцыйнага і новага адзення, якое пранікла з горада. Прычым суадносіны традыцыйных і гарадскіх элементаў у касцюме залежалі ад канкрэтнай мясцовасці, аддаленасці ад прамысловых цэнтраў.

За гады вайны, паводле няпоўных даных, у рэспубліцы загінула больш як 2,7 млн. чалавек — больш за чвэрць даваеннага насельніцтва, якое скарацілася з 9183,4 тыс. у 1941 г. да 6264,8 тыс. у 1945 г. Большая частка мужчын працаздольнага ўзросту была знішчана, а многія з уцалелых франтавікоў сталі інвалідамі. У гады акупацыі было зруйнава-





Вясковыя жыхары са Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1990-я гг. Фота У. М. Меляшэнкі



Рабочыя саўгаса на ўборцы лёну ў час перапынку на абед. Вёска Лядна Слуцкага раёна Мінскай вобласці. 1960-я гг. Фота Д. І. Мазаніка



Жанчыны перабіраюць бульбу. Вёска Прагрэс Салігорскага раёна Гомельскай вобласці. 1960-я гг.



Уборка бульбы ў калгасе імя Прытыцкага Брэсцкай вобласці. 1980-я гг. Фота А. Перахода



Уборка бульбы ў саўгасе «Рагоўскі» Мінскай вобласці. 1989 г.



Міжрадковая апрацоўка цукровых буракоў у калгасе «Камуніст» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. 1965 г. Фота В. Лупейкі



Механізаваная ўборка цукровых буракоў у калгасе «Земляроб». Брэстчына. 1980-я гг.



Ачыстка цукровых буракоў. Брэстчына. 1980-я гг.





Вясковая глыбінка. Вуліца ў вёсцы Любавічы Тураўскага раёна Гомельскай вобласці. 1953 г. Фота І. Аксельрода



Вуліца ў вёсцы Навалессе Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. 1953 г. Фота І. Аксельрода



Беларуская вёска адбудоўваецца пасля вайны. Новая калгасная вуліца ў вёсцы Залессе Халопеніцкага раёна Віцебскай вобласці. 1959 г. Фота П. М. Захаранкі



Вуліца новых калгасных дамоў у вёсцы Леніна Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. 1960 г. Фота Д. І. Мазаніка



Вуліца ў вёсцы Грыцэвічы Нясвіжскага раёна
Мінскай вобласці. 1966 г.
Фота І. М. Браіма



Жылы дом, пабудаваны пасля вайны, у вёсцы Варонічы
Полацкага раёна Віцебскай вобласці.
1980 г.



Святочны мужчынскі касцюм. Вёска Міхалкаўская Рудня Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Канец 1940-х гг.



Адзенне дзяцей. Стралкі з лука. Вёска Баравое Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. 1956 г. Фота Л. А. Малчанавай



Святочны касцюм юнака. Вёска Крынкі Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. 1950-я гг.



Штодзённае адзенне жанчын і дзяцей. Вёска Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці. 1958 г. Фота Д. І. Мазаніка



Святочнае адзенне сялянскіх дзяўчат. Вёска Міхалкаўская Рудня Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 1957 г.



Адзенне дзяцей. Вёска Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці. 1958 г. Фота Л. А. Малчанавай



Адзенне дзяцей. Вёска Бродніца Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1958 г. Фота Н. І. Камсюк



Мужчынскі штодзённы касцюм. Вёска Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці. 1958 г.



Інтэр'ер сялянскага дома.
Вёска Усохі Добрушскага раёна
Гомельскай вобласці. 1965 г.
Фота П. М. Захаранкі




Фрагмент інтэр'ера сялянскага дома. Вёска Навасёлкі
Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.
1971 г.



Гасціннасць. Вёска Латыгава
Віцебскай вобласці. 1966 г.
Фота Р. В. Надольскага



Інтэр'ер сялянскага дома. Вёска Сакаўшчына
Валожынскага раёна Мінскай вобласці. 1969 г.
Фота П. М. Захаранкі



Штодзённае адзенне жанчыны і дзяўчынкі. Вёска Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці. 1958 г. Фота Д. І. Мазаніка

на 9200 вёсак, з якіх 692 былі спалены карнікамі разам з жыхарамі; разбураны ўсе калгасы, саўгасы і МТС; знішчана ўся энергетычная і тэхнічная база сельскай гаспадаркі.

У пасляваенны перыяд узнаўлення народнай гаспадаркі рэспублікі падсобныя гаспадаркі з'яўляліся асновай выжывання вясковага насельніцтва і служылі дадатковай крыніцай павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Нягледзячы на ўрадавыя меры па стрымліванні развіцця асабістай падсобнай гаспадаркі, ва ўмовах пасляваеннай картачнай сістэмы пастаўкі прадуктаў калгаснікамі рабілі больш разнастайным асартымент сельскагаспадарчай прадукцыі на рынках гарадоў і мястэчак рэспублікі.



Свята калгаснай брыгады. Любанскі раён Мінскай вобласці. 1948 г.

Пасляваенная вёска перажывала востры недахоп тэхнікі. Паўсюдна на Беларусі ў плуг упрагалі кароў, а бароны па ворыве цягалі жанчыны, старыя і падлеткі. Сеялі ўручную, жалі сярпамі, малацілі цапамі.

Першачарговай задачай было будаўніцтва жылля, каб хутчэй перасяліць тысячы сем'яў з зямлянак, стварыць для іх больш спрыяльныя жыллёвыя ўмовы, пабудаваць школы, бальніцы. Ужо ў 1945 г. на патрэбы калгаснага будаўніцтва было выдзелена больш за 9 млн м$^2$ лесу і шмат іншых будаўнічых матэрыялаў[38]. За гады чацвёртай пяцігодкі (1946–1950 гг.) у сельскай мясцовасці БССР было пабудавана 290,3 тыс. дамоў[39].

Аднак капіталаўкладанні дзяржавы ў сельскую гаспадарку былі недастатковымі. У 1950–1953 гг. яны складалі крыху больш за $^1/_5$ укладанняў у прамысловасць[40]. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых культур у 1950 г. у БССР складала 7,8 ц/га[41].



Вяселле. Танцы на двары ў жаніха. Вёска Веляцін Хойніцкага раёна Палескай вобласці. 1950 г. Фота М. Я. Грынблата

Як і ў першыя пасляваенныя гады, у 1951–1953 гг. асноўную ролю ў жыцці калгасных сем'яў адыгрывала падсобная гаспадарка, аднак з боку раённых партыйных кіраўнікоў і старшынь калгасаў яна не падтрымлівалася. Для апрацоўкі прысядзібных участкаў не выдаваліся коні, а таксама кармы і паша для індывідуальнай жывёлы калгаснікаў[42].

Верасноўскі Пленум (1953 г.) ЦК КПСС, прысвечаны аграрным праблемам краіны, асудзіў практыку неабгрунтаваных абмежаванняў умоў развіцця асабістых падсобных гаспадарак вясковых і гарадскіх жыхароў[43]. Былі поўнасцю адменены абавязковыя пастаўкі дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў падсобнымі гаспадаркамі калгаснікаў, рабочых і служачых, што ў хуткім часе дало свае вынікі.

З 1954 па 1958 г. пагалоўе хатняй жывёлы ў БССР узрасло на 14,7 працэнта, свіней — на 27,6 працэнта. Пры гэтым колькасць двароў у дадзены перыяд скарацілася на 7 працэнтаў[44]. Аднак з канца 1958 г. кіраўніцтва дзяржавы зноў пачало праводзіць палітыку згортвання асабістых падсобных гаспадарак вясковых і гарадскіх жыхароў. На снежаньскім (1958 г.) Пленуме ЦК КПСС было рэкамендавана калгасам забяспечыць калгаснікаў прадуктамі харчавання, саўгасам выкупіць жывёлу ў сваіх рабочых і служачых на працягу двух-трох гадоў, забяспечыць іх прадукцыяй жывёлагадоўлі, а таксама бульбай і гароднінай.

Негатыўную ролю ў абмежаванні асабістай уласнасці вяскоўцаў адыграла прынятая ў 1961 г. Трэцяя праграма КПСС. На фоне дэклараванага хуткага руху да камуністычнага будучага асабістыя гаспадаркі былі непажаданым перажыткам былога і падлягалі ліквідацыі на працягу 20 гадоў — да непасрэднага пераходу да камунізму. У пачатку 1960-х гг. М. С. Хрушчоў падпісаў урадавыя рашэнні аб скарачэнні памераў прысядзібных участкаў, пагалоўя жывёлы, пазбаўленні гаспадарак кал-



Святкаванне хрэсьбін.
Вёска Янавічы Клецкага раёна
Мінскай вобласці.
1950-я гг.




Свята першага снапа ў Хадосаўскім сельскім савеце
Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці.
1970-я гг.



Удзельнікі народнага ансамбля танца «Палессе» Пінскага гарадскога Дома культуры. 1989 г. Фота Э. Кабяка



Свята «Зажынкі» ў калгасе імя П. М. Машэрава Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. 1986 г.

гаснікаў і рабочых саўгасаў дадатковых сенажацяў і пашы. Мэтазгоднасць такіх мер аргументавалася тым, што праблемы харчавання павінны вырашацца грамадскай вытворчасцю, а асабістыя гаспадаркі адрывалі вяскоўцаў ад актыўнага ўдзелу ў калектыўных вытворчых працэсах.

Акрамя таго, адзначалася, што значная частка такога каштоўнага прадукту харчавання, як хлеб, ідзе на корм асабістай жывёле насельніцтва. У 1963 г. агульнасаюзным рашэннем вяскоўцам забаранялася трымаць на падворку авечак, коз і больш за адну карову і адну свінню[45].

Масавыя закупкі ў гэты перыяд жывёлы ў вясковага насельніцтва калгасамі, саўгасамі і нарыхтоўчымі арганізацыямі спрыялі экстэнсіўнаму развіццю грамадскай вытворчасці. Аднак гэтая буйнамаштабная дзяржаўная акцыя стала чарговым звяном у разбурэнні традыцыйнага сялянскага ладу жыцця, уніфікацыі вёскі і яе людзей. За перыяд з 1958 па 1964 г. памер прысядзібных участкаў у калгасах СССР скараціўся на 12, у саўгасах — на 28 працэнтаў, вытворчасць мяса і малака ў асабістых гаспадарках зменшылася на 20 працэнтаў[46].

Адчужэнне сельскага працаўніка ад зямлі і вынікаў сваёй працы, адмена ў 1962 г. забароны на атрыманне пашпартоў значна павялічылі міграцыю найбольш адукаванага і працаздольнага насельніцтва з вёскі ў горад, што пагоршыла дэмаграфічную сітуацыю ў сельскай мясцовасці. З 1970 па 1984 г. сельскае насельніцтва ў БССР паменшылася ў 1,5 разы. Толькі ў кастрычніку 1964 г. ЦК КПСС была прынята Пастанова «Аб устараненні неабгрунтаваных абмежаванняў асабістай гаспадаркі калгаснікаў, рабочых і служачых»[47], у якой давалася ацэнка ролі асабістай падсобнай гаспадаркі у сельскагаспадарчай вытворчасці, усталёўваліся нормы ўтрымання жывёлы і памеры прысядзібных участкаў, якія дзейнічалі да ўвядзення абмежаванняў. Сельскагаспа-

дарчым арганізацыям у пастанове рэкамендавалася аказваць дапамогу насельніцтву ў апрацоўцы прысядзібнага ўчастка, забеспячэнні маладняком жывёлы і птушкі, набыцці і загатоўцы кармоў.

Напрыканцы 1960-х і ў 1970-х гг. па ініцыятыве ЦК КПБ у рэспубліцы рэалізоўвалася праграма зносу «неперспектыўных» вёсак. Жыхары невялікіх вёсак, дзе ў асноўным зберагаліся традыцыі беларускай народнай культуры, часам гвалтоўна перасяляліся ў буйныя калгасныя і саўгасныя пасёлкі[48]. У каторы раз дагледжаныя сялянскія сады і прысядзібныя ўчасткі выводзіліся з гаспадарчага абароту, зарасталі пустазеллем і кустамі.

У 1970-я — сярэдзіне 1980-х гг. урадамі СССР і БССР быў прыняты шэраг пастаноў, якія падугледжвалі арганізацыю закупак сельскагаспадарчай прадукцыі ў падсобных гаспадарках насельніцтва і каапярацыю асабістых падсобных гаспадарак з калгасамі і саўгасамі. Вялікае практычнае значэнне для падтрымкі развіцця асабістых падсобных гаспадарак насельніцтва мела Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 8 студзеня 1981 г. «Аб дадатковых мерах па павелічэнні вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў асабістых падсобных гаспадарках грамадзян»[49]. Пасля прыняцця гэтай Пастановы ў БССР сельскагаспадарчыя арганізацыі пачалі прымаць дзейсныя меры па забеспячэнні насельніцтва высакаякасным сартавым насеннем бульбы і збожжавых культур, гародніны, набыцці пародзістага маладняку буйной рагатай жывёлы, свіней, птушкі, а таксама выдзяляць зямельныя ўчасткі для пашы і нарыхтоўкі кармоў для свойскай жывёлы, гарантавалі збыт лішкаў прадукцыі, выраблenай у гаспадарках вясковых жыхароў.

Пры каапярацыі з асабістымі падсобнымі гаспадаркамі насельніцтва калгасы і саўгасы атрымлівалі магчымасць без павелічэння пасяўных плошчаў і дадатковых капіталаўкладанняў павялічваць выраб сельскагаспадарчай прадукцыі. У сваю чаргу ўладальнікі падсобных гаспадарак пазбаўляліся праблем са збытам лішкаў прадукцыі і значна павялічвалі свае даходы. У гэты час асабістыя падсобныя гаспадаркі вясковых жыхароў сталі арганічнай часткай сельскагаспадарчай вытворчасці краіны, дапаўнялі яе, з'яўляючыся арганізацыйна-прававой формай гаспадарання вясковай сям'і з мэтай задавальнення патрэб яе членаў у прадуктах харчавання і атрымання дадатковага даходу пры рэалізацыі лішкаў выраблenай прадукцыі. Пры гэтым яны заставаліся падсобнымі адносна фонду рабочага часу і фарміравання сямейнага бюджэту. Яшчэ адной асаблівасцю сялянскай гаспадаркі была адсутнасць наёмнай працы.

Значныя перамены ў 1960—1970-я гг. адбыліся ў вясковым будаўніцтве. У развіцці сялянскага жылля з кожным годам драўніна ўсё больш саступала месца новым будаўнічым матэрыялам: цэгле, шлакабетону, шыферу, драўняна-стружкавым плітам і інш. Новыя дамы значна адрозніваліся ад старых памерамі, вышынёй, колькасцю пакояў, велічынёй вокнаў. Назіраўся працэс павелічэння жылой плошчы ў разліку на аднаго чалавека.

Рост матэрыяльнага і культурнага ўзроўню адбіўся і на вонкавым афармленні сядзібы. Звычайна яна агароджвалася лёгкім штакетнікам. Перад хатай абавязкова размяшчаўся кветнік, высаджваліся дэкаратыўныя дрэвы — бярозы, каштаны, клёны. Дарожкі абсаджваліся кветкамі.

Ліштвы акон, вуглы, аканіцы, вільчыкі сялянскіх дамоў багата ўпрыгожваліся разьбой. Шырокае распаўсюджанне атрымала дэкаратыўнае аздабленне вонкавых сцен хаты мастацкай укладкай шалёўкі.



Выступленне ансамбля «Лявоны» на полі ў час свята завяршэння ўборкі збожжавых культур. 1970-я гг.

Будаўніцтва ў вёсцы шматпакаёвых дамоў адбівалася на інтэр'еры. Сцены ў пакоях бялілі або абклейвалі шпалерамі, столь падшывалі фанерай і фарбавалі ў белы колер. Традыцыйныя лавы, куфры, саматробныя ложкі выходзілі з ужытку і саступалі месца фабрычнай мэблі.

Якасныя змены адбываліся і ва ўпарадкаванні сельскіх пасяленняў. Узнікалі цэлыя вуліцы новых дамоў, будаваліся дарогі, магазіны, амбулаторыі, клубы, бытавыя ўстановы.

У гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі адбылося частковае вяртанне да традыцыйнай вопраткі, звязанае з пагаршэннем забеспячэння насельніцтва прамысловымі таварамі. Зноў у касцюме вясковага насельніцтва сталі шырока выкарыстоўвацца шынялі, гімнасцёркі, ваенныя і пашытыя па іх узоры штаны галіфэ і напаўгаліфэ, ваенныя фуражкі, пілоткі і зімовыя шапкі-вушанкі. Міграцыя ў гарады вялікай колькасці насельніцтва ў сувязі з пасляваенным прамысловым і культурным будаўніцтвам паскорыла працэсы збліжэння культуры гарадскіх і вясковых жыхароў, садзейнічала нівеліроўцы асаблівасцей у адзенні. Касцюм стаў вызначаць не сацыяльны статус чалавека, а яго ўзрост і матэрыяльныя магчымасці.

У 1950-я гг. самым распаўсюджаным мужчынскім адзеннем у сельскай мясцовасці з'яўляліся аднабортныя і двухбортныя касцюмы, кашулі разнастайных афарбовак, світары, джэмперы, лыжныя касцюмы, курткі. Разам з тым штодзённае адзенне сельскіх жыхароў ў параўнанні з гараджанамі вызначалася шырокім распаўсюджаннем сцёганак («кухваяк»), рабочых ботаў, гумовага абутку. У сувязі з развіццём пра-

мысловасці і ростам дабрабыту насельніцтва ў касцюм вясковага насельніцтва ўсё шырэй уваходзілі цёплыя і летнія паліто рознага крою, курткі разнастайных фасонаў, модны абутак.

Значныя змены ў адзенні адбыліся ў 1960-х гг. Гэтаму садзейнічалі ўдасканаленне мадэлявання адзення і рост яго прамысловай вытворчасці, масавае выкарыстанне сінтэтычных тканін. Тэмпы змянення тэндэнцый і напрамкаў моды ў гэтыя гады значна ўзраслі. Атрымала пашырэнне так званае маральнае старэнне адзення: насельніцтва перастала карыстацца рэчамі, якія яшчэ не страцілі сваіх спажывецкіх якасцей.

Рост дабрабыту вясковых жыхароў, развіццё сродкаў масавай інфармацыі, іх арыентаванасць на гарадскую культуру садзейнічалі таму, што ў цяперашні час усё вясковае насельніцтва набывае ў магазінах і на рынках гатовую бялізну, верхнюю вопратку, абутак і галаўныя ўборы. Самым распаўсюджаным адзеннем мужчынскага насельніцтва як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці з'яўляюцца масавага пашыву двух- і аднабортныя касцюмы, разнастайныя курткі, паліто, дублёнкі і г.д.

У 1960—1989-х гг. у многіх калгасах і саўгасах БССР ва ўрачыстых абставінах непасрэдна на полі адзначаліся свята першай баразны, зажынкі, дажынкі. Асабліва ўрачыста пры заканчэнні ўборкі жыта — асноўнай збожжавай культуры беларусаў — праводзіліся дажынкі, якія падводзілі вынік працы хлебаробаў. Месцам правядзення дажынак служыла поле, дзе камбайны ўбіралі апошнія гектары збожжа.

Пад час свята захоўваліся звычаі ўручэння сімвалічнага апошняга снапа і каравая з мукі новага ўраджаю кіраўніку гаспадаркі і лепшаму па выніках працы камбайнеру, пляценне вянкоў з каласоў і ўручэнне іх удзельнікам жніва. Вітаць паляводаў з заканчэннем жніва на поле прыязджалі з канцэртамі самадзейныя і фальклорныя калектывы[50].

Пасля заканчэння жніва ў маштабе раёна праводзілася Свята ўраджаю. Месцам яго правядзення звычайна былі цэнтральная плошча і парк райцэнтра, якія ўпрыгожваліся адпаведнымі транспарантамі, стэндамі, плакатамі. Стрыжнем свята быў урачысты мітынг, на якім падводзілі вынікі ўборкі збожжа, віншавалі лепшых камбайнераў, шафёраў і пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, уручалі ім каштоўныя падарункі, ганаровыя граматы. Завяршалася свята канцэртам самадзейных або прафесійных артыстаў, масавымі гульнямі, спартыўнымі спаборніцтвамі, танцамі[51].

Цяжкія выпрабаванні прынесла беларускаму народу аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Радыеактыўнымі асадкамі была забруджана $^1/_5$ частка тэрыторыі Беларусі, на якой пражывала больш за 2 млн чалавек. З гаспадарчага абароту былі выведзены сотні тысяч гектараў ворных зямель. Непрадбачаныя былі і страты, нанесеныя здароўю людзей.

У канцы XII пяцігодкі (1986—1990 гг.) у склад аграпрамысловага комплексу БССР уваходзілі 1641 калгас, 866 саўгасаў, 325 міжгасаў, 44 прадпрыемствы лясной гаспадаркі, 530 прамысловых прадпрыемстваў, 300 ветэрынарных станцый, працавала 48 прамысловых аб'яднанняў, 8 сельскагаспадарчых і 24 навукова-вытворчыя аб'яднанні, 3 аграпрамысловыя камбінаты, 3 аграпрамысловыя аб'яднанні, 30 аграфірм[52]. Капітальныя ўкладанні ў АПК БССР у 1990 г. складалі 47 працэнтаў; інвестыцыі ў народную гаспадарку рэспублікі, у тым ліку ў сельскагаспа-

дарчую вытворчасць, склалі 28,8 працэнта[53]. Гэта дазволіла рэспубліцы дасягнуць высокіх паказчыкаў развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці не толькі ва ўсесаюзным, але і ў еўрапейскім маштабе. У 1990—1991 гг. Беларуская ССР у разліку на душу насельніцтва вырабляла мяса і малака больш, чым Германія, Францыя, Вялікабрытанія, збожжа — на $^1/_3$ больш, чым у сярэднім краіны Еўрапейскага саюза. Беларусі належала сусветнае першынства ў вытворчасці бульбы і льновалакна[54]. Заработная плата ў сельскай мясцовасці была толькі на 7 працэнтаў ніжэй за сярэднюю па народнай гаспадарцы краіны. Адзін работнік, заняты ў сельскай гаспадарцы, запяспечваў прадуктамі харчавання 20 чалавек[55].

У жніўні 1991 г. была абвешчана незалежнасць Рэспублікі Беларусь. Савецкі перыяд у жыцці беларускай вёскі закончыўся.

[1] Декрет о земле // СУ РСФСР. 1917. № 1. Ст. 3.
[2] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў / рэд. В. К. Бандарчык. Мінск, 1974. С. 94.
[3] Тамсама.
[4] Шымуковіч С. Ф. Гісторыя Беларусі: курс лекцый. Ч. II. 2-е выданне. Мінск, 2004. С. 101.
[5] Цит. по кн.: Ребенок П. Ф. Дорогою столетий: Левошевичи – Левоши (от древнего поселения до колхоза (ПСК) «50 лет Октября» и агрогородка). Речица, 2011. С. 76.
[6] Там же.
[7] Там же.
[8] Социалистические преобразования в экономике Белоруссии в 1917—1920 гг. Минск, 1966. С. 159.
[9] Там же.
[10] Шымуковіч С. Ф. Гісторыя Беларусі. С. 101.
[11] Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. IX. Мінск, 1973. С. 373.
[12] Мілаванаў В. А. Першыя крохі калгаснага руху ў Беларусі. Мінск, 1958. С. 37.
[13] Шымуковіч С. Ф. Гісторыя Беларусі. С. 116.
[14] Бяспалая М. А. Беларуская вёска ў 1921—1927 гг. : аўтарэф. дыс. ... д-ра гіст. навук. Мінск, 1999. С. 27.
[15] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 3. Мінск, 1973. С. 232.
[16] Тамсама. С. 234.
[17] Коммунист Белоруссии. 1966. № 9. С. 65—66.
[18] Белорусская СССР в 1922—1923 году – к V Всебелорусскому съезду Советов. Минск, 1924. С. 47.
[19] Гісторыя Беларускай ССР. С. 237.
[20] Милованов В. А. Динамика колхозного движения в Белоруссии в восстановительный период: (1921—1925 гг.) // Из истории социалистического строительства Советской Белоруссии. Минск, 1959. С. 49.
[21] Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. С. 94.
[22] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795—2002). Мінск, 2003. С. 282.
[23] Беларускае народнае жыллё / Э. Р. Сабаленка [і інш.]. Мінск, 1973. С. 100.
[24] Шымуковіч С. Ф. Гісторыя Беларусі. С. 128—129.
[25] Беларусь: страницы истории / редсовет: А. А.Коваленя [и др.]; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. Минск, 2011. С. 256.
[26] Там же.
[27] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795—2002). С. 286—287.
[28] Беларусь: страницы истории. С. 256.
[29] Шымуковіч С. Ф. Гісторыя Беларусі. С. 147.
[30] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795—2002). С. 287.
[31] Примерный устав сельскохозяйственной артели СССР / СЗ СССР. 1935. № 1. Ст. 82.
[32] Шатова А. В. Личное подсобное хозяйство в условиях переходной экономики. Пенза, 2005. С. 9.
[33] Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967 / ред. Ф. С. Мартинкевич. Минск, 1967. С. 243.
[34] Там же. С. 249.
[35] Якуб Колас. Збор твораў: у 12 т. Т. 5. С. 337—338.
[36] Улашчык М. М. Краязнаўства. Нататкі пра бадзянні ў 1924—1929 гг. Мінск, 1999. С. 49, 63.
[37] Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году. С. 168.
[38] Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. XII. Мінск, 1975. С. 315.

[39] Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. Ч. 2. Люты 1917 г. – 2000 г. / Я. К. Новік [і інш.]. 2-е выд. Мінск, 2000. С. 291.

[40] Белязо Е. П. Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму. Минск, 1982. С. 24.

[41] Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. XII. С. 315.

[42] Белязо Е. П. Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму. С. 25.

[43] Ведомости Верховного Совета СССР. 1953. № 7.

[44] Гончаров А. Тенденции развития личных подсобных хозяйств сельского населения, их эволюция в аграрном секторе экономики // Актуальные проблемы устойчивого развития сельского хозяйства: материалы VII Международной научно-практической конференции (Минск, 17–18 сентября 2008 г.). Минск, 2008. С. 151.

[45] Сарокін А. М. Рэха эпохі крайнасцяў. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады). Мінск, 2005. С. 136.

[46] Тамсама.

[47] Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам: сб. док. Т. 5. М., 1968.

[48] Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). С. 373.

[49] СП СССР. М., 1981. № 6. С. 114–126.

[50] Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мінск, 1993. С. 250.

[51] Беларусы: у 8 т. Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко [і інш.] Мінск, 2002. С. 514.

[52] О развитии агропромышленного комплекса Белорусской ССР / Госкомстат БССР. Минск, 1991. С.1.

[53] Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г.: стат. сб. / Госкомстат Респ. Беларусь. Мінск, 1993. С. 236.

[54] Сельское хозяйство Беларуси в цифрах 1980–2007 гг.: тенденции развития / сост. В. С. Сакович; под науч. ред. В. Г. Гусакова. Мінск, 2008. С.3.

[55] Государственная программа возрождения и развития села на 2005–2010 годы: проект // Белорусская нива. 2005. 28 янв.

ГЛАВА 3

# СУЧАСНАЯ ВЁСКА (КАНЕЦ XX — ПАЧАТАК XXI СТ.)







Сельская гаспадарка з'яўляецца ўнікальнай галіной аграпрамыслова комплексу, якая забяспечвае харчовую бяспеку дзяржавы, дае насельніцтву жыццёва неабходныя прадукты харчавання, служыць сыравіннай базай для іншых галін вытворчасці. Пры добрым гаспадаранні сельская гаспадарка не зношваецца, а, наадварот, узмацняе сваю прадукцыйную здольнасць[1].

Больш як 40 працэнтаў тэрыторыі краіны складаюць землі, якія знаходзяцца ў сельскагаспадарчым абароце. Іх агульная плошча складае амаль 9 млн га, з якіх больш як 60 працэнтаў прыпадае на прыдатныя для ворыва. У карыстанні сельскагаспадарчых арганізацый знаходзіцца амаль 8 млн га зямель. Каля паловы ворных зямель у краіне адведзена пад збожжавыя і зернебабовыя культуры, каля трэці — пад вытворчасць кармоў, астатнюю плошчу займаюць бульба (5,38 %) гародніна (1,16 %) і лён (0,99 %)[2]. Каля чвэрці плошчы пасеваў засяваецца насеннем беларускай селекцыі. Сярод азімага жыта шырокавядомыя сарты «Паўлінка», «Зазерская-3», «Пралеска», «Белая Вежа»; сярод азімай пшаніцы — «Прыазёрная», «Аўгусціна», «Натуля», «Мроя»; сярод сартоў піваварнага ячменю — «Зазерскі-85», «Гасцінец», «Гонар», «Сябра», «Бурштын», «Зубр», «Дзівосны».

Новай для Беларусі збожжавай культурай стала трыцікале — пшанічна-жытні гібрыд, які ў сучасны перыяд з'яўляецца адной з асноўных зернефуражных культур у Беларусі. Яе валавы збор складае штогод 18—20 працэнтаў ад усяго валавога збору збожжа[3]. Распаўсюджаныя беларускія сарты трыцікале «Марка», «Янка», «Кастусь», «Антось», «Жыцень».

Цвёрдая пшаніца таксама з'яўляецца новай для Беларусі збожжавай культурай. У свеце на яе долю прыпадае каля 5 працэнтаў аб'ёму ўсёй вырошчваемай пшаніцы. Валавы аб'ём вытворчасці складае 30—35 млн т у год, у тым ліку ў Еўрасаюзе — каля 10, Паўночнай Афрыцы — 6, Канадзе — 5 млн т[4]. Мэтазгоднасць вырошчвання цвёрдай пшаніцы на Беларусі абумоўлена тым, што яна з'яўляецца найлепшай сыравінай для макароннай і крупяной прамысловасці.

Макароныя выбары з цвёрдай пшаніцы не разварваюцца, характарызуюцца выдатнымі кулінарнымі і смакавымі якасцямі. Жоўта-бурштынавы колер макаронам з цвёрдай пшаніцы надаюць караціноідныя пігменты, якіх у эндасперме высакаякаснай цвёрдай пшаніцы ў 2 разы больш, чым у мяккай[5]. Цэны на цвёрдую пшаніцу на сусветным рынку на 20—30 працэнтаў вышэйшыя, чым на мяккую. Пры агульнай патрэбе Беларусі ў 90—100 тыс. т зерня цвёрдай пшаніцы ў год гэта абыходзіцца ў 20—25 млн долараў ЗША[6]. Таму, улічваючы стойкія змяненні клімату ў апошнія гады, перад аграрыямі была пастаўлена задача стварэння айчынных сартоў цвёрдай пшаніцы і ўкараненне яе ў вытворчасць Рэспублікі Беларусь.

Шматгадовыя даследаванні, праведзеныя вучонымі-селекцыянерамі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, дазволілі стварыць айчынныя сарты цвёрдай пшаніцы высокай ураджайнасці, прыдат-



Пшаніца «Сакрэт»



Ячменнае поле

ныя для вытворчасці высакаякасных макаронных вырабаў. Пры гэтым у краіне для яе пасеваў неабходна толькі 20—28 тыс. га зямлі, што дае магчымасць размясціць іх у найбольш спрыяльных глебава-кліматычных умовах. Укараненне айчынных сартоў цвёрдай пшаніцы ў раслінаводства дазволіць вырашыць праблему імпартазамяшчэння зерня цвёрдай пшаніцы і прадуктаў яго перапрацоўкі і з'яўляецца эканамічна выгадным[7].

У 2014 г. паспяхова прайшлі дзяржаўнае сортавыпрабаванне першыя беларускія сарты цвёрдай пшаніцы — «Славіца» (азімы сорт) і «Разалія» (яравы). Яны ўключаны ў Дзяржаўны рэестр сартоў, рэкамендаваных для вырошчвання ў Беларусі.

Рост прадукцыйнасці сельскагаспадарчых культур без укаранення ў вытворчасць новых сартоў у сучасны перыяд немагчымы. Новыя інтэнсіўныя сарты пры аднолькавых затратах угнаенняў і сродкаў аховы раслін здольны даваць больш высокія ўраджаі. Ацэнка сартоў у дзяржаўным выпрабаванні праводзіцца паводле іх устойлівасці да палягання, хвароб і шкоднікаў, рэакцыі на розныя стрэсавыя фактары[8].

На 1 студзеня 2016 г. у Дзяржаўны рэестр сартоў уключана 59 сартоў пшаніцы азімай, 21 — трыцікале азімай, 31 — жыта азімага, 23 — пшаніцы яравой, 55 — ячменю яравога (з іх 40 — піваварных), 20 — аўса, (4 — галазерных), 20 — гароху пасяўнога[9].

На тэрыторыі Беларусі ў цяперашні час вырошчваецца больш як шэсцьдзясят сартоў бульбы. З ранніх сартоў найбольшай папулярнасцю ў насельніцтва і добрымі паказчыкамі ўраджайнасці вылучаюцца сар-



Плён хлебароба

ты «Лілея», «Капрыз», «Зорачка». У групе сярэдняранніх сартоў шырока распаўсюджаны «Брыз», «Явар», «Архідэя». Сярод групы сярэдняспелых сартоў найбольш вядомыя «Скарб», «Жывіца», «Крыніца», «Талісман», «Янка». Групу сярэдняпозніх сартоў складаюць «Ласунак», «Рагнеда», «Блакіт», «Журавінка», «Маг». З позніх сартоў найбольш папулярныя «Атлант», «Здабытак», «Зарніца».

Такім чынам, беларускія сарты бульбы задавальняюць попыт насельніцтва на харчаванне і прамысловасць на яе перапрацоўку. Найбольш



Ячмень «Бацька»



Авёс «Запавет»



Трыцікале – гібрыд жыта и пшаніцы. 1977 г.



Грэчка «Кармэн»



Кукуруза

прыдатныя для працяглага захавання клубні бульбы «Скарб», «Жывіца», «Крыніца», «Рагнеда», «Блакіт»[10].

У развіцці сельскай гаспадаркі незалежнай Рэспублікі Беларусь вучоныя-аграрнікі вылучаюць некалькі этапаў. Першы этап доўжыўся з 1991 па 1995 г., калі праводзілася палітыка рэарганізацыі калгасаў і саўгасаў былой БССР у структуры рыначнага тыпу. Ішлі размеркаванне калектыўнай і грамадскай маёмасці на долі і паі паміж работнікамі, прыватызацыя сродкаў вытворчасці, падзел зямлі. Буйнатаварныя калектыўныя гаспадаркі разбураліся, скарачаліся аб'ёмы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Сталі актыўна ствараецца кааператыўныя і фермерскія гаспадаркі.



Сорт кукурузы «Залешыцкі»

Другі этап развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі прыпадае на 1995—1999 гг. У гэты час было спынена разбурэнне буйных калектыўных прадпрыемстваў і абвешчана суіснаванне і развіццё ў сельскай гаспадарцы разнастайных форм гаспадарання.



Рапс «Вітаўт»



Вузкалісцевы люпін «Жодзінскі»



Гарох



Бульба цвіце



Сарты беларускай бульбы

У 1996 г. была прынята першая ў незалежнай Беларусі Дзяржаўная праграма рэфармавання аграпрамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на 1996—2000 гг. Аднак з-за шэрагу прычын цалкам рэалізаваць яе не ўдалося.

Пачатак наступнага этапа развіцця сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь прынята лічыць з часу ўвядзення ў дзеянне Дзяржаўнай праграмы ўдасканалення аграпрамысловага комплексу краіны на 2001—2005 гады. Адначасова з рэструктурызацыяй аграпрамысловага комплексу Праграма ўключала важныя напрамкі дзяржаўнай падтрымкі аграпрамысловай вытворчасці. На вышэйшым узроўні буйнатаварная вытворчасць у галіне сельскай гаспадаркі была прызнана прыярытэтнай. Прадугледжваліся дзесяць форм трансфармацыі і рэарганізацыі калгасаў і саўгасаў у новыя рыначныя формы, у якіх спалучаліся ў рознай ступені дзяржаўная і недзяржаўная ўласнасць, унітарныя прадпрыемствы, акцыянерныя кампаніі, кааператыўныя аб'яднанні і г. д.[11]



Квітнеючы лён

Праграма з'явілася асновай карэннай перабудовы нацыянальнай сельскай гаспадаркі на рыначных прынцыпах у спалучэнні з дзейснымі метадамі дзяржаўнай падтрымкі. У выніку стаў аднаўляцца вытворчы патэнцыял буйных таварных



Проса «Гомельскае»



Плуг паўнавагавы абаротны ПО-(6+4)-40/45. Прызначаны для гладкага ўзворвання глеб, у тым ліку засмечаных камянямі, з дадатковай апрацоўкай пласта глебы катковымі прыстаўкамі



Камбінаваны агрэгат для мінімальнай апрацоўкі глебы АКМ-6. Прызначаны для лушчэння ржышча, напаўпапарнай восеньскай апрацоўкі зябліва, восеньскай апрацоўкі палёў пасля ўборкі кукурузы, буракоў і бульбы



Самаходная машына хімізацыі МХС-10. Прызначана для транспартавання і паверхневага ўнясення пылападобных хімічных меліярантаў і цвёрдых мінеральных угнаенняў

прадпрыемстваў, яны зноў сталі дамінаваць на ўнутраным рынку. У 2003—2005 гг. у краіне былі дасягнуты аб'ёмы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі 1990—1991 гг.[12] Дзяржаўная праграма ўдасканалення аграпрамысловага комплексу на 2001—2005 гады з'явілася першай праграмай пасля станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь, якая была практычна поўнасцю рэалізавана.

Аднак жыллёвыя ўмовы ў сельскай мясцовасці заставаліся горшымі, чым у горадзе; былі менш развіты комплекс сацыяльна-бытавых паслуг, ніжэйшая заработная плата, менш спрыяльныя ўмовы для павышэння адукацыйнага ўзроўню і правядзення вольнага часу, з пры-



Машына МПН-16 для ўнясення на поле напаўвадкага ўгнаення



Агрэгат безадвальнай апрацоўкі глебы АБТ-4.
Прызначаны для апрацоўкі цяжкіх глеб, апрацоўкі глебы на зябліва пасля ўборкі збожжавых і зернебабовых культур, кукурузы, буракоў і бульбы, мульчыравання, выраўноўвання і прыкатвання паверхні поля



Глебаапрацоўча-пасяўны агрэгат АПЛ-4.
Прызначаны для сумяшчэння перадпасяўной апрацоўкі глебы з сяўбой лёну і іншых культур (рапс азімы і яравы, рэдзька маслічная, гарчыца, трава, збожжавыя) з унясеннем стартавай дозы грануляваных мінеральных угнаенняў



Модульны камбінаваны глебаапрацоўчы бульбасаджальны агрэгат АМПК-4-90. Прызначаны для рыхлення глебы, фарміравання высакапрофільных грэбняў і пасадкі клубняў бульбы з адначасовым унясеннем мінеральных угнаенняў



Сеялка пнеўматычная С-9. Прызначана для радковай сяўбы насення збожжавых каласавых, сярэдненасенных зернебабовых (гарох, лубін), траў і іншых культур



Сяўба азімых у аграгарадку Крыўлянскі. Вёска Крыўляны Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці




Саджалка радковай пасадкі бульбы на ўсіх тыпах глебы з адначасовым пратраўліваннем клубняў і ўнясеннем мінеральных угнаенняў




Культыватар-акучнік-раслінасілкавальнік КОР-4. Прызначаны для апрацоўкі бульбы. За адзін праход забяспечвае якаснае фарміраванне аб'ёмных грабянёў, рыхленне міжрадкоўяў і ўнутрыглебавае ўнясенне мінеральных угнаенняў




Бульбоўнікаўборачная машына БМК-4-75. Прызначана для ўборкі бульбоўніку з адначасовым змяльчэннем. Тэхналагічныя і канструкцыйныя характарыстыкі машын прыняты на ўзроўні лепшых замежных аналагаў



Хлебная ніва



Уборка жыта. Эксперыментальная база «Зазер'е» РУП «НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі». Пухавіцкі раён Мінскай вобласці. 2013 г.

чыны чаго страчваецца прывабнасць сельскай працы і сельскага ладу жыцця. Таму па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь была распрацавана Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця сяла на 2005—2010 гады. Ад папярэдніх праграм яе адрознівалі комплекснасць, вырашэнне праблем аграпрамысловай вытворчасці ў цеснай узаемасувязі з развіццём і ўдасканаленнем усёй сацыяльнай інфраструктуры сельскіх паселішчаў. За перыяд дзеяння гэтай праграмы дзякуючы вялікай шматаспектнай дзяржаўнай падтрымцы аграпрамысловага комплексу краіна дасягнула стабільнай харчовай бяспекі за кошт уласнай вытворчасці, узрос экспартны патэнцыял сельскагаспадарчай прадукцыі і гатовага харчавання, былі дасягнуты пашыранае ўзнаўленне вытворчага патэнцыялу прадпрыемстваў аграрнай галіны, стабільны рост даходаў прадпрыемстваў і занятых на іх работнікаў.




Збожжаўборачны камбайн «Палессе»

Дзякуючы рэалізацыі намечаных названай вышэй праграмай дзеянняў у краіне была створана разгалінаваная сетка новага тыпу паселішчаў — аграгарадкоў, колькасць якіх прыблізна супадае з колькасцю цэнтраў сельскіх (пасялковых) саветаў. Гэта садзейнічае сацыяльнаму развіццю сельскіх тэрыторый і вырашэнню праблемы кадраў сельскай гаспадаркі, таму што аграгарадкі забяспечваюць насельніцтва комплексам сацыяльных стандартаў і паслуг, якія па якасці мала саступаюць гарадскім.

Яшчэ адна адметная рыса гэтага перыяду — пачатак стварэння магутных скразных кааператыўна-інтэграцыйных структур, так званых прадуктовых спецыялізаваных кампаній, якія замыкаюць тэхналагічныя ланцужкі — ад атрымання сельскагаспадарчай сыравіны да рыначнага збыту ўнутры краіны і за мяжой гатовага высакаякаснага харчавання[13].

Новым этапам развіцця сельскай гаспадаркі стаў час рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця сяла на 2011—2015 гады. Асноўнымі яе мэтамі з’яўляліся павышэнне эканамічнай эфектыўнасці аграрнага комплексу, нарошчванне экспартнага патэнцыялу, рост даходаў вясковых жыхароў, умацаванне прэстыжу пражывання ў сельскай мясцовасці, паляпшэнне дэмаграфічнага складу вясковага насельніцтва і на гэтай аснове забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі, збліжэнне ўзроўню сацыяльных стандартаў у гарадах і на вёсцы[14]. Гэтая праграма карэнным чынам адрознівалася ад ранейшых. У




Камбайн «Палессе» на ўборцы збожжа

якасці асноўных прыярытэтаў у ёй выступалі не вытворчыя, а фінансава-эканамічныя паказчыкі: прыбытак, даход, аб'ём рэалізацыі выробленай прадукцыі, рэнтабельнасць, самаакупнасць і самафінансаванне.

Аграрная сфера эканомікі краіны інтэнсіўна развіваецца на аснове мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы шляхам рэканструкцыі і тэхнічнага пераасnашчэння вытворчых прадпрыемстваў, абнаўлення машынна-трактарнага парку, прамысловага будаўніцтва. Росту і ўдасканаленню аграпрамысловай вытворчасці садзейнічае наладжаная ўласная вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання. У краіне распрацаваны прынцыпова новыя мадэлі збожжаўборачных камбайнаў, камбінаваныя глебаапрацоўча-пасяўныя агрэгаты, машыны для разнастайнай высокапрадукцыйнай апрацоўкі глебы, унясення ўгнаенняў і сродкаў аховы раслін, дапрацоўкі прадукцыі і г. д.[15] Беларускае машынабудаванне пастаўляе для сельскай гаспадаркі краіны каля 90 працэн-



Платформа з маніпулятарам для падбору, самапагрузкі і транспарціроўкі кармоў і лёну, запрэсаваных у рулоны або цюкі, з механізаванай разгрузкай штабеляваннем у месцы складвання



Спецыяльны сельскагаспадарчы напаўпрычэп ПСС-20

таў найменняў сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання, у той час як у 1990 г. уласная вытворчасць пакрывала толькі каля 10 працэнтаў асартыментнай патрэбы[16].

У Беларусі створана буйнатаварная высокамеханізаваная аграпрамысловая вытворчасць, якая не толькі гарантуе харчовую бяспеку краіны, але і з года ў год нарошчвае экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі. Беларусь належыць да краін з дастатковым узроўнем харчавання. Значэнне паказчыка «сярэднясутачная каларыйнасць рацыёна» наблізілася да медыцынскай нормы — 3500 ккал.

Эканамічныя праблемы ў краінах — нашых гандлёвых партнёрах — закранулі і Беларусь. Матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы, якія выкарыстоўваюцца сельскай гаспадаркай, значна падаражэлі, і цэны на сельгаспрадукцыю часам не могуць кампенсаваць узрослыя затраты. У многіх сельскагаспадарчых арганізацыях атрымаўся фінансавы дэфіцыт, што паўплывала і на прымяненне розных сродкаў ахоўы раслін.

Адаптыўныя тэхналогіі абапіраюцца менавіта на прымяненне сучасных прэпаратаў, даступных толькі передавым сельскагаспадарчым прадпрыемствам. Дзяржава накіроўвае ў сельскую гаспадарку значныя сродкі, аднак хутка ўзняць агульны ўзровень укаранення адаптыўных тэхналогій немагчыма. Патрэбна ўлічваць глебавую спецыфіку ў кожнай гаспадарцы, а паколькі ў цяперашні час ідзе пастаяннае ўзбуйненне сельскагаспадарчых арганізацый, часам на тэрыторыі аднаго аграхолдынга знаходзіцца некалькі тыпаў зямель. Пад кожны тып зямлі патрэбны свае адаптыўныя механізмы. Ёсць і зоны рознай забяспечанасці вільготнасцю, цяплом, што прадвызначае працягласць вегетацыі раслін.

У беларускім земляробстве шмат што змяняецца. Напрыклад, у пасляваенныя гады на тэрыторыі БССР засявалі каля 1,3 млн га азімым жытам. У 2015 г. пад гэтую культуру адводзілася толькі 248,4 тыс. га. Пад аўсамі было 600—700, зараз — 300 тыс. га. На скарачэнне пасеваў гэтай культуры аказала значны ўплыў змяншэнне пагалоўя коней. Яшчэ нядаўна кукурузу на зерне ў Беларусі не вырошчвалі, а ў цяперашні час такімі пасевамі кожны год занята 180—200 тыс. га. Трыцікале азімая высяваецца амаль на 500 тыс. га, павялічваюцца пасяўныя плошчы рапсу[17].



Уборка кукурузы. Эксперыментальная база «Зазер'е» РУП НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі. Пухавіцкі раён Мінскай вобласці. 2013 г.

У краіне выкарыстоўваецца дакладная ўзаемазвязаная па многіх пазіцыях стратэгія атрымання высокіх ураджаяў збожжа. У земляробстве ў першую чаргу неабходна стабільнасць, калі ўраджайнасць падтрымліваецца на высокім узроўні на працягу многіх гадоў[18]. Замежныя спецыялісты сцвярджаюць, што найбольш выгаднай з'яўляецца вытворчасць збожжа з ураджайнасцю на ўзроўні 50 ц/га: вышэйшая вытворчасць нерэнтабельная — пачынаюць значна павялічвацца затраты.

Удасканаленне механізмаў функцыянавання аграпрамысловага комплексу прадугледжваецца ўрадам рэспублікі па некалькіх напрамках. Першы напрамак тычыцца акцыянавання сельскагаспадарчых арганізацый. Прадугледжваецца перадача акцый іх членам і наданне ім права ў далейшым купляць акцыі дадаткова за кошт атрыманых дывідэндаў. Акцыі будуць «хадзіць» толькі ўнутры акцыянернага таварыства. Іншыя асобы не здолеюць іх купіць.

Другі блок рэгулюе адносіны калектыўных гаспадарак і дзяржавы. Абавязацельствы перад дзяржавай будуць выконвацца ў межах дзяржзаказу: пасля разліку з дзяржавай астатняй прадукцыяй арганізацыі будуць распараджацца самастойна.

Трэці напрамак — матывацыя работнікаў сельскагаспадарчых арганізацый. Прадугледжваецца ўзгадненне ўзроўню даходаў прадпрыемства з аб'ёмам і якасцю вырабляемай імі прадукцыі.

Чацвёрты пункт у праграме закранае фарміраванне празрыстых і дзелавых узаемаадносін паміж суб'ектамі гаспадарання аграпрамысловага комплексу. Выбіраць сабе партнёраў прадпрыемствы будуць на добраахвотнай аснове.

Апошні блок мер па перабудове аграпрамысловага комплексу тычыцца механізму дзяржаўнай падтрымкі. Прадугледжваецца накіроўваць дзяржаўныя субсідыі непасрэдна прадпрыемствам. Пры гэтым 50 працэнтаў неабходна размяркоўваць прапарцыянальна плошчы сельгасугоддзяў з улікам іх бальнай ацэнкі, а астатнія 50 працэнтаў — пад аб'ёмы рэалізуемай прадукцыі[19].

Адным з найважнейшых фактараў, якія ўздзейнічаюць на ўраджайнасць, з'яўляюцца глебава-кліматычныя ўмовы. У Беларусі, дзе асноўная частка ворных зямель (74 %) размяшчаецца на лёгкіх пясчаных, супясчаных і тарфяных глебах, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых культур у апошнія гады склала 30—40 ц/га, у той час як асобныя гаспадаркі і цэлыя рэгіёны з больш урадлівымі глебамі маюць ураджайнасць 50—80 ц/га і больш[20].

Да іншых найважнейшых фактараў, якія ўздзейнічаюць на ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур у сучасны перыяд, належаць угнаенні, сродкі аховы раслін, новыя тэхналогіі і тэхніка апрацоўкі глебы, правільнасць правядзення сяўбы. Ад таго, наколькі раўнамерна і на якой глыбіні размешчана насенне на плошчы поля, залежаць яго ўсходжасць, выжывальнасць і эфектыўнасць далейшага развіцця.



Капустаўборачны камбайн КПК-1. Прызначаны для ўборкі капусты з дапрацоўкай качаноў да таварнага выгляду і пагрузкай у кантэйнеры або транспартныя сродкі, якія рухаюцца паралельна камбайну

Як паказваюць навуковыя даследаванні, у сучаснай сельскай гаспадарцы неабходна больш улічваць змены пагодна-кліматычных умоў. За апошнія 25 гадоў сярэднегадавая тэмпература ў Беларусі павялічылася больш чым на 1°С. У большай ступені гэта адбілася на тых работах, якія вядуцца пасля жніва. Тэрміны сяўбы яравых таксама давялося змяняць з прычыны таго, што працягласць залягання снежнага покрыва скарацілася, а перыяд вегетацыі збожжавых культур стаў даўжэйшы.

У 2015 г. уборка збожжавых культур у Беларусі адбывалася ў засушлівых умовах, што прынесла як некаторыя выгады, так і праблемы. Да масавай уборкі збожжавых і зернебабовых культур усе калектыўныя гаспадаркі Беларусі прыступілі 25 ліпеня. Устойлівае сухое надвор'е садзейнічала паспяховаму правядзенню ўборачных работ і атрыманню кандыцыйнага сухога зерня.



Лінія комплексаў машын для пасляўборачнай апрацоўкі збожжа і насення РСДУП. Эксперыментальная база «Зазер'е» РУП Навукова-вытворчага цэнтра па механізацыі сельскай гаспадаркі НАН Беларусі. Пухавіцкі раён Мінскай вобласці

Дастатковая колькасць камбайнаў і высокая арганізацыя ўборачных работ у большасці абласцей Беларусі дазволілі асноўную масу збожжа ўбраць у тэрмін, не перавышаючы 15 працоўных дзён, што сведчыць аб правільнасці выбару тэрмінаў жніва і недапушчэнні страт ураджаю з прычыны асыпання зерня ад перастою[21].

Паводле даных на 28 жніўня 2015 г., у Беларусі ўсімі катэгорыямі гаспадарак было намалочана 8,8 млн т збожжа (з улікам грэчкі і проса). У тым ліку намалот сельскагаспадарчых арганізацый склаў 8,62 млн т. У Мінскай вобласці было намалочана 2 млн 191 тыс. т збожжа, у Гродзенскай — 1 млн 717,4 тыс. т, у Брэсцкай — 1 млн 428,4 тыс. т. На палетках Віцебскай вобласці сабралі 1 млн 362,9 тыс. т збожжа, у Магілёўскай — 1 млн 116 тыс. т, у Гомельскай — 984,4 тыс. т[22].

Такім чынам, беларускія хлебаробы ў чарговы раз даказалі магчымасць устойлівага вядзення сельскай гаспадаркі ў складаных умовах надвор'я. Разам з тым жніво паказала, што ў сучасны перыяд аграрыям трэба надаваць пільную ўвагу выкарыстанню вільгацезберагальных тэхналогій.

У цяперашні час у Беларусі распрацавана і прынята новая Дзяржаўная праграма развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады. Асноўны акцэнт у ёй зроблены на павышэнні даходнасці гаспадарак, фарміраванні эфектыўнага ўласніка, стварэнні ўмоў і асноў аграрнага бізнесу. Выкананне палажэнняў гэтай праграмы будзе садзейнічаць насычэнню ўнутранага харчовага рынку айчыннымі таварамі ў неабходных аб'ёме і якасці, павелічэнню экспарту прадукцыі сельскай гаспадаркі, павышэнню даходнасці прадпрыемстваў і іх работнікаў. Распрацавана 11 падпра-

грам, рэалізацыя якіх дасць магчымасць дасягнуць аптымальных аб'ёмаў вытворчасці, узняць прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы ў 1,4 разы ў параўнанні з узроўнем 2015 г.[23]

Дзякуючы прыняццю названай вышэй праграмы к канцу 2020 г. значна павысіцца эфектыўнасць раслінаводства. Ураджайнасць збожжавых культур павінна павялічыцца на 9 працэнтаў да ўзроўню 2015 г., бульбы — на 25, гародніны — на 9, рапсу — на 31, цукровых буракоў — на 51 працэнт. На гэтай аснове плануецца дасягнуць аптымальных аб'ёмаў вытворчасці: збожжа — не менш як 10 млн т, бульбы — 5,6 млн т, цукровых буракоў — 4,9 млн т, гародніны — 1,6 млн т, ільноволакна — 55 тыс. т, рапсу — 820 тыс. т [24].

Акрамя таго, неабходна забяспечыць валютную выручку ад экспарту харчавання не менш як 7 млрд долараў ЗША. Зрабіць гэта няпроста, калі існуюць неспрыяльныя макраэканамічныя ўмовы ў суседніх дзяржавах. Таму на знешніх рынках Беларусі трэба працягваць асваенне новых экспартных напрамкаў. Найбольш перспектыўнымі лічацца В'етнам, Кітай, Інданезія, Ізраіль, краіны Паўднёвай Амерыкі[25].

Развіццё сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак у галіне раслінаводства пачалося ў Беларусі ў перыяд, калі краіна яшчэ ўваходзіла ў склад СССР. Закон «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» № 611-XII быў прыняты 18 лютага 1991 г. Вярхоўным Саветам Беларускай ССР. Гэты Закон вызначаў фермерскую гаспадарку як новую форму гаспадарання на зямлі, а таксама яе прававыя, сацыяльныя і эканамічныя адносіны. У Пастанове Вярхоўнага Савета БССР ад 22 лютага 1991 г. № 633-XII «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» прадугледжвалася стварэнне спецыяльнага крэдытнага фонду для льготнага абслугоўвання фермерскіх гаспадарак і было дадзена прадпісанне аб арганізацыі для фермераў спецыяльнага фонду зямельных запасаў у мясцовых Саветах народных дэпутатаў.

Закон вызначаў сялянскую (фермерскую) гаспадарку як самастойны гаспадарчы комплекс, дзейнасць якога заснавана пераважна на працы членаў адной сям'і, якія вядуць таварную вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі. Фермерскую гаспадарку маглі ствараць і асобы, якія не былі блізкімі сваякамі, а таксама адна асоба. Інтарэсы гаспадаркі прадстаўляў яго глава. Права на стварэнне фермерскай гаспадаркі меў кожны дзеяздольны грамадзянін, у якога былі спецыяльныя веды, кваліфікацыя або вопыт працы ў сельскай гаспадарцы.

Зямельныя адносіны прадугледжваліся ў форме пажыццёвага спадчыннага ўладання і арэнды. Памер арэнды зямлі не меў абмежаванняў. Зямельныя ўчасткі, аддадзеныя сялянскай гаспадарцы, не маглі быць аб'ектам куплі-продажу, закладу, падаравання або самавольнага абмену. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 95 ад 3 сакавіка 1998 г. «Аб мерах па развіцці сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і ўзмацненні іх дзяржаўнай падтрымкі», карыстанне зямельным участкам было дазволена і замежным грамадзянам, але толькі на правах арэнды.

Фермерскія гаспадаркі маглі стварацца ўнутры калгаса (саўгаса). Пры выхадзе работніка з сельскагаспадарчай арганізацыі яму аддавалася належная зямельная доля ва ўласнасць бясплатна. Дадатковая плошча сельскагаспадарчых угоддзяў для вядзення фермерскай гаспадаркі магла быць атрымана ва ўласнасць за плату ў межах норм, якія былі ўстаноўлены артыкулам 53 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі. Звыш указаных норм для вытворчых мэт работнікі маглі дадаткова арандаваць зямельныя ўчасткі.

Сельскагаспадарчае прадпрыемства ў межах долі выдзяляла фермерскай гаспадарцы вызначаную частку маёмасці, неабходнай для арганізацыі вытворчасці. Іншыя сродкі вытворчасці, якіх не хапала фермеру, маглі перадавацца яму ў арэнду, арэнду з выкупам або набывацца за поўны кошт як у прадпрыемства, так і ў знешніх партнёраў. Усе адносіны фермерскіх гаспадарак з праўленнем калгаса (дырэкцыяй саўгаса) будаваліся на дагаворнай аснове.

На першым часе пры станаўленні фермерскай гаспадаркі праўленне калгаса або дырэкцыя саўгаса маглі ўзяць на сябе функцыі яе абслугоўвання, якія аплочваліся (выкананне спецыялізаваных механізаваных работ, рамонтна-тэхнічная дапамога, правядзенне мерапрыемстваў па ахове раслін, упарадкаванне тэрыторыі, забеспячэнне паруча-змазачнымі матэрыяламі, сацыяльныя паслугі і інш.). У гэтым выпадку фермерская гаспадарка павінна была забяспечыць выкананне дзяржаўнага заказу па абумоўленых відах прадукцыі, рабіць праз калгас або саўгас узаемаразлікі з дзяржаўным бюджэтам. Побач з разліковым рахункам, які меў калгас (саўгас), для ажыццяўлення ўнутрыгаспадарчых фінансавых разлікаў фермерская гаспадарка магла мець самастойны разліковы рахунак у дзяржаўным банку, якім яна карысталася ва ўзаемаадносінах са знешнімі партнёрамі, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі.

Для арганізаванай сумеснай дзейнасці сяляне маглі ствараць кааператывы, акцыянерныя таварыствы па вырабе прадукцыі і аграсервісным абслугоўванні. На тэрыторыі гаспадаркі маглі дзейнічаць некалькі кааператываў, малых прадпрыемстваў або акцыянерных таварыстваў. Усе сфарміраваныя гаспадарчыя структуры — фермерскія гаспадаркі, кааператывы, акцыянерныя таварыствы, малыя прадпрыемствы — у мэтах рацыянальнай арганізацыі вытворчасці павінны былі інтэграваць свае намаганні на аснове фарміравання тэрытарыяльных сельскагаспадарчых асацыяцый (аб'яднанняў)[26]. Было вызначана, што ў якасці крыніцы фарміравання маёмасці фермерскай гаспадаркі могуць выступаць крэдыты, грашовыя і матэрыяльныя сродкі яе членаў, даходы ад рэалізацыі прадукцыі, работ, паслуг, а таксама ад іншай дзейнасці, не забароненай заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

На тры гады з моманту рэгістрацыі фермерскія гаспадаркі вызваляюцца ад усіх відаў падаткаў, акрамя даходаў, атрыманых ад несельскагаспадарчай дзейнасці. Фермерская гаспадарка адказвае па сваіх абавязацельствах усёй сваёй маёмасцю. Дзяржава не нясе адказнасці па абавязацельствах фермерскай гаспадаркі, а гаспадарка — па абавязацельствах дзяржавы. Фермерскія гаспадаркі павінны быць спецыялізаванымі і займацца ў галіне раслінаводства вытворчасцю збожжа і гародніны.

Фермерства з'яўляецца распаўсюджанай і ўсімі прызнанай формай гаспадарання ў аграрным сектары развітых краін свету. Найбольш ранняя і поўная фермерызацыя сельскай гаспадаркі адбылася ў ЗША, Канадзе і Новай Зеландыі, дзе фермерскія гаспадаркі вырабляюць усю валавую прадукцыю сельскай гаспадаркі. У Беларусі фермерскія гаспадаркі разглядаюцца не як альтэрнатыва буйной вытворчасці, а як яе дапаўненне, што дазваляе больш поўна раскрыць патэнцыяльныя магчымасці сельскай гаспадаркі, лепш выкарыстоўваць прыродныя і працоўныя рэсурсы. На пачатак 1992 г. у Рэспубліцы Беларусь было створана 757 фермерскіх гаспадарак, а на пачатак 1996 г. іх колькасць перавысіла трохтысячны рубеж, пасля чаго да пачатку 2000-х гг. стала назірацца тэндэнцыя да іх зніжэння.

Вытворчая дзейнасць прыблізна 80 працэнтаў фермерскіх гаспадарак сямейнага тыпу звязана з вырошчваннем прадукцыі раслінаводства (пераважна збожжавых, гародніны, бульбы, пладовых культур)[27]. Пры гэтым у 40 працэнтах гаспадарак прафілюючай з'яўлялася вытворчасць збожжа, 31 працэнт займаецца ў асноўным вырошчваннем гародніны і бульбы, 5 працэнтаў асноўным відам дзейнасці выбралі пладаводства[28].

У краіне толькі 30 працэнтаў прадукцыі раслінаводства з'яўляюцца таварнымі, а ўдзельная вага яе ў агульным аб'ёме выручкі складае каля 20 працэнтаў. Астатняя частка прадукцыі выкарыстоўваецца на корм жывёле і птушцы.

У раслінаводстве важнейшымі фактарамі росту эфектыўнасці вытворчасці з'яўляецца павышэнне ўрадлівасці глеб на аснове навукова абгрунтаванага прымянення арганічных і мінеральных угнаенняў, а таксама аптымізацыі ўсіх звенняў тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур, таму што больш як 70 працэнтаў ураджаю фарміруецца выключна за кошт агратэхнічных фактараў[29]. Далейшае нарошчванне аб'ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці магчымае толькі з улікам асаблівасцей кожнай канкрэтнай тэрыторыі і рэгіёна[30].

Найважнейшымі этапамі ў вытворчасці збожжа заўжды былі своечасовыя сяўба і ўборка, якія з'яўляюцца «вузкім месцам» ва ўсім шлейфе сельскагаспадарчых работ. Тыя фермеры, якія не маюць высокапрадукцыйнай і надзейнай тэхнікі, не могуць якасна выконваць тэхналогію вырошчвання збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур, што прыводзіць да недабору ўраджаю. Глава фермерскай гаспадаркі А. М. Лях з вёскі Грыцкі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці пачаў фермерстваваць у 1998 г. Спачатку ён атрымаў 20 га зямлі ў 17 км ад дому. У тым жа годзе купіў новы трактар і аўтамабіль ГАЗ-53. У 2012 г. плошча гаспадаркі складала ўжо 105 га ў пяці ўчастках. Вырошчвае пшаніцу сорта «Кобра», трыцікале, рапс «Прагрэс», ячмень «Стратус», бульбу «Брыз» і «Скарб».

У гаспадарцы А. М. Ляха ўраджайнасць пшаніцы ў 2012 г. склала 35 ц/га, трыцікале — таксама 35 ц/га, рапсу — 15—20 ц/га. У 2012 г. гаспадарка мела два КамАЗы, тры трактары МТЗ, зернеўборачны камбайн «Ліда», сеялкі для мінеральных угнаенняў, бульбаўборачны камбайн, перасовачную зерневую сушылку італьянскага вырабу, якая можа працаваць у палявых умовах. Дзякуючы гэтаму ўборка збожжавых у фермерскай гаспадарцы А. М. Ляха займае пяць дзён, а сяўба — два-тры дні[31].

Эфектыўнасць работы фермерскіх гаспадарак у значнай ступені залежыць ад спецыялізацыі вытворчасці, кан'юнктуры харчовага рынку, метадаў і сродкаў яго рэгулявання на дзяржаўным узроўні. У пачатку 2000-х гадоў на вольным рынку гародніны і бульбы ў краіне склалася няпростая сітуацыя ў сувязі з іх перавытворчасцю. Так, у 2003 г. у дробных фермерскіх гаспадарках з памерам зямельных угоддзяў да 20 га, якія спецыялізаваліся на вытворчасці гародніны, пладоў і бульбы, назіралася стратнасць вытворчасці[32].

Істотныя дадатныя змены ў развіцці фермерскіх гаспадарак Беларусі былі абумоўлены прыняццем з боку дзяржавы шэрагу нарматыўных прававых дакументаў, сярод якіх былі Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 293 ад 20 лютага 1998 г. «Аб аднясенні шэрагу сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак да доследных і іх дзяржаўнай падтрымцы»; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 95 ад 3 сакавіка 1998 г. «Аб мерах па развіцці сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і ўзмацненні іх дзяржаўнай

падтрымкі»; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 193 ад 2 красавіка 1998 г. «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні рэгулявання дзейнасці сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак» і інш.

Пастановай Савета Міністраў № 293 ад 20 лютага 1998 г. у Беларусі было выбрана шэсць фермерскіх гаспадарак і распрацаваны напрамкі і ўмовы іх дзяржаўнай падтрымкі. На фінансаванне гэтых гаспадарак выдзелена 30,9 млрд рублёў за кошт рэспубліканскага бюджэту. Акрамя таго, за кошт сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання было прадугледжана выдзеліць на неадкладныя патрэбы гэтых гаспадарак 20,6 млрд рублёў. Такім чынам, сукупны памер выдзеленых сродкаў для доследных гаспадарак склаў больш як 1,2 млн долараў, або амаль 60 працэнтаў агульнага памеру фінансавых сродкаў, выдаткаваных фермерскім гаспадаркам у 1998 г. [33]

Сярод доследных фермерскіх гаспадарак найбольшую вядомасць атрымала гаспадарка «Парфіяновіч» у вёсцы Юзуфова Мінскага раёна, якая была створана ў 1992 г. Глава гаспадаркі — Ярэна Фёдараўна Парфіяновіч, былы намеснік дырэктара саўгаса «Буцэвічы». У 1990-х гг. у складзе групы фермераў яна праходзіла стажыроўку ў Германіі і затым пастаралася ўкараніць нямецкую тэхналогію ў сваёй гаспадарцы.

Спачатку фермерскай гаспадарцы «Парфіяновіч» было выдзелена 5 га зямлі. З цягам часу яе плошча пашырылася да 103 га. У першыя гады гаспадарка займалася свінагадоўляй, але потым рэзка змяніла напрамак дзейнасці і стала вырошчваць гародніну. Разам з сынам Я. Ф. Парфіяновіч распрацавала асобую тэхналогію вытворчасці ранняй бульбы: у цяпліцы вырошчваецца расада, якая дасягае значных памераў у красавіку, потым яе высаджваюць у поле. Дзякуючы гэтаму ўжо ў пачатку чэрвеня першыя фуры з маладой бульбай рэалізуюцца мінскім рэстаранам і магазінам. У 2000 г. гаспадарка атрымала статус «доследная». У 2010 г. рэнтабельнасць гаспадаркі перавышала 150 працэнтаў. З гароднінасховішча на 1,5 тыс. т пакупнікам адпраўляліся бульба, буракі, морква, капуста. Гаспадарка мае бульбаўборачны камбайн, чатыры трактары, два грузавыя аўтамабілі.

Фермерская гаспадарка «Парфіяновіч» неаднаразова прызнавалася пераможцам і прызёрам спаборніцтваў у галіне арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. На яе базе праводзіліся раённыя, абласныя і рэспубліканскія семінары. Гаспадарка выкарыстоўвалася ў якасці вучэбнай базы для падрыхтоўкі спецыялістаў: тут праводзіліся навуковыя даследаванні і практычныя заняткі студэнтаў навучальных устаноў. Пераймаць вопыт гаспадаркі прыязджалі з Кітая, Амерыкі, Расіі. Гаспадарка аказвала дапамогу Івянецкаму дзіцячаму дому-інтэрнату, школам, ветэранам і інвалідам[34].

Бюджэтная падтрымка фермерства ў Беларусі адбываецца ў асноўным з Фонда дзяржаўнай падтрымкі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, які фарміруецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Рэальным спосабам набыцця тэхнікі і абсталявання з'яўляецца лізінг. У цяперашні час пад лізінгам маюць на ўвазе форму арэнды сродкаў вытворчасці. Аб'ект лізінгу (сельскагаспадарчая машына, зернесушылка і г.д.) набываецца лізінгавай кампаніяй у вытворцы або пастаўшчыка і затым здаецца ў наём або ў арэнду фермерам з далейшым правам выкупу. Фермерскім гаспадаркам сямейнага тыпу вельмі важна быць вузкаспецыялізаванымі, таму што пры вырабе многіх прадуктаў, калі раздрабіць сілы і сродкі, нельга дамагчыся высокіх паказчыкаў.

Тыя з фермераў, хто здолеў выстаяць ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, з цягам часу пастаянна пашыралі свае зямельныя ўчасткі і паступова стварылі буйныя гаспадаркі з сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай. У вёсцы Агароднікі Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў 1997 г. была створана фермерская гаспадарка «Эліта-К» пад кіраўніцтвам кандыдата сельскагаспадарчых навук А. В. Круглякова. Спачатку яму выдзелілі 25 га зямлі, а ў 2011 г. у гаспадарцы ўжо было 230 га.

У гаспадарцы «Эліта-К» вырошчваюцца таварная і насенная бульба, гародніна ў адкрытым грунце: капуста, цыбуля, морква, буракі, кабачкі. Спецыялізацыя — ранняя бульба і ранні сарты гародніны, якія гаспадарка пастаўляе на плодаагароднінныя базы і ў 20 магазінаў Мінска. Сваю прадукцыю гаспадар прадае таксама ў Расію, Украіну, Малдову і іншыя краіны СНГ.

Фермерская гаспадарка «Эліта-К» пабудавала тры гароднінасховішчы на 2,5 тыс. т, плёначныя цяпліцы плошчай 0,25 га, майстэрню па рамонце тэхнікі. У 2010 г. быў абсталяваны цэх для выганкі зялёных гароднінных культур. У перспектыве плануецца будаўніцтва цэха па мыцці і фасоўцы бульбы і гародніны, а таксама абсталяванне новага буйнога гароднінасховішча з устаноўкай штучнага холаду[35].

У перыяд аграрнага рэфармавання ў Беларусі ўзнік і працягвае развівацца працэс арганізацыі буйных фермерскіх гаспадарак на базе маёмасных комплексаў стратных калгасаў і саўгасаў. Кампактна размешчаныя на тэрыторыі, буйныя па аб'ёмах таварнай вытворчасці, такія фермерскія гаспадаркі маюць вялікую перавагу перад дробнымі гаспадаркамі сямейнага тыпу. Асноўнай формай зямельных і маёмасных адносін у такіх фермерскіх гаспадарках з'яўляецца доўгатэрміновая арэнда тэрмінам да 99 гадоў.

Як паказала практыка, у большасці такіх гаспадарак назіраецца прырост вытворчасці прадукцыі, асабліва калі яе ўзначальвае кіраўнік, які мае вялікі вопыт працы ў сельскай гаспадарцы. У гэтым выпадку вельмі паказальны прыклад фермерскай гаспадаркі М. Р. Шруба ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці, які далучыў да сваёй гаспадаркі ў 2001 г. стратны калгас «Шлях да камунізму».

Фермерскую гаспадарку Міхаіл Рыгоравіч Шруб стварыў у 1993 г. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці выбраў раслінаводства і жывёлагадоўлю. З самага пачатку сваёй дзейнасці ён эфектыўна выкарыстоўваў асабісты вопыт работы ў сельскай гаспадарцы, сумяшчаў яго з перадавымі тэхналагічнымі інавацыямі і міжнародным вопытам вядзення гаспадаркі. У выніку ўжо ў 2003 г. ураджайнасць збожжавых у яго ўзбуйненай гаспадарцы склала 41,3 ц/га, што ў два разы перавысіла ўзровень ураджайнасці, атрыманы ў 2001 г. былым калгасам.

У 2011 г. сельгасугоддзі гаспадаркі М. Р. Шруба займалі больш 17 860 га. Штогод на гэтай плошчы вырошчваецца каля 10 000 т гародніны і бульбы. Дзякуючы сучасным гароднінасховішчам прадукцыя захоўвае свежасць круглы год і рэалізуецца ў буйных магазінах Беларусі і Расіі.

Фермерская гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні элітнага насення бульбы галандскай селекцыі, вытворчасці харчовай бульбы, цыбулі, морквы, капусты, буракоў і іншай гародніны; пры гэтым выкарыстоўваюцца галандскі насенны матэрыял і сучасныя тэхналогіі

вырошчвання. Гаспадарка мае ў дастатковай колькасці сельскагаспадарчае абсталяванне і транспартныя сродкі, што гарантуе эфектыўнасць і своечасовасць правядзення ўсіх сельскагаспадарчых работ, а сучасныя сховішчы гародніны і складскія памяшканні даюць магчымасць захоўваць бульбу, гародніну і насенны матэрыял.

Паводле даных на 1 студзеня 2012 г., у Беларусі працуюць дзевяць буйнатаварных фермерскіх гаспадарак, якія далучылі або ўзялі ў арэнду стратныя сельскагаспадарчыя арганізацыі.

Акрамя вытворчай дзейнасці фермеры займаюцца дабрачыннасцю Напрыклад, А. В. Ласевіч, глава фермерскай гаспадаркі «Ісіда», адной з найбуйнейшых у сталічным рэгіёне, за дабрачыннасць атрымаў у 2010 г. ад Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта медаль Кірылы Тураўскага.

У 2014 г. фермерскія гаспадаркі выраблялі каля 2 працэнтаў прадукцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. У абсалютных лічбах гэта выглядае так: 174,3 тыс. т збожжа, 307,3 тыс. т бульбы, 265,1 тыс. т гародніны, 19,6 тыс. т пладоў і ягад[36].

З 1995 па 2014 г. агульная плошча зямель у фермерскіх гаспадарках павялічылася ў 2,8 разоў. У 2014 г. на долю фермерскіх гаспадарак прыпадала 175 тыс. га зямельных угоддзяў, у тым ліку 153,9 тыс. га зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Сярэдні памер зямельнага ўчастка складаў 68 га, а прыблізна 10 працэнтаў фермераў мелі больш як 100 га[37].

Фермерскія гаспадаркі з'яўляюцца ўдзельнікамі галіновых сельскагаспадарчых праграм. Асабліва значным быў іх удзел у Дзяржаўнай комплекснай праграме развіцця бульбаводства, агародніцтва і пладаводства на 2011—2015 гады. Такім чынам, нягледзячы на тое, што ў цэлым аб'ём прадукцыі фермерскіх гаспадарак ва ўсёй прадукцыі сельскай гаспадаркі Беларусі пакуль нязначны, яны ўстойліва развіваюцца і таму з'яўляюцца важным сектарам сельскай гаспадаркі краіны.

Новы этап развіцця асабістых падсобных гаспадарак вясковага насельніцтва пачаўся ў 1990-х гг. Увядзенне ў дзеянне з 1 студзеня 1991 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі дазволіла ўладальнікам падсобных гаспадарак атрымліваць у пажыццёвае спадчыннае ўладанне для вядзення падсобнай гаспадаркі зямельныя ўчасткі ў памеры каля 1 га.

З 1990 па 1995 г. пры невялікім (на 3,1 %) скарачэнні двароў у сельскай мясцовасці Беларусі плошча раллі ў асабістых падсобных гаспадарках насельніцтва павялічылася з 464,8 тыс. га ў 1990 г. да 1009 тыс. га ў 1995 г., а ўдзельная вага іх валавой прадукцыі ў агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі ў 1995 г. дасягнула 48 працэнтаў. Пры гэтым удзельная вага валавой прадукцыі падсобных гаспадарак у агульным аб'ёме прадукцыі сельскай гаспадаркі краіны па вытворчасці збожжа і зернебабовых дасягнула 5,5 працэнта, бульбы — 86,4, гародніны — 76,7 працэнта[38].

У гэты ж перыяд быў прыняты шэраг дзяржаўных мер, накіраваных на павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак розных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў падсобных гаспадарках вясковых жыхароў. Калгасы, саўгасы і іншыя калектыўныя арганізацыі на падставе заключаных дагавароў пачалі пераменшчаць частку зямельных участкаў сельскага насельніцтва ў палі севазваротаў, аказваць паслугі па вырошчванні сельскагаспадарчых культур і ўборцы ўраджаю, нарыхтоўцы кармоў для буйной рагатай жывёлы, рэалізацыі лішкаў выробленай сельскагаспадарчай прадукцыі.

Трэба адзначыць, што гаспадарча-працоўную дзейнасць па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ажыццяўляюць розныя катэгорыі індывідуальных гаспадарак: асабістыя падсобныя гаспадаркі сельскіх жыхароў, дачныя кааператывы, садоўніцкія таварыствы, хатнія гаспадаркі гараджан і г. д. У матэрыялах органаў дзяржаўнага ўліку ўсе яны прадстаўлены як гаспадаркі насельніцтва.

У 2002 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асабістых гаспадарках грамадзян», які аб'яднаў нормы ранейшых прававых актаў, што рэгулююць дзейнасць уладальнікаў падсобных гаспадарак, вызначаў меры па іх дзяржаўнай падтрымцы. Аднак скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў індывідуальным сектары паказала неабходнасць распрацоўкі Праграмы развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак грамадзян на 2006—2010 гады, якая была зацверджана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 мая 2006 г.

Асноўнымі задачамі названай вышэй Праграмы былі забеспячэнне харчовай бяспекі беларускай вёскі, рост даходаў і занятасці сельскіх жыхароў, паляпшэнне дэмаграфічнай структуры насельніцтва. Яна прадугледжвала арганізацыю камунальна-бытавых структур для акапання дапамогі і паслуг вяскоўцам па вырошчванні і ўборцы сельскагаспадарчых культур, нарыхтоўцы кармоў. Адно з галоўных месцаў у Праграме — гэта ўдасканаленне сістэмы збыту прадукцыі праз закупкі нарыхтоўчымі арганізацыямі спажывецкай кааперацыі. Упершыню прадугледжвалася фінансаванне мерапрыемстваў па выкананні Праграмы са сродкаў Рэспубліканскага фонда падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі.



Дом з прысядзібным участкам.
Вёска Міхалкаўская Рудня Мазырскага раёна
Гомельскай вобласці. 2006 г.







Вёска Забярэззе Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1995 г.
Фота У. М. Меляшэнкі



Традыцыйны сялянскі дом, пабудаваны ў 1940-я гг. Страха пакрыта шчапой («стружкай»). Вёска Іванкаўшчына Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 2006 г.

Паводле даных выбарачнага абследавання прыватных гаспадарак, праведзенага Міністэрствам статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, за перыяд з 2000 па 2007 г., было выяўлена змяншэнне долі спажывання прадуктаў харчавання, выраблених у сваіх падсобных гаспадарках, у агульным аб'ёме спажывання. Асобы, якія мелі прыватныя гаспадаркі, значна менш сталі забяспечваць свае патрэбы за кошт уласнай вытворчасці[39].

Спажывецкі характар вытворчасці прадукцыі ў індывідуальных гаспадарках насельніцтва і магчымасці выбару больш выгадных каналаў яе збыту не забяспечылі выкананне асноўных параметраў, прадугледжаных Праграмай на 2006—2010 гг. Узнікла аб'ектыўная неабходнасць удасканалення дзеючага заканадаўства, вызначэння новых прыярытэтаў у падтрымцы падсобных гаспадарак.

У кастрычніку 2010 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Праграму развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак грамадзян у 2011—2015 гады[40]. Галоўнай мэтай гэтай праграмы было больш поўнае задавальненне патрэб насельніцтва ў харчаванні, падтрыманне харчовай бяспекі дзяржавы, павышэнне даходаў, забеспячэнне занятасці і паляпшэнне сацыяльных і эканамічных умоў жыцця насельніцтва краіны. Галоўныя яе задачы — павышэнне эфектыўнасці выкарыстання зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў землекарыстанні насельніцтва, стварэнне ўмоў для паляпшэння якасці і павышэння тарнасці сельскагаспадарчай прадукцыі падсобных гаспадарак. Мяс-



Традыцыйны сялянскі дом, пабудаваны ў 1949 г. Вёска Іванкаўшчына Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 2006 г.

цовыя ўлады абавязваліся даваць па заявах грамадзян у арэнду дадатковыя зямельныя ўчасткі ў памеры каля 3 га для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі і інфармаваць насельніцтва аб магчымасці сельскагаспадарчых арганізацый перамяшчаць частку зямельных участкаў падсобных гаспадарак у палі севазваротаў.

За перыяд рэалізацыі Праграмы на 2011—2015 гг. у гаспадарках насельніцтва меркавалася закупіць 188,8 тыс. т бульбы, 187,4 тыс. т гародніны, 645 тыс. т пладоў і ягад. Вынікі рэалізацыі яе мерапрыемстваў у галіне раслінаводства за 2011—2013 гг. паказваюць, што сярод прадугледжаных паказчыкаў закупак сельскагаспадарчай прадукцыі ў цэлым па краіне дасягнуты і перавыкананы паказчыкі па нарыхтоўцы бульбы (132,9 %), гародніны (103,5 %). Аднак планавыя аб'ёмы закупак у насельніцтва пладоў і ягад склалі 91,9 працэнта ад запланаванага[41]. Займаючы ў 2013 г. 9,5 працэнта сельскагаспадарчых угоддзяў, гаспадаркі насельніцтва вырабілі сельскагаспадарчай прадукцыі на 23,8 трлн рублёў, або 22,6 працэнта ад усёй сельскагаспадарчай вытворчасці, у тым ліку 3 працэнты збожжа, 82 працэнты бульбы, 70 працэнтаў гародніны.

Як неад'емны структурны элемент аграпрамысловага комплексу краіны падсобныя гаспадаркі вясковых жыхароў выконваюць шэраг найважнейшых эканамічных функцый: забяспечваюць значную частку патрэб сельскага насельніцтва, а таксама гараджан у галоўных высакаякасных, экалагічна чыстых прадуктах харчавання; дазваляюць больш



Традыцыйны сялянскі дом з цэглы з двухсхільным дахам, пакрыты шыферам. Пабудаваны ў 1960-я гг. Вёска Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. 2005 г. Фота Л. В. Ракавай



Фота на памяць дзецям і ўнукам. Вёска Церабень Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1990 г. Фота У. М. Меляшэнкі



Гаспадыня каля печы. Вёска Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці. 2012 г. Фота Т. А. Навагродскага



Няма нічога смачней за матчын хлеб. Столінскі раён Брэсцкай вобласці. 1990-я гг. Фота У. М. Меляшэнкі



Сялянскі дом. Вёска Дуброва Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. 2002 г.



Пасадка бульбы на прысядзібным участку. Столінскі раён Брэсцкай вобласці. Сярэдзіна 1990 – пачатак 2000-х гг. Фота У. М. Меляшэнкі

поўна выкарыстоўваць працоўныя рэсурсы вёскі і сродкі вытворчасці, якія недаступны калектыўным гаспадаркам; служаць важнай крыніцай даходаў сельскіх жыхароў.

Значэнне асабістых падсобных гаспадарак у жыцці прызнаецца самімі сельскімі жыхарамі. Так, паводле даных рэспубліканскага апытання сельскага насельніцтва, праведзенага Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2007 г., большасць вяскоўцаў (70,5 %) лічылі, што для сельскіх жыхароў наяўнасць свайго падворка з'яўляецца неабходнасцю[42]. Аднак рэфармаванне аграпрамысловага комплексу і змяненне сацыяльна-бытавых умоў жыцця цягнуць за сабой перамены ў ладзе жыцця вяскоўцаў. Даныя праведзенага апытання сведчаць аб зніжэнні ролі падсобных гаспадарак сярод жыхароў аграгарадкоў у параўнанні з жыхарамі традыцыйных вясковых паселішчаў. Так, 12,1 працэнта апытаных у аграгарадках не лічылі прысядзібны ўчастак неабходным для сябе, тады як у вёсках такіх было толькі 6,2 працэнта[43].

З 1995 г. ідзе пастаяннае скарачэнне асабістых падсобных гаспадарак насельніцтва і іх памераў. Так, у 2013 г. іх колькасць скарацілася больш чым на 377 тыс. у параўнанні з 1995 г. Пасяўныя плошчы ў разліку на адзін двор за перыяд з 2000 па 2012 г. скараціліся з 0,8 да 0,5 га.



У выхадны дзень.
Вёска Забярэззе Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.
1995 г. Фота У. М. Меляшэнкі





Вяселле. Вёска Церабень Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1990-я гг.
Фота У. М. Меляшэнкі



У вясковай царкве. Столінскі раён Брэсцкай вобласці. 1990-я гг.
Фота У. М. Меляшэнкі



Вячэрні адпачынак. Вёска Парыж Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. 1995 г.

Дынаміка развіцця асабістых падсобных гаспадарак насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь у 1995—2013 гг.

| Паказчык | Год | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1995 | 2000 | 2005 | 2010 | 2013 |
| Колькасць двароў у сельскай мясцовасці на канец года, тыс. га | 1361,6 | 1265,0 | 1160,0 | 1070,0 | 983,8 |
| Плошча сельгасугоддзяў, тыс. га | 1466,9 | 1396,2 | 1245,2 | 924,3 | 862,3 |
| Пасяўныя плошчы — усяго, тыс. га | 937,3 | 1001,1 | 824,4 | 590,6 | 486,3 |
| У тым ліку: | | | | | |
| Збожжа і зерне-бабовыя | 145,9 | 210,7 | 177,6 | 112,8 | 80,1 |
| Бульба | 602,6 | 561,5 | 414,9 | 311,7 | 253,1 |
| Гародніна | 56,5 | 77,0 | 70,9 | 63,4 | 46,4 |
| Кармавыя культуры | 116,7 | 143,5 | 165,8 | 102,7 | 106,7 |

Сярод аб'ектыўных прычын такой дынамікі асабістых падсобных гаспадарак вясковых жыхароў можна выдзеліць наступныя:

— вызначальную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае дэмаграфічная сітуацыя. З 2000 па 2015 г. колькасць сельскага насельніцтва скарацілася на 879,2 тыс. чалавек і склала 2155,9 тыс. чалавек. Удзельная вага сельскіх жыхароў у агульнай колькасці насельніцтва краіны ў 2015 г. склада-



Сяброўкі. Столінскі раён Брэсцкай вобласці.
Сярэдзіна – канец 1990-х гг. Фота У. М. Меляшэнкі



Гаспадар. Вёска Церабень Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.
1990-я гг. Фота У. М. Меляшэнкі

ла 22,7 працэнта ў параўнанні з 29,9 працэнта ў пачатку 2001 г. Пры гэтым узрост 31,6 працэнта сельскіх жыхароў перавышае працаздольны, а 52,6 працэнта іх маюць больш як 70 гадоў[44];

— стабілізацыя агульнай эканамічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, рост заработнай платы на асноўным месцы працы насельніцтва садзейнічаюць таму, што многія падсобныя гаспадаркі набываюць аматарскі характар без арыентацыі на пашыраную вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі;

— высокія тэмпы развіцця прамысловай вытворчасці прадуктаў харчавання далі магчымасць гандлёвым арганізацыям забяспечваць вясковае насельніцтва хлебабулачнымі, мяснымі і малочнымі прадуктамі ў шырокім асартыменце;

— высокая працаёмкасць вытворчасці на падворках насельніцтва збожжавых культур, бульбы, гародніны.

Побач з аб'ектыўнымі прычынамі існуе і цэлы шэраг суб'ектыўных, па якіх падсобныя гаспадаркі сельскага насельніцтва перастаюць існаваць. Сярод гэтых прычын належыць выдзеліць аслабленне здароўя членаў сям'і ўладальніка падсобнай гаспадаркі, павелічэнне даходу па асноўным месцы працы, пераезд на іншае месца жыхарства, змяненне адносін паміж членамі сям'і і г. д.

Падсобныя гаспадаркі з'яўляюцца асновай ладу жыцця сельскага насельніцтва. Працуючы на прысядзібным участку, вясковы жыхар адчувае сябе гаспадаром, знаходзіць прымяненне сваёй дзелавой і прадпрымальніцкай энергіі. Як лічаць вучоныя-аграрнікі, у перспекты-



Прыватны дом, пабудаваны ў канцы 1990-х гг. Вёска Альшаны Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 2005 г. Фота Л. В. Ракавай

ве індывідуальная гаспадарка будзе існаваць, хоць яе формы і спосабы вядзення будуць змяняцца ў працэсе навукова-тэхнічнага прагрэсу і развіцця інфраструктуры сяла[45].

За гады існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь адбыліся істотныя змены ў народным жыллі і ладзе жыцця сельскага насельніцтва. У сувязі з прыняццем Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005—2010 гады шырока разгарнулася будаўніцтва сельскіх пасёлкаў новага тыпу, якія атрымалі назву «аграгарадкі». Аграгарадкі — добраўпарадкаваныя сельскія населеныя пункты новага тыпу, у якіх існуе вытворчая і спецыяльная інфраструктура для забеспячэння высокіх сацыяльных стандартаў жыцця іх жыхарам і жыхарам прылеглых тэрыторый.

Згодна з агульнарэспубліканскімі нормамі, насельніцтва аграгарадкоў мае добраўпарадкаванае жыллё з цэнтральным водазабеспячэннем і каналізацыяй, цэнтральным ацяпленнем і гарачай вадой, цэнтральным газазабеспячэннем, тэлефанізацыяй. У гарадку знаходзяцца школа і дзіцячы сад сучаснага тыпу, медыцынская амбулаторыя, спартыўныя аб'екты, клуб, бібліятэка, грамадская лазня, магазін, прадпрыемства па аказанні комплексу бытавых паслуг насельніцтву. Аграгарадкі маюць транспартную сувязь з раённым і абласным цэнтрамі. Жыхары сельскай мясцовасці атрымліваюць работу.

У Беларусі створаны 1481 аграгарадок. Шляхам увядзення аграгарадкоў, будаўніцтва ў іх сучасных комплексаў для вытворчасці малака і мяса, папаўнення машынна-трактарных двароў сучаснай высокапрадукцыйнай тэхнікай, прымянення перадавой агратэхнікі вырошчвання сельскагаспадарчых культур адначасова вырашалася задача рэарганізацыі ўсяго аграпрамысловага комплексу краіны. Вопыт паказвае, што затраты на добраўпарадкаванне аграгарадкоў цалкам апраўданыя. З'яўляючыся перадавымі як у эканамічным, так і ў сацыяльна-культурным плане, яны часцей за ўсё выходзяць пераможцамі раённых, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў па выніках гаспадарчай дзейнасці.

Такім чынам, сацыяльная інфраструктура беларускай вёскі за апошнія гады зведала значныя змены, што дало магчымасць пераважнай большасці сельскіх жыхароў мець добрае медыцынскае абслугоўванне, транспартныя камунікацыі, установы адукацыі і культуры, прадпрыемствы гандлю, бытавых паслуг, грамадскага харчавання, дамы сядзібнага тыпу. У жыллі жыхароў многіх аграгарадкоў знайшлі ўвасабленне лепшыя дасягненні сучаснай архітэктуры ў спалучэнні з багатымі традыцыямі народнага дойлідства беларусаў, якія карэнным чынам змянілі ўмовы быту сельскіх працаўнікоў.

Кардынальныя змены, якія адбыліся ў сельскай гаспадарцы краіны за апошнія гады, не толькі значна павысілі якасць жыцця сельскага насельніцтва, але і выклікалі цікавасць з боку замежных спецыялістаў сельскай гаспадаркі, а турысты ўсё часцей выбіраюць для адпачынку беларускія аграсядзібы.

У цяперашні час ставіцца задача добраўпарадкавання найбліжэйшых і аддаленых ад аграгарадкоў вёсак. Менавіта яны з'яўляюцца захавальніцамі і крыніцамі развіцця беларускай мовы, фальклору, народных звычаяў і абрадаў, без якіх народ не можа існаваць.



Тыпавы двухкватэрны дом. Вёска Міхалкаўская Рудня Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 2006 г. Фота Л. В. Ракавай



Панарама аграгарадка Сталовіцкі са ставам на пярэднім плане. Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці. 2010 г.



Панарама вёскі Фядоры, аграгарадок Фядорскі Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 2010 г.



Традыцыйная забудова вуліцы ў вёсцы Гнёзна Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці






Асабісты падворак у аграгарадку Клейнікі Брэсцкага раёна





Прыватны дом у аграгарадку Гарадзец Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці





Зімовы сад у спарткомплексе аграгарадка Хідры Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці



Аграгарадок Дубна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці

За многія стагоддзі ў беларусаў выпрацаваўся пэўны харчовы комплекс, які ўключае разнастайныя традыцыі, звязаныя з прыгатаваннем і ўжываннем ежы. У беларускай кулінарыі склад прадуктаў, якія выкарыстоўваюцца для прыгатавання ежы, сфарміраваўся пад уздзеяннем збожжавага характару земляробства. Гэтым тлумачыцца перавага ў паўсядзённым харчаванні беларусаў мучных і крупяных страў. Беларусы ядуць шмат хлеба амаль з усімі стравамі. Харчаванне сельскага насельніцтва захавала больш традыцыйных рыс, чым гарадскога.



Будынак Сталовіцкай сярэдняй школы. Аграгарадок Сталовіцкі Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. 2010 г.

Традыцыйнымі застаюцца кашы з розных круп, якія падаюць да стала асобна ці ў якасці гарніраў. Паступова пашыраецца асартымент страў з рысу, які ў якасці гарніру добра спалучаецца з мясам і гароднінай.

Беларуская традыцыйная кухня захавала некалькі сотняў рэцэптаў страў з бульбы, якую варылі, тушылі, пяклі, з якой гатавалі супы, дранікі, галушкі, калдуны, бабку. Іншыя стравы ўключаюць вялікі асартымент агароднінных культур (капуста, буракі, баклажаны, патысоны, салодкі балгарскі перац, кабачкі, памідоры і традыцыйныя гарбузы). Любімымі застаюцца бліны, якія ядуць з мачанкай, шкваркамі, яечняй, торагам[46].

Сярод традыцыйных мясных прадуктаў галоўнымі з'яўляюцца свініна, мяса птушкі (у асноўным курынае), ялавічына, бараніна. Шырока выкарыстоўваецца свіное сала — соленае, вэнджанае, смажанае. Значнае месца ў кулінарыі беларусаў займаюць малако і малочныя прадукты[47].

Многія калектыўныя гаспадаркі Беларусі па традыцыі ўрачыста адзначаюць пачатак жніва («Зажынкі») і яго заканчэнне («Дажынкі») у полі, у час якіх ушаноўваюцца перадавікі вытворчасці, выступаюць калектывы мастацкай самадзейнасці.



Дом культуры ў аграгарадку Заказельскі. Вёска Заказель Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. 2010 г.



Ансамбль народнай музыкі «Сваякі». Аграгарадок Бездзежскі Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. 2010 г.



Святочныя народныя стравы. Вёска Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. 2009 г. Фота Т. А. Навагродскага



Беларускае сала з прыправамі. Вёска Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. 2011 г.
Фота Т. А. Навагродскага



Хатнія каўбасы. Фота Т. А. Навагродскага

З 1996 г. на Беларусі штогод у канцы верасня праводзіўся рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў сельскай гаспадаркі «Дажынкі». Першы такі фестываль «Дажынкі-96» адбыўся ў г. Столін Брэсцкай вобласці. З таго часу сталіцамі фестывалю былі Масты (1997), Нясвіж (1998), Шклоў (2000), Мазыр (2001), Полацк (2002), Пружаны (2003), Ваўкавыск (2004), Слуцк (2005), Бабруйск (2006), Рэчыца (2007), Орша (2008), Кобрын (2009), Ліда (2010), Маладзечна (2011), Жлобін (2013).

Горад, які выбіраўся для правядзення «Дажынак», рыхтаваўся да свята на працягу года. Паступова ў «Дажынках» выпрацаваліся свае традыцыі: яны сталі сапраўдным дзяржаўным святам. У першы дзень на плошчы горада, абранага для правядзення свята, адбываўся ўрачысты мітынг, на якім выступалі Прэзідэнт краіны, адказныя работнікі Савета Міністраў, мясцовага аблвыканкама і райвыканкама. Пасля мітынгу праводзілася ўзнагароджанне лепшых камбайнераў, вадзіцеляў, пераможцаў спаборніцтва на жніве, ім уручаліся каштоўныя падарункі. Затым адбываўся канцэрт фальклорных і папулярных мастацкіх калектываў. На кожным фестывалі арганізоўваліся выставы работ народных умельцаў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кулінарных вырабаў. На другі дзень па цэнтральнай вуліцы горада ўрачыста праходзіла сельскагаспадарчая тэхніка, якая прымала ўдзел ва ўборцы ўраджаю. На некалькіх пляцоўках горада арганізоўваліся канцэрты прафесійных і самадзейных артыстаў, масавыя гульні і забавы, спартыўныя спаборніцтвы, працаваў кірмаш сельскагаспадарчай прадукцыі. Вечарам на плошчы адбываўся гала-канцэрт або салют, працавала начная дыскатэка для моладзі[48].

З 2014 г. «Дажынкі» змянілі фармат. Прынята праводзіць іх у раёнах на базе аднаго з аграгарадкоў. На абласным узроўні «Дажынкі» будуць святкавацца ў райцэнтрах, за выключэннем тых, дзе ўжо праходзіў гэты




«Барада» гаспадару поля. Дажынкі ў аграгарадку Астрамечава Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці. 2004 г.



Дажынкі ў аграгарадку Астрамечава Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці. 2005 г.




Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2013» у г. Жлобін Гомельскай вобласці




Бялыніцкі раённы фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2014». Аграгарадок Вішаў Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці




Чэрыкаўскі раённы фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2015». Аграгарадок Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці

рэспубліканскі фестываль-кірмаш. Падвядзенне вынікаў сельскагаспадарчага года, ушанаванне аграрыяў, уручэнне ім Прэзідэнтам краіны дзяржаўных узнагарод праводзяцца ў Палацы Незалежнасці ў пачатку каляндарнага года[49].

Сучасная вёска з'яўляецца асяроддзем, дзе захоўваюцца і развіваюцца нацыянальныя і культурныя традыцыі беларускага сялянства, праяўляюцца творчыя, дзелавыя і гаспадарчыя здольнасці вясковых жыхароў, прывіваюцца моладзі навыкі эканомнага і эфектыўнага вядзення гаспадаркі, выхоўваецца любоў да зямлі і працы на ёй, фарміруюцца такія якасці, як прадпрымальнасць, самастойнасць, працавітасць. Працавітасць — найбольш характэрная рыса традыцыйнага менталітэту беларускага народа. Дзякуючы працавітасці беларусы выжывалі ў розных экстрэмальных сітуацыях (неўраджайныя гады, войны, разбурэнні і г. д.). Разам з працавітасцю для беларусаў традыцыйным было гаспадарчае, дбайнае стаўленне да зямлі і вынікаў працы. Да хлеба адносіліся як да святыні, з зямлёй абыходзіліся як з карміцелькай: апрацоўваючы яе, заўсёды думалі пра будучыню.

Добрасумленнасць, працавітасць, любоў да сваёй зямлі літаральна пранізвалі ўсю гаспадарчую дзейнасць і абраднасць сялян, перадаваліся імі з пакалення ў пакаленне. Гэтая маральная аснова як галоўны набытак традыцыйнай культуры беларусаў і ў цяперашні час з'яўляецца важным фактарам грамадзянскага выхавання.

[1] Гусаков В. Некоторые принципиальные вопросы текущего и долгосрочного развития АПК // АПК Беларуси: новейшие вызовы региональной и международной интеграции: материалы X Международной научно-практической конференции (Минск, 4–5 сентября 2014 г.). Минск, 2015. С. 5.

[2] Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь [Электронный ресурс]. Режим доступа: http:// www. mshp. minsk.by/print/ structure /branches/. Дата доступа: 09.04.2015.

[3] Сельское хозяйство Республики Беларусь: стат. сб. / Нац. статист. комитет Республики Беларусь; ред. В. И. Зиновский [и др.]. Минск, 2014. С. 124.

[4] Дуктова Н. А., Дуктов В. П., Павловский В. В. Твердая пшеница — новая зерновая культура в Беларуси: проблемы и перспективы // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя аграрных навук. 2015. № 3. С. 85.

[5] Там же.

[6] Там же.

[7] Там же.

[8] Лобач Е. Новые сорта зерновых и зернобобовых в Государственном реестре // Белорусское сельское хозяйство. 2016. № 3. С. 54.

[9] Там же. С. 55.

[10] Фицуро Д. Д., Гурко С. А., Пищенко Л. И., Рылко В. А. Пригодность к длительному хранению и направления использования сортов картофеля белорусской селекции // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя аграрных навук. 2015. № 4. С. 123.

[11] Гусаков В. Г., Бельский В. И. Этапность развития сельского хозяйства Беларуси с 1991 по 2008 год и на перспективу // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя аграрных навук. 2009. № 4. С. 5.

[12] Там же. С. 6.

[13] Там же. С. 8.

[14] Государственная программа устойчивого развития села на 2011–2015 годы: Указ Президента Республики Беларусь № 342 от 1 авг. 2011 г. // Нац. реестр правовых актов Республики Беларусь. 2011. № 1/12739.

[15] Шпак А. Повышение эффективности АПК на основе инновационной модернизации производства // АПК Беларуси: новейшие вызовы региональной и международной интеграции: материалы X Международной научно-практической конференции (Минск, 4–5 сентября 2014 г.). Минск, 2015. С. 12.

[16] Там же. С. 13.

[17] Результаты испытания сортов растений озимых, яровых зерновых, зернобобовых и крупяных культур на хозяйственную полезность в Республике Беларусь за 2013–2015 годы. Минск, 2016.

[18] Адаптыўныя тэхналогіі: каму па кармане будучыня? // Белорусское сельское хозяйство. 2014. № 12. С. 4–5.

[19] Вешторт В. Совет министра: реформы должны быть продолжены // Белорусское сельское хозяйство. 2015. № 2. С. 4–5.

[20] Яковчик С., Лепешкин Н., Точицкий А. Основы качественного посева зерновых под урожай 2016 года // Белорусское сельское хозяйство. 2015. № 9. С. 97.

[21] Клочков А. Уборка-2015: этапы и результаты // Белорусское сельское хозяйство. 2015. № 9. С. 95–96.

[22] Там же. С. 96.

[23] Крапивина Л. Программа аграрного бизнеса: оптимальные объемы и качественный рост // Белорусское сельское хозяйство. 2016. № 4. С. 4.

[24] Там же.

[25] Жуков А. Стране нужен результат // Белорусское сельское хозяйство. 2015. № 12. С. 5.

[26] Архіў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Воп. 23. Спр. 180. Арк. 20–22.

[27] Гусаков В. Г., Казакевич А. В., Будкевич Е. И., Артюшевский Н. В. Развитие и модели организации крестьянских (фермерских) хозяйств в Беларуси. Минск, 2004. С. 8.

[28] Текущий архив Министерства сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь.

[29] Архив Министерства сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь. Документы к протоколам заседаний коллегий Минсельхозпрода за 2007 г. Т. 1. опись 23 (прод.). Л. 50.

[30] Государственная программа возрождения и развития села на 2005–2010 годы. Минск, 2005. С. 43–45.

[31] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 6. Воп. 14. Спр. 165. Арк. 10.

[32] Гусаков В. Г., Казакевич А. В., Будкевич Е. И., Артюшевский Н. В. Развитие и модели организации крестьянских (фермерских) хозяйств в Беларуси. С. 9.

[33] Там же. С. 17.

[34] Крестьянские (фермерские) хозяйства Республики Беларусь. 2011. № 6. С. 44–45.

[35] Там же. С. 37.

[36] Ерошенко Е. Проблемы и победы белорусского фермерства // Белорусское сельское хозяйство. 2015. № 4. С. 26.

[37] Там же. С. 27.

[38] Развитие подсобных хозяйств граждан. Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь [Электронный ресурс]. Режим доступа: http: // www. mshp. minsk.by / print/ farmer/ /lph/ t495e9f56a3152d0.html. Дата доступа: 09.04.2015.

[39] Ракицкая О.Л. Тенденции и направления развития сельского хозяйства Республики Беларусь // Устойчивое развитие агропромышленного комплекса: производственно-экономические, миграционные и мотивационные процессы: материалы Международной научно-практической конференции, посвященной 45-летию БГЭУ / редкол.: А. А. Наумчик [и др.]. Гомель, 2009. С. 143.

[40] Программа развития и поддержки личных подсобных хозяйств граждан в 2011–2015 годах [Электронный ресурс]. Режим доступа: http: // mshp.minsk. by/ print/ programs/ a458c79775ec01. html. Дата доступа: 29.04.2013.

[41] Развитие личных подсобных хозяйств граждан [Электронный ресурс]. Режим доступа: http: // www. mshp. minsk. /by/ print/ farmer /lph/ t495e9f56a3152d0. html. Дата доступа: 09.04.2015.

[42] Кузьменко Т. В. Роль личных подсобных хозяйств в условиях реформирования села // Устойчивое развитие агропромышленного комплекса: производственно-экономические, миграционные и мотивационные процессы: материалы Международной научно-практической конференции, посвященной 45-летию БГЭУ. С. 126.

[43] Там же.

[44] Статистический ежегодник Республики Беларусь. 2015 / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. Минск, 2015. С. 56, 61.

[45] Василькевич С. М. Личные подсобные хозяйства населения – один из важнейших секторов агропромышленного комплекса Республики Беларусь // Экономика и управление. 2010. № 3. С. 28.

[46] Навагродскі Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стст. // Аўтарэф… дыс. докт. гіст. навук. Мінск, 2015. С. 30–31.

[47] Тамсама. С. 19–20.

[48] Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі. С. 515–516.

[49] История праздника «Дожинки» в Беларуси. Как все начиналось // Инфокобрин [Электронный ресурс]. Режим доступа: http: // www. inkobrin. org/ page-id-1104 html. Дата доступа: 02.07.2016.

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

АВАК — Акты, издаваемые Виленской Археографической комиссией для разбора и издания древних актов.

АЗР — Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией.

АСД — Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа.

ИЮМ — Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг Витебской и Могилевской губерний.

ІМЭФ НАН Беларусі — Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

ПСРЛ — Полное собрание русских летописей.

# ЗМЕСТ

Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .3
Глава 1. ТРАДЫЦЫЙНАЯ ВЁСКА (X — ПАЧАТАК XX СТ.) . . . . . . . . . . .5
Сістэмы земляробства і прылады апрацоўкі глебы . . . . . . . . . . . .6
Землеўладанне і землекарыстанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .28
Палявыя харчовыя культуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .52
Сяўба і догляд за пасевамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .79
Уборка, апрацоўка і захаванне ўраджаю . . . . . . . . . . . . . . . . . .105
Глава 2. БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў ГАДЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ . . . .172
Глава 3. СУЧАСНАЯ ВЁСКА (КАНЕЦ XX — ПАЧАТАК XXI СТ.) . .251
Спіс скарачэнняў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .310

Навукова–папулярнае выданне

**Бялявіна** Валянціна Мікалаеўна

**ХЛЕБ НАДЗЁННЫ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ**

Рэдактар *Ю.А. Аверчанка*
Мастацкае афармленне *У.П. Свентахоўскага*
Мастацкі рэдактар *В.Г. Загародні*
Тэхнічны рэдактар *Ю.М. Раковіч*
Карэктары *Н.Г. Баранава, В.І. Смірнова, Л.К. Сямёнава*

Падпісана да друку 12.08.2016. Фармат 60×70 $^1/_8$.
Папера мелаваная. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 33,15. Ул.-выд. арк. 30,0. Тыраж 1000 экз. Зак. 822.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь. http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.



Выдавецтва «Беларусь»
ISBN 978-985-01-1183-8
9 789850 111838

В.М. Бялявіна

# ХЛЕБ НАДЗЁННЫ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ